Другі фронт мастацтваў

Аляксей Талстоў

# БЕГ

Раман

Мінск
«Галіяфы»
2008

УДК 821.161.3-31
ББК 84(4Беи)-44
Т 16

Серыя заснаваная ў 2000 годзе

Р э д а к ц ы й н а я   к а л е г і я   с е р ы і:

Зміцер Вішнёў (галоўны рэдактар), Міхась Башура,
Валянцін Акудовіч, Ілля Сін

Выдавецтва “Галіяфы” выказвае падзяку сп. Г. Грушавому
за падтрымку ў выданні гэтай кнігі.

**Талстоў, А. С.**

Т 16 Бег : раман / Аляксей Талстоў – Мінск : Галіяфы, 2008. – 200 с. – (Другі фронт мастацтваў).

ISBN 978-985-6906-05-6.

Раман «Бег» – гэта ў першую чаргу спроба ставіць пытанні, спроба сумнявацца. Героі кнігі – не ўпэўненыя ў будучыні, не ведаюць, ці было нешта ў іх мінулым; ім застаецца адно сучаснасць, нематываваны бег сярод крохкіх пейзажаў, такіх жа самых, як і раней, толькі пазбытых сваёй грунтоўнасці. Раман мае заблытаны сюжэт, на фоне якога падзеі падаюцца рванымі і нелагічнымі. Часам чытач можа адчуць нясконченасць думкі. Усё гэта правакуе да роздуму над вечнымі каштоўнасцямі і дробным існаваннем чалавека ў гэтым свеце...

**УДК 821.161.3-31**
**ББК 84(4Беи)-44**

**ISBN 978-985-6906-05-6**

© Талстоў А. С., 2008
© Афармленн. ПВУП «Галіяфы», 2008

# Незаймальная антрапалёгія Аляксея Талстова

На жаль, гэтай кнізе не наканавана стаць сэнсацыяй – з прычыны «паліткарэктнасьці» выдаўцы пазамянялі ўсе густа раскіданыя па ёй мацюкі нейкімі эўфэмізмамі. І гэта гарантыя таго, што грамадзкага рэзанансу раман Лёшы не атрымае і цытаты зь яго, утвораныя са словаў з трох або пяці літар, ня будуць упрыгожваць крытычныя артыкулы і абсмоктвацца ў ЖЖ. Бо астатнія словы, якіх у роднай мове да халеры, сёньня мала каго цікавяць.

Тым ня меней (або нават болей), «Бег» можа прэтэндаваць на статус найвялікшай неспадзяванкі з усяго, напісанага па-беларуску за апошнія гады. Зьдзіўляе ён і сам па сабе, і зважаючы на тое, што зазвычай па-беларуску пішацца. Зрэшты, ад апошняга гэты твор цалкам дыстанцыяваны.

Здавалася б, усеагульнае памкненьне да лёгкага і забаўляльнага чытва ўжо павінна было забіць у беларускай літаратуры ўсё жывое. І маладым аўтарам застаецца адно спаборнічаць у сваім уменьні разьвесяліць спажыўца не заўсёды кемлівымі «кавээнаўскімі» жартамі. Бо для літаратуры, якую амаль ніхто не чытае, павярхоўнасьць уяўляецца як адзіная панацэя.

Замест гэтага аўтар прапаноўвае інтэнцыйна сур’ёзнае (хаця й зусім не занудлівае) антрапалягічнае дасьледаваньне, для якога характэрныя заблытаны клубок калізій, да непрыстойнасьці шчырыя думкі і папраўдзе мастацкія апісаньні. Трэшу тут таксама хапае, але ён ня здатны выклікаць замілаванай усьмешкі.

Раман пачынаецца досыць звыклым для сучаснай літаратуры апісаньнем панурых рэалій: бітма набіты траспарт, шэрыя твары, бэтонныя джунглі… Без асаблівай цікавасьці і асалоды назіраючы за ўсім гэтым, ты пакуль нават і не прадчуваеш, што замест вандроўкі ў плоскасьці працягласьцю ў наступныя дзьвесьце старонак аўтар неўзабаве прапануе табе іншы шлях: узьняцца трохі вышэй па-над звыклымі краявідамі – не ў духоўным пляне, а проста каб лепей было відаць. Убачаныя ў такім ракурсе, апрыклыя рэаліі становяцца ўмоўнымі і несамадастатковымі. Становяцца проста дэкарацыямі, у якіх наканавана выконваць свае ролі Лёшавым героям.

Бы маленькія і не заўсёды бяскрыўдныя кроцікі, кожны зь іх самастойна пракладае свой шлях у тоўшчы быцьця, непрыемна вільготнай і гразкай. Гэтыя шляхі праходзяць па розных мясьцінах – у цывілізаваным сьвеце, запоўненым людзьмі, у цывілізаваным сьвеце, дзе людзей ужо няма, і ў атачэньні не кранутай цывілізацыяй прыроды. У выніку шляхі перасякаюцца альбо не перасякаюцца. Кожны з тых, хто рухаецца, ставіць перад сабою пэўныя мэты, але насамрэч іхны рух атрымліваецца ня больш мэтаскіраваным за ранішні бег трушком.

Героі гэтыя вельмі падобныя да жывых людзей: у іхнай галерэі ёсьць і «нефер» са схільнасьцю да забароненых рэчываў, і «сучасная дзяўчына», што амаль выпадкова забівае свайго каханка, і «прыстойны грамадзянін», у якога раз-пораз не спрацоўваюць тармазы… Некаторыя героі пазбаўле-

ныя сваіх сацыялягічных прыкметаў – мусіць, пад узьдзеяньнем эмансіпаванага ад соцыюму навакольнага асяродзьдзя. Але ж яны ўсё адно здаюцца жывымі.

Таму пазыцыя аўтара, які з чыста дасьледніцкім інтарэсам разглядае іх праз лупу, уражліваму чытачу можа падасца досыць спрэчнай з маральнага пункту гледжаньня. Зрэшты, літаратура – гэта менавіта тая сфэра дзейнасьці, дзе досьледы над людзьмі не зьяўляюцца супрацьзаконнымі. Бо героям насамрэч не баліць і бадуна ў іх не бывае.

Самыя моцныя фрагмэнты раману – тыя, дзе словы пачынаюць нібы напаўзаць адно на адно, дзе іх плынь ужо не дэтэрмінаваная ўласьцівымі для мовы канструкцыямі. У такія моманты часам здаецца, нібы героі перажываюць нейкае хваравітае прасьвятленьне, свайго кшталту памежную сытуацыю. Але аўтар і не хавае таго, што такія ўражаньні падманлівыя. І неўзабаве бег аднаўляе свой тэмп.

Высновы, здатныя ўзьнікнуць па прачытаньні гэтай кнігі, могуць быць вельмі сумнымі. Жыцьцё бессэнсоўнае, Бога няма, хэпі-энд немагчымы… Чалавек немагчымы таксама, бо, па вялікім рахунку, ён ня надта адасабляецца ад жывёлы. І ўвогуле, усе мы памрэм.

Але спрачацца з аўтарам чамусьці зусім ня хочацца – нават калі сфабрыкаваныя вышэй думкі (паверце, я зусім ня стаўлю перад сабой мэту прыпісаць іх Лёшы) зусім не адпавядаюць тваймy сьветапогляду. Дый увогуле, гэтыя думкі лепей не фабрыкаваць. Лепей наогул не рабіць ніякіх высноваў.

Роля аракула, які валодае адказам на згаданыя вышэй пытаньні, для Лёшы, відавочна, не па плячы. Дый шукаючы гэтыя адказы, толькі самы бязглузды чытач прыме на веру ўжо гатовыя. Бо шукаць і знаходзіць іх трэба самім.

Таму важнасьць гэтага твору менавіта ў тым, што ён здатны задаваць пытаньні. Актуалізаваць тыя пытаньні, якія ладна прыцярушаныя ў нашай сьвядомасьці павярхоўным спрафанізаваным жыцьцём, занадта банальным для таго, каб пра яго пісаць.

*Ільля Сін*

# 1

Тралейбусы. Бясконцая штурханіна, барацьба за месца. Маладосьць і старасьць. Сьмярдзеньне целаў; пах тытуню, перагару і таннай парфумы. Працоўныя і службоўцы. Дысананс сэрцаў, думак. Гучныя галасы маладзёнаў замінаюць чытаць. Нэрвовы пералік прыпынкаў. Колькі там яшчэ засталося? Пяць? Шэсьць? Кожны дзень прымушаць сябе, але наўрад ці прызвычаісься. Заўжды будзеш бурчэць сабе пад нос, і чым далей, тым больш. Неістотна, чалавек заўжды ўмеў гэта лепш за іншых. Бурчэць, прызвычайвацца... Ці памыляюся? Можа, і так, але гэта, ізноўку ж, неістотна. Так ці інакш, штодня мы робім тое, што быццам бы трэба рабіць... Каму? Перад кім мы мусім весьці справаздачу? Лухта. Ніхто ў гэтым сьвеце не нясе за нас адказнасьці, мы нікому нічога ня вінныя. Мы ўсіх пашыхтавалі і загадалі падпарадкоўвацца. Нават цяляты нараджаюцца толькі дзеля нас...

Колькі людзей мы ўжо ўсунулі ў гэты тралейбус? Дзе яго канцавы прыпынак?..

Сьпераду зьлева, насупраць таго, што сьпінкаю наперад... Вось менавіта на ім сядзела маленькая дзяўчынка. Дрэнна апранутая, мурзатая, нейкая недагледжаная, штосьці сярэдняе між вулічнай жабрачкай і сіроткай зь дзіцячага дому. Маленькія вочы і пустыя. У такіх вачох ніколі ня знойдзеш важкіх думак. Такія вочы ня могуць належаць чалавеку, які будзе ўсё жыцьцё корпацца ў навуковай літаратуры, спрабуючы вынайсьці лекі супроць сьмяротнай хваробы. Такія вочы ня могуць уплываць, зрэдку здольныя вабіць, ня могуць, дый ніколі не захочуць штосьці зьмяніць. Гэта вочы касіркі ў вашай краме. Насамрэч яшчэ не вядома, ці ёсьць у гэтым якія заганы. Можа, наадварот, уладальнікі такога спакойнага, бесклапотнага позірку насамрэч і зьяўляюцца найлепшымі зь людзей, самымі гарманічнымі. Ім нічога не патрэбна, нічога звыш таго, што мае кожны.

Ім нават ня трэба шукаць спакою, ды і думаць пра гэта ня трэба. Але чамусьці прынята лічыць усю гэтую жыцьцяздольнасьць нейкай адмоўнай, бессэнсоўнай... Ды ўвогуле ўсё гэта мусіць адпавядаць слову «блага». Гэтая маленькая дзяўчынка ўжо дрэнная. Загадзя. Вось так і пахавалі жыцьцё. Ёй толькі пяць, наўрад ці болей. Але дастаткова толькі позірку. Нават калі гэтае меркаваньне спрэчнае, то можна спаслацца на тое, што тралейбус паедзе далей, дзіця паедзе далей, схаваецца дзесьці ў далечыні, але ў любым выпадку касірка ў краме не паглядзіць у ваш інвэнтарны кошык неяк па-іншаму, не адлічыць рэшту зь нейкай неверагоднай хуткасьцю і ня пойдзе дамоў у прадчуваньні вячэры і тэлевізара. Як казаў Антуан дэ Сэнт-Экзюпэры, «у кожным з гэтых людзей, магчыма, памёр Моцарт».

Жорстка?

Так.

Але гэта маё жыцьцё. І менавіта я глядзеў тады ў тыя вочы і рабіў высновы сваім розумам, і пісаў сваімі пальцамі. Ад дакладнасьці ці верагоднасьці агульная карціна сьвету не зьмяняецца. Ад гэтых словаў не залежыць колькасьць пасажыраў тралейбуса, у якім вы цяпер едзеце. Дзеці робяцца дарослымі, дарослыя сталеюць, блытаюцца ў сваёй сівізьне і хваробах, а старыя больш ня хочуць цяжкасьцяў выбару, дый ня маюць яго. Старым дастаткова спакою і ўвагі з боку нашчадкаў.

Пустымі вачыма непрыгожая дзяўчынка глядзіць праз шкло на горад, які патроху набывае абрысы ў маленькай памяці... За яе сьпінай стары зь сівою барадою. Відавочная нястача зубоў, мокры позірк. Разгубленасьць. Падаецца, ён адчувае сябе няўтульна. Цалкам верагодна, што рэдка карыстаецца грамадзкім транспартам. З гаспадарчай торбы ў нагах ён час ад часу дастае жмені нейкіх ласункаў. Ці то кукурузныя шарыкі, ці якіясь цукеркі. Стары працягвае сьціснутую руку малой праз плячо і асьцярожна высыпае зьмесьціва ў падстаўленую дзіцячую далоньку. Тая прыціскае сьціснуты кулачок да грудзей

і зрэдчас кладзе па шарыку сабе ў рот, ледзьве заўважна. Дзед, бачна, хоча есьці, ён неяк сарамліва паглынае сваім зарослым сівізной ротам усю гэтую салодкую прафанацыю і імкнецца больш глядзець у вакно, пазьбягаць трапных позіркаў суграмадзянаў. Ня хоча быць заўважным, хаваецца. Ад каго? Стары нічога не зрабіў. Ні добрага, ні благога – нічога. Ён хутка памрэ.

Хтосьці глядзіць у будучыню (будучыню! будучыню!! будучыню!!!), хтосьці ў бруднае вакно.

Зморшчаная, вялікая, троху ссохлая рука дзеда і пустыя вочы дзіцяці. Вельмі сымбалічная карціна. Выдатная характарыстыка сёньняшняга вечару.

Дык колькі нас там на задняй пляцоўцы?.. а зрэшты, неістотна.

– Ну?

– Што «ну»?

– Ну чаго тэлефоніў?

– А… зараз… пачакай сэку…*:%_…?;№7,(*?%:3:…. П?89895?%:)*…

– Ляць…

– Ало… чуеш?

– Так.

– Трэба сустрэцца. Мне тут слухаць няма чаго. Хацеў у цябе наконт дыскаў спытаць.

– Якіх дыскаў?

– Ну кажу, слухаць няма чаго. Можа, у цябе што па рэгі ёсьць новага?

– Не, па рэгі няма.

– Няма?..

– Але ёсьць такі неблагі даб. Ня так даўно сабе тут пару балванак нарэзаў.

– У! нішцяк! А які фармат?

– Audio.

– Слухай, падгані пару гэтых…

– Добра... Ну як заўжды... Угу?

– Так.

Перамотка троху наперад. Ці назад. Карцінкі незразумела рухаюцца на экране. Якія там 24 на сэкунду?! Фігня нейкая.

Бег між платоў. Бег ад жыцьця між жалезабэтонных платоў. Індустрыяльнае грамадзтва нарадзіла нас такімі, і няма чаго нас цяпер судзіць. Мы ня менш, чым астатнія, ненавідзім, ня менш гвалтуем, ня менш забіваем. Я ня думаю, што мы ўжываем больш наркотыкаў, чым папярэднія пакаленьні, але гэты адвечны бег ужо ў крыві. Можа, зь цягам часу ён ператворыцца ў новы інстынкт. Калі гэта адбудзецца, то можна будзе назіраць і сьмяяцца. Што возьме верх: «Хопіць! Не чапайце мяне! Пайшлі прэээч!!!» ці «Хадзі сюды, сука, я пакажу табе, хто тут сапраўдны мужчына!». Магчыма, сьмяяцца давядзецца даволі доўга. Нават і сёньня часам можна злавіць у сябе на вуснах усьмешку. Так ці інакш, а чалавек пакуль што ня больш чым сацыяльнае гаўно.

«Была вясна...» – грубы мазок масьцярком па грунтоўцы, першая жалезная пражавелая пляма на полі вобразаў, першая намаляваная чорная клетка на шахматнай дошцы. Усё ўжо зразумела. Далей чытаць няма неабходнасьці. Усім, хто пачынае займацца такімі справамі, вядома, што нічога новага напісаць сёньня немагчыма, усё ўжо створана. Навокал толькі чарговыя перафразіроўкі і абсмоктваньні архаічных сэнсаў. А пайшлі вы ўсе на гуй. Бягу, а значыцца, існую.

(як казаў адзін мой знаёмы, калі хацеў сьцісла ахарактарызаваць самаадданых маладых апазыцыянэраў: «Я...аныя рамантыкі.»)

У 14 год хлопчык прачнуўся адзін сярод ночы ў чужым пакоі, у чужой кватэры, на чужой канапе. Першы раз у жыцьці напіўся і прачнуўся ад таго, што ў сьне ўзгадаў пра маці. «Маці будзе турбавацца». Ён надзеў кеды і пабег дамоў. Пакуль бег, хваляваўся. На электронным гадзіньніку было ўжо тры, на вуліцы не

было нікога. П’яны падлетак. Якая лірычная карціна! Маці нічога не заўважыла. Яна толькі сказала:

– Ну дзе ты ходзіш? За што ты мяне так ня любіш? Давай хутка спаць, заўтра – у школу.

Пасьля – ранак, школа, дзёньнікі, адзнакі, настаўніца – старая блядота. Усё проста. Словам «прастытутка» хлопчык актыўна карыстаўся ў адрас выкладчыцаў ужо ў другой клясе, што тады казаць пра іншыя, куды карацейшыя. Маці гэта не падабалася. Яна «нараджала яго ня дзеля гэтага...»

Пасьля, на даху шматпавярховіка, а можа, і да таго, дзеці курылі цыгарэты. Не, пэўна, да таго, год у дзесяць, а то і раней. Мама таксама нічога ня ведала. Ня тое, што яна была няўважлівай да свайго дзіцяці. Не, нават часта крычала на яго, а той плакаў. Сьціскаў кулачкі, крыўдаваў, але нічога ня мог з гэтым зрабіць. Маці любіла яго, хацела зьберагчы ад шкодных уплываў вуліцы, выхаваць сапраўднага чалавека... Шмат чаго хацела і яшчэ шмат піла. Бацькі пілі, а дзеці ў летніку таксама пілі. І дзьмулі дудку. А яшчэ пазьней навучыліся карыстацца рондалямі і патэльнямі, што дало новыя магчымасьці. Гэта ўсё было куды больш цікавым, чым падручнікі і заняткі з рэпэтытарамі, куды патрэбней, чым паступленьне ў абраную бацькамі незразумелую ВНУ.

Ня трэба зьдзіўляцца. Чарлі Паркер ужо ў 17 ганяў па дарогах і займаўся падобнай лухтою, а ён дакладна быў адзін зь іх. Але дзеці былі толькі дзецьмі. Дзеці яшчэ вельмі блага разьбіраліся ва ўсіх гэтых тэмах. Яны ня ведалі пра Паркера і таму хацелі памерці ў 21, як Сід, ці ў 27, як Курт, але ніяк не пазьней. Напэўна, наваколле не выклікала ў іх асаблівага даверу. Ды і казалі яны куды больш, чым разумелі, у чым, зрэшты, нічога незвычайнага не было. Такія вось Пітэры Пэны... Але ў рэшце рэшт яны рабіліся клапатлівымі матулямі і татачкамі і два разы на дзень прабівалі талёны.

Хлопчык перастаў быць хлопчыкам, але яшчэ ня стаў таткаю. І была вясна.

Бег між платоў.

Пабліта выйшаў з брамкі. Удар жалеза аб жалеза. Зразумелы і безапэляцыйны, як першыя лісьцейкі на дрэве. Толькі да іх было яшчэ далёка. Напэўна, некалькі месяцаў... ці тыдняў. Дакладна Пабла ня памятаў; прасьцей кажучы, ня ведаў. Ён забыў усё, усе акалічнасьці гэтых год, праведзеных у ролі маладога мужчыны, падлетка, дзіцяці. Усё неяк згубілася, ператварылася ў нейкія гісторыі з кніжак, ці, можа быць, якіхсьці фільмаў. Нядаўна ён злавіў сябе на думцы, што мала што ведае. Але гэта не асабліва ўразіла. Настрой часу суцэльна спраўджваў гэтую абыякавасьць. Гуй на ўсё, размазаныя па асфальце соплі, енкі і іншая біялёгія. Тыдні ля манітору адкаліся ў сьвядомасьці белымі стужкамі першаклясьніцаў, зьмяшаліся ў кропках і працяжніках, у нулях і адзінках. Хлопец згубіўся ў літаратурных крыніцах, экзамэнацыйных пытаньнях і парнасайтах. Мозг асьцярожна выскублі з чэрапу і пакінулі апошні сушыцца, каб пасьля адлякаваць і прадаць багатым турыстам за іхныя даляры. Усе яны маюць вялікі досьвед працы ў офісе, у іх актыўная жыцьцёвая пазыцыя і забясьпечаная старасьць. Прыхільнікі Карнэгі ніколі не прызнаюцца ў тым, што бачаць у снох лякаваныя бліскучыя чарапы прыгожых юнакоў. Што ім яшчэ патрэбна, самаўпэўненым і да ванітаў здаровым, як ня троху вычварэньня пасьля вячэры?

Пабліта, напэўна, будзе такім жа, але ня заўтра. На заўтра ў яго іншыя пляны. Нас яны не датычацца. Сонца вывалілася з-за суседзкай страхі ды выклікала надзею. Можа быць, калісьці ўсё будзе паіншаму. Колеры зноўку набудуць яркасьць, і перагрызеныя шыі загояцца. Лязгат мэталу і крокі па асфальтаваных ходніках. Гук падэшваў, надакучлівы, як пятая сымфонія Бэтховэна, мерны рух наперад у да болю знаёмую будучыню. Уздоўж плота, драўлянага і прагнілага, старога як дух гэтага гораду. Бег. Духа паспрабавалі загнаць пад новенькую брукаванку, пасадзіць за бліскучы мармур і новыя

агароджы. Наіўныя. Ніхто ў гэтым месцы ня меў большай здольнасьці да адаптацыі. Калі тут зьявяцца натоўпы турыстаў, нават тады дух будзе жыць тут, бадзяцца па вуліцах і есьці са сьметнікаў у няўтульных дворыках. Дух гораду, даволі ўмоўнае вобразнае ўвасабленьне стагодзьдзяў канцэнтраваных пакутаў і амбіцыяў, крыкаў пабітых дзяцей і пацалункаў на вечаровых лавачках. Усё зьмяшанае ў адной шклянцы і выпітае нагбом толькі што прачнуўшымся, усё яшчэ паўп’яным беспрацоўным гуманітарыем. Але цяпер толькі сонца гэтаму духу калега. Толькі сонца можа быць зь ім у хаўрусе. Першае сонца новай вясны. Хай і чарговай па сваёй сутнасьці. Калі яно зьявілася, хтосьці нават пачуў урачыстыя фанфары, так яго чакаў. Але будуць яшчэ тысячы такіх жа, і ня трэба хлусіць, што яны чымсьці адрозьніваюцца адно ад другога. І тысячы Паблаў... Мільёны Паблітаў рана ці позна пачынаюць здагадвацца, што ім падсунулі ня хэндмэйд, а кітайскую штампоўку, ня больш. Пяшчотна прыціскаючы яе да свайго стомленага, неадкрытага сэрца, усе яны бягуць, як ім падаецца, прэч, а насамрэч бягуць на месцы. Падстаўляюць твар сонцу, а яно ня больш чым зорка, якой засталося якіхсьці пяць мільярдаў год. Такіх па ўсім сусьвеце куды больш, чым лічбаў у галаве гэтага юнака.

Але ўсё гэта ня страшна. Няма чаго баяцца. Анікуды мы не падзенемся, памрэм усе як адзін.

Глухі мэталічны ўдар. Без асаблівых фонавых наступстваў. Крокі па асфальце ў бок маналітных сьценаў мікрараёну. Мала хто верыў у тое, што ў гэтым горадзе могуць быць трушчобы. У гэтай краіне ніколі не ўжывалася падобнае слова. Тут заўжды ўсё было выдатна, і ў трушчобы ўвогуле ніхто ня верыў. Ды іх і не было насамрэч. Хаця на тле праспэктаў і спальных раёнаў падобныя кварталы прыватнай забудовы часам выглядалі менавіта так. Але памылкова было б выкарыстоўваць слова «гета». Было шмат задаволеных падобным ладам жыцьця. Ды і кожны

сам вырашае, у якім лайне яму корпацца. Але зь цягам часу нават добра пафарбаваная драўніна пачынае падгніваць. Нічога з гэтым ня зробіш, ёсьць працэсы, на якія чалавек яшчэ не навучыўся ўплываць.

Пабла збочыў. Ён думаў не пра прагнілыя платы і беспародных сабак-вартаўнікоў, што надрывалі зьвязкі. Калі штодня іх бачыць, цяжка надаваць ім якую-кольвечы значнасьць. Платы і стрэхі. Мы не зважаем на іх, але тым ня менш адгароджваемся і прыкрываемся імі. Хаваем сябе ад гэтага сьвету, прагнем спакою і сувэрэнітэту... А пасьля скардзімся на адзіноту.

Яшчэ адзін паварот, а за ім проста, да прыпынку. Як жа паліць сонца! Яно яшчэ не набрала столькі энэргіі, да лета яшчэ далёка, але ўжо адчуваецца ягонае здольнасьць паставіць на месца каго заўгодна. Яно заліла бульвар, неяк пяшчотна і спакойна. Без агрэсіі і папулізму. Навокал было ціха. Ніколі Пабліта не адчуваў тут залішняй мітусьні. Жанчыны з сабакамі, маладыя матулі, што яшчэ ўчора былі аднаклясьніцамі, мерна пагойдвалі калыскі. Жыцьцё чалавека з усёй сваёй мернасьцю цякло кудысьці наперад.

...Бэтонную плітку тут яшчэ не зьмянілі, і бульвар падаваўся нейкай архаікай у параўнаньні з вылізанымі і дэманстратыўна дагледжанымі цэнтральнымі прыпынкамі і крамамі. Падэшвы націралі плітку і рухалі цела. Юнак думаў пра абвастрэньне пахаў. Пахла ня толькі зямлёй. Гэта заўжды ўвесну так пахне. Але былі і іншыя водаравыя выявы. Нагрэтая гума, старая фарба лаваў. Калі загнацца, магчыма было нават адрозьніць пах сьнегу, што так настойліва і самаадданa трансфармаваўся ў лужыны. Ўсё нейкім чынам стварала дэкарацыі... усе адчуваньні... нейкі рэстарт. Крумкачы са зграбнасьцю дасьведчанага інваліда скакалі па асфальце, часам уздымаліся на дрэвы, выгіналі шыі, нешта хрыпелі. На лаве сядзелі дзьве бабулькі, побач стаяла трэцяя. Яны гналі сваю адвечную бытавуху. Рысы твараў пэрыядычна напружваліся, і было прыблізна зразумела, які мімі-

ны малюнак будзе наступным. Бабулькі чамусьці боўталі нагамі, як маленькія дзяўчаткі, але заўважыць гэтае падабенства ў іхных вачох было значна цяжэй. Яны былі папросту хітрымі старымі сукамі, але, вядома ж, ня між сабою. Між сабою толькі з павагаю і ледзьве не на «вы».

Насамрэч, калі ідзеш міма, то звычайна ня думаеш пра такіх пэрсанажаў. Максымум што – павядзесься на пахі і на птушак. Звычайна сам сабе нешта там. Пабліта цяпер менавіта такім і быў. Штосьці ў галаве круцілася, штосьці білася і калола пусты чэрап.

«Менш трэба піць».

Сёньня ён ня хоча займацца справамі. Ня хоча вучыцца. Ня хоча ўдзельнічаць ва ўсёй гэтай ідыёцкай клаўнадзе. Ня той дзень, не для гэтага. Сьвежы вецер па голеных шчоках. Тытунь.

Заскочыў у тралейбус – і панеслася. Вуліцы, скрыжаваньні, сьвятлафоры, людзі ў транспартных сродках. Сакавіцкі горад расплыўся фарбамі. Зраніцы паабяцалі да +8, ёсьць нагода яшчэ раз усьміхнуцца. Яшчэ адзін паварот, рукі мацней сьціснулі поручні. Брудныя, высушаныя сонцам самаходы прагнулі вады. Як цяжка было ім у гэтай бруднай зімовай сьвітцы. Але сёньня вады не было. Учора. Удзень – дожджык, а ўвечары прыемная вільгаць. Вечар куды цяплейшы, чым раней. Нічога, відаць, засталося ўжо няшмат, такі выкруціліся. Пабла блага пераносіў халадэчу. Часам падавалася, што лепей бы яму жыць там, дзе зімы ўвогуле няма. Але тым ня менш усё было толькі так, як было, і думкі пра нейкія зьмены так і заставаліся толькі думкамі.

– Малады чалавек, прашу прабачэньня. Можна да вас зьвярнуцца? – дзядзька спартовага выгляду, характэрная вязаная шапачка. Сьпіты лыжнік? Вар'яцтва ў вачох. Позірк пільны і асьцярожны. Чакае. А як яшчэ можна паставіцца да падобных пытаньняў у грамадзкім транспарце, як не насьцярожана? Ва ўмовах сучаснага грамадзтва, канечне.

Як на гэта рэагаваць, калі кожны сам за сябе, і ўсе навокал канкурэнты і ворагі зь ветлівымі ўсьмешкамі і бранiраванымі выразамі твару?

– Так. Можна.

– Я вось ужо трэці прыпынак за вамі назіраю. Вы, напэўна, студэнт.

– Так, – але Пабліта не студэнт. Дый якая ж цікавая і арыгінальная ў дзядзькі вэрсія. Кім можа быць такі маладзён яшчэ, як не студэнтам? Так, натуральна, хто, як не студэнт. Але сёньня – не. Кім заўгодна, толькі не студэнтам. Ніякіх сацыяльных роляў. Колькі можна засоўваць сябе з галавою ў гэтую сраку? Колькі можна вешаць на грудзі бэджыкі і прабаўляцца ціхімі, спакойнымі гульнямі? Хай працоўны, паэт, фэльдшар, краязнаўца ў экспэдыцыі, але ня гэтая лухта!

«Новыя і новыя пытаньні! Толькі не спыняйся, разарві маю галаву, разьбі яе развадным ключом сваіх бяздонных блакітных вачэй, шаноўны незнаёмец!»

– Думаю, вы цікавіцеся філязофіяй. Бачна, што вы разьбіраецеся ў людзях…

– .., – нечакана, – Пабла зьдзіўлена паглядзеў на чалавека. Той чамусьці ўсё яшчэ сядзеў на сваім месцы, нягледзячы на тое, што гутарка ўжо прайшла сваю ўступную стадыю. Можа, ён папросту забыўся, што згодна з этыкетам у падобнай сытуацыі трэба было ўзьняцца і працягваць размову стоячы.

– Я назіраў за вамі і таму вось і зьвярнуўся... Усходнія рэлігійныя сыстэмы, ці ня так?

– У нейкай ступені, – а чаму б і не, часам патрэбныя і прыгоды. Так. Чаму б не паразмаўляць з выпадковым пасажырам, незнаёмым прыхільнікам спартовага стылю зь невыразным, але ўсё ж такі заўважным вар’яцтвам дзесьці ў глыбіні чырвоных вачэй.

– …мяне Валодзя…

– Паша.

– Я каратэ займаюся… вось так… ужо даўно, – вочы выяжджалі з арбітаў і засоўваліся назад. Яны, небаракі, відаць, чагосьці сарамліва так шукалі. Які

шалёны выраз твару ў гэтага чалавека. Кароткія валасы ўжо сівелі, але падобны ён быў больш да разгубленага дзіцяці, да падлетка-завучкі, якога напалохалі новыя пачуцьці. Кожнае ягонае слова паасобку было зразумелым, але сынтаксычныя канструкцыі развальваліся на вачох, як тыя амэрыканскія хмарачосы.

– ...як ты думаеш, Паша, ці мела гэта сэнс? То бок, ці гэта нармальна?

– Так, – аўтаматычная фармулёўка. Толькі тое, што мела сэнс, чамусьці засталося дзесьці па-за размоваю.

Чалавек глядзеў наўпрост Паблiту ў твар. Галава рухалася з боку ў бок, спрабуючы прыдаць словам як мага болей выразнасьці.

– Вось ведаеш, калі чалавек прыходзіць дамоў і крычыць на сваю жонку «я цябе заб'ю!», і кідаецца ўжо на яе, ці гэта нармальны чалавек?

– Што вы маеце на ўвазе пад словам «кідаецца»?

– Ну, я мяркую, у яго ня ўсё з галавою добра. Як ты думаеш? – Валодзя казаў гучна, часам нават пераходзячы на крык. Ён зусім не зважаў на бедных, і без таго знэрваваных пасажыраў. А тыя між іншага ўважліва сачылі за ходам падзеяў. Такое адчуваньне, што калі б спартовец панізіў голас, з усіх бакоў да яго прысунуліся б вушы суграмадзянаў, настолькі патрэбным, нават неабходным, для іх быў факт падзеі, выпадку. Нарэшце тут штосьці адбывалася, да чаго яны мелі хіба нейкае, няхай і зусім ускоснае, дачыненьне.

– А навошта ён на жонку кідаўся?

– Ну, мы сядзелі, значыцца. Я зайшоў, ну там, пазыку аддаць. Сядзелі, значыцца, гарбату пілі... А ён толькі нядаўна выйшаў, – вочы напружана шукалі спакою. З-пад вуснаў Валодзі пахла ня так пагана, як чакаў хлопец. Чалавек відавочна трымаў сябе ў форме. – А ён, значыцца, прыйшоў і крычыць: «Я заб'ю цябе, ляць, сука!» Ну ці гэта нармальны чалавек, як ты думаеш?

– Натуральна, не нармальны.

– Вось і я думаю. Навошта ён такое кажа? Нармальны чалавек так рабіць ня будзе.

Дзьверы адчыніліся.

– Ведаеце, я выходжу, – але Пабла ўжо зразумеў, што чалавек выйдзе разам зь ім.

Яны перайшлі дарогу і рушылі праз дворык на суседнюю вуліцу. Каратыст ня вельмі напружваў, было нават трошкі цікава, але разам з тым хацелася ўсё ж ткі яго скінуць. Дыскамфорт, насьцярожанае стаўленьне да незнаёмцаў...

– Не, нармальны чалавек, дакладна, так рабіць ня будзе, – хлопец у які ўжо раз паўтарыў гэтую тэзу.

– Добра, а як тады быць з гэтым чалавекам?.. а ён... ён раней баксэрам быў. А ў іх, я табе скажу, там насамрэч з галавою праблемы... так, адбіваюць галаву, – спартовец ківаў і махаў рукамі, быццам бы надаваў словам дадатковую форму, падводзіў лініі, рабіў іх тлусьцейшымі, лепш заўважнымі.

– Навошта тады зь ім знацца?

– Значыцца, ты мяркуеш, што яго трэба папросту пакінуць... пакінуць... Ведаеш, я таксама так думаў. А можа, яму трэба патлумачыць?

– А навошта тлумачыць, калі сам сказаў, што гэта немагчыма? Навошта тады рэагаваць на нэгатыў? – было цікава штосьці раіць чалавеку зь сівізною. Але пытаньні былі сапраўды нейкімі ці то дзіцячымі, ці то ідыёцкімі.

– То бок пакінуць яго ў спакоі, так ты мяркуеш?

– Так.

– Ты ведаеш, папросту я магу яму нашкодзіць. Ён мяне баіцца і на яе ўсё... а ён дурны. Я мацнейшы за яго. Але я спакойны. Я вельмі спакойны! Яны ж баксэры, у іх жа ўсё жорсткая сіла. А ў нас – гармонія... З космасам.

Валодзя ўвесь рухаўся, штосьці быццам бы крэсьліў у паветры, нейкія схемы. Усё было амаль што бязьзьвязным. Звонку падавалася, што, калі мэханізм спыніцца, адбудзецца штосьці непажаданае, таму іншага выйсьця, як ганяць паветра, не існавала. Вусны выплёўвалі словы лёгка і хаатычна, безь якойсьці

сыстэмы. – Цьвёрдае і жорсткае памірае, мяккае і гнуткае жыве.

«Цьвёрдае і жорсткае памірае, мяккае і гнуткае жыве».

– Так, я ведаю, – паўтараў Пабліта, – ведаю.

– Ты лічыш, што ня трэба прымаць на сябе гэты бруд? Лічыш, што гэта ўсё бруднае?

– Так, натуральна.

– Добра, дзякуй табе. Дзякуй вялікі, я так і зраблю. Усё зразумела.

Пацiснуў руку. Скочыў у аўтобус.

Плынь інфармацыі раптоўна спынілася.

У чым вы ўпэўненыя болей: у сваім нараджэньні ці ў сваёй сьмяротнасьці?

Тут было цёмна. Наведвальнікаў было зусім небагата. Пабліта толькі адчыніў дзьверы, і ўсе твары павярнуліся да яго. Але чамусьці гэта адбылося настолькі павольна, што хлопец пасьпеў заўважыць, як перакацілася па скуры бляклае сьвятло электралямпачак. Старыя добрыя галівудзкія вэстэрны. Кінастужкі яшчэ не канчаткова згнілі ў архівах, не да канца сьцерліся з памяці. Тыя, хто сядзеў бліжэй, і тыя, хто ў глыбіні, – усё гэта папросту калекі, што ня маюць іншага выйсьця, чым бавіць час за стойкаю. Больш ісьці ім не было куды. Госпад Бог па-ранейшаму не зьвяртаў на іх увагі. Ды і понту яму было гэта рабіць. Адвечны пах тытуню і алькаголю ўрос у гэтыя сьцены, і прыхільнікаў усялякіх абстракцыяў тут не шанавалі. Іх тут моўчкі пераважоўвалі.

Усе вочы глядзелі на юнака. Шэсьць мужчынаў. Сапраўдных, мужных мужчынаў у шыракаполых капелюшох. Глядзелі быццам бы цэлую вечнасьць. Чамусьці зьявілася моцнае, неабгрунтаванае жаданьне спалохацца і зьбегчы прэч. Несьціся не азіраючыся, паспрабаваць схавацца, зрабіцца маленькім і незаўважным дзіцём... «Супакойся, гэта ўсё наркотыкі, папросту апошнім часам іх было зашмат, а так

ўсё нармалёва». Спружына спрацавала і пацягнула дзьверы назад. Павольным крокам Пабла ішоў па бруднай падлозе. Усё насамрэч было нармалёва, ён зноўку трымаў сябе ў руках. Перажываньні былі надзейна схаваныя за пранізьлівым і адначасова спакойным позіркам. Галоўнае – упэўненасьць.

Стойка. Сонечныя праменьчыкі, якія ўсё ж ткі здолелі трапіць праз запыленыя жалюзі ў гэты змрок, вычварнымі яскаркамі ўпрыгожвалі бутэлькі і шкляны посуд. Белыя пылінкі ў паветры...

– Добры дзень, – бармэн быў сівы і зморшчаны, але твар так і пыхаў здароўем і моцнай жыцьцёвай энэргіяй. У некалькіх месцах зламаны нос і халодная бездань вачэй. Гэта можа быць толькі ў жыхароў танных піўнякоў. Бармэн выглядаў спакойна, як і астатнія, ён не прамовіў аніводнага лішняга слова, пакуль юнак набліжаўся да стойкі.

– Добры дзень. Дайце, калі ласка, гарбаты.

Павісла цішыня. Вочы глядзелі наўпрост у вочы. Аніводнага руху на працягу трох сэкундаў. Пяці...

– Чорная? Зялёная? Сунічная? – усё без залішняй эмацыйнай афарбоўкі, але з усёй прафэсійнай ветлівасьцю. Склалася такое адчуваньне, што калі б гэты сівы чалавек зь іншага боку стойкі сказаў цяпер што-небудзь іншае ці папросту прамаўчаў, Пабліту праз імгненьне б...

– Чорную з цукрам, калі ласка.

Гімбрык, кіпень, кубак, талерка, лыжка, цукар, гарбата, кіпень.

Нуль на твары.

Варушэньне мэханізмаў пад панцырам касавага апарату... паперкі...

Пабла ўзяў гарбату і сеў ля вакна, падалей ад магчымай траекторыі ваўчынага руху. Але руху не было. Вочы шасьці мужчынаў пакінулі яго і заняліся сваімі справамі. Вусны варушыліся, але выяве відавочна бракавала гуку. Хлопец дастаў з кішэні пульт і троху дадаў зялёных рысачак. Не атрымлівалася – напэўна, не было сыгналу. Ладна, фігня. Можна глядзець і так. Ён знайшоў цыгарэты і стварыў агеньчык, пакорпаўся ў

кубку і стварыў хвалі і вецер. Натуральны Пасэйдон гарбатнага мора. Толькі ўсё гэта, канечне, вельмі танна. Ніхто б не згадзіўся верыць у такога Пасэйдона.

За вакном быў 33-ці год, і ва ўсіх барах мужчыны пілі выключна гарбату. Раптам людзі здагадаліся, што старэйшы брат вырашыў усіх ная...аць, падсоўваючы танны віскі па неверагодна завышаных коштах. Натуральна, усе адмовіліся. Усе паслалі і забілі. Салідарнасьць у чарговы раз зрабіла выгляд, што перамагла. Людзі падселі на гарбату. А пасьля пачалі жартаваць, што Індыя ў хуткім часе стане звышдзяржавай. А за ёй і Пакістан з Аўганістанам, усе нармалёвыя рабяты. Вайны не было, усе стаміліся і забілі...

Гарбата. Цукар разьмешваўся ў карычневай вадкасьці пад мэханічнымі рухамі бліскучай лыжачкі.

Падсеў чалавек:

– Можна?

– Так.

Вось іх ужо двое за столікам. Спачатку заўжды даводзіцца зрабіць выгляд, што адчуваеш сябе цалкам натуральна, быццам бы толькі і чакаў, каб хтосьці падсеў і завёў гутарку ні пра што. Сядзець і маўчаць. Апатычная завершанасьць... час ад часу цішыню парушае звон посуду. Цукар ужо разьмяшаўся, але лыжка менавіта для таго, каб разьмешваць...

– Ты адкуль сам? – спытаў незнаёмец. Пранізьлівы позірк. Хрыплаваты голас. Шнар на шчацэ... адным словам, усё як мае быць. Усё ў адпаведнасьці са стылем эпохі.

– Менскі.

– А я з Каламіі, Нэвада.

Далей усё разгортвалася паводле стандартнага сцэнару, найнатуральнейшым чынам. Толькі хіба што напрыканцы незнаёмец не папрасіў падкінуць дробязі, маўляў, на пляшку нестае. Блёк пытаньняў, каб скласьці першае ўражаньне аб суразмоўцу. Наяўнасьць сям'і, род заняткаў, заробак, адукацыя, пляны на будучыню. Больш анічога і ня трэба ведаць. Дзеля таго, каб прабавіць час у бары, дастаткова зусім сьціплай

інфармацыі. Нават і гэты мінімум часам бывае непатрэбны. Але можа, так было ня ў гэты раз.

У сінім сьвятле яшчэ маладое вясновае сонца песьцілася ў лёгкіх аблачынках. Шэсьць мужчынаў у капелюшох, і Пабліта стаў сёмым. Былі… сталі… ролі… Бармэн праціраў посуд і варушыў вуснамі ў бок нейкага каўбоя. Усьмешкі паразуменьня. Ані гуку навокал. Нямое кіно, але, зрэшты, усё відавочна. Сьвятасьць барных стасункаў. Усё марудна. Усё запаволена, як відэакантроль на фінішы. Норма. Невядома чаму, але прадметы, людзі, нават само паветра – усё выглядае быццам бы прапушчаным праз сіні фільтар. Калі я быў маленькі, памятаю, разам зь зялёнымі, менш зялёнымі, больш зялёнымі і карычневымі пляшкамі я часам заўважаў і сінія. І вось каб такую паднесьці да вока і паглядзець праз яе на гэты сьвет. Хоп… Усё робіцца зусім іншым. Паглядзець на неба, на траву, на сонейка, на твар гандляркі піражкамі на рагу, на галубоў зь іхнымі танцамі, на чалавека, які цэліць з кольта ў гэтую пляшку, і ў рэшце рэшт на марудную, падобную да старой тлустай мухі, лянівую кулю, што, павольна пераvalьваючыся з лапы на лапу, ляціць да тваёй бутэлькі…

Аскепкі шкла ва ўсе бакі. Кроў. Мазгі на сухой шэрай жалезабэтоннай сьцяне.

Фініш.

На гэтай фатакартцы мы і нашае палітычнае графіці.

Столік. Гарбата.

– Езьдзіў на рынак учора.

– У, – адсёрбваючы з кубачка пакрысе, каб не апячыся.

– Так, таго-сяго ўзяў. Ну, ведаеш, паехаў па бульбу, а тут – тое, тут – тое. Дык глядзіш, а ўжо й у дзьвюх руках нясеш.

– Ну, гэтак заўжды і атрымліваецца… я раней таксама хадзіў, а цяпер чагосьці забіў. Ведаеш, неяк… так…пр… к…

– Кожнаму – свая мэтадалёгія.

– Так – так, менавіта.

Паўза. Глыток.

– Кажуць, днямі вялікае сьвята будзе.

– Ня будзе.

Кроплямі па асфальце. Рытміка цішыні. Тонкая матэрыя за вакном. Мікракасманаўты. Шэсьць мужчынаў. Сьвятло агромністага пратону праз жалюзі наўпрост у вока.

Вось яно, энэргетычнае напаўненьне рэальнасьці гэтай плянэты. Вось ён, сапраўдны лякальны цэнтар.

– Калі раней, дык я мастаком быў. Улетку, памятаю, паеду ў Любімаўку. Ну, не ў самую Любімаўку – там няма чаго рабіць, – а вось падалей, туды, за ўсе тыя пляжы, за станцыю, туды, паўночней. Там ластаўкі ў скалах. Спакойна. Сядзіш сам сабе такі. Працуеш. Часам хто-небудзь зойдзе, на ноч спыніцца. Напоіш гарбатаю, накорміш, пад сраку дасі. А зраніцы ўздымуцца і далей кудысьці там, па сваіх справах. Заплечнікі накінуць – і наперад.

– Часта заходзілі?

– Ды не асабліва. Ведаеш, якія баяліся, якія так, кшталту збоку паглядзяць і далей сабе пхнуць. Навошта я ім? З такога разьліку. Глядзяць адтуль зьверху, са скалаў, на мяне, такога маленькага і брудненькага.

– І ўсё лета так?

– Угу-угу, – чалавек адпіў крыху з кубачка. – А пасьля, як па восені халады пойдуць, дык дамоў у пустыню.

Чалавек зь ветру, солі і фарбы...

Чалавек створаны зь ветру, солі і фарбы...

Створаны чалавекам.

– А я раней у опэрным тэатры рабіў, – Пабліта дастаў новую цыгарэту. Жалюзі рэзалі промні сонца

на дзясяткі рысаў… у цыгарэтным дыме. Усё жыцьцё ў цыгарэтным дыме.

– У! Опэра?! – зь нейкім ценем зьдзіўленьня працягнуў незнаёмец. – Опэра – гэта выдатна! А дзе рабіў? Тут?

– Не. У Вене, Нікарагуа.

– А што цяпер? Усё? – скрыжаваныя ў паветры рукі.

– На фронце ворагі горла перараэалі, дык зьвязкі, напэўна, пашкодзілі, курвы. Хрыпець штосьці пачаў пасьля таго, – Пабліта піў гарбату, бы хаваўся ад доўгіх прамоваў. Размаўляць ня вельмі хацелася, але так было спакайней. – А, гуй зь ім! Так мне й трэба.

Незнаёмец пільна паглядзеў на юнака. Так паглядзеў, быццам бы зрабіў нейкія важныя высновы, якія датычыліся непасрэдна Паблы. Вочы папросту прапалілі хлопца, бы прайшліся рэнтгенам. Відаць, ён сапраўды штосьці там пабачыў, бо неўзабаве ў Паблава вуха заляцела:

– Ёсьць квіток.

Паўза. Усё спынілася. Перакрыжаваньне вэктараў…

Канечне, можа быць, ёсьць шанец прапусьціць гэтую стужку нейкім іншым чынам. Можа быць, тады атрымаюцца нейкія іншыя фатакарткі, але ў нас ужо ёсьць гэтыя, і наўрад ці паўторная раздрукоўка здолее штосьці патлумачыць лепей. Цені ў любым выпадку застануцца ценямі, максымум, што можна падправіць, – чырвоныя вочы ў якім-небудзь графічным рэдактары, але гэта за дадатковую плату.

Да таго ж, сапраўдная толькі першая раздрукоўка. Копіі заўжды другасныя. Але яны паўсюль, і ў пошуках першай аддрукаванай фатакарткі зусім нескладана пазбавіцца розуму.

– Яначка! Можа, яшчэ чырвоненькага? – гэтая тлустая сьвінота ізноўку нажэрлася. П'яная чырвоная пыса «генія».

– Не, дзякую. Мне ўжо досыць. – Часам сапраўды цяжка быць карэктнаю і цярпліваю. У такія моманты застаецца толькі сьціснуць у далоні што-небудзь цяжкое і вострае, каб заплюшчыць вочы і біць, біць. Чуць енкі, ускрыкі, азірацца і біць зноўку.

Усьмешкі! Людзі сьмяюцца, ім добра. Ім усё адно, абы было весела.

Пайшла прагуляцца, пазнаёміцца зь цікавымі людзьмі, але чамусьці спаткала да ванітаў знаёмае і сьмярдзючае мінулае. Яшчэ ранкам было такое невыразнае адчуваньне, што дзень сапсаваны. Але нэрвы здаюць... ляць! Колькі можна?!

– Чаму?!! Чаму вы ня хочаце?! Ну давайце! – тупая ўсьмешка і звышдаўгія галосныя. Празьмерная напеўнасьць. Пазэрства. Яшчэ праз пару бакалаў мінулае пойдзе да прыбіральні, а пасьля вернецца з новым пахам словаў і абавязковай цыгарэтай. З крыху пазмрачнелым тварам выкурыць яшчэ дзьве, і пачнецца па-новай. Цікава, а хіба раней ён быў зусім іншым? Калі так, няўжо ёй усё гэта тады падабалася.

– Яначка, чаму вы мяне так ня любіце? – канечне, чалавек ня мог за сябе адказваць, яго кудысьці несла і цягнула. Відаць, у целе больш не было аніякай волі. Толькі дзесьці на самым дне розуму захлёбваўся ў серных лужынах джэнтэльмэн. Але тыя бляклыя праявы сядзелі вельмі глыбока, а на самай паверхні на ўсю моц разгулялася Вялікая Чалавечая Сутнасьць. Яна патрабавала з усёй сваёй ідыёцкай урачыстасьцю...

– ..! - .., але трапляла на вострыя лёзы спакойнага халоднага позірку...

– Ну, ня хочаце, як хочаце... Давайце, таварышы! – яны дык заўжды радыя выпіць з шаноўным «маэстрам».

Новая майстэрня. Яшчэ нават не пасьпелі засраць. Добра, што ня шмат сьвятла. Адно хіба што ў парадку. Pink Floyd лунаў дзесьці высока пад стольлю. Так. Адвечны Another Brick In The Wall. Усё, Pinky, ты прыклеіўся сракай да гэтага фатэля, родненькі. Табе ўжо ня ўзьняцца, не зьмяніць сваёй пазыцыі ў праста-

ры... Чаму Валік падаецца такім маленькім? Бы яшчэ зусім падлетак. Навошта ўвогуле ён патрэбны? Навошта яна тут? Вельмі шмат пытаньняў, на якія няма сэнсу шукаць адказы. Хутчэй за ўсё іх увогуле няма.

– Валянцін!

– Што? – хлопец павярнуўся. На вуснах засталася ўсьмешка, прызначаная для былога суразмоўцы. Яго даўгія валасы зранку паляцелі ў сьметнік, але яна пакінула дастаткова. Хоць да чалавека стаў падобны, а то хадзіў кудлаты як малпа... Так, сапраўды, твар у яго нейкі празьмерна прыгожы. Неяк усё па-дзіцячаму.

– Валік, можа, яшчэ?

Ён толькі ўсьміхнуўся; ужо даўно ўсьміхаўся, але гэта, зрэшты, нічога ў ім не псавала. Сунуў тонкія пальцы ў кішэню і дастаў белы папяровы скрутак.

– У цябе ўсё нармалёва?

– Так, – Яна паказала зубы.

– Ну й добра.

Дым у лёгкія, яснасьць у галаву. Часам, напэўна, усё ж ткі трэба. Ва ўсялякім выпадку, яна больш не магла дазволіць сабе жыцьцё бяз допінгу. Калі гэта, канечне, можна было назваць допінгам. Непрыемна, нават неяк сорамна адчуваць сябе цалкам цьвярозай. Як можна, калі навокал, куды ні зірнеш, паўсюль робяцца рэчы, якія аніякага дачыненьня да чагосьці разумнага і здаровага ня маюць. Ды і ўвогуле, як рэагаваць на гэты сьвет, у якім усхваляецца любоў, роўнасьць, нейкае братэрства свабодных, і разам з тым асноўным сродкам сьцьвярджэньня гэтых прынцыпаў служыць гвалт. Натуральны дыскамфорт. Як бы паталёгія гіпэртрафаванай агульначалавечай сьвядомасьці... Адмахнулася ад сябе – хопіць.

Сэкунды. Такты.

Магчыма, усё гэта сумна, але іншых варыянтаў Яна ня ведала. Добра, што ў яе ёсьць хаця б той самы Валік. Так усё ж ткі, які-ніякі прытулак.

Падышла да вакна. Адсюль, з глыбіні пакоя, столік і фатэлі падаваліся нейкімі празьмерна шумнымі. Пляшкі, келішкі. Хлеб і віно. Людзі выгля-

далі акторамі, што не было далёкім ад праўды. Але гэта не кіно. Хутчэй усё нагадвала тыя тэлевізійныя спэктаклі, што раней паказвалі ўдзень па тэлевізіі, калі ўся асноўная аўдыторыя павінная была працаваць. Як гэта было патасна. Нават... звышэстэтычна, калі хочаце. Уся гэтая кадка бедакоў... «Чаму мне не сьмяяцца зь імі?»

Няўжо ня сьмешна? Вельмі сьмешна!

Яна павярнулася тварам да вуліцы. ЛЮДЗІ І САМАХОДЫ. Бясконцая плынь. Сёньня быў ясны дзень. Дарэчы, ужо ня першы тыдзень так. А можа, толькі падаецца. Пакуль што гэта натхняе і ўсьцешвае, але ў рэшце рэшт давядзецца супакоіцца. Пацяпленьне стане традыцыяй на нейкі час. Паўсюль ужо адчувалася гэтае новае паветра. Быццам бы хтосьці адчыніў фортку пасьля доўгай ночы. Калі зранку выходзіла на гаўбец пакурыць, дык сьнег у двары быў ужо ледзьве заўважны. Добра, што гэтая зіма нарэшце скончылася.

Адкульсьці з-за сьпіны, праз думкі і мроі аб нечым цёплым і блізкім, празь цішыню напаўпрыкрытых павекаў данёсься залівісты рогат...

– Трэба не забыць у гэтым годзе паехаць у лес... калі пойдуць пралескі... Пралескі... – але думкі так і павісьлі ў паветры, бы лёгкі дымок.

Яна ізноўку вярнулася да астатніх.

На гзымс прысеў голуб. Рэзкія рухі галавы. Праз шкло ён бачыў пакрытую тканінай чалавечую сьпіну і дзесьці ўглыбіні некалькі актыўных постацяў. Постаці рухаліся і крычалі. Скокі, перакошаныя твары, узбуджаныя вочы... Якія дзіўныя гукі часам выдае чалавек! Папросту фантастыка нейкая. Але галубы ня ведаюць словаў. Ва ўсялякім выпадку, чалавек вырашыў менавіта так. І яшчэ птушкі ня маюць сьвядомасьці, роўнай сапіентнай, а значыцца, і няма пра што казаць. Гэта яшчэ адзін непарушны закон, закліканы ўзьнесьці чалавека па-над усім астатнім сьветам.

Толькі нягледзячы ні на якія законы ўнізе гула вуліца, а тут, троху бліжэй да неба, блукаў вецер. З таго боку шкла – танец чалавека... Целы разарва-

ныя ў лахманы аўтаматнымі чэргамі. Бесклапотныя сьмяшлівыя лахманы.

Яшчэ некалькі імгненьняў птушка зьдзіўлена круціла галавой, узіраючыся ў гэты звышынтэлектуальны, але такі незразумелы ёй тэлеспэктакль. Рух крылаў. Адрыў. Яшчэ адзін нязначны біялягічны аб’ект у паветранай прасторы роднага гораду.

...Хлопчыкі й дзяўчаткі (котка на плоце) сьмяяліся, аж спыніцца не маглі, небаракі. Сьвінота нажэрлася. Цяпер ён зацягнуў гальштук на ілбе і скакаў у нязграбным танцы, сьпяваючы разам з астатнімі нейкія ўркаганскія песьні. Сьпінжак і нагавіцы былі заляпаныя ззаду фарбай. Падобна да таго, што ногі ня вытрымалі, і цела паваліласяна чыюсьці сьвежую працу. Што зробіш, здараецца часам. Pinky быў пазбаўлены ўвагі і так і застаўся ў выніку ў сваім гатэлі (яшчэ адна котка). Зацыклены дыск забясьпечваў яму лёгкі пераход ад сьмерці да нараджэньня. Кола круцілася... сьмех і песьні. La dolce vita...

Можа, я сёньня сапраўды не ў гуморы. Лепей пайсьці? Так. Ня даў ты мне, Божа, сёньня адпачыць. І гуй з табою! Няма магчымасьці і няма жаданьня.

Адно ідыёцкае напружаньне. Да таго ж ня вельмі...

– Яначка! – п’ныя вочы раптам заўважылі яе.

«Вось ляць! Ці штосьці кшталту таго.»

Брудны, чырвоны, з ідыёцкай усьмешкай на твары рухаўся да яе, нязграбна спрабуючы прытанцоўваць. Нічога агульнага са старажытнарымскімі оргіямі. Банальная п’янка.

Сапраўды, вельмі сьмешна.

– Яначка! Хадзіце ж сюды! Чаму вы там у самоце?!

Няўдалыя рухі. Лахманы ног. Лахманы рук. Дзяўчына троху адышла, і ён ізноўку страціў раўнавагу. Гук удару – усе павярнуліся. Засьмяяліся яшчэ мацней.

Усьмешкі. Зубы. Усьмешкі.

– Пал Палыч! Што ж вы так неасьцярожна?!! – сьмешна-сьмешна!!! Брыдка і сьмешна, а яшчэ крыху сорамна.

Дзьверы бясшумна зачыніліся. Хуткія крокі па прыступках. Зьбягаючы па лесьвіцы, два разы абкруціць шалік, расправіць... пальцы ў валасы. На двор, за рог, у плынь вуліцы.

Вытанчанасьць сярод пустыні.

Шэсьць мужчынаў у капелюшох ізноўку выбраліся на паверхню. Вузкія ходнікі і шэсьць мужчынаў. На вуліцы не было нікога... Увогуле. Пустая, яна нагадвала дэкарацыі таннага амэрыканскага фільму з апакаліптычным сюжэтам. Але гэта быў ніякі ня Новы сьвет. Навокал – Эўропа. Шчыльна пакрытая графіці і залепленая незразумелымі рознакаляровымі паперамі манумэнтальшчына, сярод якой мужчыны падаваліся нейкімі ну зусім ужо недарэчнымі. Але тут... Тут ня толькі мужчыны. Штосьці ня тое было з усімі гэтымі будынкамі і ліхтарнымі слупамі. Нешта няправільнае ў агароджах і сьметніцах. Ды і ўвогуле, як яшчэ ставіцца да спыненых пасярод вуліцы трамваяў, пакінутых без нагляду латкоў з садавінаю і да напоўненых каньяком келіхаў на століках кавярні, дзе няма аніводнага наведвальніка? Раптам стала незразумелым, для каго працуюць сьвятлафоры і зьмяняюцца плякаты рэклямы. Больш не было анічога. Толькі, падавалася, птушкі сталі сьпяваць гучней, бо ніякія іншыя гукі цяпер не заміналі ім гучаць у натуральную сілу. Складвалася ўражаньне, што за нейкіх пару імгненьняў горад згубіў усю сваю насычанасьць, усю значнасьць, зрабіўся каменным лесам, поўным ветру і цішыні. Чулася нават пагойдваньне галінак на дрэвах. Фантастыка? Канечне, ніхто падобнага раней ня бачыў, таму ў такой сытуацыі адразу прагучала б слова «неверагодна», сымбаль шырыні і глябальнасьці чалавечай думкі.

Але не, аніводнага гуку. Аніводнага слова.

Мужчыны прызвычаіліся не выходзіць на праезную частку і стаялі на месцы. Справа тут, напэўна, была не ў выхаваньні, а ў нейкім набытым рэфлексе, у за-

кладзенай штодзённым жыцьцём рэакцыі на рух гэтага вялікага каменнага меху, у якім, каб разьмінуцца на ходніках, не заўжды дастаткова папросту падацца троху ўбок. Часам даводзіцца павярнуць плечы, а нярэдка і абгрунтоўваць сваё права на вольную хаду... Яны стаялі шчыльна адзін да аднаго і наўрад ці штосьці разумелі. А можа, хто зь іх і быў дасьведчаны ў падзеях апошніх дзён, але ён пра гэта анікому не казаў. Мужчыны ўвогуле не размаўлялі. Неяк так у іх завялося між сабою. Складвалася ўражаньне, нібы калісьці даўно яны вычарпалі ўсе тэмы, абмеркавалі ўсё, што было магчыма. Словы, словы... У любым выпадку ў такой сытуацыі і казаць не было чаго. Натуральная «засада», гэта нават падлеткам зразумела. Пальцы пацягнуліся ў кішэні і дасталі партсыгары. У кагосьці не знайшлося запалак, і гэта на пэўны час разрадзіла сытуацыю. У выніку мужчыны нарэшце закурылі, і вецер падхапіў дым амаль што аднachасовых выдыхаў. «Што да чаго?» – шэсьць мужчынаў стаялі на рагу і моўчкі жавалі вуснамі гільзы.

Дзесьці ў нябёсах было сонца. Яно яшчэ не надакучыла. Яго так чакалі і прагнулі, і вось яно тут, залівае гэты горад. Але дзе хто? Ляпніна на фасадах. Выявы жанчынаў у антычным стылі. Рэдкія пашарпаныя рэльефы. Сям-там ад твараў адколатыя насы, але вочы звычайна на месцы. Што ж ім, вачам, будзе? Твары глядзяць на гэты вясновы цуд і, бы жывыя, падстаўляюць промням шчокі. Вокны. На трэцім паверсе адчыненая фортка. Там котка грэе свае стомленыя ад зімовай халадэчы косткі. Яна прымружвае вочы. Усё ў яе нармалёва. У сподачку яшчэ засталося крыху малака. Часам з-пад паўпрыкрытых веек яна ловіць позіркам галубоў, але ведае, што тыя ніколі ня сядуць на ейны гзымс.

Вусны краналіся паперак, лёгкія ўцягвалі дым. Розумы працавалі ў пошуках лягічнага тлумачэньня ўсёй гэтай сытуацыі. Так, спадарове. Часам з намі можа здарыцца невялічкая гуйня. На рагу дзьвюх вуліцаў, увесну, пад гэтым першым сонцам... А чаму б і не? Дым зьмешваўся з паветрам і сам рабіўся па-

ветрам. Думкі зьмешваліся зь цішынёю, і ім таксама было адведзена ўжо няшмат часу іхнае самастойнасьці. Промні скакалі па брукаванцы і ператвараліся ў чыстае зьзяньне ў квартале вышэй. Слупы, абвітыя плякатамі, пагойдваньне дратоў. Нейкім незразумелым чынам трамвай, што стаяў мэтраў за сто ўгору, не скаціўся пад сілай свайго цяжару, а так і застаўся на месцы. Бывае... А ніжэй, там, дзе праз два кварталы маналітным каменным мурам высілася аграмада нейкага, напэўна, старажытнага, сабору, там, у кучы мэталу і шкла памерлі амбіцыі некалькіх дзясяткаў аматараў прыгожага і эстэтычнага «ўтылітарызму». Аўтааматары… шкло, звон шкла, трымценьне нэрваў.

Мужчыны ня чулі гэтага звону. Яны былі толькі нямымі сьведкамі наступстваў. Калі па-шчырасьці, дык напаўнямымі, але ня тут-і-цяпер, канечне. Мужчыны маўчалі. Затое як гучна выказваліся на гэты конт барадатыя бронзавыя сьвятыя. Яны зьвешваліся са сьценаў і пагражалі пальцамі, перакрыкваючыся адзін з адным: «Ага-аа! Бачыш, Пятро? А ён ім казаў! Ён іх папярэджваў!» Яны зь нейкай садысцкай зацікаўленасьцю аглядалі ўвесь гэты мэталічны вэрхал. Відаць, сумна было са сьціплымі позіркамі стагодзьдзямі чакаць апакаліпсісу. Але цяпер турбавацца ім не было чаго. Яны тады былі ля Яго. І цяпер кшталту зь Ім… Выдатна ўладкаваліся.

Іх стварыў чалавек, адліў з бронзы… яны ня першасныя.

А тым часам у двух кварталах вышэй, на рагу, хтосьці стаяў і спрабаваў падабраць нават ня словы, дарэмнасьць словаў была відавочнай. Чалавек спрабаваў папросту падумаць. Толькі і ўсяго. Шэсьць чалавек…

Мужчыны глядзелі на ўсё гэта і моўчкі дакурвалі. Спрабавалі высмактаць як мага больш са сваіх цыгарэтаў. Недапалкі адзін за адным падалі на ходнікі, адскоквалі… адскоквалі і трацілі сваю каштоўнасьць. Хтосьці азірнуўся. Хтосьці моўчкі паправіў капялюш. Першыя крокі, целы сарваліся зь месца,

пачаўся рух. Шэсьць мужчынаў нарэшце выйшлі на дарогу і збочылі ўлева. Туды, дзе быў цень.

Той незнаёмец задаваў зашмат пытаньняў. І казаў зашмат. Усё гэта ня так проста. Галоўнае – не спрабаваць у чымсьці разьбірацца. Ня думаць. Вырачыся часу. Больш не засяроджваць увагі. Зачыніцца ў хаце і задавальняцца сабою. Ні з кім ня бачыцца. Прыпыніць рэакцыю. Адключыць рэфлексію. Зруйнаваць розум...

– Ведаеш, сонейка, калі націснуць пімпачку RESET, можа быць, штосьці і зьменіцца.

– Ведаю. Але ці ёсьць сэнс пачынаць усё наноў?

– У некаторых раманах я чытала, як шыкоўныя мужчыны ў гальштуках пасьля шматлікіх выпрабаваньняў такім, ведаеш, троху хрыплаватым барытонам казалі сваім каханым: «Давай пачнем усё спачатку, бэйбі».

– Я не чытаў такіх раманаў, і ўвогуле, што гэта?..

Горад праносіўся з двух бакоў. Вуліцы праносіліся, затрымліваліся на прыпынках і з новай хуткасьцю несьліся далей. Пабла бачыў. Вочы працавалі. Патрэба ў сьвежым, няхай і адносна, паветры выцягвала з дому і прымушала ісьці, ехаць... зьмяняць дэкарацыі. Штурханіна аздобленая прывідам Антоніё Вівальдзі. Рух. Саскочыць на прыпынку і пазьбегнуць кандуктаркі. Двары, паркі, вуліцы. Людзі, людзі, людзі... колькі можна знайсьці галечы ў гэтых тварах! Наколькі яны зьнішчаныя гэтым сьветам, і разам з тым, наколькі шчасьлівымі яны часам бываюць! І радасьць гэтая, і сьмех, ды і ўсялякія іншыя праявы падаюцца такімі тупымі і ідыёцкімі, што вось думаеш, так бы й даў па гэтых выстаўленых наперад крывых жоўтых зубах. Але хто ты? Хто ты, каб пазбаўляць іх гэтага шчасьця? Дакладна такі ж... нават калі маеш больш якіхсьці якасьцяў: розуму там, адукацыі, яшчэ чаго, дык ні гуя гэта цябе не ўратуе. Ніколі не ўратуе ад жыцьця, ад гэтага бадзяньня па

вуліцах і парках і ад сьмерці таксама, напэўна, не ўратуе. Ды і ўвогуле падобныя характарыстыкі глыбока суб'ектыўныя. Ты, Паблітачка, дарэмна ў гэтую справу ўвязаўся. Цяпер можа быць ужо позна пачынаць штосьці разумець. Ня трэба было так зацягваць. Памянташ, як у дзяцінстве? Як зычылі табе на кожны дзень нараджэньня слухацца маму і тату? Вось так і трэба было рабіць! А цяпер ужо дакладна невядома, ці зможаш ты выкруціцца. Чалавек у чырвонай бэйсболцы пачэсваў вялікую сівую бараду. Моцнае цела было спакойным і вочы таксама. Можа, яму сапраўды нарэшце стала шкада? Зморшчаны твар і ўсялякія іншыя прыкметы доўгіх гадзінаў у чэргах, месяцаў працы ў запыленых падвальных памяшканьнях, сон на нязручных подушках. Усе расклады... «Ну вось і дачакаўся старасьці. Ужо шкадую.»

Юнак саскочыў, ледзьве толькі адчыніліся дзьверы. Давялося штурхануць нейкую старую, што бясконца мокрымі вачыма глядзела ў салён, бы чакала адтуль зьяўленьня Хрыста. Гуй вам, шаноўная. «Я...аныя гаўнюкі. Вырасьцілі, ляць!» Але троху пазьней, праз два прыпынкі, старая наступіла камусьці на нагу. Зусім не выпадкова. Адпомсьціла. Нічога страшнага.

Пабла перабег на другі бок вуліцы і рушыў у напрамку цэнтральнага парку. Сёньня неяк троху журботна. Здараецца ўсялякае. Гастраномы і паставыя ля дзьвярэй. Дзядзька зь нейкім завялікім для сваёй спэцыялізацыі пузам:

– Я прашу прабачэньня. Можна Вас на хвілiначку? / Прабачце, калі ласка. Ці можна да Вас зьвярнуцца?

– Так. Я Вас уважліва слухаю.

– Ведаеце, неяк няёмка... Але тым ня менш, можа, Вы зможаце дапамагчы двумастамі рублямі?

– Так, шаноўны, канечне. Вось, калі ласка. Вазьміце пяцьсот.

– Вялікі Вам дзякуй. Усяго Вам найлепшага.

– Няма за што. Да пабачэньня.

Рухацца далей. Кожны крок быў Паблу вядомы, кожны рог, кожны каменьчык, кожная ямінка ў ходніках. Дрэвы. Яны хутка ачуняюць ад зімы і пачнуць жыць далей. Так і ёсьць. Казцы гэтай няма канца. Пабліта любіў алькаголікаў. Любіў Тома Ўэйтса і Веню Ярафеева, сваіх сяброў і часам, але ня так і часта, пранікаўся пяшчотаю да свайго памерлага бацькі, што сваім адвечна п’яным позіркам і спарадычнай здольнасьцю да фармулёўкі думак упарта спрабаваў натхніць сына на матэрыялістычны лад жыцьця. Не атрымлівалася. Не было асаблівага даверу да гэтага вынішчанага часам, знэрвованага, зьедзенага алькагольнай тугою цела.

«Бухло зрабіла з хлопчыка мужчыну» – ці так гэта, было дакладна невядома, але мужчынам часам даводзілася быць. Ва ўсялякім выпадку, адыгрываць ролю. «Праца зрабіла з малпы чалавека» – не прымаецца, ці калі прымаецца, то з пэўнымі ўмоўнасьцямі.

Збочыць у двор. Справы больш важкія, ніж развагі...................................................

Гарады патанаюць у грукаце індустрыяльных сэрцаў. Океан Ельзи – 911. Гуй на вас. Як будзеце каляпсаваць, мяркую, на мяне не забудзецеся. Не пазбавіцца мне вас, даражэнькія суграмадзяне. Пабліта часам любіў паслухаць папулярную музыку. Звычайна гэта ад яго не залежала. Грамадзкі транспарт поўніцца гукамі: магнітола ў кабіне кіроўцы, навушнікі ў ракавінах сымпатычнай паненкі… некаторы час ён яе разглядаў, падалося, што дзесьці бачыў, але мужчынская сарамлівасьць узяла сваё. Усё спрыяе адукацыі. Уводзіны ў сучасную культуру пачынаюцца менавіта з музыкі. Мода пачынаецца з музыкі. Ад гуку схавацца куды цяжэй, чым ад выявы. Тут не дастаткова папросту заплюшчыць… вушы? Чым ратавацца, Пабла ня ведаў, але затычкі – гэта ня выйсьце. Як і чорныя акуляры. Усё адно хоць штосьці дый працісьнецца, пралезе ў шчыліны, як карэньне маладога дрэва, што прыжылося на скале, точыць камень і

нараджае абвалы пароды. Жалезабэтон – не заўжды самы надзейны матэрыял. Таму нерухомасьць таксама ня самы бясьпечны шлях укладаньня капіталу... разьбіць у кроў хайло, спаліць хату і адрэзаць галаву немаўлятку-сыну.

.....................справы........развагі...... Хлопец адчыніў дзьверы. У гэтым пад'езьдзе заўжды было багата розных пахаў. Смажаная бульба пераплялалася з ацэтонам, фізыялягічнымі спарахненьнямі і этэрам. Затое чалавек жыве ў цэнтры. Лёгка знайсьці, няма праблемаў, але галоўнае ў такім выпадку трымаць сябе ў руках, а то накрыюць. Чым больш навокал тарчкоў, тым цяжэй захоўваць мэнтальны сувэрэнітэт. Лесьвіца. Рухі ног. Патрэбны паверх (ніколі не кажыце дакладную інфармацыю). Гукавы сыгнал. Вока з таго боку акуляра. Пабліта папярэдзіў, таму праблемаў не было. Часам і барыгам патрэбна штосьці паесьці. Адчыненыя дзьверы, памятыя твары. Ня мы першыя, таварышы. Ня мы першыя...

Пабла адмовіўся ад кавы, спаслаўся на нейкую херацень, але ўсе гэтага чакалі і не засмуціліся. «Усе задаволеныя?» – «Клас-клас!»

Рух. Рух па лесьвіцы. Назад у музыку вуліцаў. And here is our battlefield. Падзертыя, дзіва, што яшчэ драўляныя, дзьверы ціхутка прарыпелі: «Сачы за сабою, хлопча.» Калі ўсё атрымаецца, можа, яму пашанцуе пазьбегнуць непрыЕмнасьцяў і ня трАпіць у складАныя жыцьцЁвыя абстАвіны. Псс-пспссс-пспс...

Мэтрапалітэн зачыніў свае дзьверы. Прыбіральшчыцы ўзяліся за плятформу. Гэтую станцыю адчынілі ня так даўно, і таму яна неяк не па-сапраўднаму блішчэла. Аднойчы Яна была на спэктаклі ў Палацы Аўтарытарызму... такія ненатуральныя, плястыкавыя кветкі, такі ж менавіта бляск і добра выгаленыя, бездакорна апранутыя мужчыны са стрыманымі бэджыкамі: «Підорскі Аляксандар Пятровіч.

Служба аховы». Але бліжэй да рэальнасьці. Квіткі ў мэтро куды таньнейшыя... але, зрэшты, аніякай розьніцы – ужо не пасьпела.

Бляск! Бляск! Бляск! Бляск!.. Так і кідаецца ў вочы.

Дзяўчына прытулілася да сьценкі і ўздыхнула. Што рабіць. Нават не пытаньне, а нейкі фатальны адказ на ўсё, што заўгодна. Згубілася ў часе. Хутчэй за ўсё, вельмі доўга блукала па вуліцах. Дзіўна. Усё ішла, ішла, а ў выніку ў цэнтры. Як доўга цягнуцца імгненьні. Павольныя крокі. Цішыня рухаў... Пераход быў амаль што пусты. Два п'яныя дзядзькі ў абдымку неслі кудысьці свае азадкі. Напэўна, мясцовыя. Яны цалаваліся, рагаталі. Яны любілі сябе... любілі сябе жыць.

Не было больш моцы трываць гэтае цела! Усё навалілася разам, у адзін вечар. Стомленасьць, якую неабходна пераадольваць, людзі, якіх трэба любіць. Навошта ёй гэта ўсё? Навошта патрэбная гэтая памяць, якую аніяк не адключыш, калі так трэба супакоіцца? Засынаць кожны вечар, з асалодай аддавацца мроям, уткнуўшыся ў подушку ці ў Валікава плячо, закручвацца ў коўдру. Усё гэта толькі дзеля таго, каб праз некалькі гадзінаў абудзіцца з разуменьнем, што ізноўку спазьняесься і што трэба сьпяшацца й бегчы. Заўжды бегчы. Заўжды быць станоўчай, адпавядаць усім крытэрам. Менавіта так, як яе навучылі выхавацелькі. Абавязкова кожны вечар маліцца, абавязкова... Быць добрай і адказнай...

Пачуліся крокі. Няпэўныя, але роўныя, яны ціхай ніткай рытму напаўнялі пусты пераход. Яшчэ адзін начны вандроўнік? Спакой ізноўку парушаны? Не надоўга... Неўзабаве, цягнучы на плячох вялізную вязанку штапіку і нейкіх дробных дошчачак, згінаючыся пад цяжарам – так мала сілаў было ў гэтым целе – з-за рогу паказаўся стары. Падавалася, ён ледзьве трымаецца на нагах, але крокі былі мэтаскіравана роўнымі. Старыя мужчыны менавіта так сябе паводзяць, так рухаюцца і апранаюцца. Яны ў дакладнасьці такія ж самыя. Усе. Абапіраючыся на

тронак, павольна перастаўляючы хворыя, відаць, ногі, дзед рухаўся па тунэлі. Яна амаль што чула, як рыпяць старыя косткі, як марудна б'ецца старое сапсаванае сэрца. Раз, два, раз, два… тронак чамусьці ня ўдзельнічаў у гэтым рытме, нягледзечы на тое, што так было б больш слушна. Карцінка патрабавала ліку «тры», толькі… Але думаць цяжка. Павольныя рухі і манатонныя крокі. Чалавек набліжаўся, і ягоная галава, зарослая барадою, ледзь заўважна трэслася. Вочы засяродзіліся на дзяўчыне. Падавалася, ён глядзеў у самую ейную сутнасьць і адначасова кудысьці скрозь. Халера ведае, што ён хоча. Ды і справы няма. Яна шчыльней прыціснулася да сьцяны. Стары крочыў міма, але ня зводзіў зь дзяўчыны вачэй. Павернуты да яе твар не ўсьміхаўся і не выяўляў непрыязнасьці. Падавалася, увогуле ніякіх эмоцыяў.

«Неяк не па сабе».

Імгненьні-імгненьні-імгненьні…

Хоп!

Нарэшце паўза перапынілася. Раптоўна падкасіліся ногі, і цела не ўтрымала раўнавагі. Дзяўчына заплюшчыла вочы. Гэта, калі вы заўважалі, у такіх сытуацыях робіцца аўтаматычна. Спроба схавацца. Пачуўся нейкі, ледзьве не паранармальны, грукат, лязгат мэталу, выбухі, крыкі д'ябла, і ў наступны момант дзед ужо расьцягнуўся на мармуровай падлозе, засыпаны сваімі дошкамі. Чырвоная брудная кепка зьляцела з галавы.

Што ж ёй рабіць?.. Яначка спахапілася і падбегла да яго:

– У Вас усё нармалёва? Дазвольце я Вам дапамагу, – толькі цяпер дзяўчына адчула ўсю абсурднасьць гэтай сытуацыі. Пасярод пераходу, на роўнай, як вада ў горным возеры, падлозе расьцягнуўся стары дзед. Ён неяк спрабаваў узьняцца, і дзяўчына дапамагала яму… дапамагала… спрабаваў. Час цягнуўся, а гэтыя двое ўсё мітусіліся і мітусіліся, корпаліся ў думках і дошках, у крыках і ўзмахах рук. Міналі стагодзьдзі. Але не ад старасьці цяпер трэслася сівая галава.

Зь бяззубага роту ліўся нейкі дзікі вар'яцкі сьмех. Гэта неяк ужо зусім недарэчы.

– Так. Так. Усё ў парадку, унучка, – стары стаў на карачкі і павольна ўздымаўся. – Мы, баявыя афіцэры, да ўсяго прызвычаеныя. Усё нармалёва.

Стары павярнуў да яе твар, і толькі цяпер Яна заўважыла, што левае брыво расьсечанае і адтуль на бліскучую мармуровую падлогу ўжо накрапала крыху чырвоненькага. Мужчына, відаць, таксама заўважыў ці папросту прасачыў за ейным позіркам. Паднёс да твару дрыготкую руку, і праз усё такі ж сьмех нешта прабурчэў сабе пад нос. Яна дастала насоўку і прыклала да раны. Так, прыгожы кантраст. Бялюткая дзявочая насоўка і зморшчаны, невядома калі загарэлы твар старога мужчыны. Стары глядзеў наўпрост у ейныя вочы і пасьмейваўся. Нарэшце супакоіліся. Неяк дзіўна гэта ўсё было. Неяк ненатуральна... звышненатуральна.

Мужчына, нягледзячы на цяжкасьці, усё ж такі здолеў узьняцца. Відаць, цела ўжо пачало адмаўляць у выкананьні падобных фізычных практыкаваньняў. Але ўсё было настолькі няпэўным, настолькі недакладным, што Яна не магла скласьці пэўнага ўражаньня, ці перад ёй дужы стары чалавек, ці ўжо напаўнябожчык. Ва ўсялякім выпадку, ён быў досыць высокі. І яшчэ ад яго так і сьмярдзела старасьцю. Але толькі ня вочы. Быццам бы хтосьці пакінуў нядаўна ў іх па дозе нейкага атрапінавага рэчыва. Ясныя і троху агрэсіўныя... толькі гэта ні ў якім разе ня вочы старога чалавека.

Ён узьняўся, яшчэ раз кінуў позірк на Яну і пачаў зьбіраць свае раскіданыя па падлозе дошкі і тронкі.

– Дзякуй табе, дзяўчынка. Вялікі дзякуй. Але ведаеш, што я табе на гэта скажу? Ня трэба табе так думаць пра ўсё. Паспрабуй папросту папусьціцца. У любым выпадку ты ж ня зможаш штосьці павярнуць назад і перарабіць наноў усе гэтыя рэчы... што цяпер прымушаюць... узгадваць. Ня варта.

Словы гублялі рытм, зьбіваліся, ператвараліся ў незразумелае булькатаньне.

– Што?.. Пра што Вы кажаце, дзядуля, – спачатку ёй папросту падалося, што дзед усё мармыча сабе ў бараду бясконцыя, невядома да каго зьвернутыя, падзякі, але празь некалькі сэкундаў ёй стала зразумела, што тут было нешта яшчэ.

– Як пра што?! Пра цябе кажу.

– То бок? Я не разумею.

– Што тут разумець, даражэнькая мая, – дзед пакінуў сваю драўніну. – Ты сябе даўно бачыла?

Яна маўчала. Дзяўчына не прызвычаілася рэагаваць на падобную неўраўнаважанасьць. Ды і ўвогуле...

Дзед пакорпаўся дзесьці ва ўнутраных кішэнях, і ў ягоных руках зьявілася маленькае люстэрка.

– На, трымай, – стары сунуў яго Яначчы ў рукі і зноўку ўзяўся за свае палкі. – Вось хадзіў на сьметнік. Гэтыя дурні часам такія выдатныя рэчы выкідаюць. Навошта? Во... – стары падняў якуюсьці дошку, ці тое былі дзьверцы ад шафкі, ці што... Але гэта ўжо было не істотна. Яна трымала ў руках люстэрка. Нічога больш ня чула.

– Якое старое.

– Старое – старое, як сонца зь перапою... – ці то прасьпяваў, ці то прадэклямаваў мужчына, зьбіраючы свой багаж.

Яначка ўважліва разглядала люстэрка. А пасьля ўсё ж ткі зрабіла намаганьне і паглядзелася. Нічога асаблівага. Хіба што толькі троху стомленая, а так нічога такога.

– Цяпер людзі ўвогуле шмат дабра выкідаць сталі. Сьпяшаюцца пазбавіцца ад усяго непатрэбнага. Але спачатку разабрацца няблага было б, што выкідаць, а што яшчэ і выкарыстаць можна, – дзед ахайна перабіраў свае трафэі.

– А навошта Вам усё гэта? – Яна пазірала на адлюстраваньне і спрабавала надаць свайму абліччу хаця б трохі ўпэўненасьці.

– Спатрэбіцца, не хвалюйся. Хто пра сябе ня дбае, таго і да іншых падпускаць ня варта. А людзі пра гэта ні халеры ня думаюць, – дзед ужо пасьпеў сабраць увесь свой скарб і цяпер зь невядо-

ма адкуль узьніклым спрытам перавязваў усё гэтае даброцьце вяроўкамі і нейкімі ірванымі кавалкамі тканіны.

«Чаму ён мне падаўся такім нямоглым? Жвавы, што той конь», – дзяўчына пару разоў пакасілася на дзеда. Той нарэшце скруціў сваю вязанку, узьняўся, закінуў яе сабе на плечы.

– Ну, што там відаць? – мужчына абышоў Яну са спіны і паглядзеў праз плячо ў люстэрка. – А ёж жа ту душу! Што ж ты так запусьціла?!

– Што запусьціла?!.

– Глядзі колькі дэманаў! Во! Во! – стары тыцкаў пальцам у паветры. – Вось яшчэ адзін! Бачыш? І якія ж рухавыя ўсе!..

– Дзядуля, Вы пра што?.. Што Вы такое кажаце?

– Што «дзядуля»?! Гуюля! – стары перайшоў на крык. Відаць, уся гэтая Яніна зьбянтэжанасьць яго раздражняла. – Так, усё, давай. Давай хуценька, а то позна будзе…

– Што давай?..

– Ляць! Ну што ты зь імі рабіць будзеш! Дурная, ці што?! Чысьціцца табе трэба! Тэрмінова! А то, ляць, пасьля плакаць будзеш, а позна будзе. «Ай, то ж я, дура, дзеда Юзіка ня слухала! А ён жа папярэджваў! А я ж ня слухала!»

Яна ня ведала, як сябе паводзіць. «Мову адняло». Аслупянелая, яна глядзела на старога, а той ужо зусім не нагадваў пердуна-пэнсіянэра. Ён круціў сваімі дзікімі вачыма, размахваў рукамі, пагражаў пальцам і часам нават лёгенька штурхаўся. Абяцаў чарцей і пекла, спасылаўся на Алаха і яшчэ кагосьці… Чамусьці зрабілася страшна. Падзейнічала.

– Ну, што стаіш, давай хутчэй!..

– Ага. Добра! Добра, дзядулечка! Дзякуй вам вялікі… – дзяўчына падхапілася і што было моцы пабегла прэч па пераходзе. Напэўна, яна ніколі так ня бегала. Куляй даляцела да прыступак і, пераскокваючы праз адну, вылецела на паверхню.

Гэты сьвет перапоўнены вар'ятамі і ўсялякімі іншымі шызікамі.

Чамусьці ў Яны так і не атрымалася стаць тупой сукаю. Але шкадаваць – апошняе, што можна было зрабіць з гэтай нагоды. Не атрымалася, дык не атрымалася. Ужо, напэўна, позна. У рэшце рэшт Валік калі-небудзь пасталее і яна не захоча шукаць нічога лепшага. Было троху сумна, але не хацелася вяртацца да адвечных змрочных думак. Усё тлумачыцца вельмі проста. Толькі фізычная стомленасьць і рэакцыя на яе з боку мозгу. Вось і ўсё. Як проста знайсьці ўсе адказы.

Так, сапраўды тут зашмат хворых. Адкуль увогуле ўзяўся той дзед? Але Яна насамрэч спалохалася. Нейкая незразумелая энэргетыка, ці як яшчэ гэта можна назваць. Дурацкі выпадак.

Люстэрка спакойна ляжала сабе ў кішэні. Нічога зь ім не адбывалася, але дзяўчына ўсё яшчэ афарбоўвала яго ў нейкія звышнатуральныя колеры.

«Што меў на ўвазе стары? Якія дэманы?»

Так цяжка сучаснаму чалавеку разумець простыя рэчы… Вельмі даўно гэта пачалося. З таго часу мы напрыдумвалі мноства багоў, на якіх і ўсклалі ўсю адказнасьць і ўсе паўнамоцтвы найвышэйшай аналітыкі нашага сьвету. Ну няўжо ж мы самі павінныя пра ўсё клапаціцца, калі ёсьць такія адказныя і паважныя асобы, як Іегова, Алах і НТР?.. ляць! Ну чаму яна не нарадзілася дзяўчынкай-даўнам? Ці сынам рыбака дзесьці ў Нарвэгіі? Так хацелася спакою. Напэўна, усе гэта адчуваюць час ад часу. Утупую задавальняцца вячэрай, канапай і тэлеэкранам. Усё прапісанае наперад. Без ініцыятывы, бяз выбару, без адказнасьці…

…тым ня менш набліжаўся сьвітанак. Вуліцы і ліхтары – апошнія прыкметы ночы, настолькі характэрныя для зімы. Але, на шчасьце, перажылі ўжо. Можа, і не заўжды лёгка, але звычайна ўсё ж ткі атрымліваецца перажыць.

«Так. Гэта вуліца Мічурына. Значыцца, наступная – вуліца Марата». Усе аскепкі займаюць свае мес-

цы і перад вачыма зноўку апынаецца ваза. Часам у яе нават трапляюць кветкі. Ружы. Так, здаралася, Яне падабаліся нават яны. У промнях ранішняга сонца на століку ля вакна... Толькі ў любым выпадку лёс гэткай вазы вядомы наперад. Аскепкі... Кожная талерка, ня тое што ваза, ведае гэтую ісьціну. Быць створанай дзеля таго, каб разьбіцца.

Вуліца спускалася долу, і, напэўна, дзесьці тут мусіла быць плошча Рэвэрбэрацыі. Раптам дзьверы нейкага напаўпадвальнага кнайпэка адчыніліся, выпусьціўшы на вуліцу абрыўкі музычных фразаў і трох падпітых маладзёнаў. Хлопчыкі хісталіся і ледзьве трымаліся на нагах. Дысананс п'яных хамаватых мацюкоў і ранішняга спакою ціхай вулачкі. Немагчыма было разабраць гэтае незразумелае мармытаньне, але яго экспрэсіўнасьць і нават нейкая агрэсія прымушалі задумацца. Дзяўчына спынілася. Лепей перачакаць. Да таго як сонца зазірне ў вочы першых працоўных, яшчэ, напэўна, некалькі гадзінаў. Прыхіліўшыся да блага асьветленых дзьвярэй параднай, адчула нейкую палёгку. Так троху спакойней. «Што за дзень сёньня такі?..»

– І яшчэ яны такія сьмешныя ў гэтых сваіх позах. П'яныя ўсе ў сраку. Яны, ведаеш, галаву трохі наперад высоўваюць, а плечы назад адводзяць. Вось так, – Яна паспрабавала паказаць, і ў выніку гучна засьмяялася. Ён таксама засьмяяўся, але стрымаў сьмех унутры. – І на такія тэмы там цікавыя размаўляюць. Вязаныя шапкі гэтыя на патыліцу ссунутыя... ну, так і стаяла, і глядзела, бы кіно нейкае.

– Ну, гэта толькі ты магла да такога дадумацца, – Валік усё яшчэ нэрваваўся. Насупіўся. Цяпер ён так быў падобны на пакрыўджанае дзіця, якому маці чагосьці не набыла ў шапіку.

– Ды ну, супакойся. Усё ж нармалёва.

– А калі б было не нармалёва. На гэтых вуліцах можа ўсё што заўгодна здарыцца.

– Ну дык ня здарылася ж...

– А калі б усё ж ткі... – Валік не пасьпеў скончыць. Стомленая ўсёй гэтай марнасьцю, Яна кінулася да яго і перапыніла нарэшце плынь гэтай лухты старой як сьвет і самай надзейнай фізыялёгіяй. «Не гуй тут пісьцець».

Вакно. Заліты сонцам пакой. Сьвежае паветра праз адчыненую фортку. Жанчына. Мужчына. Стандартная схема. Усё па-default`е. Нічога новага. Прасьціны і падушкі. Яскаркі-пылінкі ў паветры. Чым гэтая сытуацыя не ідэальная? Можа, менавіта гэтага імкнуцца дасягнуць мільярды? Спакой?

Насамрэч Яна хацела б усё вырашыць як мага хутчэй. І ў першую чаргу вырашыць самой. Сапраўды, часам можа й ня варта так многа думаць. «Чаго ж ёй трэба?» Думкі за сэкунду да таго, як апошняя кропля вонкавай рэальнасьці пакіне розум......... ‘ ......сон.

Мора было неспакойным. Надвор’е дакладна не спрыяла шпацырам і ўвогуле якой бы то ні было дзейнасьці. Чалавек заўжды бездапаможны перад гэтымі танцамі стыхіі. Толькі вось незразумела, ці блага гэта, або так і мае быць. Вада перамагала зямлю. Ствралася такое адчуваньне, што цяжкія аблокі быццам бы выціскаюць цябе з гэтай прасторы між небам і... і ўсім астатнім. Вецер бязьлітасна лупцаваў скалы, ірваў скручаныя дрэўцы, што, папраўдзе кажучы, невядома як яшчэ трымаліся за гэтую шэрую, старажытную зямлю. Нястомны Пасэйдон, бы жанглэр, зь лёгкасьцю прафэсіянала ўпраўляўся з хвалямі, дасылаючы на бераг усё новыя і новыя. Такім быў дзень. Але і ноч магла быць такой самай. Гэты бераг тысячагодзьдзямі быў пустым. Але аднойчы зьявіліся хлопчыкі. Можа...

Тры юнацкія постаці на пустым пляжы. Босыя ногі патанаюць у пяску. Ускудлачаныя валасы. Кашулі поўныя ветру. Абадраныя нагавіцы і прымружаныя вочы. Няхітрыя торбы на плячох... Хіба гэтага не дастаткова, каб патлумачыць іхную прысутнасьць тут? Чаму? Як гэта такк-кх?.. Канечне, ніхто ня мог

адказаць на пытаньні. Хто ведае прычыны, той можа бачыць будучыню. Толькі ня вельмі далёкую.

У рэшце рэшт яны ўсё ж ткі стаміліся. Скінулі торбы і ледзьве не пападалі на пясок. Цяжкія целы. Такія маладыя, а ўжо цяжкія. Хочацца верыць, што гэта толькі сытуатыўна і што рана ці позна, хлопчыкі, як тыя матылькі, ізноўку закружацца ў паветры... у танцы!.. лёгкія, як пер'е хатняй птушкі. Адзін дастаў плястыкавую бутэльку:

– Тут палова і мусіць яшчэ адна быць.

– Так, ёсьць. У мяне, – у другога быў перабіты нос, але... нічога страшнага. Каму тут да гэтага справа? Спачатку крыху пасьмяяліся, а потым страцілі цікавасьць.

Круціць самакруткі было беспантова. Вецер не даваў спакою, узьнімаў пясок і балюча біў па твары. Але курыць хацелася. Нізкія хмары і перапэцканыя кашулі. Саляныя падцёкі на нагавіцах. Трэці пакорпаўся ў сваіх рэчах і нечакана знайшоў пачак папяросаў.

– Ну хоць гэта добра, – з палёгкаю і нейкай невыразнай усьмешкай вымавіў першы і пацягнуўся да пачка. – Феадасійскі беламор... хай дапаможа ім бог.

– Дай запальнічку.

– А ты сваю згубіў, ці што?

– Мля, ну лянота ў кішэню лезьці. Дай!

Трэці папросту паднёс тытунь да агеньчыка.

Ані птушак, ані жывёлаў, ані чалавека... няма нават і прыкметаў. Не пашанцавала. Трэба спачатку падумаць было. Але даводзіцца згадзіцца, што, калі ўсё да дробязяў ясна, ужо ня так цікава. Ды і навошта ўвогуле «думаць»?

– Якога гуя мы сюды паперліся? – першы няспынна азіраўся, бы намагаючыся знайсьці штосьці новае ў навакольлі. Такі пэйзаж ён бачыў ужо ня першы дзень. І надвор'е амаль не зьмянялася. А ён вельмі хацеў, але нічога ня мог зрабіць дзеля гэтага, толькі нэрваваўся.

– А хто быў за шамана? А? Ну дык... – ізноўку паднялі адвечна актуальнае пытаньне. Насамрэч, калі

паназіраць за імі гэтыя некалькі дзён, то падобныя размовы ўжо надакучвалі. Наўрад ці хлопчыкі яшчэ пабачаць калі-небудзь таго вылядка, што параіў ім гэтую дарогу. Дзеці верылі. Дзеці вяліся на ўсё цікавае. Некалькі дзён таму – пяць ці, можа, шэсьць – на рынку аднаго забытага богам мястэчка адзін мясцовы вар'ят параіў ім гэтую дарогу, «поўную маляўнічых мясьцінаў і дзікай прыгажосьці».

– А...

– Так! Усё! Хопіць! Вось дзе ўжо ўсё гэтае! – усё вельмі гучна, вельмі нэрвова, на падвышаных танах. Дэцыбэлы... Другі насамрэч быў куды больш спакойны за першага. – Усё! Трапілі і трапілі. У наступны раз спачатку падумаем.

– Ладна. Маеш рацыю, – гэтыя страсеньні паветра ўсіх ужо стамілі, але чым яшчэ дзецям заняцца ў вольную хвіліну, як ня пошукамі ісьціны.

Трэці юнак ня ўдзельнічаў у спрэчцы. Увогуле ніколі. Ён звычайна адыходзіў на некалькі мэтраў ці папросту адварочваўся. Іншыя ня ведалі, чаму ён маўчыць. Яны ўвогуле ня ведалі, хто ён такі. Аднойчы зраніцы першы і другі знайшлі яго ў сваім ложку, а пасьля ўсе неяк прызвычаіліся. Зрасьліся, ці што? Нельга было сказаць, што трэці быў «хвастом». Часам нават яны былі ў яго на падсосе. Але... ну, спачатку ніхто зь іх нічога ня мог зразумець, а пасьля ўсё зноўку зрабілася нормаю. Неяк само сабою ўсё наладзілася, і як па-іншаму жыць, ніхто сабе не ўяўляў.

Не ўяўляў!!!

Падсушвала... першае адчуваньне ўсё ж прыйшло ў гэтую галаву, у гэты закінуты, парэпаны храм чалавечай думкі. Апошнім часам яго небеспасьпяхова разносілі па каменьчыках руплівыя гаспадары навакольнага сьвету: дні, падзеі, людзі. Працэс нельга было прыпыніць, таму няма чаго і зьдзіўляцца яго паступовасьці і мэтаскіраванасьці. Так ідзе канвэер з бутэлькамі на піўзаводзе. Наклейваюцца этыкеткі.

Кожная штосьці значыць, кожная мае нейкі сэнс, не паспрачаесься.

Заўжды падсушвае... падавалася, нічога ў такой сытуацыі не паробіш. Але... У чыю яшчэ галаву магла прыйсьці думка аспрэчыць гэтую лягічную пасьлядоўнасьць? Толькі чалавеку. Хочаш піць? – пі! Падаецца, што высмактаў бы ўсю ваду з крану. Але гэта так, лірыка, ня болей. Я...аныя рамантыкі?! Ізноў?! Колькі табе год, Пал Палыч? Ня ведаеш ці ня хочаш верыць?.. маўчыш?.. Добра. У такім выпадку харэ пісьцець. Паставім на абмеркаваньне іншае пытаньне. Як ты, Пал Палыч, мяркуеш, калі ты расплюшчыш вочы, дзе ты сябе знойдзеш? Што ж, гэта цікава мусіць быць?

Рана ці позна сьвятло павінна было прабрацца пад павекі. Ня будзеш жа ляжаць тут вечна (а чаму б, уласна кажучы, і не?). Пакрысе дзень перацягнуў да сябе і гэтага хворага. Ён знайшоў сябе ў нейкім глухім дворыку, за сьмецьцябакамі. Так, сьмешна было б, калі б не было так пагана. Пал Палыч чамусьці адразу ўзгадаў, што, калі быў маладзейшы, звычайна спраўляў у падобных месцах малую патрэбу. Цікава, ці шмат зьмянілася ў прыярытэтах чалавека за гэты час? Зрэнкі прызвычайваліся да сьвятла. Прымітыўная саматычнасьць. Які прыгожы блакітны колер у гэтага бака! Ды і ўвогуле такія раніцы быццам бы адмыслова нараджаюцца дзеля колераў, і яшчэ дзеля гукаў і пахаў. Няўжо паліто ў гаўне? Што вы такое кажаце? – Гэта ня больш чым вэрсія, так што пакуль можна без хваляваньняў...

Нарэшце прымусіў сябе ўзьняцца. Здаецца, сам увесь цэлы. Абмацаў сябе, паварушыў нагамі, рукамі. Толькі твар застаецца загадкаю да апошняга часу. Таямніца. Галава баліць, і не дае зразумець, што з абліччам. Пакорпаўся ў кішэнях і высьветліў, што мае толькі выкарыстаны квіток на электрычку. Да чаго тут электрычка? Пашпарта няма, ключэй няма. Нататніка з учарашнімі п’янымі вершамі –

гуй. Толькі вось што яшчэ цікава, адзін такі аспэкцік: ён жа мог пакінуць сваю торбу і ў майстэрні... грошы? – сьмешна. Ён мог усё, і ў тым ліку спадзявацца на міласьць божую, як і на чалавечы розум. Мог... Абчысьцілі сранага інцелігенціка, як тую ліпку. Нічога страшнага. Агледзеў вопратку і адзначыў, што магло быць і горш. Правёў рукою па валасох, ціпа, прывёў сябе да ладу.

І тут, менавіта па заканчэньні апошняга руху, у двары зьявіўся яшчэ адзін тыпаж. Колькі ж нас тут боўтаецца, пакрыўджаных і зруйнаваных.

– Я прашу прабачэньня, – нерашуча, асіплым голасам пачаў было Пал Палыч, – можа ў Вас будзе цыгарэта?

– Шо?.. – дзед азірнуўся. На твары ясна чыталася падазронасьць.

– Можа ў Вас пакурыць будзе? – паўтарыў і паспрабаваў прыняць як мага больш пакутніцкі выгляд. Так працуе мімічная аўтаматыка.

– А! Махоркі хочаш? Гы-ы. Зараз, пачакай. Зараз, – стары палез у нагрудную кішэню. Паказаўся разьдзерты край мяккага пачка. – На трымай.

– Дзякуй, дзіду.

– На здароўе. Няма за што... – заўважыў, што ў мужыка няма запалак. – На.

– Угу, – дрыготкімі рукамі Палыч узяў пажаваны недапалак і падпаліў. Удыхнуў і паверыў, што стала крыху лягчэй.

– Усё. Будзь здаровы, – што яшчэ можна было пажадаць, нават калі б гэта было сказана абдумана. Толькі здароўе і было цяпер патрэбным, толькі яго і неставала. Але часам здараецца, што пляваць на яго хочацца. Бывае, узьнікае такое непераадольнае жаданьне зьнішчыць гэтае цела, такі эмацыйны мазахізм. Колькі можна трымацца за сваё крохкае цела, за няпэўны розум, калі і таму і таму рана ці позна давядзецца сапсавацца, разьбіцца, бы той вазе? Ранак падаваўся зусім нелягічным.

Пал Палыч кіўнуў, ці то дзеду, што ўжо пасьпеў схавацца ў арцы, ці то сваім дэфармаваным думкам.

І яшчэ раз моцна зацягнуўся. І яшчэ раз знайшоў паратунак. Што можа так ратаваць, як нікатын, у цяжкі час перад узыходам сонца? Ён зрабіў яшчэ адно намаганьне і пацягнуў сваё цела ў бок самотнай лавы з трох ненадзейных дошак. Што прынясе гэты дзень? Падавалася, што там былі яшчэ нейкія пляны на сёньня. Можа, трэба было з кім сустрэцца? Зараз-зараз. Яшчэ крыху і памяць перазагрузіцца. Але, зь іншага боку, так ня хочацца ўзгадваць.

«Што там было?» – традыцыйнае падарожжа ў архівы адмудоханай, непрытомнай памяці.

Першае, што вылезла, дык гэта, натуральна, майстэрня. А ці быў сэнс станоўча адказваць на прапанову «ўзяць удзел у невялічкай вечарынцы з нагоды...» Якія на гуй нагоды! Эрых Фром. Чалавечая Сытуацыя... Трэба было яшчэ пасядзець. Ён паглядзеў на літаркі каля фільтру, нічога не разабраў. Калі Пал Палыч быў маладзейшым, падобныя прыгоды здараліся куды часьцей, а цяпер ён, натуральна, ужо ня ў форме. Любая падвязка рана ці позна мусіць скончыцца. У любым выпадку, ці разьвяжасься, ці памрэш... памяць... запрацавала... раптоўна... вечар... людзі

– ...Які ж я мудазвон, – «Добры дзень! Прачынаемся! Час рабіць ранішнюю гімнастыку. Пастаўце ногі на шырыні плеч... калі зможаце сабе гэта дазволіць».

Што мы бачым, калі глядзім на карціну славутага францускага мастака першай паловы дваццатага стагодзьдзя Амадэа Мадыльяні «Дзяўчынка ў блакітным»? Мне падаецца натуральным, што гэта выява дзіцяці ў блакітнай сукенцы зь беленькім каўнерыкам (котка на плоце). Ручкі складзеныя на жываце, галава троху нахіленая ўбок. Валасы ўпрыгожаныя чырвонай стужачкай, завязанай у ахайны банцік. На нагах чорныя чаравічкі. Партрэт зроблены ў інтэр’еры, але дэталяў няшмат. Больш за тое, дзіця стаіць у куце. Вочы блакітныя. Нават больш чым

блакітныя. І гэта самая сьціслая характарыстыка гэтага твору, якую можна прыняць да ўвагі. Канечне, магчымыя і іншыя, больш мінімалістычныя спробы апісаньня гэтай карціны. Але ня ведаю, ці ёсьць у іх сэнс. Такім чынам – вось ён, твор мастацтва. Але што перадае гэтым творам аўтар? Мы можам, канечне, паспрабаваць прааналізаваць і вывесьці нейкія магчымыя варыянты перадумоваў для напісаньня гэтай карціны. Толькі ёсьць адзіны нюанс. Наўрад ці ў гэтым пакоі прысутнічае хоць адзін чалавек, які калісьці там, даўным-даўно, расьпіваў з майстрам недарагі алькагольны напой у якім-небудзь парыскім барчыку. Ёсьць? Калі тут такіх няма, значыцца, падобных высноваў мы рабіць ня можам. Можна нават сказаць больш. Пры жаданьні, канечне. Факт субутыльніцтва і нават сяброўства з панам Мадыльяні таксама ня можа даць дакладнай ацэнкі ягонага ўнутранага стану ў той пэрыяд, а тым больш мы ня ведаем, пра што ён дакладна думаў, калі глядзеў на гэтую сьветлую дзяўчынку. Нават прысутнасьць сярод нас такога чалавека, які знаходзіўся ў той самы момант у тым жа пакоі, наўрад ці дала б нам нагоду, каб прасунуцца трохі наперад у падобных разважаньнях. Гэта не дало б плёну нават тады, калі б такі чалавек займаўся высьвятленьнем падобнага пытаньня і тады, у той момант. Чаму? Адказ вельмі просты. Ёсьць нават некалькі прычынаў лічыць так. Першае: калі б хтосьці дазволіў сабе вывучаць гера Мадыльяні за працаю, і нават, што падаецца крыху фантастычным, калі б яму гэта дазволіў сам мастак, то ні ў якім разе той не знайшоў бы вонкавых прыкметаў унутранага сьвету, якім насамрэч апераваў аўтар. Досыць сумнеўным падаецца і тое, што ў падобнай сытуацыі ўвогуле хтосьці змог бы працаваць. Другое: падобны «мэдыюм», які цяпер мог бы вэрбальна перадаваць прысутным тут свае меркаваньні па гэтым пытаньні (Што хацеў перадаць Амадэа Мадыльяні ў карціне «Дзяўчынка ў блакітным»?), ня меў бы рацыі, бо, натуральна, быў бы суб’ектыўным. І ў такім выпадку няма аніякай прынцыповай розьніцы ў нашых і ягонай пазы-

цыях, бо валоданьне больш дакладнай інфармацыяй, так бы мовіць, больш першаснай, не пазбаўляе, ня можа пазбавіць суб'ектыўнасьці як факту. Трэцяе: час. Той час, які прайшоў ад моманту стварэньня гэтага партрэту і, адпаведна, ад моманту атрыманьня «мэдыюмам» цікавай нам інфармацыі, адклаў некаторыя эмацыйныя плямы, ды і ўвогуле неяк узьдзейнічаў на чалавека, які б мог цяпер быць сярод нас. Зыходзячы толькі з гэтых трох пазыцыяў, мы ўжо маем значныя падставы для ўспрыманьня сьведчаньняў інфарматара як, мякка кажучы, ня цалкам адпаведных рэчаіснасьці. Але гэта яшчэ далёка ня ўсе фактары, якія было б варта ўлічыць падчас падсумаваньня вынікаў нашага невялічкага, калі так можна сказаць, дасьледаваньня. Больш за тое, мы не ўлічылі яшчэ самага галоўнага. Мы забыліся на нас саміх: што робіцца цяпер у галаве кожнага з нас? Ці хтонебудзь адчувае поўную адданасьць пытаньню, і хто можа аддаць яму болей? Болей сілаў. Болей інтэлектуальных здольнасьцяў. Хто тут найбольш лягічны і пасьлядоўны, а хто больш схільны да эмацыйнага пачатку? Ад усяго гэтага залежыць праўдзівасьць адказу, які мы, мажліва, атрымаем.

Але перш-наперш адказ на гэтае пытаньне залежыць ад самога Мадыльяні. Ці адчуваў ён прыліў натхненьня ў тым пакоі, перад гэтым дзіцём? Ці думаў ён пра яе ўнутраны сьвет, ці пра ранішні мамурлак, пра прагараючыя трубы? Што гэта было, праца апантанага музаю мастака ці штампоўка дзеля таго, каб зарабіць на каву з круасанам і на пляшачку каньяку? Можа, хтосьці возьмецца даць адказ са стоадсоткавай упэўненасьцю? Нават калі б я быў больш дасьведчаным у гэтым пытаньні, а ня меў бы папросту рэпрадукцыю, наўрад ці палічыў бы мэтазгодным рабіць падобныя высновы... Тым больш і сам аўтар карціны наўрад ці змог даць нам нейкія цікавыя сьведчаньні. Ізноўку ж, час і падзеі. Ды і ўвогуле памёр, падаецца, ён ужо. Дык хулі мы тут гонім. Пакіньце нябожчыка ў спакоі, і годзе ў рэшце рэшт пісьцець!

І яшчэ. А ці была ўвогуле дзяўчынка? І ці быў Мадыльяні?.. Невядома. Можна задаволіцца папросту ўражаньнем, быць больш сьціплым і, урэшце, не дзяўбсьці нікому мазгоў.

Калі ісьці па вуліцы Ісуса Хрыста ад плошчы НАТА ў бок скрыжаваньня з вуліцай Мухамэда Алі, то дзесьці на палове шляху можна было заўважыць невялікі рэстаранчык хуткага харчаваньня. Там заўжды было шмат народу за вынаснымі столікамі, дый нават узімку людзі таўкліся на ходніках. Напэўна, месца было папулярнае. Назва просьценькая, але кліентам, відаць, не было да яе ніякай справы. Hofbrauhaus – пацертыя літары над дзьвярыма. Нічога асаблівага.

Але сэнс не ў піўняку для працоўных. Ну, ва ўсялякім разе не цяпер. На другім баку вуліцы быў невялічкі завулак, дзе заўжды сьмярдзела адкідамі чалавечага мэтабалізму, незразумелай смажанай бульбаю і яшчэ чымсьці. Тут былі заднія дзьверы гаспадарчай крамы і яшчэ нейкія рампы, да якіх пад'яжджалі грузавыя самаходы. Вакол можна было пабачыць грузчыкаў, працоўных-нелегалаў і іншых мутных пэрсанажаў. Дзесьці тут выраблялі нейкую хімію, патрэбную грамадзтву, як тое сьвежае паветра правансу. Ну, усё як мае быць. Маргінэз, тарчкі, барыгі. Стымуляцыя геданізму. Усьмешкі, усьмешкі. Ааааааааааааааааааааааааааа... Тут у падвале і жыў дзед Юзік.

Зрэшты, жыў стары тут спакойна. Нікому да яго не было справы. На ветэранскую пэнсію, напэўна, ці на якія там грошы, ды і якая розьніца, уласна кажучы. Удзень ён звычайна хадзіў на сьметнік. Там і бавіў свой час. Можна было нават падумаць, што жыў там. Толькі з суседзяў пра гэта ніхто ня ведаў. Ды і якая каму справа? Пхаў шторанак кудысьці свае ненадзейныя косткі. Ну і хрэн зь ім. Толькі старая бабулька зь пятага паверху, якой было год пад сто і якая ўвесь час праводзіла ў ложку ці ў фатэлі, толь-

кі яна адна і лічыла Юзіка ведзьмаком. Але нават яе дачка, а ўнучка й тым больш, не зважалі на дзедаву брыдоту. Зь іх было дастаткова тых цяжкасьцяў, якімі забясьпечвала цела старэчы.

Дзеда Юзіка справы ягоных суседзяў таксама, мякка кажучы, не турбавалі. Ён прачынаўся раніцаю ў сваім абклееным рознымі рэклямнымі плякатамі і рэпрадукцыямі шэдэўраў рознага выяўленчага мастацтва падвале і ставіў на старэнькі патыфон кружэлку з рамансамі ў выкананьні Ніны Дулькевіч. Рыпеньне іголкі на паверхні дыска і голас адкульсьці з пачатку стагодзьдзя. Як яна прыгожа сьпявала! Стары з замілаваньнем слухаў і рабіў выгляд, што сьнедае. Пасьля вады і ўчорашняга хлеба, пачэсваючы бараду, Юзік насоўваў на кудлатую, неахайна пастрыжаную галаву сваю ўлюблёную чырвоную кепку з надпісам USA. Корпаючыся пальцам у носе, ён адсоўваў падпертыя дошкаю дзьверы ўбок, і гэта быў той адзіны раз за дзень, калі хаця б нейкае сьвятло трапляла ў ягоную нару. Толькі на імгненьне. На імгненьне...

«Э-гэ-гэ-гэй!!!»

Навошта дзед крычаў гэта кожную раніцу, ніхто ня ведаў. Усе лаяліся і мацюкаліся, але зрабіць нічога не маглі. Мала хто здагадваўся, што гэта ўвогуле за сыгналы такія, бо старога звычайна было ня так лёгка заўважыць. Але менавіта гэтыя старэчыя выбрыкі не давалі людзям праспаць. Насамрэч, Юзік лічыў сябе чырвоным пеўнем, што мусіць будзіць гэтую засраную вёску. Ён крычаў вельмі сумленна, нават часам перабіраў, але затое адразу ў ложках пачыналася варушэньне, і праз якую гадзіну гаспадарчая крама спакойна адчынялася, а бабуся зь пятага паверху ўжо была вымытая і прычасаная.

Дзед зачыняў дзьверы і, усьміхаючыся бяззубым ротам сонцу ці яшчэ чамусьці, калі неба было хмарным, цягнуўся да трамвайнага прыпынку. Першыя пасажыры троху касіліся на старога, але, колькі не прынюхваліся, чамусьці не адчувалі смуроду. Нават аніякага непрыемнага паху, наадварот – ружы. Яны

схіляліся і ледзьве не залазілі сваімі даўгімі насамі пад чырвоную кепку, абнюхвалі кожную складку тулава. Некаторыя нават спрабавалі сунуць нос яму пад вопратку, але нават калі і атрымлівалася, то і там іх чакала расчараваньне. Усё гэта трошку зьдзіўляла. Разгубленыя людзі выходзілі і подбегам несьліся да заводзкіх прахадных, пракручваючы пракручваючы-чы-чы... Стары стаяў на задняй пляцоўцы і глядзеў у вакно. Ён усіх іх бачыў, але ня меў нічога супраць. Зь ягоных вуснаў пэрыядычна зрывалася нейкае мармытаньне. Але нічога адмоўнага. І яшчэ Юзік не дазваляў сабе зашмат радыкальшчыны. У выніку, ён выходзіў на канцавым прыпынку, махаў рукою кіроўцу і шкандыбаў сабе ўздоўж вялізнага бэтоннага плоту ў бок гарадзкога сьметніку.

Вось такі вось лёс быў у гэтага чалавека. Так... дзіўна.

– Гэй, вы, у капелюшох! – не, падалося.

Яны прачыналіся сярод ночы амаль што адначасова. Падавалася, што хтосьці клікаў. Нейкі вельмі агрэсіўны голас. Так могуць клікаць у войскуці на будоўлі. Можа, у турме. Такі голас мог належаць толькі кіраўніку. І не шараговаму зьвяну ў бюракратычным ланцужку, а камусьці насамрэч важнаму. Стваралася адчуваньне нейкай абавязанасьці, падначаленасьці. Але хто гэты Кіраўнік? Дзе ён? І чаму дазваляе сабе падобныя зьдзекі?.. Куды, ляць, глядзіць прафсаюз?! Нябачны, незразумелы, амаль што нерэальны. Толькі дзесьці ён усё ж ткі мусіў быць. Існавала такая ўпэўненасьць. Хтосьці ж павінен узяць на сябе адказнасьць за ўсё, што рабілася навокал, за гэтае незразумелае «нічога», у якое трапілі шэсьць мужчынаў у капелюшох. Яны азіраліся навокал у пошуках гэтага чалавека, але вуліцы ўсё так жа маўчалі. Аніводнага слова, акрамя тых, што паступова гублялі сэнс на шыльдах крамаў, указальніках... Але ўсё гэта было калісьці вельмі даўно. Кадзіроўкі мінулага, яны ня мелі аніякіх стасункаў з тым часам, які быццам бы запаволіўся і стра-

цію сваю дынамічнасьць, ня мелі нічога агульнага з усім тым, што адбывалася навокал. Усё зьмянілася за адну сэкунду, за адно імгненьне, якое так і засталося незаўважаным.

Шэсьць мужчынаў анічым не маглі гэтага патлумачыць. Яны ўвогуле мала што разумелі ў дадзенай сытуацыі. Да таго ж, раней яны не былі знаёмыя, а калі нават і ведалі адзін аднаго, дык сустракаліся выключна ў бары. У любым выпадку, даводзілася прадстаўляцца яшчэ раз. Мужчыны не лічылі дзён. Яны прачыналіся раніцай і кудысьці ішлі, а калі заходзіла сонца, і зямлю паступова ахутваў змрок, яны спыняліся. Не была бачная дарога, а тое, можа, і рухаліся б сабе наперад. Куды? Навокал усё ж ткі неяк неспакойна. Мужчыны баяліся. Мужчыны нічога ня ведалі. Ні прычынаў, ні вынікаў. Падвешаная сытуацыя, няпэўнасьць... разгубленасьць. Яны не разумелі чаму, але часам даводзілася нэрвавацца.

З таго моманту, як гэтыя шэсьць пакінулі бар, сонца стала прыпякаць яшчэ гарачэй. Амаль не было дзён, калі, стомленае, яно прыкрывалася аблокамі, каб хіба трошкі адпачыць. Праз некаторы час мужчыны канчаткова страцілі ўпэўненасьць ў мэтазгоднасьці сваіх пошукаў. А можа, яны і не шукалі?.. Але як бы тое ні было, яны прызвычаіліся да абвостранага слыху і ненатуральнай цішыні куды хутчэй, чым здолелі прыняць, што акрамя іх у гэтым горадзе наўрад ці ёсьць хто яшчэ. Толькі гэта было ўжо неістотна і тычылася максымум шасьці.

Некаторыя зь іх падумалі, што неяк вычварна памерлі, што пашанцавала падзяліць гэтую пазажыцьцёвую прастору зь іншымі. Ці добра гэта, ці блага, ніхто зь іх ня браўся меркаваць. Папросту так склалася сытуацыя... І яшчэ немагчыма было на штосьці спасылацца, і не было дзе знайсьці хоць якія сьведчаньні на карысьць гэтай сваёй сьмерці. Навокал з дня на дзень магло зьмяняцца што заўгодна, толькі ня твары. Шэсьць мужчынаў блукалі па пустым горадзе, і ім падавалася, што вось-вось – і хтосьці знойдзе хоць які, няхай і ня самы рэалістычнычны, ня

самы абгрунтаваны, але ўсё ж ткі адказ на гэтае пытаньне: «Што ўвогуле тут робіцца?» Такі адказ можна было б прыняць хіба ў якасьці варыянту і ўсяляк абсмоктваць яго, і мадэфікаваць, дый увогуле папросту паспрабаваць адштурхнуцца ад яго і... Але кожны дзесьці ў глыбіні душы ведаў, што ўсё гэта толькі самападман і лухта, бо ні адзін зь іх ніколі ў жыцьці не сутыкаўся з чымсьці падобным.

Рана ці позна, яны ў любым выпадку мусілі пакінуць горад. Ніхто ня ведаў чаму, але гэта было непазьбежна. Кожнага зь іх штосьці выцягвала і выштурхоўвала з гэтых вуліцаў. Прэч ад гэтых пустых фасадаў. Можна было правесьці паралелі зь некаторымі іншымі жывёламі, у якіх увесну прачынаецца рэпрадуцыйны рэфлекс. Гэта прымушае іх пераходзіць на іншыя тэрыторыі. Але наўрад ці такая тэорыя была б вартая ўвагі. Хіба што паставіць на дэсацыялізацыю? На выпадковы разрыў сувязяў зь іншымі прадстаўнікамі падвіду. Ну хіба што толькі так.

Тым ня менш, гісторыя спынілася, а новая яшчэ не пачалася.

Разгубленасьць.

Што ты можаш даць ім, хлапчо? Чым ты заплаціш за сваё непадпарадкаваньне?

Пабла даўно прыдумаў сабе свае правілы. Але нават калі яны не стасаваліся з агульнымі, то вялікіх праблемаў з гэтым не ўзьнікала. Дастаткова, напрыклад, супакоіцца ці прызнаць сваю неправату, толькі і ўсяго, але ў большасьці выпадкаў Пабліта рабіў так, як патрабавалі існыя сярод дзьвюхногіх канвэнцыі. Не хацелася праблемаў. І можна было лёгка іх пазьбегнуць. Вы ведаеце, пра што вядзецца. Так, так. Менавіта ён. Стары добры рамантызм.

Пабла перабег на іншы бок вуліцы. Ён усё яшчэ лавіў сонца. Заўжды яго мала. Хутка яно зноўку скончыцца, і трэба будзе вырашаць пытаньне пра мерапрыемствы на вечар. Дзіўна, але значна прась-

цей аддацца адвольнаму руху энэргетычных плыняў, чым заганяцца на ўсялякія пляны і размуты. Ды і хіба гэта цікава? Насамрэч толькі так ён і мог забаўляць сябе апошнім часам. У горадзе бракавала паветра. Тут бракавала менавіта цікавага паветра, такога, якое пералівалася, можа, ці неяк там гэтак. Карацей, тое, што існавала, не задавальняла патрэбаў Пабліты. Заўжды гэтым людзям чагосьці нестае. Таму ён прысеў на лаву і троху пакорпаўся зь нескладанымі прыстасаваньнямі... Паразарадзіўшы, хлопец узьняўся і заўважыў трамвай. Рэзка сарваўся зь месца...

Рухі, позіркі, подыхі.

Хутчэй! Хутчэй, Пабліта, дурань – не пасьпееш! Пажыць не пасьпееш! Жыць!!!

Праз два прыпынкі ён выйшаў. Тут былі старыя вулачкі і паўдраўляныя хаткі. Іх пабудавалі перасяленцы з забруджаных рэгіёнаў яшчэ год за пятнаццаць да вайны. Распаленыя сонцам бруд і шчыліны на тынкаваных мурох, бітае шкло, аўтамабільныя покрыўкі... старыя, гнілое дрэва – усё было празьмерна сухім, але гэтая сухасьць не стварала такога, ведаеце... такога летняга адчуваньня. Папросту цёпла, ня болей за тое.

Пабла адышоў мэтраў за сто ад трамвайнага прыпынку. Неба праз сетку пустых галінаў і дзесьці там, на захадзе, за платамі, за мурамі і дахамі, сонца, што заходзіць за коміны ТЭЦ. Колькі мы зьнішчылі навакольля дзеля таго, каб людзі жылі ў падобных умовах?

«Зараз папрэ сацыяльшчына», – думкі пра лёс людзей, вымушаных пакутаваць, калі іншыя ня могуць сабе дазволіць падараваць каханай каробку цукерак «Камунарка», бо гэта будзе праявай безгустоўя і часам нават сквапнасьці. У якую ж сраку мы сябе загналі, шаноўныя таварышы?! З вокнаў глядзяць вочы. Вочы поўняцца тугою і непаразуменьнем. Зайздрасьць, клясавая нянавісьць. Якая драбніца – камусьці нестае грошай на такую пару ботаў, як у гэтага юнака. А можа, зьняў бы і аддаў? Папросту сунуў праз вакно, і Васечка б парадаваўся

на старасьці. Але кім быў той васямнаццацігадовы інвалід Васечка, калі не шараговым гаўном на ўзьлеску каля аўтатрасы? Хто ўвогуле калі зважаў на паміраючых ад голаду?

Не, ну добра, зважалі. Так, каб зусім ужо сорамна не было. Ну нельга ж клапаціцца пра кожнага пакутніка, трэба ж і пра сябе падумаць. У першую чаргу!

– Дзе вы былі, калі яны цкавалі вас сабакамі, а? Куды вы глядзелі, калі тыя адгрызалі вам рукі? Што маўчыцё?...

...Рэплікі з авангардных кінастужак. Яшчэ адзін пункт гледжаньня на чалавека. Навошта? Дзеля плюралізму ў мастацтве. Простыя адказы. Іх зручна фармуляваць, і галоўнае, ня трэба доўга думаць, падбіраць словы, каб патлумачыць суразмоўцу тыя пачуцьці, што перапаўняюць тваю хворую душу. Адной рэплікі цалкам дастаткова.

Манахромны чалавек на экране спрабуе засунуць руку сабе ў рот. Нешта дрэнна атрымліваецца, але яшчэ ёсьць спадзяваньне – ён толькі пачаў. Пэрыядычна ён дастае пакрытыя сьлінаю пальцы і сплёўвае ўбок. Жанчына глядзіць на мужчыну і выяўляе на сваім твары жах. Вельмі натуральна! Ляць, ды ёй жа пісьцец як страшна!

– Дзе вы былі, калі сабакі палілі вашыя хаты, калі перагрызалі шыі вашых бацькоў?! Адказвайце!

Цікава, хто званітуе раней, мужчына, жанчына ці тая дзяўчынка на фатэлі. Калі меркаваць па твары, яна нічога падобнага яшчэ ня бачыла. Але ня страшна. Здараецца ўсялякае. Чым больш шоку атрымае падлетак, тым талерантней будзе ў будучыні. Калі будзе, канечне, бо гэта зусім не абавязкова. Паблiту ня быў бачны твар дзяўчыны, але хацелася верыць, што ён меў рацыю. Тысячы такіх аматарак вострых адчуваньняў і звышынтэлектуальнай дзейнасьці знаходзіліся цяпер у гэткім жа падвешаным стане. Ды і як жа цнатлівай сьвядомасьці ўспрымаць такую

жорсткую вытанчанасьць?.. Па ўсім сьвеце. Можа, гэта і было насамрэч трошкі цікава?..

«Мля! Харэ гнаць! Узгадай сябе пяць год таму!» – а сапраўды, было і гэтае. Хіба, можа, трохі па-іншаму, але сутнасьць засатавалася той самай.

Цені экрану бегалі па столі і шпалерах. Нічога незвычайнага. Вось рукі. Вось ногі. Таксама ён меў галаву, зь якой глядзелі вочы. Вочы быццам бы прымалі некаторыя сыгналы. Пасьля іх апрацоўваў мозг, а ці быў ва ўсім гэтым сэнс, ён ужо ня меў магчымасьці высьветліць. Перад вачыма круціліся карцінкі, у вушы біліся гукі, але ўсё разам тут і цяпер ня мела ніякага значэньня. Трэба менш думаць ці менш ужываць усялякіх рэчываў. Усе ж самі адказваюць за свае рэальнасьці, то бок можна супакоіцца і закурыць.

Пабла выйшаў на кухню. У пакоі людзі штосьці заціралі адзін аднаму. Там тэмы і тэорыі. Там адныя амбіцыі. Юнак узяў кубак і наліў вады. З крану крапала. Ён адчыніў вакно. Мяккі вечар у адносна новым раёне. Дзеці на школьным стадыёне ганялі мяч. Некалькі хлопчыкаў на роварах. Аранжавае сонца ў расплаўленых аблоках.

Блюзы вялікіх прастораў і лесьвічных пляцовак. Выканаўцы ня ведаюць музычных тэрмінаў. Яны вывучылі шмат розных іншых словаў дзеля таго, каб стварыць свой сьвет. Пляваць, што ён як дзьве кроплі вады падобны да сьвету суседняга двара. Ля-мінор, рэ-мінор, мі-мажор – вось яны, адзіныя магчымыя каардынаты. Вайна, вязьніца і няшчаснае каханьне. Хто ніколі, хаця б якім краем, з гэтым не сутыкаўся, той мае мала шанцаў устаяць на нагах у цёмным куточку між трансфарматарнай будкай і заднімі сьценкамі мэталічных гаражоў. Усе правілы запісаныя ў падсьвядомасьці зь дзяцінства. Усе ведаюць усіх. Усе шануюць старэйшых, пакуль тыя не стамляюцца быць старэйшымі. Гарэлка як першы досьвед мужнасьці. Разьбітыя вусны і нос як сьведчаньне фізычнай дастатковасьці. Але ня ўсе... ня ўсе...

...Даўгія валасы пад каўнерам, і асьцярожней з завушніцамі... але, зрэшты, усё ўжо скончылася. Хутка

людзі прыдумаюць што-небудзь новенькае, цалкам адпаведнае мадэрнізацыі нораваў.

Пабла марудна апусьціў недапалак у шкляную попельніцу. Яскаркі спакойна каналі на роўнай, троху занесенай попелам паверхні. Усё гэта было вельмі даўно і ня зь ім. Амаль што ня зь ім, і амаль што было. Карцінкі зьмяняліся. Дыяфільм у працэсе. Ведаеце, а можа быць, і стомленасьць. Розныя варыянты тлумачэньня ўласнае гісторыі. Усё дзеля спакою і ўпэўненасьці. Галоўнае не паддавацца на правакацыі. Захоўваць раўнавагу сярод акіяну эмацыйна напружаных суб’ектаў.

Было падобна да таго, што хтосьці адчыніў дзьверы ці ва ўсялякім разе спрабаваў гэта зрабіць. Рэзкі паварот галавы, і ў поле зроку трапляе чалавечая постаць. Мантажор перабірае кадры, сьвятар перабірае ружанец, сяляне перабіраюць бульбу. Яўны перабор. Трэба з гэтым сканчаць… У дзьвярох зьявіўся чалавек, якому вельмі падабалася адчуваньне татальнага аб’ябосу. Ён спрабаваў падавацца як мага больш нецьвярозым, папросту кайфаваў ад таго, што можа быць у такім стане, і ўвесь час на гэтым настойваў. Было сьмешна назіраць за ілжывымі гіпэртрафаванымі вачыма і напружанай мімікай.

– О, нішцяк… Здарова, – чалавек працягваў руку і ўсьміхаўся поўным ротам, што стварала адчуваньне, нібы праз імгненьне рэклямная карцінка твару асыплецца, як фарба са старой шыльды. З роту выляцяць дзікія пчолы несумленнасьці і глупства… і яшчэ крыху нахабства, як жа безь яго… Патрымай-ка, Паблітачка, сябе ў руках. А тое, каму тут якая справа да твайго абвостранага пачуцьця рэальнасьці? Кожны паасобку надае яму прыкладна столькі ж увагі, колькі ты, магчыма, ім усім разам. Супакойся, дастань…

– А можна ў цябе, чувак, цыгарэту папрасіць? – жэст, які выяўляе працэс курэньня: указальны і сярэдні пальцы выпрастаныя і рухаюцца каля вуснаў, два – чатыры рухі.

…дастань цыгарэту і закуры, і не палохайся. У любым выпадку, калі ты ня скончыш раней зь якіх-

небудзь іншых прычынаў, то ад раку анікуды не падзенесься.

– Трымай, – Пабліта працягнуў адкрыты пачак. Рукі паварушыліся і пацягнуліся корпацца ў цыгарэтах, каб пасьля вялікіх намаганьняў атрымаць тое, што было такім жаданым і такім неабходным.

Пабла ня мог пазбыцца напружаньня, было падобна, што хтосьці хацеў зносінаў. Пабла не хацеў. Дзеля гэтага трэба было стаць мантажорам ці сялянамі. Колькі можна было знайсьці карысьці ў тым чалавеку, што так падобны да прастытуткі? Зашмат пустой весялосьці. Ультравесялосьць. Хлопец адвярнуўся да вакна, а з чужога роту панесла пахам пакутаў і бессэнсоўнага пазыцыянаваньня. Напэўна, гэты весялун зьявіўся ў кватэры адносна нядаўна. Можа, хвілінаў пятнаццаць таму, але, зрэшты, час спыніўся, і ўсё перастала зьвязвацца з гадзіньнікавымі стрэлкамі. Падобныя фізіяноміі ў падобных абставінах наводзілі на думку пра тое, колькі ўсяго рознага чалавек прыдумаў дзеля задавальненьня свайго эгаістычнага намеру быць важным і патрэбным. Да таго ж для большасьці гэта рабілася сэнсам існаваньня. Мільярды амбітных пацучкоў... піце атруту. Піце. У такіх выпадках гэта можа дапамагчы... а можа й не. Ці паспрабуйце сябе падмануць, звычайна гэта куды прасьцей. І больш натуральна выглядае.

...У выніку высьветлілася, што хтосьці прынёс піва; гаспадары глядзелі мульцікі і часам знаходзілі тэмы для прагонаў. Маленькая дзяўчынка з куточка неўзабаве перасунулася ў прыбіральню. Часам бывае блага. У такіх выпадках можна ўзгадаць Ісуса... ці яшчэ каго-небудзь, хто там цяпер актуальны. Пабла тупіў і шмат курыў. У выніку ён стаміўся быць непрацоўным вухам. Няхай нават усе дзеці гэтага сьвету павіснуць на ўнітазах і будуць маліцца на чарговых ідалаў, поўныя прагі пазбавіцца ад усіх настаўнікаў і кантралёраў, і адчуць, перажыць што-небудзь такое, што ня будзе ўпісвацца ў «стандарты» і «канфармізм». Усе вытанчаныя і высокагустоўныя, яны будуць сьціраць з вуснаў ваніты і

прасіць увагі і любові... Але жадаючы спажыць, ніхто не захоча аддаць.

На гуй! Дастаткова супакоіцца. Папросту супакоіцца.

– Выпі атруты, – Пабла ўзьняўся, загасіў цыгарэту і адчыніў дзьверы, ціхенька дзынькнуўшы шклом. Не зважаючы на тое, што рабілася ў задымленым пакоі, пераступаючы праз усё гэтае шчасьце, нібы ў затупе, ён нацягнуў боты, накінуў куртку. І вылецеў у фортку. Як мага далей. Яшчэ далей.

– Гэй! Гэй, ты хто такі, га?! Ты хто такі?! – чулася ў сьпіну. Яшчэ крыху і... можа.

Супакойся, ніхто ня кіне. Мала хто ў нашыя дні трымае ў кватэры камяні, дый каму ты на гуй патрэбны?

Пад’езд. Зацяжка. Вуліца.

(вазьмі якую заўгодна кніжку, і рана ці позна там хтосьці скажа: «І вось надышоў час...» Гэта папросту кампазыцыйны сродак. Ягоны сэнс – адзначыць нейкую мяжу, нейкі этап. Гэта пачатак чагосьці новага, што мусіць адрозьнівацца, да таго ж кардынальна адрозьнівацца ад папярэдняга адрэзку. Чэкпоінты (імпрынты?). Яны падзяляюць усю гэтую цягамоціну ад «мінус» бясконцасьці да «плюс» бясконцасьці на гісторыі, тэмы, прагоны і іншую дробязь, што зьвініць у кішэнях Іеговы, ці як там яго...)

Ом.

Скалам глядзець у мора. Адзінае, што застаецца. Можна не разглядаць іншыя варыянты... На сьвітанку высьветлілася, што ноч выкінула на бераг трупы двух дэльфінаў. На што ж яны былі падобныя да сьмерці? Першы іх яшчэ ня бачыў. Ён пакуль што заўважыў толькі бязроднае неба і камень. Ня мае значэньня. Хлопец прачнуўся канчаткова. Ізноўку знайшоў сябе брудным, у пяску. Жорсткі хаос валасоў. Жорсткасьць. Бляклае кола сонца, што выкацілася з-за скалы, і адвечная маўклівая барацьба

хмараў над морам. Астатнія ўжо таксама ня спалі. У трэцяга быў адсутны позірк, але відавочна, што ён усё асэнсоўваў. Хлопцы маўчалі. Рана ці позна яны ўзьнімуцца і пачнуць жаваць хлеб, вып'юць па некалькі глыточкаў нясьвежай вады. Вельмі цяжка падтрымліваць унутраны дыялог.

Дэльфіны на беразе. Што напісанае ў іхных нерухомых вачох? Хвалі вымыюць матэрыю, а пазьней рэшткі заменяць на іншыя. Усё рана ці позна зьменіцца. Усё назаўжды застанецца такім самым.

– Магчыма, раней я быў вартаўніком у дэльфінарыі. І прыходзілі дзеці, і сьмяяліся. А можа, я прадаваў цукровую вату і ліманады. Малыя глядзелі на ўсе гэтыя дэльфінавыя выкрутасы і пляскалі ў ладкі, – другі глядзеў на трупы і марыў пра нешта, чаго не было. Манатонным голасам ён маляваў карціны няіснага мінулага. Насамрэч ён бачыў гэтых жывёлаў толькі па тэлевізіі і вось тут.

– Так, ляць, сука! Ты зноўку пачынаеш?! З самага ранку будзеш мне настрой паганіць, гаўно?! – першы падарваўся, ускочыў на ногі і быў ужо гатовы ледзьве ня зьбіць другога. – Я, ляць, папярэджваў цябе! У наступны раз павыбіваю, сука, зубы! Зразумела?!

– Няўжо такога не магло быць?! Было!.. Я папросту не казаў табе.

– Што, ляць, гуёва чуеш, гаўно?!! Зараз, сука, атрымаеш!!! – крыкі, удар.

– Добра. Прабач. Я зраблю ўсё як ты скажаш, я заўжды буду цябе слухацца. Я пайду за табой куды заўгодна, – другі раптам скончыўся, як тытунь у цыгарэце.

– Глядзі, больш казаць ня буду.

– Усё! Добра, сказаў! Адвяжыся! – нэрвы пачалі здаваць. Але другі па-ранейшаму яго кахаў. Нічога ня мог з сабою зрабіць.

Жорсткасьць.

Хвалі. Бераг. Два маладыя мужчыны ледзьве не пабіліся. Так, цяжка бывае трываць кагосьці доўгі час. Але даводзіцца. Не заўжды атрымліваецца стрымацца. Што ж казаць пра такія ўмовы, калі на пра-

цягу цэлага тыдня, і заўжды разам, і ў напружаньні... натуральна, што ня кожны вытрымае.

Ранак. Дзьве постаці на беразе. Якія ж яны прыгожыя! Першы ўжо гатовы заехаць босаю нагою па твары другога. Той сядзіць, абапіраючыся на паўсагнутыя рукі, што ў любы момант гатовыя спрацаваць і выкінуць цела наперад. Жорсткасьць. Камяні скалаў. Позіркі. Варожасьць. Каханьне. Неасэнсаваная дзікунская нянавісьць. Тут яны, напэўна, маглі б стаць жывёламі, але... яны імі і былі. Нікуды не маглі ад гэтага падзецца. Напружанасьць у мускулах. Напружанасьць у эмоцыях. Сон перастаў быць сном, але ўсе яшчэ хапаліся за гэтую гульню падсьвядомасьці. Так лёгка пераконваць сябе ў нязначнасьці рухаў кулакоў. Адмахнуцца ад думак – лёгка. Каму патрэбная гэтая гуманістычная брыдота? Падбяры пад сябе ногі, каб зручней было ўскочыць. Адважныя хлопчыкі. Але вочы супакойваліся, твары паступова гублялі чырвань. Позы не зьмяніліся, толькі галовы павярнуліся да лініі прыбою, дзе ранішнія хвалі пакінулі два целы. Навошта мы выйшлі на гэты бераг?

Жорсткасьць?

– Прабач. Я паспрабую...

Першы адвёў вочы і прамаўчаў. Трэці жаваў свой кавалак хлеба, седзячы сьпінаю да мора. «Нічога, – меркаваў ён, – анікуды не падзенуцца. Папусьцяцца. Калі, канечне, голад не прымусіць зьесьці адзін аднаго».

Жорсткасьць.

Хлопцы глядзелі на мёртвых жывёлаў. Калі яны ўчора сюды прыйшлі, было ўжо цёмна. Можа і не заўважылі. Што робіць чалавек дзеля гэтага?.. Але, напэўна, ужо нічога не спыніць. Марна эколягі турбавалі вуліцы сваімі лёзунгамі. Чалавек перарос сэнтымэнталізм. Тут на пляжы юнакі ня плакалі, іхныя сэрцы ня нылі. Усё ўспрымалася толькі як факт. Было непаразуменьне. Можа, хлопцы папросту тупелі ад гэтага бясконцага паходу між скаламі і морам?

– Дайце мне вады, – трэці, не паварочваючы галавы, працягнуў руку па бутэльку. Астатнія, што, на-

пэўна, некалькі хвілінаў бяздумна разглядалі дэльфінаў, нечакана апынуліся ў гэтай рэчаіснасьці.

– Трымай, – першы ўзяў бутэльку і падкінуў трэцяму. – Мне падаецца, што, калі ў бліжэйшы час мы ня знойдзем паселішча, можа здарыцца штосьці нядобрае.

– Давай паспрабуем супакоіцца, папросту падключым чалавечнасьць. Мы ж не зьвяры зь лесу, мы – людзі, – у другога былі занадта мяккія вочы. Занадта пяшчотныя для гэтых скалаў.

– Прабач мне, калі ласка. Тут зашмат пустаты, зашмат думак і ўспамінаў. Наўрад ці я калісьці меў столькі свабоднай прасторы.

Нявызначанасьць. Разгубленасьць.

Трэці паднёс плястыкавае рыльца да вуснаў і зрабіў некалькі глыточкаў. Вада была ня зь лепшых, але цяпер гэта ня мела значэньня, і было невядома, ці зможа ён надаваць гэтаму ўвагу ў будучыні. Трэці чуў шолах хваляў і крыкі крачак. Трэці быў спакойны. Дэльфіны не ўскалыхнулі яго, і спачатку гэта падалося нязвыклым. Чамусьці ён увесь час думаў, што падобныя сытуацыі маюць на яго хаця б нейкі ўплыў. Можа, зашмат мэлядрамаў па відэа ў дзяцінстве? Краем вуха ён чуў размову першага і другога. Нічога такога, што можа справакаваць надзею.

– У любым выпадку выйсьце толькі адно – рушыць далей, бо вяртацца ўжо ня мае сэнсу. Мы папросту падохнем на гэтым пляжы, – першы ўсё ж ткі спрабаваў трымацца. Цікава, колькі яшчэ ён працягне. Больш актыўны і рухавы за астатніх, ён, відаць, аніяк ня мог пазбавіцца той энэргіі, што гуляла ў крыві. Ён патрабаваў дзеяньняў і рашэньняў. Ён казаў: «Я!»

– Так, мы так і зробім, – другі згадзіўся. Другі таксама, як падавалася, супакоіўся, але ці надоўга? У выніку яны ўтрох мелі супэрвыбухную сытуацыю і паступова стагнуючую псыхіку. Адну на трох. Лепей быць папросту не магло.

– Хадзем, – трэці ўзьняўся і пачаў згортваць лахманы сваёй коўдры. Можа, ён адзіны тут разумеў,

што пакуль яшчэ ёсьць у іх сілы, трэба аддаваць іх на працу мускулаў, а не на дарэмныя спрэчкі. Драматычны тэатар у такіх абставінах – яшчэ адна праява дурасьці і абмежаванасьці. Тут трэба было выжываць, а ня граць гэтыя нікому не патрэбныя ролі. П'есы для мёртвых дэльфінаў? Якая брыдота!

А можа, усё было зусім па-іншаму? Псыхадэлічная музыка пустых прастораў...

Так падэшвы ідуць па пяску.

Яна не зважала на жабракоў. Яны папросту былі, і гэтага хапала. Ніякіх праблемаў.

На кожным кроку, пры кожным павароце галавы, падчас усмоктваньня паветра ў лёгкія, у любое імгненьне навальвалася жаданьне дастаць ствол, прыставіць рулю да скроні і разьвітацца. Або па-ангельску... Але да чаго тут жабракі? Так, папросту пад руку патрапіліся. Падавалася, што наперадзе сьцяна, і трэба было кудысьці збочыць, але куды ні пойдзеш, усё роўна трапляеш на яе. Можа, Яна нават магла б перастаць быць чалавекам, але ці здолела б гэта яе задаволіць? Чалавек, які не чалавек. Нічога не вядома і нічога ня бачна. Гэта менавіта такая сытуацыя, калі розум чамусьці працуе насуперак тваім жаданьням. Ішла па вуліцах, езьдзіла ў транспарце, знаходзіла грошы, і на гэтым чамусьці ўсё спынялася. Ніякіх працягаў. І што яшчэ больш невыносна – ніякіх вынікаў. За прыступкаю прыступка. Але куды яна ідзе? Ці ёсьць мэта?.. Яна штовечар вярталася ў адну і тую самую кватэру і будавала спакой і ўтульнасьць. Часам усё было файна.

За вакном тралейбуса матэрыя перацякала ў матэрыю. Горад успрымаецца як натуральны асяродак існаваньня чалавечай істоты. Па-за ім быццам бы нічога і не адбываецца. Дзьверы адчыняліся, мэталічны голас з дынамікаў перабіраў назвы прыпынкаў, віншаваньні са сьвятамі і папярэджаньні пра небясьпекі, што з усіх бакоў пагражаюць шчасьцю грамадзяніна. Жыць, таварышы, небясьпечна. Вось так.

Але пакуль мы разам, нам ня страшны шэры воўк. Тралейбус спыніўся, праз адчыненыя дзьверы на вуліцу вылілася порцыя біямасы, а ў салён улілася новая. Жанчына і двое дзетак. Хлопчык і дзяўчынка. Малы трымаў у руках гармонік і як мог выяўляў папулярную два гады таму мэлёдыю, дзяўчынка трымала плястыкавы пакунак для грошай, а жанчына хвалявалася за дзяцей. Ці не? Сям'ю не абіраюць. Паампам-па-ра-рааам-пам... Ніхто нічога не абірае.

– Людзі добрыя, дай вам бог здароўя. Хочам зьвярнуцца да вас з просьбай. Хто можа, дапамажыце дзіцяці на апэрацыю............

Яна ня верыла. Ня верыла ні жанчыне, ні ў бога. Часам дазваляла сабе троху спачуваньня, а часам слала на гуй, бо сама была б ня супраць атрымаць ад каго-небудзь пяшчотны позірк разуменьня і прыхільнасьці. Цяпер быў другі выпадак. Дзяўчына бачыла гэтыя дзіцячыя вочы, чула гэты нудны, добра адрэпэтаваны жаночы плач, акампанэмэнт старога гармоніка, але дарэмна... яна не хацела сёньня. Папросту не хацела. Папросту яна была злая і раздражнёная. І ўвогуле суіцыдалка.

Люстэрка было ў сумцы, там, куды яна паклала яго пазаўчора ўвечары. Яна хвалявалася, непакоілася. Чаму – невядома. Адчай?

«Якія дэманы?! Ты ўсё ведаеш, даражэнькая. Ты выдатна разумееш, якія. Папросту трэба зрабіць намаганьне і ўдарыць сябе па твары, трэба абудзіцца і ўважліва паназіраць за сваім жыцьцём. Спакою? Дык чаму тады жывеш у адных турботах і ня робіш анічога, каб штосьці тут зьмяніць? У сабе самой. Ты заўжды плявала на іншых і часам нават мела рацыю. Табе і цяпер насраць на ўсіх іх. Так, сапраўды, моцная і самастойная жанчына. Нават, калі пашчырасьці, і Валіка ў разьлік не бярэш, акрамя як у ролі таго, хто можа задаволіць мінімальныя патрэбы. Тлумачыш усё ягонай маладосьцю, але ведаеш, што галава насамрэч пустая. І твая галава таксама хутка стане такой самай. Адаптацыя. А пасьля, стоячы над рондалямі і патэльнямі, будзеш бурчаць

пра сапсаванае жыцьцё. І ты гэта выдатна ведаеш. Ня бачыш шляхоў вырашэньня гэтых праблемаў і сцыш іх шукаць!..»

Яна мацюкалася пра сябе. Злавалася. Прыкрае адчуваьне бездапаможнасьці. Ступар волі.

Тралейбус выехаў з цэнтру, пасажыраў паменела. Цагляныя платы, вялікія збудаваньні. Коміны. Часам вадаёмы зь нечаканымі пяціпавярховікамі па берагах. Хтосьці запытаўся б, як тут можна жыць. Але можна. Даведзена на практыцы. Дзяўчына глядзела ў вакно, спрабавала знайсьці ў навакольлі хоць штонебудзь, здольнае адцягнуць на сябе мазгавую актыўнасьць. Грузавыя самаходы. Людзі з партфэлямі выходзілі з прахадной нейкага заводу. Радасьць і фізычная стомленасьць. Жарты і залатыя зубы. На беразе чарговага каналу некалькі чалавек тузалі мужчыну ў шэрым плашчы. Напэўна, малады пралетарыят бавіць час пасьля практыкі. Яна назірала за імі, пакуль чарговы мур не схаваў ад яе гэтае цудоўнае відовішча. Гвалт. Даўно дзяўчына не адчувала нічога такога. Неяк па-за... Праз два прыпынкі яна выйдзе, пяройдзе дарогу і зойдзе ў краму. Пасьля па сьцежачцы ў арку. Пад'езд. Ліфт. Кватэра.

Усе людзі ведаюць, што ім трэба рабіць. Яны сьпяшаюцца, бягуць, мітусяцца, але насамрэч выдатна ведаюць, як трэба жыць. Дакладней, у кожным розуме ёсьць простая схема, якая, калі ўсё рабіць слушна, пазбавіць ад якіх бы ні было цяжкасьцяў. І ўсё будзе нармалёва. Дзеці будуць здаровыя, бацькі шчасьлівыя, і чарка будзе, і шкварка... Але патрэбна яшчэ штосьці, штосьці звыш.

Хутчэй! Вышэй! Мацней! Круціцца рухавік – чалавек бяжыць, нэрвуецца, думае, думае, думае. Няма спакою, ёсьць крыўда, злосьць, сівізна ў валасох... Але мэта... МЭТА?!

Бляваць хочацца...

Разьбітыя вусны, зламаны нос, выбітыя зубы, акрываўленая вопратка. Ляць, як гэта ўсё сьмеш-

на! Найлепшы працяг падзеяў папярэдняга вечару. Значыцца, яшчэ ёсьць надзея, ня ўсё так блага, не такі яшчэ і стары.

Пал Палыч перабіраў нагамі ў невядомым кірунку. Ён не пазнаваў мясцовасьці, хаця яшчэ сёньня лічыў, што выдатна ведае гэты горад. Сапраўды, было сьмешна. Падлеткі пабілі дарослага п'янага мужчыну. Такое здаралася кожны дзень, але з кімсьці іншым. Пал Палыч лічыў, што даўно выйшаў з таго ўзросту, калі мог дазволіць сабе бойку. Нават калі мог уявіць сабе яе магчымасьць. Тым ня менш, так атрымалася. Ды і, зрэшты, якая гэта была бойка, калі ён даволі цьмяна яе ўяўляў? Так, нейкія абрыўкі, твары, крыкі. Чалавек, асабліва калі яшчэ не супакоілася гарачая маладая кроў, ды і пазьней таксама... чалавек заўжды хоча быць моцным, быць галоўным. Дамінаваньне – вось ягоная асноўная мэта. Гэта насамрэч інстынкт самазахаваньня, толькі трошку перабольшаны... Але ўсю гэтую балбатню цяпер разводзіць няма сэнсу. Хіба ад яе перастане балець галава? Галоўнае, што рэбры цэлыя. На гэта можна было спасылацца, калі розум распачынаў свае хваляваньні пра здароўе. Нічога страшнага. Пал Палыч спыніўся, каб паглядзецца ў люстра прыпаркаванага ля ходнікаў самаходу. Адтуль пазіраў не такі нават і страшны пэрсанаж. Кроў збольшага ўжо запяклася, але чапаць раны неяк не хацелася. Відаць, ён ужо выцер усё, што было магчыма.

– Хлопец, дай цыгарэту, – занюханы школьнік працягвае пачак. – Можна я дзьве вазьму?

– Так, канечне, – малы ківае. Бачна, што напружваецца. Ну, няма чаго зьдзіўляцца. Хто б тут не напружваўся?

Чамусьці Палычу было весела. Балела ўсё, і ў першую чаргу галава, але вось на настрой гэта ўплывала выключна пазытыўна. Даўно не ўзьнікала такога адчуваньня глябальнай неперагожнасьці дабра. І так прыемна было, што гэтае дабро ўвасабляў менавіта ён, мужчына няпэўнага ўзросту зь цяжкім дыханьнем, разьбітым ё...лішчам і заляпанай крывёю вопраткай. А ў тым, што ён перамог, не было аніякага

сумневу. Ён перамог інэртнасьць свайго існаваньня. Гэта было куды важнейшым за выбітыя зубы.

Пал Палыч выйшаў на нейкую чарговую ўзьбярэжную і прысеў на паўзгнілую лаву. Падпаліў цыгарэту. Невядома адкуль у кішэні гэтыя запалкі. У такія моманты ўсё бярэцца халера ведае адкуль. Напэўна, адтуль жа, куды і зьнікае? Пакуль ён думаў толькі пра тое, што было, і не прыкідваў, што рабіць далей… Да будучыні яшчэ далёка.

– Пал Палыч, пазнаёмцеся. Гэта – Іван Пятровіч. Выдатны чалавек, грандыёзны розум, паэт і да таго ж у мінулым чэмпіён сьвету па боксе, – Вася прывёў новага таварыша.

– Добры дзень, шаноўны, – чэмпіён працягнуў руку. Пал Палыч паціснуў і заўважыў нястачу пальцаў. Новы чалавек, відаць, ня меў мезенца.

– А гэта мой добры знаёмы Пал Палыч, – па твары і тоне голасу Васі было відавочна, што той вельмі шануе Івана Пятровіча. Мужчына быў высокі і добра складзены. Было заўважна, што калісьці, шмат год таму, ён пільна сачыў за сваім целам, але гэта было вельмі даўно. Нездаровы лад жыцьця зрабіў сваю справу. Твар у чэмпіёна падзаплыў, а рухі сталі запаволенымі.

– Вельмі прыемна. Пал Палыч.

– Мне Вася сказаў, што Вы таксама літаратурай займаецеся. Ужо друкаваліся дзесьці? – Іван Пятровіч зацікаўлена глядзеў наўпрост у вочы. Безапэляцыйны позірк. Цяжкі. Ён зьвёў рукі за сьпінаю, і, калі б не няголенае памятае аблічча, мог бы зь лёгкасьцю закасіць пад доктара.

– Так. Толькі ў некалькіх часопісах. Няшмат зусім, – Пал Палыч не падманваў. Сёньня ён быў менавіта такім. З гэтымі людзьмі і ў гэтай сытуацыі не было аніякага жаданьня ірваць цельнікі.

– Ну, я таксама, ведаеце, няшмат. Некалькі разоў у завадзкой газэце і так па дробязі. Але мяркую, што гэта не асабліва важна.

Іван Пятровіч пакідаў уражаньне гэткага неактуальнага клясыка. Нізкі голас, на дзіва амаль што ня

хрыплы, ня тое, што ў Васіля. І стан адносна роўны. Толькі рукі хіба трошкі трэсьліся. Чэмпіён сапраўды быў падобны да нейкага значнага мастацкага дзеяча. Але Пал Палычу ўсё ж ткі штосьці падказвала, што гэта поўная лухта. Наяўнасьць вонкавай харызмы яшчэ не дае падставы меркаваць аб сутнасьці. Ён даўно навучыўся вызначаць для сябе людзей, якія насамрэч чагосьці вартыя. Канечне, ён мог памыляцца, але час мусіць расставіць усіх па сваіх месцах. У такім выпадку толькі на яго і трэба зважаць. Да таго ж Пал Палыч быў схільны верыць у мэтад алькаголю. Падобныя людзі ня ўмеюць хавацца так добра, калі па крыві гуляе сьпірт. Звычайна ўсё выкладаюць. Усё, што іх хвалюе, усе жаданьні і прэтэнзіі.

«Адкуль я гэта ўсё ведаю? Чаму вырашыў, што маю права так думаць? Чалавек сказаў толькі некалькі словаў, а я ўжо склаў агуенна разгорнуты партрэт. Напэўна, таму, што ў гэтым сьвеце я здольны толькі на суб'ектывізм, і ніякім іншым чынам ўспрымаць не магу. Гэтага чалавека, напрыклад, ці Васю, ці яшчэ каго. Толькі я адзін жыву ў маім целе, і толькі я бачу маімі вачыма. Толькі я думаю гэтымі мазгамі... Вось і адказ. Вось што падаўжае няшчасьцям нашым век на столькі год... падаецца, мяне кудысьці выносіць... Ды і, зрэшты, было ўжо ўсё гэтае... дакладна было.»

– Пал Палыч, што з вамі?

– А?..

– З Вамі ўсё нармалёва? – чэмпіён паклаў яму руку на плячо і ўважліва глядзеў у твар. – Штосьці ня так?

– Ой, не. Не. Папросту неяк выпаў з сытуацыі, – Пал Палыч вінавата ўсьміхнуўся, але атрымалася ня вельмі ўдала. Толькі тут гэта ня мела асаблівага значэньня. Людзі ўсе былі дарослыя і ўсё выдатна разумелі.

– Не хвалюйцеся, мы ўсё разумеем. Усё нармалёва, – Іван Пятровіч так быў падобны да доктара. Можа, гэта праз бараду?

– Усё файна, дзякуй вялікі, але ня трэба хвалявацца. Са мной часам бывае.

– З усімі бывае, але трэба ж любіць адзін аднаго, як казаў таварыш Ісус, – Васіль прыязна ўсьміхаўся, і такая пяшчота, такая чалавечнасьць былі ў вачох гэтага алькаша з-пад крамы №17, што Пал Палыч ледзьве не пусьціў сьлязу (котка на плоце).

Насамрэч, часам падавалася, што ўсе людзі добрыя і разумныя. Але толькі ў такія рэдкія моманты можна было ўпэўніцца ў гэтым. Усе яны ўтрох выдатна разумелі сваю сытуацыю, ведалі, што ім усім патрэбна. Тры пабітыя горадам чалавечыя целы, хворыя і недагледжаныя, але ўсё яшчэ здольныя на спачуваньне.

– Хадземце, таварышы. А то штосьці я больш не магу трываць, – Іван Пятровіч усьміхнуўся ў сваю бараду, і яны рушылі ў бок сямнаццатай.

Ногі, крокі, асфальт, арганізм патрабаваў алькаголю. А так усё было спакойна. Калі Пал Палыч слушна ўсё зразумеў, то ставіць мусіў Пятровіч. Падавалася, ён атрымаў пэнсію ці штосьці там яшчэ. Ня важна.

Шэсьць мужчынаў сьнілі футбольныя палі Англіі і лясы францускіх правінцыяў. Але калі яны прачыналіся, то навокал ізноўку былі тыя самыя знаёмыя карціны. Ніхто нічога ня ведаў ні пра першае, ні пра другое, акрамя іхнага ўмоўнага існаваньня на фатакартках і рэпрадукцыях, у навінах, кніжках. Але ў рэальным жыцьці нічога такога не было. Толькі ў сьне можна было там папрысутнічаць, паганяць мяч на роўнай, выстрыжанай траве, пазьбіраць кветкі... ці, скажам, узяць удзел у сьвятах квятненьня сакуры ў Японіі. Але пра апошнія ведаў, напэўна, толькі адзін зь іх. Чуў неяк ў маладосьці і запомніў. Ды толькі ён маўчаў, нікому не расказваў, бо думаў, што ўсе і так гэта мусяць ведаць. Ды і ці варта было надаваць такім дробязям столькі ўвагі? Турботаў і так ставала, галава папросту разрывалася. А да пачуцьцёвасьці мужчыны былі ня схільныя, бо былі мужчынамі. Да таго ж true.

Куды яны ішлі?

Хто там штосьці пачаў пра месца, якое займае працэс руху ва ўсясьветнай літаратуры? Можна адказаць

вельмі проста. Якая цяпер розьніца, куды і навошта пхнуўся той Эдып, калі ўрэшце рэшт пустая пляшка з-пад напою каштуе 140 рублёў... Усё зразумела? Рух заўжды ёсьць, так уладкаваны сьвет.

Мужчыны ішлі і не зважалі на дурацкія пытаньні. Часам яны выходзілі на сцэны, асьветленыя мяккім таямнічым сьвятлом, міналі белыя раялі і зьнікалі ў супрацьлеглай кулісе. Яны задавалі сабе роўна столькі пытаньняў, на колькі былі ў стане адказаць. Столькі і яшчэ адно: «Якога ляду?» Але апошняе ў любым выпадку было рытарычным, і наўрад ці каго сапраўды цікавіла. Выходзілі з заляў праз службовыя выхады, на нейкі час затрымліваліся на ганках, на якіх раней курылі працоўныя сцэны і акторы. Першых мужчыны адназначна паважалі, але затое да другіх не выказвалі ніякай прыязнасьці. «Акторы – прастытуткі і тыя яшчэ шмары»– мужчыны ведалі гэта ледзьве не зь дзяцінства, а самі акторы пра гэтых людзей у капелюшох нічога ня ведалі, але рабілі выгляд, што падобнай таннай самадзейнасьцю ўвогуле не цікавяцца. Ва ўсялякім разе раней. Напэўна, яны мелі б шанец атрымаць пару падачаў, але, на іхнае шчасьце, кудысьці выпадкова зьніклі, пакінуўшы мужчынаў у самоце. Тыя выходзілі на пустыя ганкі службовых уваходаў закінутых тэатраў і даставалі цыгарэты. Навокал не было анікога, і гэта ўжо не зьдзіўляла... не зьдзіўляла... толькі вось прызвычаіцца да гэтага было па-ранейшаму немагчыма.

Апошні зачыніў драўляныя дзьверы, зь якіх пакрысе асыпаўся ляк (чаму так?). Першы паправіў капялюш і пстрыкнуў запальніцай, узятай некалькі дзён таму ў адной з пустых крамаў. Навокал быў парк. Тут, як падавалася, расьлі дубы і сьпявалі птушкі. Лавы безнадзейна пусьцелі ў цені высокіх моцных дрэваў. Мужчыны занялі найбліжэйшую і марудна назіралі за навакольлем. Нічога асаблівага. Толькі трупы вавёрак зрэдчас трапляліся на вочы. Напэўна, яны прызвычаіліся да таго, што людзі іх кормяць, і ў выніку ня вытрымалі зьнікненьня чалавека з гэтай мясцовасьці. Парушэньне харчовага

ланцужка? Падобна да таго. Некаторыя мужчыны нават падумалі пра гарадзкія паркі іншых гарадоў, дзе, напэўна, таксаманазіралася падобная карціна. Але такая думка не магла займаць кагосьці зь іх вельмі доўга. Ну і хрэн зь імі! І з думкамі, і з вавёркамі...

Пасьля таго як нейкая абстрактная сука ўдарыць вас абухом па галаве, наўрад ці захочацца дадатковых разумовых задачаў. Таму мужчыны курылі і задавальняліся ценем і адноснай прахалодай парку. З кожным днём усё менш і менш разважаньняў. Некалькі зь іх ужо ўспрымалі працэс бясконцага перамяшчэньня ў прасторы як штосьці нармалёвае. Напэўна, так адчувалі сябе сярэднявечныя трувэры і мінэзынгеры. Хаця не, тым было чым заняцца. Толькі мужчыны не сьпявалі песень. Ня тое, што яны іх ніколі ня чулі ці ня ведалі на памяць, але... папросту не сьпявалі. Напэўна, яны былі ўсё яшчэ кепска знаёмыя. Ці на тое знаходзіліся якія іншыя прычыны. Ды і якія, ляць, яшчэ могуць быць прычыны, калі такая гуйня навокал?!!.. гоніва! Неістотна. Усё роўна слухаць не было каму, і плаціць не было чым. Ды і ўвогуле сэнсу ва ўсёй гэтай сытуацыі – нуль.

На дрэвах сядзелі птушкі. Яны менш востра перажывалі нястачу чалавека ў гэтым горадзе. Хутчэй нават наадварот. Можна было казаць пра ўсе перадумовы для залатога веку. Але шэсьць мужчынаў у капелюшох мала цікавіліся птушкамі. Ім было, па шчырасьці, насраць. Мужчыны дакурылі, павыкідалі недапалкі ў сьметніцу і рушылі далей па алеі. Тэатар паступова хаваўся за дрэвамі, а паабапал дарогі ўсё часьцей зьяўляліся лініі высакавольтных перадач. Гораду яны ўжо былі не патрэбныя. З кожным днём перагарала ўсё больш уключаных калісьці лямпачак, а шыльды, што заклікалі да ашчаднага карыстаньня і эканоміі электраэнэргіі даўно страцілі свой сэнс. Сьвятла больш не было. Засталося толькі сонца, калі яго, канечне, браць у разьлік. Адна за адной спыняліся электрастанцыі... а можа, і не? Сярод мужчынаў аніводнага энэргетыка. Ды і насамрэч і гэта іх ня вельмі цікавіла.

Што цікавіла шэсьць мужчынаў у капелюшох?

...

Тайныя рэлігійныя культы?!

Нож кухонны. Другая паводле пулярнасьці зброя ў сьвеце пасьля аўтамата Калашнікава.

Калі Вы на сто адсоткаў ня ўпэўненыя ў сваім партнэры, ня варта пакідаць кухонны нож на стале. Падчас вячэры настойліва рэкамэндуем Вам карыстацца адмысловымі сталовымі нажамі, якія заўжды можна знайсьці ў нашых супэрмаркетах па адрэсах...

Малады чалавек сядзеў на канапе і шукаў спакою ў тэлевізары. Але там яго не было, і гэта нават школьніку вядома. Так, ён калісьці таксама быў школьнікам. Але цяпер падавалася, што гэта было вельмі даўно. І можа нават з кімсьці іншым. Тэлевізія ўзьдзейнічала, замяняла сапраўдныя жыцьцёвыя хваляваньні на больш яскравыя, добра змадэляваныя, але нерэальныя, выробленыя адмыслова дзеля гэтай падмены. Чыстая ўтылітарнасьць. Але гэта было разьлічана на сярэдні ўзровень і мала дзейнічала на выключныя сытуацыі, якія тым ня менш здараліся.

«Ведаеш, што я табе скажу, Божа? Канечне ведаеш. Ты ў нас усё ведаеш. Дык калі ты гэта ведаў, дык навошта такія падставы муціць, а Божа? Навошта пароць усю гэтую гуйню?»

Валікава галава, падавалася, хутка разьляціцца на дробныя аскепкі. Страўнік скруціла. Так заўжды адбывалася, калі штосьці было ня так, калі хацелася біць сябе кулакамі па твары. Нічога страшнага. Папросту пачуцьці разгуляліся. Але Валік ня мог такога сказаць. Розум ужо не дазваляў сабе такія простыя і здаровыя думкі. Эмоцыі – самая надзейная псыхічная зброя. І чалавек аніяк ня ўдзельнічаў у яе стварэньні. Папросту так атрымалася, што гэтая файная пігулка, прынятая пры нараджэньні, дзейнічае на працягу ўсяго жыцьця, і хаця часам і здоль-

ная забіць на месцы, але звычайна працуе павольна, паступова зьнішчаючы розум. Часам гэта асалода, часам – боль і пакуты. Але вынік заўжды адзіны.

Хлопец доўга тут сядзеў. Калі паказвалі кінафільм, ён яшчэ неяк спрабаваў зачапіцца за сюжэт, зьбегчы, але падчас рэклямы даводзілася ледзьве не крычаць. Затыкаў рот цыгарэтай і мераў крокамі пакой. Ён ужо амаль што кінуў алькаголь, здымаючыся іншымі drug'амі, але ўсё ж ткі вырашыў крыху выпіць... Усяго толькі тры разы прыклаўся да рыльца.

Яна адчыніла дзьверы. У пакоі працаваў тэлевізар. Нешта яна не памятала за Валікам падобнай завядзёнкі. Як жа стамілася! А здаецца нічога і не рабіла. Дурацкі стан. Няўпэўненасьць і неадэкватнасьць. Добра, што ён дома. Зараз здыме боты і ўпадзе побач зь ім на канапу, і прыцісьнецца да пляча, а ўсю гэтую лухту пакіне на пазьней. Зараз ёй хацелася быць у бясьпецы. Хацелася надзейнасьці і патрэбнасьці. Толькі паменей думаць... паменей.

Так і зрабіла б. Але нешта пайшло ня так.

– Дзе ты была? – каменны твар. Нечакана. Вельмі нечакана.

– Ня ведаю.

– Што ты ня ведаеш? – твар быў стомлены. Было падобна да таго, што Валік зараз заплача ці страціць прытомнасьць. Але словы былі ясныя і дакладныя, толькі чамусьці іх спакой напружваў.

– Так, гуляла па горадзе, – Яна не чакала падобнай размовы. Больш за тое, яна яшчэ не зусім разумела, што ён хоча. – Да сяброўкі на працу заходзіла. Што з табою?

– Са мною ўсё нармалёва. А што з табою, Яна?

– А што са мною?

Валік ўзьняўся і ўзяў са століка пляшку.

– Навошта ты так? Я ж усё бачу. Ужо ня школьнік...

– Ды пра што ты кажаш?!

– Дзе ты была?

– Я ж табе сказала, дзе я была. Што ты ад мяне хочаш? – вось гэтага яшчэ ёй не хапала дзеля поўнага шчасьця. Пакуль што адносна спакойная, але голас ужо больш цьвёрды. Нельга яе на каня высаджваць.

– Навошта ты хаваесься, калі ўжо ўсё вядома?

– Што?!

Ён паднёс бутэльку да вуснаў. Некалькі глыткоў, і амаль што не скрывіўся.

– Ня трэба рабіць зь мяне дурня! Што, думаеш, я сьляпы? Я нічога ня бачыў там, у майстэрні, думаеш?!

– Чаго ты крычыш?! Супакойся! Што ты, ляць, бачыў?!

– Ды ўсе ўсё бачылі. Толькі я, можа, не адразу зразумеў, але цяпер усё па сваіх месцах. Гэта Колька, так?

– Што?! Які Колька?! Ты шо, епануўся?!

– Не, ляць, даражэнькая, епанутая тут ты!

– Ты думаеш, што я з Колькам была?! Ведаеш што?.. – словаў натуральна нетавала. Жорсткая сытуацыя. Было ня тое што крыўдна. Гэта ўсё было настолькі брудна, настолькі непрыемна...

– Што ведаеш?! Я, ляць, усё ведаю! Усе, ляць, усё ведаюць! Дзякуй табе вялікі, Янанчка! Мне агуййенна прыййемна! І што, ты меркавала, што не заўважу?! А нагуя ты пасьля прыйшла, сказала, што спазьнілася на мэтро?! Навошта было ўвогуле штосьці казаць, калі табе папросту насраць на мяне і ня толькі на мяне! На ўсіх табе, сука, насраць!

Словаў больш не было. Шок.

– Хадзі-ка ты на гуй!

– Ты каго, шалава, на гуй паслала?!

– Цябе, сонейка! Fuck u! FUCK U! F U C K U !

– Ах ты, ляць, с-сука!

Гонг.

Удар правай далоняй па левай шчацэ. Ён нават не паварушыўся.

Удар у адказ, толькі ўсё ж троху мацнейшы.

– Скаціна! – яна заўжды была напагатове, але тут сытуацыя склалася неяк зусім ужо нечакана.

Перагрупоўка. Дзяўчына прыняла пазыцыю і сканцэнтравалася. Ногі трохі шырэй за плечы, некалькі ўзмахаў простымі далонямі. Адчула ўспышку містычнага сьвятла дзесьці за левым вухам. Норма.

Валік дастаў памаду і падфарбаваў вусны, троху размазаў па шчоках.

– Вазьмі свае словы назад ці памры! – некалькі рухаў ног, і ён гатовы да атакі.

– Ніколі!

Напружанасьць. Фізычная нянавісьць. Небясьпечныя рухі.

Маланкай выпрастала правую нагу.

Заблякаваў.

Адскочыла назад.

«панеслася» – апошняя дазволеная думка.

Рукі ўжо не былі пяшчотнымі. Вылітыя са сталі, перадплеччы і далоні разразалі паветра. Кагосьці сёньня чакала сьмерць. Танец целаў. Танец з шаблямі. Сутыкненьне дзьвюх касьмічных сфэраў.

Бязьлітаснасьць.

Дзьвюма адкрытымі далонямі ў грудную клетку. Трапіў.

Адляцела, але своечасова перагрупавалася і кампэнсавала ўдар галёнкай па скроні. Захоп. Празь сябе ў дальні кут. Але шкада, што ён не такі важкі, можа, і зламала б храбціну. З наскоку пяткаю ў твар…

Пасьпеў схапіць і перанакіраваць.

Звон шкла. Расьсечанае брыво.

«shit»

Звышымклівыя рухі. Запаволены час.

Прабеглася па сьценцы і трапіла нагою ў вуха.

«памада размазалася. Ты адкажаш за гэта, здрайца!»

Вецер рухаецца марудней.

Захоп рукі. З развароту тварам у сьцяну.

Зламаны нос. Нічога страшнага…

Падхапіла зэдлік і з усёй моцы апусьціла яму на галаву...

«што такое?..»

Валік перастаў абараняцца. Вочы закаціліся. Ён стаяў роўна.

«што тут яшчэ? – у Янінай галаве прабегла шалёная думка, – О Божа, толькі ня гэтае». Невядома адкуль у руках у Валіка зьявілася лазэрная вінтоўка. Відаць, апошні ўдар запусьціў дадатковы рэзэрв.

– Табе не перамагчы. Са мною ўсе дванаццаць духаў Вялікага Юрыя Гагарына, – падпарадкуйся, і мы даруем табе права на малітву, – гэта быў ужо ня Валік. Малады хлопец ператварыўся ў пасланца духаў касьмічнага хаосу. Чырвоныя вочы палалі чыстай нянавісьцю, расьсечаная скура зусім яго не турбавала.

– Божа, дапамажы! – Яна толькі і пасьпела адскочыць, у наступную сэкунду прамень лазэру прапаліў дзірку ў сьцяне, якую яны разам тыдзень таму абклейвалі шпалерамі. Цяпер перавага была ў ягоных руках. А ў Янчынам сэрцы прабег цень вялікай крыўды. Адкінула думку. Не цяпер. Маладога хлопца больш не было, засталася тупая жорсткасьць і адзіная мэта.

Ухіляючыся ад стрэлаў, дзяўчына ўсё ж ткі пасьпела патрапіць некалькімі пратоннымі хвалямі ў ворага. Але спыніць яго было куды цяжэй, чым вытрымліваць усе ягоныя скандалы і сваркі. Да таго ж Яна губляла кроў і была вымушаная адступіць у кухню.

«Што ж рабіць? Што гэта за гуйня, няўжо гэта канец? Няўжо Бог пакінуў яе?»

Кульгаючы на адную нагу, сьцякаючы крывёю, ён увайшоў у кухню, годна трымаючы вінтоўку, бясстрашны і бязьлітасны, гатовы ў любы момант скончыць сваю справу. Усе ўсё выдатна разумелі.

Паўза.

Акрываўлены паўчалавек уважліва глядзеў на стомленую, пабітую суку. Выдатная карцінка для фіналу трагедыі. Што можа быць лепей за ўсе гэтыя

цудоўныя схемы! Вядома нават ня толькі тое, чым усё скончыцца, а загадзя зразумелыя і ўсе экспазыцыі, і ўсе варыянты пачатку гэтай чалавечай п'есы. Нават прыкладныя героі.

І вось нарэшце... (урачыста, як мага болей патасу).

Мэталічным голасам, быццам бы размаўляючы з самім сабою..:

– It is the cause, it is the cause, my soul.
Let me not name it to you, you chaste stars!
It is the cause. Yet I'll not shed her blood,
Nor scar that whiter skin of hers than snow
And smooth as monumental alabaster.
Yet she must die, else she'll betray more men.
Put out the light, and then put out the light.
If I quench thee, thou flaming minister,
I can again thy former light restore,
Should I repent me; but once put out thy light,
Thou cunning'st pattern of excelling nature,
I know not where is that Promethean heat
That can thy light relume. When I have pluck'd the rose,
I cannot give it vital growth again,
It must needs wither; I'll smell it on the tree. Kisses her.
O, balmy breath, that dost almost persuade
Justice to break her sword! One more, one more;
Be thus when thou art dead, and I will kill thee,
And love thee after. One more, and this the last;
So sweet was ne'er so fatal. I must weep,
But they are cruel tears; this sorrow's heavenly,
It strikes where it doth love. She wakes...

– Шо?!

OTHELLO. Out, strumpet! Weep'st thou for him to my face?

DESDEMONA. O, banish me, my lord, but kill me not!

OTHELLO. Down, strumpet!

DESDEMONA. Kill me tomorrow; let me live tonight!

OTHELLO. Nay, if you strive-
DESDEMONA. But half an hour!
OTHELLO. Being done, there is no pause.
DESDEMONA. But while I say one prayer!
OTHELLO. It is too late.

– Да ну на Х.., – адзін дакладны, спрактыкаваны рух і ўсё было скончана.

Кроў, куды гусьцейшая за тое чырвоненькае, моцнымі струмянямі біла зь перарэзанага горла, выцякала на кафлевую падлогу. Валік здымаў кватэру, таму гаспадар, напэўна, ня будзе ўзрадаваны такой сытуацыі.

...ягоныя дужыя рукі ўжо былі гатовыя зламаць пяшчотную дзявочую шыю, але... НЯМА БОЛЬШ НЕБЯСЬПЕЧНАЙ ЗБРОІ ЗА ВЯЛІКІ КУХОННЫ НОЖ ДЛЯ АПРАЦОЎКІ МЯСА. ЁН ТАК ЛЁГКА МОЖА ПЕРАРЭЗАЦЬ АРТЭРЫІ, ШТО ВЫ НАВАТ НІЧОГА НЕ ЗАЎВАЖЫЦЕ. ГЛЯДЗІЦЕ, ЗЬ ЯКОЙ ЛЁГКАСЬЦЮ ЁН РАСЬСЯКАЕ ГАРТАНЬ. ЗАБУДЗЬЦЕСЯ НА ІНШЫЯ КУХОННЫЯ ПРЫСТАСАВАНЬНІ, ЯНЫ БОЛЬШ НЕДАРЭЧЫ.

ВЯЛІКІ НОЖ ДЛЯ АПРАЦОЎКІ МЯСА – НАДЗЕЙНЫ ПАМОЧНІК НА ВАШАЙ КУХНІ!..

ШУКАЙЦЕ Ў КРАМАХ!

АСЬЦЕРАГАЙЦЕСЯ ПАДРОБАК!

## 2

Тралейбусы ламаліся, і раззлаваныя пасажыры выходзілі на вуліцы. Яны мацюкаліся, перапаўнялі прыпынкі. Яны ішлі далей пешшу, крычалі і махалі прастрэленымі штандарамі. Тысячы галасоў крычалі: «Revolution!!!» Усе рабілі тое, што хацелі. Толькі ціхенька, самі сабе. Небаракі спазьняліся на працу. Што ж зь імі будзе, калі яны прыйдуць на пяць хвілінаў пазьней? Кіраўнікі раззлуюцца і пазбавяць іх чаго-небудзь, яны адбяруць у іх, напрыклад, прэміі ці, што канечне менш сур'ёзна, але таксама непрыемна, адбяруць дзяцей. Пасадзяць у клеткі, каб потым прадаць на органы. А негуй тут! «Колькі можна спазьняцца, Пал Палыч?! Гэта ўжо трэці раз за тыдзень!» Сапраўды, асабліва не пазайздросьціш. Але што рабіць – усе такія, усе мусім быць на працы ў вызначаны час. Гэта яшчэ адзін крытэр, паводле якога вызначаюць, ці добры ты чалавек, ці не. Пасажыры заўжды зайздросьцілі сваім сабачкам і коцікам. Яны казалі наступнае:

– Добра табе. Адно што, еш ды сьпі. На працу хадзіць ня трэба, нічога рабіць ня трэба. Навошта табе грошы? Зашыбіся!

Жарты, канечне, але што тут незразумелага? Ніхто ж не хацеў стаяць на прыпынках і штурхацца ў транспарце (котка пад плотам), але вінаватых шукаць ужо позна. Якія яны ўсе былі слабыя і бездапаможныя, калі сутыкаліся са шчыльнасьцю расьсяленьня да сябе падобных у гэтым горадзе! Ды напэўна і ў іншых месцах так было. На падсьвядомым узроўні нараджалася напружаньне, якое насілася ўвесь дзень, папаўнялася яшчэ адной вечаровай порцыяй і ў выніку вылівалася ў сямейныя сваркі, п'яныя бойкі ў барах і вулічныя пагромы. Усё натуральна і амаль што незаўважна. Нічога дзіўнага, і прычыны толькі на паверхні, у касым позірку ці ў пасыланьні на гуй. Далей ніхто раскопваць ня будзе.

Юзік ня ўдзельнічаў. І ня толькі таму, што ён быў ужо занадта стары для гэтага. Не. Колькі сябе памятаў, ніколі асабліва ня біўся, хіба што маладым на вайне, але і там ня вельмі ахвотна. Напэўна, ягоныя бацькі былі хіпамі, але дакладна гэта вызначыць так і не атрымалася, Юзік іх ніколі ня бачыў. Навакольнае асяродзьдзе ня вельмі шанавала яго. Сакратаркі і офісныя службоўцы ня любяць жабракоў, яны ўсе чытаюць разумныя кніжкі і любяць цытаваць на памяць улюблёных клясыкаў. Яны шануюць дарагія кактэйлі і даяраюць толькі нескампрамэнтаваным крыніцам інфармацыі. А Юзік... Юзік – гуйня. Што ім усім да яго? Ды хутчэй за ўсё падобнае лайно нават і чытаць ня ўмее. Ды ён і ня ўмеў асабліва. Хіба што толькі так, на ўзроўні вулічных шыльдаў. А большага для нармалёвага існаваньня ў гэтай засранай ваўчынай яме і не патрабавалася. Канечне, нават і тут часам прабіваліся нейкія кветачкі. Дзякуй угнаеньням. Арганіка.

У гэты раз стары таксама выйшаў разам з усімі, і навакольлю падалося, што фарбы зрабіліся куды больш яркімі, ды і ўвогуле неяк лягчэй стала. Пайшоў пешшу... нефіг тут.

– Ды іх увогуле нельга ў транспарт пускаць! – думалі пасажыры-службоўцы ды крывілі твары. Якая безгустоўнасьць!.. аййооой-айой.

Стары Юзік моўчкі рухаўся прэч і не надаваў увагі гэтым дурным камяням, што, быццам матылькі, ляцелі наўздагон. А можа, папросту не заўважаў па старасьці. Пусты заплечнік-калабок, ну і кавалак хлеба з пляшкай вады... Нічога страшнага. Сонца раніцы. Адно зь першых, яно ўсьміхалася на сьвітанку гэтаму сівому, бяззубаму сыну чалавечаму. Чырвоная кепка і штосьці накшталт кедаў. Добра, што тралік спыніўся тут, а не раней. Хоць ня так далёка ад канцавога прыпынку. Ня тое што Юзіку ўжо было цяжка хадзіць. Дый не такім старым ён яшчэ быў, ва ўсялякім выпадку, з унутранага боку скуры... Папросту трэба было пасьпець. Чамусьці апошнім часам стары пачаў заўважаць за сабою нейкае самапрысьпеш-

ваньне, нейкую дзіўную, неўласьцівую яму раней, мэтаскіраванасьць.

«Адкуль што бярэцца?» – стары ставіў пытаньне і ў сьпешцы забываўся знайсьці на яго адказ. Працаздольнасьць падвышалася, але гэта ніколі не было для яго характэрным, і нават падавалася крыху ненатуральным у гэтым узросьце. Нягледзячы ні на што жыцьцё працякала вельмі гарманічна. Ніякай апантанасьці. Толькі спакой. Юзік рабіў сваю спарву і выдатна ведаў, што больш яму нічога не застаецца.

«Які жвавы дзядок! – падумала дзяўчына, што стаяла побач на сьвятлафоры. Яна ўсьміхнулася і адвяла ўбок свае сьветлыя, пісьцючыя вочы. – Быццам бы па «хуткаму» валіць».

Нечакана стары таксама зарагатаў. Ды так моцна, што нават і сам зьдзівіўся. Што да чаго? Яна ўсьміхалася, а «дзядок» ледзьве ўжо не катаўся па зямлі, агалошваючы ранішнюю вуліцу сваім глыбокім сьмехам. Ідыёцкая сытуацыя. Яшчэ адна ідыёцкая сытуацыя. Але самае галоўнае, што звонку ніхто зь іх нават не варухнуў аніводным мускулам на твары. Спакойныя людзі. Самакантроль? Дысцыпліна?

Абыякавасьць?!

Нічога страшанага. Рух працягваўся. Рух аніколі не спыняўся. Таварыш Космас, відаць, быў супраць. Зялёнае сьвятло і два розныя крокі. Адзін трохі лягчэй, другі больш важкі. Кожны ў сваім кірунку, згодна з набытымі квіткамі... і самаадчуваньнем.

Пяціпавярховыя будынкі ў промнях узыходнага сонца. Мікрараёны. Калі б была нядзеля, можна было б адчуць пах бліноў чыёйсьці бабулі, што вылятаў у фортку і наштурхоўваў на цёплыя думкі... халодныя галовы. Стары-стары Юзік паступова набліжаўся да свайго фінішу. Заставалася штосьці каля трох прыпынкаў. Дзіўна, што ён ня ведаў дакладна. Ня першы год ён танчыў свае танцы па гэтым маршруце. Можа нават і ня першае стагодзьдзе. Але тады не было ні маршрутаў, ні тралейбусаў, ні гэтай дзяўчыны з плэерам у вушох.

DISCO?!..................

…не. Напэўна, Юзік быў не актуальны для кадзіровак сучаснай сацыяльнай аксіялёгіі.

Выпаў.

На лавы паступова выпаўзалі старыя. Яны ўсё нешта выглядалі навокал, і бадзёра вітаючы сваіх школьных сябровак, скардзіліся адна адной на шматлікія цяжкія хваробы. На сваі, і, канечне ж, на хваробы герояў тупых расейскіх сэрыялаў.

Listen this beat!

Але яны і раней боўталі нагамі. Ды так жа, як і раней, на іх можна было не зважаць. Так, элемэнты дэкору. Нічога істотнага, акрамя пары-тройкі пратэрмінаваных чалавечых жыцьцяў. Юзік і не зважаў асабліва. Толькі крыху ўсьміхаўся сам сабе:

«Во дурніцы».

Але старыя, як стала вядома раней, былі тымі яшчэ шмарамі і насупіўшы бровы маўчалі. Жабракам і тут не было месца. Ніхто ня хоча беспэрспэктыўных кавалераў, нават такія пратэрмінаваныя, як гэтыя. Зрэшты, і Юзік Х на іх клаў. Ды і на ўсіх астатніх таксама. І даўно ўжо не цікавіўся! І ніколі ня быў кавалерам! Ну, толькі хіба маладым на вайне, а цяпер ён папросту слухаў гэты біт і гнаў з дальняга кута. Жанчыны пра нешта там сабе падумалі, а стары мужчына ўвогуле мала думаў.

Мікраараёны скончыліся. Пачаліся платы прадпрыемстваў, большасьць зь якіх калісьці ня вытрымала канкурэнцыі і так і засталася тут прастакутнымі каменнымі глыбамі. Роўнымі штучнымі геамэтрычнымі скаламі. Рукі чалавека маглі шмат чаго, і гэта таксама. Рукі стваралі скалы. Але коміны не пускалі ў нябёсы дыму, бо чалавечыя рукі не стасаваліся з розумам. Ва ўсялякім разе ня ў гэтым выпадку дакладна. Калючы дрот выглядаў неяк недарэчна. Тут не было каштоўнасьцяў. Толькі рэдкія сквотэры-індустрыяльшчыкі і напаўзьдзічэлыя сабакі. Інфраструктура была разбураная. Адно некалькі шапікаў каля прахадных камбінатаў, што яшчэ нешта там… Варушэньне лыжкаю ў пустой талерцы… Але і тралейбусы тут рабілі куды менш прыпынкаў,

чым паўсюль. Некаторыя папросту павыкрэсьлівалі з маршрутнага ліста. Не было патрэбы. Вецер ганяў па вуліцах паперы і старыя газэты, што зрэдчас пакідалі за сабою старэнькія сьмецьцявозы. Яны марудна тарахцелі сабе ў бок сьметнікаў… Вецер, пустыя сьцены, пыл. Там-сям былі склады, але звычайна памяшканьні не падыходзілі нават для гэтага. Амаль што ўсё ў аварыйным стане… але нічога страшнага. Чалавек – істота моцная, звыклая да сацыяльнай адаптацыі. Пазьней высьветлілася, што тут таксама маглі жыць людзі. І жылі…

Зь нейкіх, толькі яму вядомых, прычынаў Юзік усё яшчэ не пераехаў сюды, а па-ранейшаму вяртаўся вечарамі ў цэнтар. А мог бы жыць і тут. Стары заўжды зь нейкаю пяшчотаю думаў пра гэтае месца. Напэўна, ягоныя бацькі былі рамантыкамі. Але, вось жа зараза, ён іх ніколі ня бачыў! Ці можа й бачыў, але папросту не надаў тады гэтаму ўвагі. У любым выпадку падобная сустрэча магла здарыцца толькі да вайны.

Далей пачыналіся пусткі ды сьметнікі. Нічога дзіўнага. Кожны горад мае на гэта права. Кудысьці трэба адпраўляць увесь бруд, усё самае дрэннае і непрыгожае. Сонца таксама мае права часам заходзіць за хмары, але ў гэтую вясну яно ім не карысталася. Стары ў чырвонай кепцы рухаўся ўздоўж нейкага бэтоннага муру і наўрад ці якія-небудзь касьмічныя чыноўнікі ці міжплянэтныя агенты лавілі яго цяпер у аб’ектывы сваіх складаных спадарожнікавых камэраў. Такой была ягоная радасьць, ягоная непатрэбнасьць, ягоная, кшталту, свабода… Ды толькі Юзік пра гэта зусім ня думаў.

Тут таксама была вясна.

Яся захуталася ў лёгкае паліто, у тое, якое так любіла, і моўчкі сядзела за столікам. Кавярня. Гаспадар вырашыў выставіць столікі на тэрасу, напэўна, захапіўся такой нечакана раньняй вясною. Можа быць, першы раз за шмат гадоў ён заўважыў,

як адзін сэзон зьмяняецца іншым. Звычайна пра гэта ня думаюць, бо ў жыцьці ёсьць куды больш значныя турботы, чым паступовае раставаньне сьнегу і прарастаньне першай зеляніны на кустах ля пад'езду. Гаспадар стаяў тут, каля ўваходу ў залю, і дыміў цыгарэтаю, корпаўся ў думках. Напэўна, яму ўжо было не да надвор'я, але тым ня менш за столікі сядалі першыя ўзрадаваныя кліенты.

Дзяўчына не карысталася вачыма. Яна дала ім крыху адпачыць, закрыўшыся ў сваёй галаве. Сонца нагрэла ёй сьпіну, але Яся нават не заўважыла сьпёкі. Кава ў кубачку так і заставалася некранутаю. Рух думак, ці што?

Ня горача?..

«Ніколі ня думала, што так захочацца яго зьняць. Паліто. Адзінае пытаньне: чаму ён гэта зрабіў… і яшчэ чаму яна гэта зрабіла. Але гэта ўжо два пытаньні, і ні адно зь іх ня мае цяпер аніякай вартасьці. Так атрымалася. Сапраўды. Папросту так усё склалася, і я ні ў чым не вінаватая. Трэба было думаць раней. А цяпер ужо позна. І тады ўжо было позна. Кодэкс не дазваляе адмаўляцца ад бою. А што было раней? Чаму мы сталі такімі? Што магло прывесьці нас, двух нармалёвых, выхаваных людзей да такога стану? Усё адбылося так нечакана. Памятаю, калі ён упершыню падышоў да мяне, ён быў зусім іншым. Я яшчэ зьдзівілася тады, што існуюць такія спакойныя і не завернутыя на ўласьніцтве мужчыны. Якім жа маладым і новым ён тады мне падаўся. Так, трохху ня тое, чаго чакала ад гэтага жыцьця, але не ў маім стане патрабаваць чагосьці звышнатуральнага. І навокал усе так глядзелі на нас і казалі так цёпла, жадалі шчасьця і дабрабыту і радаваліся. Але такі малады… некаторыя жанчыны нават раілі паасьцярожнічаць падчас выгулу…

Божачка! Ну чаму ж ты даў мне такую магчымасьць? Навошта ты выпрабоўваеш мяне так жорстка?! Ён жа не зрабіў анічога кепскага… Ці ўсё ж зрабіў? Зрабіў, а я пра гэта ня ведала. Што будзе далей? Няўжо на гэтым усё скончыцца?………………………………

Няўжо яны пакінуць мяне?............. Няўжо ня знойдуць злачынцу?............................... Гэта немагчыма.... Фантастыка».

Думкі разьбягаліся, бы прусакі па начной кухні, раптоўна асьветленай самотнай лямпачкай самотнай маладой жанчыны. Не было ім ні канца, ні пачатку. Усё вельмі нагадвала прагрэсуючы псыхоз. Можа, так і было, але ніхто ня мог паставіць дыягназу гэтай згубленай у сваіх думках...

– Можна мне да Вас? – усьмешка галівудзкай зоркі. Але несвоечасова, дый памыліўся ўвогуле.

Насамрэч Яся, канечне, была вельмі прыгожай. Напэўна, ейная разгубленасьць і вабіла падобных пэрсанажаў. Здаралася, што можна было і на нешта згадзіцца.Часам было нават сьмешна. Але не цяпер. Здольнасьць успрыманьня часова прыпынілася. Ступар. Менш за ўсё хацелася цяпер штосьці заўважыць. Але, дзякуй богу, гэта было цяжка. Шкада толькі, што Ясіна абалонка магла прыцягваць увагу сама па сабе...

– Я гляджу, што Вы адна тут седзіце. Думаю, можа, падсяду. Вы ня супраць? – малады чалавек насамрэч не пытаўся. Адказы яго не турбавалі. Ён рабіў тое што хацеў. І нават, калі б цяпер дзяўчына яму адмовіла, гэта яго не спыніла б, як, зрэшты, і пагрозы судом за сэксуальныя дамагальніцтвы. Ён, напэўна, ніколі не спыняўся.

Ці яна насамрэч яго не заўважала, ці папросту пераконвала сябе ў гэтым, ці толькі ігнорыла – ва ўсім гэтым не было аніякай розьніцы. Папросту два асобныя чалавекі. Кожны сам сабе. На сваіх хвалях. А ўвогуле, людзі, канечне, любяць кантактаваць. Ім страшна ў самоце. Так звычайна і бывае. Але самы надзейны суразмоўца, які заўжды гатовы цябе выслухаць, гэта толькі той, хто жыве ў тваёй галаве. Толькі ён насамрэч усё разумее. Астатнія ж робяць выгляд ці пераконваюць сябе ў гэтым. Насамрэч наладкі зусім іншыя. Ніхто з людзей ня можа размаўляць з кімсьці настолькі шчыра, наколькі гэта магчыма з тым унутраным чалавекам...

– Я Вас не асабліва напружваю? Не падобна да таго, каб Вы кагосьці чакалі, – так, ён меў рацыю. Яся больш анікога не чакала. Хіба толькі тых, хто не пакіне яе ў спакоі, тых, хто ня зможа ёй дараваць.

Гаспадар дакурыў і цяпер папросту стаяў склаўшы рукі на грудзёх і час ад часу пачэсваючы бараду. Ён глядзеў на людзей, на пешаходаў, што рухаліся па вуліцы. Сьпінжакі з партфэлямі, сукенкі з торбачкамі, кепкі з заплечнікамі. Нічога. Ён як-небудзь выкруціцца. Сонца залівала вуліцу і давала лішнюю нагоду для ўсьмешкі, але з кожным днём іх было ўсё меней і меней. Ня больш за сярэдні паказчык.

– Калі скажаце, я пайду.. – малады чалавек хацеў падавацца культурным, а можа і сапраўды быў такім. Толькі цяпер не было каму ў гэтым разьбірацца.

Яся памятала ўсё. Дзіўна, што ў такой сытуацыі яна здолела захаваць спакой. Напэўна, не адразу ўсё асэнсавала. Добра памятала, як зьнішчала цела, як выцірала кроў. А можа, яна і не рабіла гэтага. Можа, былы вораг так і застаўся ў той маленькай куханьцы расьцякацца сваімі вадкасьцямі па падлозе? Можа, усё гэта толькі выдумкі? Верагодна, што Яся ў паніцы здолела хіба толькі ўмыцца, а на большае яе і не хапіла. Апошняе выглядала больш натуральным. Але памяць?.. Тут дакладна мелі месца нейкія парушэньні і прабелы. Што адбывалася там? Галава забітая крыкамі і ўдарамі. Напэўна і ёй добра дасталося. Дзяўчына не магла адэкватна ацэньваць сытуацыю. Яна нават не разумела, што зь ёй адбываецца і ці скончыўся ўвогуле ўвесь гэты жах. Розум разгойдвала, хістала з боку ў бок.

– А чаму Вы ўвесь час маўчыце? – хлопец прыязна ўсьміхаўся. Відаць, што звонку не было заўважна. А можа, нікому не было цікава, таму і не заўважна. І нават гэтаму. Ён карыстаўся касмэтыкай і намашчаў валасы гелем. Ці было гэта характарыстыкай? Характэрнай рысаю? Малады чалавек не цікавіўся тым, што было там унутры, яго прывабіла толькі абалонка. Зьнешнасьць і ўражаньне. Вось яны, паказьнікі сучаснага чалавекаўспрыманьня. Якія,

зрэшты, не асабліва зьмяніліся з пэрыяду раньняга каменнага веку.

Увесь час намагалася зачапіцца за гэты сьвет. Але ў выніку чамусьці зь яго выпала. «Навошта, Божа, ты гэта зрабіў?» – ён не адкажа, і Яся гэта ведала. Ён тут ні да чаго нават пальца не прыклаў. Гэта толькі людзкія справы. Да чаго ж тут бог, калі два бязбожнікі нечакана сутыкнуліся са сваімі жывёльнымі рэакцыямі. Ды і ўвогуле, пра што яна цяпер думае, калі ніхто ўжо ня зможа ажыць? Час – не кінастужка. Ды і бога, напэўна, усё ж ткі няма. Так казалі людзі, якія лічылі сябе сур'ёзнымі і разумнымі, а пасьля пачыналі рабіць глупствы і перaадрасоўваць усе прэтэнзіі на чужую выдуманую паштовую скрыню.

– Ну, калі Вам так больш падабаецца, то як хочаце. Я навязвацца ня буду, – ды і ўвогуле яму папросту стала крыху сумна ў свой абедзенны перапынак. Ня больш за тое.

Яся ўжо ненавідзела гэтае паліто. Ёй стала сапраўды сьпякотна. Падавалася, што яшчэ крыху і пот буйнымі кроплямі пачне праступаць на ілбе і скронях.

– Вам не сьпякотна?

– Няўжо Вы сапраўды хочаце гэта ведаць?

– Не.

– Ну дык чаму Вы пытаецеся менавіта пра гэта, а не пра тое, што цяпер у Вашай галаве?

– Таму што я – чалавек, істота зь нізкім разьвіцьцём сьвядомасьці і вялікім друзам стэрэатыпаў. Таму што я заўжды кажу тое, што прынята казаць у цывілізаваным грамадзтве замест праўды.

– Я так чамусьці і падумала. Сапраўды, Вы чалавек і ня болей.

– Але няўжо гэта блага? Хіба Вы не чалавек?

– Чаму Вы так думаеце?

– Не?

– Я анёл з крыламі, што пяць імгненьняў таму спусьціўся зь нябёсаў.

– Значыцца, я не памыліўся? – хлопец выпусьціў доўгую ўсьмешку.

– Канечне памыліліся…

– Няўжо? А хіба ў Вас пад паліто ня крылы…

– Не, – яна расшпіліла паліто і паказала чалавеку сваю перапэцканую крывёю вопратку. – Сёньня ноччу я забіла чалавека. Ён быў вельмі падобны да Вас.

Неяк здарылася такое, што дзень пачаўся раней. Хтосьці зь іх гэта заўважыў, але больш анікому не распавёў. У чарговы раз маўчаньне і абыякавасьць. Шэсьць мужчынаў прачнуліся і падумалі, што ўсё ізноўку стала на свае месцы. Але падумаць і прыстасавацца да цяперашняй сытуацыі – рэчы зусім розныя. Яны прачнуліся ў адно і тое ж імгненьне, кожны ў сваім пакоі, і адразу ж падумалі аб кубачку гарачай гарбаты. Але не было каму прынесьці яе ім у ложак. Да таго ж яны былі мужчынамі, і пакуль што, на жаль, гетэрасэксуаламі. Ды і на гэта можна было не спасылацца. Ва ўсялякім выпадку іншых прапановаў пакуль не паступала. Там, дзе яны нарадзіліся, не было завядзёнкі падаваць мужчынам у ложак сьняданак, як толькі тыя прачыналіся. Ды і ўвогуле ня кожны дзень іх пускалі на ноч у спальню, звычайна даводзілася спаць дзе заўгодна, толькі не на прасьцінах. Даволі рэдка можна было знайсьці побач з сабою нават шклянку вады, калі, канечне, сам яе ўвечары не падрыхтаваў (котка за плотам), калі яны яшчэ былі дзецьмі, то бабулі распавядалі ім казкі ды розныя жыцьцёвыя гісторыі са сваёй маладосьці напрыклад... Але казалі, што казкі. Існавала адно слова. І там было ўсё прыгожа, там ня білі анікому пысы, і калі людзі кладіся спаць, па іх ня бегалі пацукі. І так файна там усё было...

Падобная лірыка больш не кранала мужчынаў. І ці кранала калісьці ўвогуле? Хіба толькі каго-небудзь у дзяцінстве, і тое з павагі да бабульчынага ўзросту і аладак... Але не цяпер. Перад імі стаялі іншыя задачы. А дакладней, аніякіх. Павольна яны ўсё ж ткі прачыналіся, азіралі паўсоннымі вачыма пакой і рухаліся у ванны. Дзіўна, наколькі аўтама-

тызавана чалавечае жыцьцё. У такой сытуацыі не было куды сьпяшацца. Але чамусьці мужчыны ўсё рабілі ледзьве не сынхронна. Так атрымлівалася. Напэўна, яны настолькі прыстасаваліся адзін да аднаго, што ўзаемадзейнічалі нават на ўзроўні біярытмаў. Акрамя іх тут нікога не было. Звычаі спрасьціліся. Патрабаваньні паменшыліся. Шэсьць арганізмаў – гэта ня шэсьць мільярдаў. Мужчыны прачыналіся не далёка адзін ад аднаго. Яны ўсё яшчэ трымаліся разам, і гэта паступова пераходзіла ў звычку. Ну толькі не ў адным пакоі. Можа быць, у хуткім часе яны навучацца ненавідзець адзін аднаго, але пакуль, падавалася, напружаньне было мінімальным. Шэсьць мужчынаў у капелюшох зьбіраліся разам і пілі гарбату. Калі, канечне, была такая магчымасьць. За ўвесь гэты час яны прайшлі шмат пустых паселішчаў. Гарады, вёскі... але гарады, канечне, ураждвалі больш. Пустыя каменныя калідоры вуліцаў, помнікі, будынкі, у якіх зь цягам часу сяліліся сабакі. Птушкі сьпявалі так гучна, як ніколі раней.

У такой сытуацыі можна было рабіць што заўгодна, але на вялікія ўчынкі чамусьці не цягнула. Апатыя і абыякавасьць пасьля нямога шоку. Яны не зважалі на адсутнасьць сухога закону, мужчыны не былі аматарамі выпіць і да яго ўвядзеньня. Толькі ці ўводзілі яго калісьці, дакладна ніхто сказаць ня мог. Але, канечне, без папоек не абышлося. Некалькі імпрэзаў. Невялічкія пагромы, якія ўжо не маглі нанесьці каму-кольвечы матэрыяльных стратаў. Так, невялічкая разрадка абстаноўкі. Разбурэньне дзеля разбурэньня, ня больш за тое. Дзеля падтрыманьня традыцыяў. Сьцены маўчалі. Сьцены не маглі адгукнуцца нават самай нязначнай рэакцыяй. Часам толькі патурбаваныя жывёлы зь непаразуменьнем глядзелі на гэтых людзей у капелюшох, што бездапаможна выносілі дзьверы і разьбівалі вітрыны буцікоў, перакульвалі дарагія самаходы, падпальвалі іх. Жывёлы нічога не разумелі. Напэўна, думалі, што ня ўсё яшчэ скончылася, што хутка двухногія зноўку распачнуць свой крывавы тэрор. А мужчынам за-

ставалася хіба што плакаць (толькі зусім ціха), пляскаць у ладкі і весела крычаць. Энэргічней! Як мага мацней сьцьвярджаючы прысутнасьць чалавека на гэтай плянэце.

Так ім было лягчэй. І толькі ім. Больш наяўнасьць гэтага віду нікога тут не цікавіла.

Але хтосьці зь іх прачнуўся зранку і адчуў нейкія зьмены. Спачатку падумаў, што толькі падалося, але пасьля пераасэнсаваў і пачаў разважаць. Хутчэй за ўсё гэтую ж думку распрацоўвалі і іншыя, бо апошнім часам тут было шмат прасторы і мала інфармацыі. Дзень пачаўся раней?

Напэўна, гэта зь імі жартавалі богі. Такая думка ўсё часьцей праносілася ў этэры. Незразумелае – лепшая глеба для мітатворчасьці. Мужчыны не панікавалі, папросту яны ўжо стаміліся зьдзіўляцца і хацелі хіба як-небудзь супакоіць сваю расхістаную псыхіку. Яны пілі гарбату і па-ранейшаму маўчалі. Закурылі. Ім нічога не заставалася, як зьмяняць адзін горад на іншы, спрабуючы знайсьці нейкі спакой... Па шчырасьці, ім былі патрэбныя іншыя людзі і нічога болей. Шэсьць мужчынаў стаміліся ад ветру, ад сонца і ад гэтай пранізьлівай цішыні. Спакой... Усё навокал так ім ажно дыхала, але толькі ня гэтыя шэсьць душаў, шэсьць стомленых нявольнікаў.

Яны выйшлі на чарговую брукаваную вуліцу. Кожны са свайго дому. Яны больш не маглі спаць разам. Нават у снох яны цяпер бачылі гэтыя знаёмыя твары. Толькі ў гэты раз было штосьці ня тое. Быццам бы сонца ўзышло раней, чым мусіла. Але тлумачэньняў гэтаму як заўжды не было. Іх ўвогуле не было. Ідыёцкая сытуацыя. Лязнуўшы бэнзінавымі запальнічкамі, шэсьць мужчынаў папраўілі капелюшы ды ізноўку кудысь пайшлі. Усход ці Захад? Куды вядзе гэтая дарога?

Пустка. Бессэнсоўнасьць.

Пабліта, Пабліта... Мой ты хлопчык. Няўжо ты, небарака, ізноўку паверыў у добрых людзей?

Няўжо адшукаў дзесьці тую пад'япосную глыбока схаваную пазытыўшчыну? Не своечасова. Усё ў гэтай краіне праз сраку! Што ж ты будзеш рабіць! Нічога страшнага. У наступны раз ты будзеш куды больш жорсткім, больш мужным. Сапраўдным мужчынам, Пабліта, будзеш!!! Ну-ка давай! Досыць тут. Скардзіцца сабе на гуёвы лёс? Знайшоў каму! Ты ж і так усё ведаеш.

Пабла, насамрэч, усё ведаў. Усё, што было патрэбна, а часам нават высьвятлялася, што крыху болей. Але ён не любіў распаўсюджвацца на гэты конт. Дый каму што скажаш? Нікому і справы не было. Так, увага дзеля ветлівасьці (котка на плоце), а пасьля ўсьмешка, за сьпінай. Гэтым людзям шчырасьць не пасавала. Яна так да канца і не праяўлялася. Нават у ціхіх думках пад коўдрай, нават там, у начной цішыні, ёй было вельмі далёка да абсалюту. Але да яго, зрэшты, было далёка і ўсяму чалавечаму.

Ба-бах!!!

Выбух. Ня трэба хвалявацца, гэта ізноўку ў Іраку. Нам няма чаго хвалявацца. Максымум некалькі амэрыканскіх хлопчыкаў і пару дзясяткаў мясцовых.

– Ды супакойцеся Вы! Колькі ж можна?! Усе даўно прызвычаіліся, толькі Вы, спадар Хрыстос, увесь час моліцеся.

– Добра. Добра. Я больш ня буду.

– Ну самі падумайце, хіба Вам заняцца больш няма чым? Кніжку пачытайце, і то больш карысьці.

– Добра.

Пабла гнаў. Сядзеў у сваім фатэлі бяз ножак і бескампрамісна гнаў. Насамрэч і на вайну тую насраць было. Сваё ўжо быццам бы адваяваў, дык чаго цяпер клапаціцца? Гэтыя мудакі заўжды знойдуць нагоду, каб пастраляць. Тым больш сёньня, калі сканчаецца іхная ўлюблёная нафта. Як яны яе хочуць! Як яны хочуць, каб нафтачка-нафтусечка перапрацоўвалася і рабілася бэнзінам і разьлівалася плямамі па паверхні акіяну. Для іх, напэўна, не было ні-

чога прыгажэйшага за бэнзінавыя вясёлкі. Гэта бабло, хлопчык. Чаму ты яшчэ ня з намі, а?

«чаму я яшчэ ня зь імі?»

Зашмат пытаньняў. Раніца праразалася скрозь фіранкі вузкімі палосамі сьвятла. Сёньня прачнуўся нечакана рана і больш так і ня змог заснуць. Так і сядзеў у сваім бязногім фатэлі і корпаўся, і корпаўся, і корпаўся... за сьценкаю запрацаваў тэлевізар. Ранішнія зацыкленыя тэлеканалы разьлічаныя максымум на паўгадзіны. Зацыкленыя раніцы супэрграмадзянаў. Усе мары сыходзяцца тут. Памяты твар, лязо, якое голіць чысьцей за любое іншае ў сьвеце. Радасьць вытанчанага водара кавы. Шчасьце перад тралейбусам. Кожны дзень новая рубрыка. Што ў нас у чацьвяргі? Даты?

«Дзе ты быў, Паблітачка, у ноч з 10 на 11 траўня шэсцьдзесят восьмага?»

«Дзе ты цяпер?»

Зашмат пытаньняў. Большасьць зь іх ня мае сэнсу. Большасьць пытаньняў увогуле бессэнсоўныя настолькі ж, наколькі і адказы на іх. Гэтыя людзі заўжды любілі цікавіцца чым-небудзь. У іншым выпадку ім было б сумна. Яны выдумалі сабе шмат забаваў. Шмат сьмешных словаў і карцінак. І вось сапраўды жыцьцё пайшло ўсё такое вясёлае. Чым весялейшае, тым больш практычнае.

– Дык дзе ты, сука, быў у ноч з 10 на 11 траўня?! Апошні раз цябе, гаўно, пытаю?!

– У асьцы сядзеў. Размаўляў зь сябрам зь Нігерыі пра падарожжа Тура Хеердала праз Атлянтыку.

Яшчэ адзін удар цяжкім ботам па рэбрах. Адным болей, адным меней. Хіба гэта зьменіць расстаноўку сілаў на ўсясьветных рынках? Не, наўрад ці. Ну, тады можна не хвалявацца.

Пабліта сядзеў і гнаў, больш ні на што ён цяпер ня быў здатны. Сьвітанак ламаў ноч. І здані зноўку хаваліся ў кішэні. Сунеш руку і нічога ня знойдзеш, быццам бы і не было іх зусім. Мяккі фатэль, які за гэтыя гады ўжо прызвычаіўся прымаць абрысы ягонага цела, па-ранейшаму заставаўся, напэўна, адзі-

ным больш-менш надзейным месцам. Але ад розуму не схаваесься нават тут. І ўжо напэўна ня толькі ад яго.

«Якой прыгожай была тая дзяўчына ўчора ў тралейбусе!» – хіба праз гэта вярніся ў сваё цела, дух чалавечы. Самае простае, на што можна спаслацца ў гэтым сьвеце, дык гэта на ўражаньні. Пакуль яны ёсьць, значыцца, ты яшчэ тут, а калі не, ну, тады рыхтуйся, засталося зусім няшмат да таго як адключыцца рэфлексія. Менавіта тады будзе актуальным слова «позна». Але і яно ў выніку стане бессэнсоўным, бо сапраўды позна. Позна для таго, каб жыць тое, што ўжо пражыў. Насамрэч кожнае імгненьне набліжае да фіналу і разам з гэтым падсоўвае табе, Пабла, пад нос кіпу розных рэклямных улётачак і флаеркоў. Усё што ты рабіў, дык выбіраў самыя прыгожыя зь іх. Усё жыцьцё корпаўся ў гэтых Вясёлых карцінках. Вось сядзі сабе цяпер і не пясьці, разглядай свае забавы.

А дзяўчына сапраўды была нейкая... гэткая. Пабла вельмі хацеў у гэта верыць. Але часьцей забываў праз некалькі дзён. Максымум тыдняў. Адзінае, чым ён валодаў, была жорсткая пазыцыя. Непахіснае стаўленьне да ўсяго чалавечага блядоцтва. Але часам спрабаваў знайсьці свае рысы ў кімсьці іншым. Так хацелася менш памыляцца. Ён спрабаваў... Звычайна беспасьпяхова.

Нічога. Можа, у іншы раз пашэнціць.

Не чытаў бы ты лепей гэтых кніжак, Пал Палыч. Лягчэй бы цяпер сябе адчуваў.

Ён і сам гэта выдатна ведаў. Але што ўжо паробіш? (і абавязкова разводзіў рукамі, і крыху паціскаў плячыма, і зморшчваў лоб). Рабіць не было чаго. Трэба было цягнуцца дамоў. Цікава, што скажа жонка. Нічога ня скажа, яна ўсё яшчэ кахае. Ці, ва ўсялякім выпадку, перакананая ў гэтым. Цалкам дастаткова. Толькі доўга маўчаць будзе. Да таго часу, пакуль Пал Палыч ня стоміцца ад гэтага маўчаньня

і не абдыме яе, не зазірне ў вочы, не пачне прасіць прабачэньня... толькі б гэтая цягамоціна хутчэй скончылася. Насамрэч гэта яна яго заўжды вымушала. Але калі б не любіў яе хаця б як-небудзь, нават так па-дурацку, дык і не прабачаўся б. Да таго ж, даўно зь ім такога не здаралася. Супакойвала хіба адно: на працы праблемаў не прадугледжвалася. Ня так даўно Пал Палыч быў адзначаны нейкай граматай за нейкія там дасягненьні, і таму новы кіраўнік, састарэлая кабінэтная пацучына, што ўвесь час сачыла за ім і прыглядалася, быццам бы супакоіўся і нават быў усьцешаны тым, што ў ягоным аддзеле працуе такі «паважаны чалавек, гонар нашай нацыі».

«Да ну вас усіх на гуй...» – ня крыўдна, не. Папросту штосьці такое залезла ў галаву і точыць мазгі. Нічога асабістага, шаноўныя таварышы. Трошкі перабраў, не разьлічыў сілы і ў выніку ў які ўжо раз апынуўся ў гэтым старым добрым лайне. Што яшчэ патрэбна мозгу для нармалёвага функцыянаваньня, акрамя якаснага харчаваньня і добрага, здаровага сну? Відаць, штосьці яшчэ патрэбна. Такое адчуваньне, бы ўжо сто год пражыў. Стаміўся, як працоўны пасьля тыдня ў дзьве зьмены. А можа і не... Пал Палыч ніколі ня быў працоўным. І не цягнула. І героем таксама ня быў. Трэба было тэрмінова штосьці зрабіць з гэтым цудоўным, добраўладкаваным, спакойным жыцьцём. Хацелася патрэшыць... але ня так тупа, як учора. І што ўвогуле значыць «патрэшыць»? Словы, ляць. Адныя словы. А што за імі хаваецца, акрамя некалькіх піруэтаў розуму, некалькіх штучна створаных сытуацыяў і быцам бы дасягнутых вынікаў?

У чым мэта?

Учора Пал Палычу разьбілі яблічча. І што ў выніку? «...не, ну вы ведаеце?.. Сапраўды, пачаў варушыцца! Адчуў сябе маладзейшым. Ня ўсё яшчэ, відаць, страчана! Як высьветлілася, узрост – не нагода для кансэрвацыі мазгавых працэсаў. Так! Я ўсё яшчэ магу!»

І колькі яшчэ гэта будзе цягнуцца? Маленькае дзіцё ўсё яшчэ хоча змагацца з усім сьветам. Непакоіцца

пра чыйсьці там лёс ці пра яшчэ якуюсьці гуйню. Нэрвова трасе кулаком. Плюецца сьлінаю... Што яшчэ ты хочаш пакінуць пасьля сабе, што яшчэ ты паспрабуеш навязаць усім гэтым людзям... «на доўгую памяць удзячных нашчадкаў»?

Галава балела. Кроў запяклася на валасох. Ня блага было б зараз прыняць ванну. Пал Палыч дастаў апошнюю цыгарэту. Агменьчык – і тытунь працуе. Адвечная празьмерная мазгавая актыўнасьць зь перапою. А з чаго ўсё пачынаецца? Знайдзі карані сваіх няшчасьцяў у сабе і паспрабуй зьмяніцца. Захлынесься лайном у гэтых спробах. Нічога ня знойдзеш, толькі згубіш сілы, страціш здароўе.

Ён сядзеў, зацягваўся і сашчураным вокам глядзеў на першыя, ранішнія праявы вясновага сонца. Ён узгадваў. Выдатна разумеючы, што ўспаміны – гэта, напэўна, адно, што яму засталося. «Тут і цяпер» разьбілася аб чалавечую рэчаіснасьць. У гэтым сьвеце «тут і цяпер» дакладна было недарэчы. А далей, сапраўды, пайшлі ўспаміны. І яшчэ нейкі горкі смак. Ці то гэта пыл, ці то гнілое лісьце. Штосьці з таго шэрагу. Памяць, здаралася, захоўвала шмат цікавага, але зь цягам часу Пал Палыч навучыўся карыстацца памяцьцю, навучыўся заціраць, рассоўваць па дальніх кутох непатрэбнае і класьці на відныя месцы ўсялякую лухту ў яркіх абгортках. Але часам непатрэбнае вылазіла на паверхню і ябошыла з усёй моцы, вострым лязом прабівала грудзіну і праколвала сэрца. Зноўку і зноўку. Яшчэ раз... і яшчэ. Не хацелася думаць, але, калі фізычная апатычнасьць кампэнсуецца завышанай актыўнасьцю мозгу, з думкамі нічога ня зробіш.

Калі быў малады, ён любіў падарожнічаць, нават ня мог бяз гэтага жыць. Ня мог быць спакойным студэнтам. Ніколі асабліва не хацеў, але ў выніку ўсё ж ткі стаў прызнаным геніем, зь вялікай колькасьцю абавязкаў. Не... хутчэй за ўсё хацеў, бо ў іншым разе такога б зь ім ня здарылася. Так і боўтаўся б сабе па розных гарадох і спаў бы на лавах. І сьніў бы каляровыя сны. І быў бы бліжэй да сваіх.

Да карэнных жыхароў зялёнай плянэты, да тых, каго абмінула гэтая сучая сацыяльная мутацыя. Тады не было праблемаў, якія б немагчыма было вырашыць. Ды і што там былі за праблемы: ежа, сон, дакалупваньні паліцыі. Грошы на бухло і наркотыкі нават не патрабаваліся. Усё прыходзіла невядома адкуль. А што яшчэ было патрэбна? Новыя шкарпэткі, што можна было заўжды стырыць у якім-небудзь вялікім гандлёвым цэнтры, дзе іх нават калі і лічылі, дык дакладна кіляграмамі. Жанчыны? Заўжды маладыя стрытовыя авантурысткі. Гуй ведае адкуль прыходзіла ўсё гэтае. І туды пасьля і сышло. Чалавек у выніку заўжды застаецца ў самоце. І нічога з гэтым ня зробіць. Усьмешкі навокал паступова зьмяняюцца на задуменнасьць, а задуменнасьць на заклапочанасьць асабістымі праблемамі і перажываньнямі. Задачы зьмяняюцца. На першы плян выходзяць біялягічныя... Менавіта там Пал Палыч аднойчы і знайшоў сябе, у той самай старой добрай срацы чалавечай супольнасьці.

Сонца паступова вылазіла з-за пяціпавярховак на тым беразе каналу і біла сваёй энэргіяй наўпрост у вочы, а праз іх у гэтую параненую чалавечую сутнасьць. Так хацелася ізноўку зьмяніцца і наступным ранкам пабачыць яго ўзыход дзе-небудзь на горным возеры, ці беразе мора, ці папросту ў якім-небудзь лесе, няхай і зь першымі прыкметамі высечкі. Толькі ня тут, ня ў гэтым мурашніку, дзе кожнаму можна адкусіць галаву толькі за тое, што ён удзельнічае ў падзеле чыстага паветра. Толькі ня тут, бо гэта пачынае пахнуць могілкамі. І ня тымі ідыёцкімі градкамі крыжоў і мармуровых плітаў, што з такой ахайнасьцю прыбіраюць шаноўныя суайчыньнікі ў дзень памяці продкаў. Ня гэтым глупствам. У ноздры пачынае прасочвацца пах татальнага зьнішчэньня розуму. У дадзеным выпадку, канечне, толькі ягонага розуму. Але пры жаданьні Пал Палыч можа спакойна правесьці паралелі.

Няўжо ён ўсё яшчэ здольны адкапаць у сабе гуманіста?

Не, гэта не гуманнасьць. Хутчэй гэта нейкая занепакоенасьць лёсам Усясьвету, што раптоўна ўзьнікла ў хворай галаве атручанага алькаголем гуманітарыя. Ня больш. І справы да гэтай заклапочанасьці нікому няма, бо для чалавека куды больш важнейшым зьяўляецца прачнуцца ў час і выйсьці хвіліна ў хвіліну, каб не спазьніцца на тралейбус і не апраўдвацца пасьля перад шэфам, губляючы годнасьць яшчэ да пачатку працоўнага дня. Гэта зранку турбуе чалавека значна болей, чым уся гэтая брыдота міжасабовых канфліктаў і лёсаў Усясьвету, пра якія ўвогуле ніхто ніколі ня ўзгадвае. Хіба толькі навукоўцы. Але навуковец – гэта ці прафэсія, ці дыягназ.

Так, Пал Палыч згубіў мінулую энэргію, а разам зь ёй згубіў і яшчэ штосьці. Больш не было жывасьці ў ягоных думках. Напэўна, там засталася адна лёгіка, аздобленая надзьмутай вобразнасьцю, і больш нічога. Усе сэнсы засталіся дзесьці там, на невядомых лавачках і ў закінутых будынках. Тут было месца толькі высокаму мастацтву, рэглямэнтаванай геніяльнасьці, пацьверджанай граматамі і гербавымі пячаткамі.

Дзе ён пабачыў яе ўпершыню? Нейкая рыпучая сцэна прапахлага алькаголем і цыгарэтамі бару на ўскраіне ад галоўных культурных шляхоў, падалей ад багемы. Людзі заўжды больш шанавалі лабухаў, чым пантовых творцаў. Апошніх не разумелі, і мелі рацыю. Іх было цяжка зразумець. Пантовыя не імкнуліся быць прасьцей, бліжэй. Што?! Не разумееце нас?! Вось якія мы крутыя і цікавыя ўсе зь сябе... Маладая дзяўчынка ў простай сукенцы спрабавала зарабляць сабе на жыцьцё сьпевамі старых шлягераў пад фартэпіяна. Тапэру было ўжо ня вырвацца з гэтай дзіры. Да таго ж ня той узрост і хранічны алькагалізм. «Утрымацца б хіба тут. А дзяўчынка? Зь ёй лягчэй. І капейка нейкая малой, і практыка. Можа, зь яе што і атрымаецца. Можа, возьмуць у кавярню, што праз два кварталы на рагу. Але ўжо не пры ягоным жыцьці. Няшмат ужо засталося».

Так, там ён і піў ранішняе піва, прачнуўшыся ў нейкай незнаёмай кватэры зь нейкай незнаёмай бабаю...

А што далей было?..

– Ну што, давайце, можа, тут? – першы запаволіў хаду, азіраючы месца. Насамрэч можна было дзе заўгодна. Ніякай розьніцы. Паўсюль была прыкладна адна і тая ж карціна.

Астатнія спыніліся і моўчкі аглядалі пясок. Так, камянёў тут было не асабліва шмат, ды і, праўду кажучы, якая на гуй розьніца.

– Тут, дык тут. Мне ўсё роўна, – другі скінуў заплечнік і плюхнуўся на пясок. Неяк змрочна ўсё было. Увесь дзень адчуваў сабе неяк незразумела, ня так як заўжды. Натуральна, што апошнім часам ніхто з трох ня мог ганарыцца выдатным настроем, але для другога гэта, відаць, было ўжо занадта. Можа, ён папросту захварэў?

– Нармалёвае месца. І вунь там нейкае дрэва сухое. Відаць, ветрам са скалы сарвала, – першы спрабаваў верыць і ўсё рабіў дзеля таго, каб ня стаць падобным да другога. Ён падбадзёрваў хлопцаў і ў першую чаргу сябе.

Трэці нічога не сказаў. Ён паглядзеў на дрэва, на скалы, бясконцыя, як невядомае «дзесьці там» з таго боку неба. Вецер біў у твар, хвалі мылі пясок. Цікава, а тры мільярды год таму таксама было так, ці штосьці было іншым? Ніякіх сьведчаньняў чалавечай жыцьцядзейнасьці. Можа, сюды так ніхто ніколі і не дайшоў?.. Не, лухта. Напэўна, даўно, але не ніколі. Ды і розьніцы аніякай няма. Няма людзей, затое да халеры крабаў і яшчарак. Чым яны не правы жыцьця? Можа нават куды больш дасканалыя за гэтых вар'ятаў.

– Гэй! Хадзі дапамажы мне, – першы азірнуўся на другога, што так і сядзеў на пяску, схаваны ў сваіх думках. Хлопец бачыў гэтую закрытасьць, але яму не было аніякай справы да пустых перажываньняў. Хутчэй бы распаліць вогнішча і заснуць, каб хаця б на некаторы час пазбавіць розум неабходнасьці асэнсоўваць рэчаіснасьць. З кожным днём рабілася ўсё

цяжэй і цяжэй адэкватна на яе рэагаваць. Сытуацыя, што ўсё выразьней пачынае сьмярдзець дуркаю.

– Пачакай крыху. Дай адпачыць.

Першы таксама быў недалёка ад той апошняй мяжы. Але ўсё ж ткі здолеў стрымацца. Нэрвы развальваліся, і з гэтым цяжка было штосьці зрабіць.

«Наламалі б зараз дроваў, і селі б адпачываць, дык не, трэба ж пацягнуць час. Што за лянотнік! Ніякай, ляць, дысцыпліны. У войску б табе паказалі! С-сука!»

Але першы стрымаў усё гэта ў сабе, і спакойна падышоўшы да другога, сеў побач. Захацелася курыць.

«супакоіцца».

Трэці, які нешта разглядаў удалечыні, відаць, таксама стаміўся. Ён так і ня змог адказаць сабе на пытаньне, што ж так прыцягнула ягоную ўвагу. Быццам бы заўважыў штосьці на даляглядзе, нейкі цень, ці што? Ён вярнуўся да астатніх і, расшпіліўшы заплечнік, дастаў пачак. Словы памерлі. Яны мала што значылі. Жывым падавалася толькі мора. І тое хутчэй за ўсё праз сваю рухавасьць, бо прызнаць за ім паўнавартаснае права на жыцьцёвы пачатак ніхто пакуль што ня мог. Але так было заўжды. Папросту на тле мёртвых шэрых скалаў яно было ўсё ж ткі больш актыўным. Але – умоўнасьць, ня болей.

Юнакі закурылі. Нейкая нагода пераключыць увагу. Хай і ненадоўга. Дый ня вельмі надзейна. Колькі яны ўжо тут, на гэтым бясконцым пляжы? Колькі яшчэ працягнуць? І ці выкруцяцца ў выніку?..

Першы супакоіўся. Не зусім, канечне, але наколькі гэта было магчыма.

– Ну што, па дровы? – ён загасіў цыгарэту ў пясок.

– Хадзем, – другому чамусьці таксама захацелася як найхутчэй заснуць. Захацелася цеплыні і хаця б нейкага падабенства камфорту. А яшчэ больш хацелася, каб усё гэта скончылася.

Утрох яны хутка справіліся. Распалілі вогнішча і падманулі свае страўнікі хлебам і вадою. Здаецца, троху дапамагло. Дзеля гэтага і варта было жыць

пасьля абеду. Дзеля таго, каб увечары закінуць штосьці ў рот і забыцца сном.

...але ў другога не атрымлівалася. Стомлены, ён моўчкі ляжаў і глядзеў на вагонь. Вочы быццам бы сталі шклянымі. Сон не ішоў.

Навошта ён увогуле згадзіўся ісьці пешкі? Ня тое, што другі сябе дакараў, ці ныў сам сабе, ці скардзіўся на свой безпантовы лёс. Не. Сёньня быў занадта цяжкі дзень, дый які сэнс займацца падобнай лухтою? Адзінае, што засталося, дык гэта неразуменьне сытуацыі. Як такое магло здарыцца, што паселішча, да якога было некалькі дзён хады, ці то адсунулася на невядомую адлегласьць, ці то папросту растварылася ў прасторы. Можа, яго ўвогуле не было? Але няўжо хлусілі ўсе турыстычныя даведнікі, абяцаючы незабыўны адпачынак і рай. Дзе гэта ўсё? Чаму яны ўсё ж ткі вырашылі ісьці пехатою, а не скарысталіся аўтобуснымі маршрутамі, якіх было так багата? Вырашылі самі. Паслалі ўсё гэтае спажывальніцтва нахрэн, бо так было больш натуральна.

Другі так хацеў тады выглядаць моцным, пацертым, загартаваным шматлікімі жыцьцёвымі выпрабаваньнямі маладым мужчынам. А дзе ён цяпер, той мужчына, калі трэба сапраўды быць мужным?.. Трымаць сябе ў руках, не губляць мэтаскіраванасьці. Не было больш веры ў свае сілы. Усё кудысьці падзелася.

«Госпадзе! Прабач мне, Госпадзе! Прабач рабу свайму грэшнаму, бо сапраўды стаў бедны я вераю сваёй. Прабач мне, Госпадзе! Да Цябе да аднаго цяпер вочы свае грэшныя зьвяртаю і Табе малюся! Прабач грэшнаму рабу свайму за тое, што ня ведаў, што рабіў, за сьлепату і глухасьць сэрца майго. Прымі душу маю, о, Госпадзе, і ўратуй ад спакусаў д'ябальскіх. Амэн».

І пачуў Бог словы ягоныя. І асьвятлілася неба. І ў промнях сьвятла чыстага, і ў маланках зьявіўся яму анёл Божы.

І сказаў ён:

– Чуе Айцец наш малітвы твае... так што ня сцы, вечна тут сядзець ня будзеш. Бо сапраўды міласэрны Ён.

– Чаго чакаць мне, о пасланьнік Божы?

– Будзе табе знак птушкаю зь пер'ем колераў розных...

І на гэтым усё скончылася. Анёл дастаў з-за сьпіны рыдлёўку і пераехаў што было моцы другому па твары.

А ранкам ён прачнуўся яшчэ і з галаўным болем... у дадатак да ўпэўненасьці ў існаваньні вышэйшай пэрсаніфікаванай сілы. Канечне, яму ніхто не паверыць. Нічога дзіўнага. Шмат чаго можа здарыцца з чалавечай псыхікай у крытычнай сытуацыі.

Гарады, як лябірынты, разьбягаюцца калідорамі. Калі тут жыць доўгі час, то выдатна ведаеш, што прыкладна можна сустрэць за чарговым рогам. Ведаеш, дзе пастка, а дзе шарная раздача нішцякоў. Вучысься прыстасоўвацца. Людзям папросту патрэбныя грошы. А калі казаць дакладней – яны думаюць, што ім патрэбныя грошы. Праз гэта і валіць урбанізацыя. Ніхто ня хоча цяжкіх фізычных намаганьняў. Куды прасьцей жадаць большага і атрымліваць гэта як мага лягчэй на скрыжаваньні «гандлёвых шляхоў», там, дзе часьцей сустрэнеш падобных да сябе пэрсанажаў. На скрыжаваньні плыняў. На скрыжаваньні інтарэсаў жадаючых.

Атрымліваць. Хіба ня гэта асноўная задача сучаснага чалавека?

Нават аддаваць дзеля таго, каб пасьля атрымаць. Карагод амбітных намаляваных малпаў.

– Ну што, родненькія, мы ж можам працягваць нашыя гульні, ці ня так?

Хто б тут быў супраць? Усім папросту насраць на ўсю гэтую халеру. Наколькі ж яна індывідуальная, тая мара пра Вялікага чыстага чалавека! Але неверагоднасьць таксама ёсьць часткаю гэтага сранага розуму. Яго можна папаліць, разьбіць, дробна нарэзаць ці што заўгодна яшчэ, але гэтая сука ўсё роўна будзе там сабе нешта выдумляць. Можа, калісьці атрымаецца адключыць гэтую вясёлую і такую ту-

пую функцыю, што афарбоўвае і напаўняе водарамі нашыя сумныя дні. Але нельга быць на сто адсоткаў упэўненым, што пасьля можна будзе вось так жыць, без аніякіх запараў. Ну, у сэнсе… ну, вы разумееце. Тое, што па іншы бок ад сьмерці, нас пакуль не турбуе.

Гэтыя гарады цудоўным чынам уплываюць на мазгавую актыўнасьць. Хацелася б верыць, што калі б цяпер які-небудзь хлопец, кшталту Хрыста, патрапіў бы ў гэтую парэпаную мяшчанскую скуру, ён бы ня брыкнуўся непрытомны на зямлю. Увогуле было б файна, калі б расьсьмяяўся. Ня так прыкра, ва ўсялякім выпадку. Тады гэта з нацяжкаю можна было б прыняць за знак…

Няўжо ня ўсё яшчэ прайбалі?..

Усё. Харэ гнаць.

Гэтыя сьцены хочуць цябе дзеля… І хтосьці тыцкае ўказальным пальцам у тваю зьбянтэжаную фізіяномію. Нічога, ты таксама атрымаеш тое што хочаш. А калі пакуль яшчэ ня хочаш, дык гэта ненадоўга. Ды і ўвогуле, што ты тады, тваю маць, тут робіш?

– Папросту так атрымалася, – невыразнае мармытаньне з вачыма, упёртымі ў асфальт.

– Ня сцы, малы, мы зробім зь цябе сапраўднага грамадзяніна. Патрыёта. Руплівага гаспадара, якому неабыякавы лёс…

Усе выдатна ведаюць, чым гэта скончаецца. Сьмерцю. Усё скончаецца сьмерцю. Для ўсіх. І што нам там неабыякава, і на што паклалі… Так што давайце. Хопіць гнаць. Час сьпяваць гімн. Гімн – як выяўленьне грамадзянскай пазыцыі. Прадэманструем бясконцасьці нашую грамадзянскую пазыцыю! Каб ведала!

– …Не, ну завёўся! Табе ж сказалі, хопіць!

– Што ты мне рот затыкаеш, курва?! Што, я сказаць не магу? Я, ляць, вольны чалавек! Маю права казаць што заўгодна, а ўсялякіх фашыкаў недабітых папрашу стрымаць свае недаразьвітыя псэўдаразумовыя варыяцыі.

– Ай, не пісьці…

А калі па шчырасьці, дык сапраўды сьвінарнік нейкі. І ніхто пальцам не варухне дзеля таго, каб стаць чалавекам. А можа, менавіта так выглядаюць людзі? Можа, ім уласьціва вось так корпацца ў сваім лайне і, перакрыкваючы адзін аднога, разьбіваючы ў бойках пысы, ірвацца да сваёй сьветлай будучыні, размахваючы штандарамі навуковага і сацыяльнага прагрэсу? Праломваючы каму-небудзь капытам чэрап, разважаць пра роўнасьць і братэрства. Абмяжоўваючы свой розум умоўнасьцямі, сьцьвярджаць прыярытэт свабоды як галоўнай каштоўнасьці.

Калі гэта і ёсьць людзі... то, сапраўды, харэ пісьцець.

Вуліца, калі яе, канечне, так можна было назваць, выходзіла наўпрост у пустыню. Але яшчэ некалькі кілямэтраў па ёй цягнуліся будаўнічыя сьметнікі. Мясцовыя разьнесьлі горы бітай цэглы і бэтону на матэрыялы для сваіх хатаў. Усё гэта чымсьці нагадвала зямлянкі і каменны век. Ці нейкія часовыя ваенныя ўмацаваньні... але наўрад ці хтосьці змог бы назваць гэта жыльлём. Акрамя мясцовых, канечне. Дзіўныя людзі. Пра іх мала хто ведаў з таго боку агароджаў. Звычайна падобны лад жыцьця ўспрымаўся, хутчэй, у мастацкім кантэксьце. Апакаліптычныя матывы фантастычнай літаратуры. Адкульсьці адтуль. Для большасьці мяшчанаў гэта было выдумкаю пісьменнікаў, але аніяк не рэальнасьцю. Дый увогуле пра гэта ніхто й ня думаў. Гарадзкія ўлады ўсяляк намагаліся зьнізіць колькасьць жабракоў на вуліцах, асабліва ў цэнтры. А тут, на ўскраінах, у закінутых прамзонах галота мала каму траплялася на вочы.

Юзік быў тут за свайго, але ўсё ж ткі ня цалкам. Пра яго казалі: «Наш чалавек У ЛЮДЗЯХ». Але ён да гэтага ставіўся зь неразуменьнем. Штосьці са свайго мінулага ён, канечне, мог узгадаць, і падаецца, што калісьці ён там, «у людзях», быў кімсьці, выконваў нейкую значную ролю... там... Дзесьці там у мінулым. Але гэта было даўно, а цяпер выклікала ў

старога ня больш чым усьмешку. Ды і з памяцьцю ня ўсё было ў парадку.

«Ну і хрэн зь ім. Значыцца, ня важна», – думаў Юзік, калі штосьці выскоквала з галавы.

Ды і калі шчыра казаць, мала што для яго мела значэньне, хіба што толькі адно. І тое ён няшмат разважаў на гэтую тэму. Людзі казалі, асабліва тыя, хто быў старэйшы, што калісьці ён рэзка зьмяніўся. Літаральна за некалькі дзён стаў да сябе не падобны. Але важка дадавалі, што да таго ўсё й ішло. Можа і так. Памяці ў Юзіка з кожным днём заставалася ўсё меней, і ён усё больш і больш губляўся дзесьці ў сабе.

«…Адкуль тут узяўся раяль?»

Навокал не было каго спытаць… недарэчнасьць на пяшчанай гурбе. Пару дзён таму яго тут яшчэ не было, і стары троху зьдзівіўся. Якога гуя?! Некалькі нотаў, і ў выніку ня ўсё яшчэ так блага. Пакрысе, спачатку трохі прыпалохана, але з кожным рухам пальцаў усё больш упэўнена. Што гэта? Штосьці з клясыкаў. Можа, Шапэн? Няўжо ён ведаў калісьці, хто такі Шапэн?! Неверагодна! Сапраўды, дзень зьдзіўленьняў. Скручаныя пальцы ўсё ж ткі імі і засталіся, але… РУКІ Ж… рукі ж, ляць, памятаюць!

Часам ня мае розьніцы, хто грае. Часам патрабуюцца толькі гукі, нават самыя простыя варыяцыі. Галоўнае, каб была нейкая гарманічнасьць. Можа, гэта і не філярмонія, але ўсё ж ткі дастаткова хіба нейкай больш-менш мэлядычнай партыі для таго, каб загнанае сэрца нарэшце супакоілася. Каб трохі адпачыла. Дзеля гэтага бегалі па клявішах старыя пальцы. Але сэрца тут было толькі адно. Старое і хворае, яно папросту атрымлівала задавальненьне ад магчымасьцяў розуму. Шапэн, калі гэта, канечне, можна было так назваць, расплываўся над засьмечанай пусткаю, а за ім і бяззубая ўсьмешка старога. Усё трымалася ў адной стылістыцы, у адным эстэтычным ключы. А што яшчэ б магло адпавядаць падобнай чалавечай сытуацыі, як ня гэтая музыка пад яркім сонцам вясновай раніцы. Лахманы цела і бліскучы містыч-

ны раяль, і Шапэн зь ягонымі пераліvамі. Калі б дзенебудзь у пустыні пачаўся б мэтэарытны дождж, то і гэта цалкам адпавядала б карціне. Эстэцтва? Так. Апошнія ўражаньні, што нам засталіся.

Але нікога не было навокал. Стары граў у самоце.

«Дзе ўсе яны падзеліся?» – гэта пытаньне кагосьці іншага, якога таксама не было побач. Нікога не было, а Юзік даўно не задаваў падобных пытаньняў. Тым больш цяпер, калі наноў вынаходзіў мэханіку рук, мэханіку пальцаў і мэлядычных выразаў. Стары патанаў дзесь у дробных аскепках розуму, ва ўспалахах таго, што калісьці было памяцьцю, а сёньня стала папросту бязьзьвязным трызьненьнем хворага мозгу. Вось яно, усё тое, што засталося ад мінулага. Тое, што было раней насычана словамі і выявамі, што было вельмі важкім, з часовымі неабходнасьцямі і недасягальнасьцямі, з марамі і памкненьнямі. Усё гэтае пальцамі па клявішах... і з-пад вечка кудысьці ў маўклівую бясконцасьць засраных чалавекам нябёсаў і зямлі.

Так, вось ён, ужо не такі малады, грае папулярныя матывы на старым фано зь некалькімі запалымі клявішамі. На бруднай сцэне, якую, падаецца, прыбіралі раз на тыдзень, ці, можа, максымум два. Перад заляй, што грукоча на падвышаных танах. Зьвініць словамі і піўнымі куфлямі. Чырвоныя твары і вусаты бармэн. Кшталту ўсе свае. Чужых там не было, працоўныя сканчалі зьмену й ішлі адразу сюды. Добра зьбіты, надзейны кантынгент. Як заўжды незасяроджаная ўвага, толькі некалькі чалавек слухаюць, як сьпявае малая вакалістка. Сьпявачка з голасам францускай шансаньеткі і лірычным рэпэртуарам са старых кінафільмаў. Часам штосьці з папулярнай клясыкі. Нічога звышгустоўнага. Тут усе разам. Тут усе па сваіх справах. Каму грошы на зімовыя боты, каму папускная атмасфэра пасьля напружанага працадня. Некалькі твараў глядзяць на сцэну, асьветленую бляклымі жоўтымі лямпамі. Можа, хтосьці зь іх і слухае. Але справа зусім ня ў гэтым. Добры чалавек, напэўна, быў той гаспадар. Даў ма-

лой працу, а тое сьпілася б, як і астатнія. А можа, яе ўжо і няма. Нічога. Усіх калі-небудзь ня будзе.

Стары лавіў гэтыя пылінкі думак і ўсьміхаўся. Быццам бы дробны сьнег, сарваны з даху раптоўным ветрам і кінуты ў твар. Але гэта ня прыкра. Часам... Толькі сонца вынішчыла ўвесь сьнег і навокал панавала вясна. Калі б тут была зяляніна, то можна было б чакаць хуткіх кветак. Але каму? Тут быў толькі стары. Юзік перабіраў пальцамі і ўсьміхаўся. Мэлёдыя рабілася ўсё больш роўнай і ўпэўненай. Пальцы сапраўды памяталі... толькі розум блага...

Дзіцё ўважліва глядзела на дзеда.

«Які дзіўны дзед», – вочкі назіралі за рухамі старога.

Гэта была першая музыка, якую яна пачула.

Каленкі ўпіраліся ў сьпінку. Так заўжды. Калі яны, нарэшце, перастануць эканоміць на прасторы? Уцісьніце сюды як мага больш народу. Забіце колькі мажліва, каб усе разумелі сваю жыцьцёвую каштоўнасьць. Кампактней, таварышы, яшчэ кампактней! Камусьці паламалі руку? Нічога страшнага, камусьці – гэта ня мне.

Пабла глядзеў у вакно і выхопліваў знаёмыя карцінкі. Калі зрастаесься з гэтай прасторай, паступова прытупляецца адчуваньне сьвету. Куды прасьцейшым робіцца зарыентавацца ў завулках і дварох, сярод самаходаў і падземных пераходаў, чым у сваёй галаве, у адчуваньнях, у подыхах. Немагчыма дакладна адказаць, дзе ўсход, а дзе захад. Гэтыя каардынаты губляюць тут свой сэнс. Сьвет тут створаны з прастакутнікаў. Будынкі, кварталы, вуліцы. Шырыня, даўжыня, колькасьць паверхаў. Геамэтрыя, яшчэ адно выдатнае вынаходніцтва чалавека. Куды прасьцей стварыць сыстэму ўмоўнасьцяў, чым не ствараць нічога. Лёгіка як асноўная вера.

«Аплачваем за праезд, хто яшчэ не аплаціў».

Пабла ніколі не плаціў. Ну, хіба толькі ў выключных сытуацыях. Цётка паглядзела на яго і прайшла

міма. Пасажыры корпаліся ў сумках і кішэнях. Цётка моршчыла твар і часала нос. Хлопец павярнуўся да вакна. Яшчэ доўга ехаць. А можа, і не выходзіць, праезьдзіць увесь вечар і прамаўчаць. Трэсьліся рукі. Апошнім часам сапраўды штосьці было ня так. Клюб ці кіно? Пакуль што яшчэ невядома. Нічога не хацелася. Патрабаваўся толькі спакой. Розуму патрабаваўся, а ўсяму астатняму хацелася ўвагі і троху пяшчоты на канцы нажа. Пабла не любіў больш гэтага шуму, але выйсьця не было.

«Час ня той, каб штосьці кардынальна зьмяняць. А калі той будзе? Чым табе не падабаецца гэтая вясна? Гэй, дружа, адкажы мне!»

Пабла ня ведаў адказу, але зь лёгкасьцю мог сфармуляваць што-небудзь складанае і высокае, з кучай тэрмінаў і разумных словаў, абгарнуць усю гэтую лажу ў бліскучую паперу і перавязаць чырвонаю стужкаю. Поўныя кішэні чырвоных стужак. Але каму гэта было патрэбна? З тых, хто сядзеў у ягонай галаве, усе прамаўчалі. Ды і ён сам цудоўна ведаў, што на гэтым наё...кі, відаць, скончацца. Больш займацца гэтай лухтою ён ня мог. Калі шмат сабе дазваляць, то можна зь лёгкасьцю згубіцца ў гэтых адказах і фармулёўках, у прыгожых выразах, аздобленых цытатамі тых людзей, якіх паважаюць за прозьвішча, ня ведаючы ці мала ўяўляючы сабе іх саміх. Фармулёўкі, сфармуляваныя з фармулёвак, як эквівалент інтэлекту. Вось ён, заблытаны ў формах, як у павуціньні, сучасны чалавек. Чалавек бяз сутнасьці. Чалавек-форма.

Годзе жангляваць словамі. У пэўны час гэта робіцца невыносным.

– Я прашу прабачэньня. Вы не падкажаце, малады чалавек… Вось мне трэба да Лядовага палацу. Гэта на якім мне выходзіць? – вочы дарослай жанчыны лыпалі і падаваліся троху сарамлівымі

– Вам на наступным.

– Дзякуй Вам. Дай бог добрага здароўя.

...Пабла таксама выйшаў і пешшу пайшоў назад, у бок мэтро. Сам ня ведаў, што тут рабіў. Заблытаўся? У формах?.. Дзе?!

Сонца хілілася да зубчатай сьцяны шматпавярховак. Сапраўды нейкая вясновая тэма. Галубы ўжо ня грэліся на люках, і тыя ўжо і не паравалі, як узімку. Лёгіка? Так… Хлопец бачыў птушак і заўжды адчуваў нейкую… роднасьць, ці што. Можа, калісьці і ён быў голубам? Думкі, што выклікаюць усьмешкі, і птушкі, што невядома чаму выклікаюць замілаваньне. Хтосьці сказаў яму, што галубы – адны з самых жорсткіх птушак. Быццам бы яны могуць задзяўбсьці канкурэнта ня тое што да сьмерці, а нават так, што ад таго застануцца толькі крылы. Пабла заўважаў некалькі разоў такія пустыя крылы на асфальце… а так паглядзіш, дык ня скажаш…

Крокі мералі асфальт. Памяць закліньвала, але пакрысе ўсё ж ткі спрацоўвала. Было троху сумна. Трэба было зайсьці ў аптэку. Купіць сыропу. Падлячыцца троху. Ідыёцтва… думкі-карцінкі-гукі-думкі-усё-усё-усё… чалавек перамагае нават вясну, вось які ён дужы. У промнях вечаровага сонца было сапраўды лягчэй. Было лягчэй зарыентавацца. Набыў бляшанку напою і сказаў сабе, што гэта ледзьве ня ўсё, што цяпер патрэбна. Запэўніў і паспрабаваў адключыць розум.

«давай-ка забудзем, мой маленькі дружа, пра ўсю гэтую гуйню з праблемай выбару шляхоў, з дэзадаптацыяй, сумленнасьцю, космасам і гармоніяй. Давай-ка папросту прысядзем на вунь тую лаву і супакоімся».

– Супакоіцца, як часта гучыць гэтае слова.

– Тс-с-с…

Ён прысеў на лаву. Сапраўды, калі сонца ідзе да заходу, фарбы зьмяняюцца. Паветра робіцца іншым. Усё робіцца іншым. Заўжды так… Міма праходзілі людзі, міма пралятalі самалёты, гады і пералётныя птушкі, але ўвечары фарбы сапраўды набывалі сваю значнасьць. Ва ўсялякім разе так падавалася. Непрыемная салодкасьць у роце, перагружанасьць рэцэптараў. Усё сапраўды зьмянялася. Раней ён больш размаўляў і часьцей знаёміўся…

«якія яркія колеры!»

...вядома, што гэта ўсё лухта і ня болей чым рытуалы. Але паводле такіх загонаў валіць навакольле. Ці паводле іншых, але прыкладна настолькі ж карпаратыўных. Брыдота вясновага вечару як шлях на неба. Аранжавы – колер вечаровага сонца. Адвечны аранжавы. Бліскучыя скрынкі і этыкеткі... вадкасьці. Так, папросту каб троху разьвеяцца, ня болей. Той, хто бачыць сэнс у спрашчэньні, можа, у чымсьці і мае рацыю. Так ва ўсялякім выпадку, зручней. Але гэта адзінае, што зьяўляецца плюсам. А пра мінусы – не цяпер.

Промні. Промні. Промні. Калі, цікава, Пабла апошні раз так усьміхаўся. Неяк нязвыкла адкрыта. Але тым ня менш.

– Прывітаньне табе, вялікі пратон!

– Хоп-хоп!

– Ну, як сам, чувак? Што там у цябе робіцца?

– Да нармуль тут усё. Так, спакойна, ведаеш. А ты там як?

– Ды таксама нішцяк, толькі вось ганю шмат апошнім часам. Чаму, гуй ведае.

– Ды не, не. Так і мусіць быць, ё тваю. Гэта зь цябе шняга ўсялякая выходзіць. Нармалёва ўсё. Ты галоўнае гэта... Ты папусьціся. Паламае троху, а там як новенькі будзеш.

– То бок нішцяк кажаш? Папусьціцца?

– Угу. Папусьціся, музла паслухай, палак папалі, мантры там... уся гуйня...

– А, ну ок тады.

– Ну давай.

Сонца схавалася за домам. Пабла закурыў. І здаецца, сапраўды троху разгрузіўся.

Ом.

«Ладна, гуй зь ім», – падумаў і пайшоў.

– Не, я сур'ёзна кажу, – Яся настойвала. – Чаму Вы ўсьміхаецеся, Вы мне ня верыце?

Хлопец маўчаў.

– Вы ня верыце?! – яна схапіла юнака за руку. У дзявочых вачох не было ані кроплі спакою. Два шалёныя... шалёныя...

– Веру, веру! Супакойцеся! Усё нармалёва. – Ён быццам бы спалохаўся. Дый ня быццам бы, а насамрэч. Папросту ўжо троху навучыўся стрымліваецца.

– Што нармалёва?! Што?!! Тое, што я забіла чалавека, які падобны да Вас як дзьве кроплі вады?! – усё гэта ўжо зусім не нагадвала ціхую размову двух сэрцаў, але неістотна, людзі за суседнімі столікамі ў такіх выпадках звычайна робяць выгляд, што нічога ня чуюць. Можа, у некаторых сытуацыях гэта іх і ўратоўвае.

Якое ж яно было гарачае, гэтае доўгачаканае вясновае сонца. Ёй падавалася, што неўзабаве ейны мозг ня вытрымае і сьцячэ расплаўленым рэчывам.

– Чаму Вы маўчыце? – нечакана для сябе Яся супакоілася. – Няўжо Вам няма чаго сказаць? – і відаць, гэта стала апошняй кропляю.

– Вар'ятка, – з усёй моцы ірвануў руку, ускочыў і, нэрвова азіраючыся, ледзьве ня подбегам прэч... у бок утульнага спакою свайго працоўнага стала.

– Пастойце! Ня кідайце мяне!!! Ня кідайце мяне тут! – шэптам невядома каму.

Сонца прыпякала. Людзі пілі напоі і усьміхаліся адзін аднаму. Гаспадар даўно схаваўся ў залі. Напэўна падумаў, што закаханыя сварацца. Але інтуіцыя падманула. Ды і хрэн зь ім. Дзяўчына засталася адна. Ды і раней як бы таксама... але тут усё неяк з рук паваліласа. Вераб'і, нахабныя рабяты, скокалі па пустых століках у пошуках крошак. Людзі ішлі па вуліцы, а з муроў вялікага сабору на іх глядзелі барадатыя мужчыны. Каменныя і ўсхваляваныя, як тое сэрца, што адказвала на імпульсы пакрыўджанага нездаровага розуму.

«Бядачка», – думалі сьвятыя, праважаючы позіркам няпэўныя дзявочыя крокі. І так да рога, а далей ужо ня іхны раён.

Але ўсё гэта было ўчора. Учора быў дзень нэрвовых зрываў, а сёньня неяк троху спакайней. Неяк ут-

рэслася. Ці яна папросту прымусіла сябе супакоіцца? Калі імкнуцца думаць пра штосьці іншае, то ня так страшна. Але галоўнае не спаліцца. Галоўнае паводзіць сябе так, быццам нічога ня здарылася. У такой сытуацыі трэба захоўваць цішыню, інакш знойдзецца які-небудзь адстаўны гэбіст, што з пачуцьцём выкананага абавязку здасьць цябе ў адпаведныя рукі. А там жартаваць ня будуць. У іх адладжаная сыстэма.

«Зрэшты, гэта іхная прафэсія, ім трэба дзяцей карміць, жонак вадзіць у рэстарацыю раз на месяц. Ці ў тэатар які», – Яся ведала, што можна абгрунтаваць усё на сьвеце. І гэта таксама... але ўсё ж ткі яна ня зь імі. Дванаццаць духаў Вялікага Юрыя Гагарына не маглі дазволіць сабе памылак. Калі яны што-небудзь знаходзілі, хай нават якую драбніцу, можна быць упэўненым, што так проста гэта ня скончыцца. Там не было такіх архіваў, у якіх магло што-небудзь згубіцца. Там была толькі лёгіка, і аніякіх эмоцыяў. Трэба было паводзіць сябе ціха.

Так яна і зрабіла. Набыла ў шапіку газэту і яшчэ раз упэўнілася. Там не было нават ніякіх намёкаў. Відавочна, што яны ўжо знайшлі труп... Паехала да бацькоў, і пакуль тых не было дома, змыла зь сябе ўсе сьведчаньні бойкі і эмацыйнай дэстабілізацыі. Быццам бы супакоілася. Пераапранулася. Крыху грыму – і вось яна зноўку не вылучаецца на мясцовасьці. Вось яна зноўку падобная да дзяўчыны. Ва ўсялякім выпадку, куды больш, чым да крывавага забойцы зь вялізным нажом для апрацоўкі мяса пад вэльвэтавым сьпінжаком. Ці хтосьці можа падумаць інакш?

– Ты што, сука, хочаш сказаць, што гэтая дзяўчына нагадвае твайму хвораму, ляць, розуму крывавага забойцу зь вялізным нажом для апрацоўкі мяса пад вэльвэтавым сьпінжаком?!! Ці я цябе, гандона, слушна зразумеў?!

– ...Не-не, я нічога не казаў такога... прабачце... прабачце мне, калі ласка.

– Вось і я думаю, што яна ніяк не падобная да крывавага забойцы зь вялізным нажом для апрацоўкі мяса пад вэльвэтавым сьпінжаком.

Яся выйшла з кватэры. Самае ідыёцкае, што можна было б зрабіць, дык гэта застацца тут. Гэта было б занадта падазрона. Яны пасварыліся два тыдні таму, і з таго часу яна ня хоча яго бачыць.

– А што, штосьці здарылася? Штосьці сур'ёзнае?! Што зь ім?!! – апошнія словы на троху падвышаных танах. І канечне з адпаведнай мімікай. У коледжы Яся ўдзельнічала ў моладзевым тэатры, і кіраўнік іхнай студыі нават спадзяваўся пабачыць яе на вялікай сцэне. Але гуй яму! Не атрымалася... нічога... такога...

12:47. Дзяўчына выйшла з пад'езду і роўнай, упэўненай хадою накіравалася ў бок тралейбуснага прыпынку. Вонкавых прыкметаў псыхічнага напружаньня і празьмернай мазгавой актыўнасьці не зафіксавана. Стан – стабільны.

У цішыні ўсё падавалася троху іншым. Думкі былі больш буйнымі, больш аб'ёмістымі, бы паветраныя шары, што раней запускалі ў неба ў вялікія сьвяты. У цішыні кожны гук, любое шамаценьне лістоты за вакном нараджлі фантазіі, стымулявалі працу розуму. Можна было навыдумляць сабе чаго заўгодна, і часам яно нават набывала нейкія абрысы. Асабліва калі заплюшчыць вочы. Але ізноўку ж, адзіны які-небудзь гук – і ўсё разьляталася, бы пер'е па ветры. Усё руйнавалася, і даводзілася наноў адбудоўваць гэтыя палацы, надзяляць пэрсанажаў характарамі, аздабляць усё гэта вобразамі... і ведаць, што кожнае імгненьне ўсё ізноўку можа разьляццецца на дробныя аскепкі. Ці быў сэнс?.. А ці была магчымасьць ня думаць?

Мужчыны сапраўды пакутавалі ад цішыні. Яны не заўважалі гэтага, але, напэўна, калі б нехта зь мінулага, хто-небудзь кшталту вусатага бармэна пабачыў бы іх цяпер, то дакладна спытаўся б пра здароўе. Ён бы чыста інтуітыўна адчуў, што нешта ня так. Вочы зрабіліся неспакойнымі, а рухі хаатычнымі і няўпэўненымі. Часам хтосьці зь іх лез у кішэню па цыгарэту, але, паклаўшы яе ў рот, забываўся пад-

паліць. Мужчыны ўсё часьцей і часьцей правальваліся ў свае думкі. Кожную ноч яны бачылі настолькі падобныя сны, што зь цягам часу гэта рабілася немагчымым. Шэсьць мужчынаў прызвычаіліся да гэтага голасу, што ўжо мог зьяўляцца нават і ўдзень. Яны непакоіліся. Яны пілі зраніцы сваю гарбату і ўсё з большай пільнасьцю прыглядаліся адзін да аднаго. Тут сапраўды ўсе былі роўныя. Ніхто нічога дакладна ня ведаў. Падобныя да сьляпых кацянятаў, яны вымушаныя былі трымацца разам. Надта шмат пытаньняў заставалася без адказаў.

Раней яны папростуківалі адзін аднаму пры сустрэчы, максымум, пацікалі руку. Яны былі статыстамі. Толькі гэта было не кіно, а чыёсьці жыцьцё. Гэта ня значыць, што ў іх не было свайго. Кожны быў асобаю, але ніхто зь іх не цікавіўся іншымі. Кожны быў як бы сам сабе. Толькі стары бармэн іх усіх і ведаў. Ды ня тое што добра ведаў. Так, трохі пра таго, трохі пра гэтага. Некалькі маленькіх эпізодзікаў з жыцьця кожнага кліента. Звычайна бармэнам больш і не патрэбна. Дастаткова ўмець падтрымаць гутарку. Пасьля зачыніць і пайсьці адпачываць, каб зраніцы зноўку праціраць свае вокны-вокны. Гэты шмат бачыў у сваім жыцьці. Калі быў маладым, быў аматарам намяць каму-небудзь бакі. Калі ж памёр бацька, то ўсе клопаты па бары давялося ўзяць на сябе. Сямейная справа… Вось, зрэшты, і яшчэ адна гісторыя чалавечага жыцьця. Штосьці падобнае гэты ўжо немалады прафэсіянал мог распавесьці пра кожнага з тых шасьці, але не ўдаваўся б у падрабязнасьці. Так, невялічкі адказ на пытаньньне «А хто гэта?». Ён зь лёгкасьцю адрозьніваў цывільнага ад агента і за столькі год выдатна вывучыўся па адным позірку складаць дакладнае ўражаньне, якое ў выніку, канечне, аказвалася слушным. Па адной замове, па тоне голасу, па нейкіх аднаму яму вядомых паказьніках ён ледзьве не з абсалютнай дакладнасьцю вылічваў, чаго чалавек хоча: ці выказацца, ці разьвеяцца, ці яму дапаможа якая парада, ці дастаткова толькі добрай показкі…

Але цяпер яго тут не было. Сярод мужчынаў панавала цішыня, і баек ніхто не распавядаў. Толькі час ад часу прастору разразалі думкі і бляклыя позіркі. Канечне і гарбата сапсавалася. Ніхто з мужчынаў ня ўмеў добра заварваць, таму карысталіся ўсім, што траплялася пад руку. Але на першае месца мімаволі выходзілі іхныя цьмяныя пляны на будучыню. Мужчыны перасоўваліся, патаналі ва ўласнай брыдоце, пхнуліся кудысьці па сьвеце, што быў пад завязку набіты міражамі і зданямі. Яны чулі гэты голас, і не было тут ніякага тлумачэньня, нават самага элемэнтарнага, каб дазволіць розуму хіба троху супакоіцца. Калі гэтае зь імі здарылася, напэўна, хто-небудзь тут мусіў ведаць, у чым справа, мусіў быць нейкі адказны, той, хто пазбавіў мужчынаў іхнага спакойнага жыцьця і прымусіў боўтацца па гэтай пустой зямлі. Дні зьмяняліся, але ніякіх адказаў не было. Шэсьць мужчынаў стаміліся, некаторым падавалася, што яшчэ крыху і яны звар'яцеюць. Але гэта былі толькі агульныя фразы. Небаракі ўжо пачалі забываць, хто яны ёсьць, пачалі блытаць імёны і звычкі, успаміны… але менавіта той самы ранак і расставіў усё па сваіх месцах.

Яны сядзелі і пілі сваю адвечную гарбату. Плястыкавыя столікі, такія ж белыя крэслы. Позіркі і думкі. Ноч уліла ў іхнае нявызначанае існаваньне новыя сьненьні. І тут усе пачулі голас:

– Ну што вы за людзі такія?! Ну колькі можна вас клікаць?! Сярод вас жа ёсьць сын папа. Шо вы тупіце?!

А насамрэч так і было. Адзін зь іх нарадзіўся ў сям'і сьвятара. Ды і ўсе мужчыны зь ягонага роду чамусьці былі служыцелямі культу. Усё адразу стала па сваіх месцах. Канечне, і раней падобныя вэрсіі агучваліся, але тут сумневу быць ужо не магло. Яны чуюць голас Бога. Яны ёсьць абраньнікі, тыя, каго Ён пакінуў у жывых.

– Ну што, Пал Палыч, круціце бырлатрон, – чэмпіён усьміхаўся ў прадчуваньні паляпшэньня сытуацыі. Працягваў «шаноўнаму госьцю» пляшку.

– Дзякуй вам вялікі, таварышы. Давайце ж вып’ем за гэтую сустрэчу і за нашае знаёмства!..

– Ну навошта Вы так урачыста, Пал Палыч? Тут жа ўсе свае, – Вася глядзеў на яго з прыязнаю ўсьмешкаю, за якой ледзьве заўважна чыталася непераадольнае жаданьне як мага хутчэй атрымаць сваю дозу.

Пал Палыч паглядзеў у ясныя вочы чэмпіёна. «Дзіўна, якім чынам гэты чалавек дакаціўся да паэзіі?» Іван Пятровіч падбадзёрвальна кіўнуў, усьмешка быццам бы расьцяклася па ўсёй ягонай галаве. Нечакана лёгка паддаўся плястыкавы корак. Практыка была заўважнай адразу. Відаць, мужчынаў падобнае ўразіла. +1 да агульнага стрытовага рэйтынгу. Пал Палыч перакульнуў пляшку і зрабіў некалькі глыткоў. Алькаголь быў найжахлівейшы, але... менавіта тое, што трэба, каб дадаць сьветаўспрыманьню тонусу. Справіўся з паветрам, глыбока ўдыхнуў, і адразу стала лягчэй. Расплюшчыў вочы і пабачыў добрыя, нават, можна было сказаць, пяшчотныя ўсьмешкі мужыкоў. Ранішняя ідылія гарадзкіх закуцьцяў. Пал Палыч з падзякаю перадаў пляшку. Настрой сапраўды троху заварушыўся. Бляклыя фарбы паступова набывалі яркасьць, і з кожным глытком неба рабілася бліжэй, як і Вася, як і чэмпіён. Іван Пятровіч троху расчырванеўся, але гэта было амаль што незаўважна, гады трэніровак адклалі адбітак на ягоным твары. Цёплыя пачуцьці.

– А дазвольце, Іван Пятровіч, у вас пацікавіцца.

– Цікаўцеся, шаноўны.

– А чаму Вы не пайшлі ў трэнэры? Вы ня супраць, калі я задам Вам гэтае пытаньне?

Чэмпіён троху супакоіўся, было бачна, што Палыч разварушыў глыбокія пласты памяці.

– Ведаеце, што я Вам скажу, – ён задумаўся, магчыма, падбіраў слушныя словы, – вось калі я трэніраваўся, дык выдатна ведаў, што сам адказны за свой фізычны стан, за сваю падрыхтоўку. Ніхто і ніяк ня мог на мяне паўплываць, акрамя хіба што трэнэра майго... То бок я хачу вам сказаць, ніякай хіміі я ніколі ня жраў і здароўе сабе не псаваў, і нікому

ня раіў гэтай гуйнёй займацца!.. – Іван Пятровіч на хвіліну спыніўся і акінуў шматзначным позірам мужчынаў. – А цяпер жа бяз гэтага ніяк! Трэнэр мусіць рыхтаваць на кожнага пацана адпаведную праграму. Мусіць карміць яго, ляць, гэтай гуятою. А што трэнэру яшчэ рабіць? Нічога ён зрабіць ня можа, бо менавіта да гэтага яго тыя підары з нацкаму і вымушаюць. Яму, ляць, так проста і кажуць: «Давай мэдалі! Давай першыя месцы! Ня можаш – пістуй нагуй!» Усё проста... Я адмовіўся. І, ведаеце, што я Вам, Пал Палыч, скажу? Не шкадую. Ні кропелькі не шкадую! Затое ніводзін ад мяне калекам з паламаным здароўем ня выйшаў!..

Чэмпіён быццам бы згубіўся ў сваіх думках, але не такі ён быў яшчэ і п'яны.

– Усё, годзе. Давайце больш не падымаць гэтую тэму. Добра?

– Добра. Прабачце, калі сказаў штосьці ня тое... – Пал Палыч быў ужо ня рады свайму пытаньню. Гэта ўсё яшчэ займала нейкае важнае месца ў атручаным сэрцы былога спартоўца. Ня варта ўсё ж ткі было.

– Ды не, не бярыце да галавы, шаноўны, але давайце лепей паразмаўляем пра што-небудзь іншае. Паглядзіце вось, якая вясна ў гэтым годзе цудоўная!

І раптам сталася так, што навокал сапраўды надышла вясна. Ранішняе сонца разьвеяла туман, і там у дворыку, куды траплялі яго промні, паступова зьнікалі лужыны. Сьнег таяў літаральна на вачох. Але галоўнае – гэта птушкі. Іх сьпевы чуліся адусюль. Так, у горад сапраўды прыйшла вясна.

...натхнёныя позіркі. Урачыстая музыка. Мужчыны азіраліся і бы наноў адкрывалі для сябе гэты сьвет...

– Ну што, трэба яшчэ за адной, – Іван Пятровіч адным глытком дапіў рэшткі жоўтай вадкасьці і паглядзеў праз шкло на сонейка. – Васілька, як ты? Сходзіш?

– Дык ты ж, Іван Пятровіч, ведаеш, што няма ў мяне нічога...

– Ды ведаю, у мяне яшчэ ёсьць. Сходзіш?

– А чаго б не схадзіць? Схаджу, – няўжо ён мог адмовіцца?

– Тады на, вазьмі адразу дзьве, каб меней бегаць, – рука палезла ў кішэню і выцягнула з кучы дробязі буйную купюру. – Хлеба яшчэ вазьмі цэлую. І давай там не затрымлівайся.

– Дзьве дарослыя?

– Ну дык ёп тваю!..

Іван Пятровіч паглядзеў на неба, і чамусьці ўсьміхнуўся. Ён дастаў з кішэні пачак цыгарак бяз цэтліка і прапанаваў Пал Палычу.

– Дзякуй, – сапраўды было штосьці паэтычнае ў гэтым чалавеку. Ня скажаш, што чэмпіён быў вельмі стары, але лад жыцьця накладаў на ягонае абліччы свае адбіткі. Можа, штосьці каля сарака. Жыцьцё тут разгулялася на славу. Нічога дзіўнага не было ў гэтых надрукаваных калісьці ў завадзкой газэце вершах. Відаць, часам душу грызла туга па мінулым. Ці па тым, чаго ён так і ня здолеў зрабіць. Нявыкарыстаныя шанцы, няўдалыя рашэньні. Відаць, у нейкі момнт штосьці пайшло ня так, не туды збочыў. Адсюль, напэўна, і вершы. Але было відавочна, што Іван Пятровіч больш не працаваў на заводзе, а можа, Пал Палыч і памыляўся. Цяпер шмат падобных кадраў, якіх немагчыма звольніць з сацыяльных прычынаў. Але і сэнсу няма, бо ўсе кандыдаты на працу з такім заробкам мелі агульныя інтарэсы.

Яны стаялі і курылі, абмяркоўвалі штосьці, падаецца, нейкія навіны, важныя ўсясьветныя падзеі. Чакалі ганца...

– Ёсьць у мяне таварыш адзін, нармалёвы такі хлопец. Шмат мы зь ім ужо знаёмыя. Таксама адсюль, дарэчы. Толькі вось шызануўся нядаўна. Узгадаў маладосьць, а ён раней каратэ займаўся, – Іван Пятровіч троху моршчыўся ад дыму і з-пад прышчураных вейк неяк дзікавата паглядаў на суразмоўцу. – Ну дык вось, тэлефануе мне аднойчы, значыцца, і кажа: ну

тое-сёе, маўляў, давай сустрэнемся. А я якраз думаў, куды гэта ён падзеўся. Ну, дамовіліся. Я ў нычку палез, дастаў там на пару гэтых... ну, і на сустрэчу. А ён мне нейкую гуйню як панёс. Божа ты, божа...

– Дык мо белка?

– Ды ты што! Якая белка? Я гэтыя справы адразу адрозьніваю, у мяне ж бацька таксама аматарам быў... Ды і пілі ж сядзелі... Кажу табе, шызануўся ён. Я яму: «Валодзя, ляць, супакойся. Блага табе, дык на яшчэ выпі. Зараз лягчэй стане!» – ну натуральна ж, хвалююся за чалавека. А ён мне як пачаў там такую муць штурхаць. Усё давай пра гармонію, пра космас штосьці там. Пра нейкія колы... казаў, што быццам бы ты нараджаесься... а пасьля сьмерці зноўку нараджаесься... Я памятаю, калі мы малыя былі, мы ж з суседніх пад'ездаў, у адной школе вучыліся... Дык прыяжджаў нейкі кітаец, трэнэр там іхны, і ён тады запісаўся. А я ўжо на бокс хадзіў. Але ж ведаеш, малыя, дык нічога, хадзілі. А пасьля пасталелі, і ён штосьці забіў... Ну там, вядома, дзеўкі, шуры-муры, гарэлачку на бульварчыку. А я тады ўжо на спаборніцтвы езьдзіў, за юнацкую зборную выступаў...

Іван Пятровіч патанаў дзесьці ў мінулым, часам ягоны расповед перапынялі недарэчныя паўзы. Ён даставаў цыгарэты, закурваў, прапаноўваў Пал Палычу, пачынаў штосьці мармытаць сабе пад нос, але раптам, спахапіўшыся, зноўку працягваў.

– Дык вось, значыцца, мые ён мне гэтай лухтою вушы, а я яму і кажу: ляць, чалавек, скажы, што ты хочаш. А ён: «Усё, Ваня... Усё... Я прачнуўся сёньня і зразумеў, што ўсё гэта нічога ня вартае. Трэба пра душу думаць, Ваня. Сьмерць хутка. Сьмерць паўсюль».

Чэмпіён напружыўся. Відаць, ён сапраўды хваляваўся за каратыста.

– Дык і што далей было?.. – Пал Палыч парушыў паўзу. – Што зь ім цяпер?

– Халера яго вядае, я тады яму проста сказаў. Кажу: «А ідзі ты лесам, Вова. Табе ўвогуле банку сарва-

ла. Лячыцца трэба.» І пайшоў адтуль. Сходзілі потым вунь з Васькам, з мужыкамі яшчэ шахнулі. Бо не гуя ж сабе тут такое робіцца, стары дахам паехаў…

З-за рогу паказаўся Васіль з хлебам у руках. Нейкай бадзёрай хадою (невядома адкуль узялася бадзёрасьць), з тупой усьмешкаю на няголеным твары, ён падышоў да мужчынаў.

– Я яшчэ цыгарэтаў набыў, Іван Пятровіч! Нічога? – ён працягнуў чэмпіёну мятую рэшту.

– Нічога, – рукі ўзялі працягнутую пляшку і пасьля невялікага напружаньня сарвалі плястыкавы корак. – Я тут, Вася, Пал Палычу пра Воўку-каратыста распавядаў.

– А-а, – невыразна працягнуў той. – Гэта каторы… Вы тады распавядалі… каторы з трэцяга пад'езду?

– Ну, – Іван Пятровіч зрабіў глыток і перадаў пляшку далей. – А ведаеш, што пасьля таго было? Гэта яшчэ не канец, як высьветлілася. Прыходжу я пасьля ўвечары дамоў, гляджу – на кухні сьвятло, і гэты сядзіць. Думаю: якога ты прыпёрся? А гляджу, сядзіць і пазірае на мяне так, ведаеш, мутнавата, бы нашкодзіў чаго. І тут, разумею, што, сука, да бабы маёй прыйшоў. А я яшчэ троху падвыпіўшы быў. Эмоцыі туды-сюды, да таго ж зраніцы, сука, мне гуйню гэтую заціраў. Ну дык я да яго: «Што ты, сука, прыйшоў?! Хто цябе, ляць, клікаў?» А ён мне пра пазыку нейкую, што быццам бы меўся маёй аддаць. Зноўку гляджу, па вушох езьдзіць. Я…ааацЬ! Я тое-сёе. Пакуль зарыентаваўся, пакуль жонцы пісты ўставіў, за тое што ў хату пусьціла, бачу, ужо дзьверы за сабой зачыняе. Не гуя сабе, думаю, ляць, лепшы сябар кшталту!

Мужчыны, спачуваючы, ківалі галовамі і перадавалі жбан. Канечне, кожны зь іх выдатна разумеў Івана Пятровіча. Такая сытуацыя. Вядома, калі-ніколі, а ўсе сутыкаюцца з падобным.

– Ну сваёй я, канечне, прапістону ўставіў! Доўга, сука, помніць будзе, як дзьверы чужым мужыкам адчыняць! Але гэтага гандона сустрэну, я яму… – у чэмпіёна нставала словаў, – я яго, суку, навучу, ляць!!!

Будзе ведаць, як да чужых баб хадзіць!!! Я яму ўсе зубы павыбіваю, рукі гаўнюку вырву. Нічога! Вось толькі трапіцца ён мне!

– Цішэй, Іван Пятровіч, не хвалюйцеся. Усё нармалёва. Выпейце лепей. Давайце, можа, супакоімся, паразмаўляем пра штосьці іншае... – Вася, відаць, не аднойчы сутыкаўся з гэткай чэмпіёнаўскай лютасьцю, і ведаў, чым яго ў такую хвіліну супакоіць.

Пал Палыч паднёс яму пляшку. Той узяў, з падзякаю паглядзеў на калегу і зрабіў некалькі глыткоў. Неўзабаве Іван Пятровіч усё ж супакоіўся, закурыў... супакоіўся... супакоіўся. Нэрвовае дыханьне ізноўку прыйшло да нормы. Нічога, усё ў парадку...

Усе мы толькі людзі. Усе эмацыйныя.

Але тым ня менш, зранку ён усё распавёў астатнім.

– ...а пасьля сказаў пра птушку з рознакаляровым пер’ем, маўляў, гэта будзе знакам, – навошта другі ўвогуле пачаў пра гэта расказваць? Трэба было стрымацца і прамаўчаць. Ён насамрэч ведаў, што першы вось так і будзе сядзець і саркастычна ўсьміхацца. Другога даводзіла гэтая пагарда, але нічога зрабіць ён ня мог.

– Птушка з рознакаляровым пер’ем, – паўтарыў першы і паглядзеў на трэцяга. Той сядзеў, курыў і лагодна ўсьміхаўся, маўляў, ну і добра, няхай будзе так. Нічога страшнага. – Мне падаецца, ты, братка, патроху зьяжджаеш. Так хутка мы ў дурдом ператворымся. Ну што я табе магу яшчэ сказаць? Малойца... малойца... А больш божанька нам нічога не перадаваў?

Другі не асабліва і крыўдзіўся. Ён ведаў, што так і мусіла быць, ды і да пад’ёпак першага ўсе даўно прызвычаіліся. Хлопец папросту адвярнуўся і прамаўчаў. Навошта было рэагаваць на дурасьць. «Калі сам пабачыць, толькі тады зразумее, што Ён сапраўды ёсьць, і насамрэч іх чуе», – праўдаю гэта было ці папросту другому прымроілася, у любым выпадку,

юнак атрымаў надзею. З таго дня ён стаў больш пільна ўзірацца ў навакольле, зноўку пачаў маліцца. У выніку стала куды лягчэй, чым было. Галаўны боль хутка прайшоў, саступіўшы месца яснасьці і чыстым думкам. Калісьці даўно пракрокаў закідвалі камянямі, плявалі ім у твары і танчылі на іхных трупах, але гэта ня мела ніякіх вынікаў, хіба толькі загартоўвала ўсё новых і новых. Нават калі чалавек прыдумаў гільяціну, а пазьней здагадаўся прапускаць праз цела электрычны ток, дык і гэта нічога, па сутнасьці, не зьмяніла. Час ад часу ўсё ж ткі сустракаліся такія, хто сьцьвярджаў, што сапраўды бачыў Бога і што той перадаваў усім прывітаньне і спадзевы на хуткую сустрэчу ў сваім валадарстве.

Але людзі сьмяяліся. Што ім яшчэ было рабіць, як не адстойваць сваю праўду і годнасьць... Што яшчэ патрэбна чалавеку, акрамя добрага жарту?.. Людзі заўжды людзі... што ж зь імі зробіш?

Толькі трэці, што ўвесь час маўчаў, неяк супакойваў. Ва ўсялякім выпадку, ён не расьсьмяяўся другому ў твар і не прыпісаў яму шызы і паступовага разьвіцьця хваробы. Другі спачатку разьлічваў, што той яго падтрымае, але трэці толькі загадкава ўсьміхаўся і шукаў на даляглядзе джынаў. Часам падавалася, што яго ўвогуле нічога не турбавала. І ў гэтым падвешаным стане ён нейкім чынам адчуваў сябе нармалёва. «Трэба будзе сёньня спытаць у Госпада, ці ня стаўленік сатаны гэты трэці». Канечне, мала было падобна, але тым ня менш. У ягонай сытуацыі трэба было паводзіць сябе асьцярожна...

Стоп! А вось тут, мусіць, і сапраўды пачыналася брыдота. Але «дзякуй табе, Божа», другі своечасова заўважаў падобныя перагібы. «Сапраўды. Трэба быць асьцярожным. Як мага больш пільна сачыць за сабою».

У той дзень нічога так і не зьмянілася. Хлопчыкі даўно прызвычаіліся да бясконцага ветру, да рытму хваляў, што нястомна накочвалі і накочвалі на бераг. Да ўсяго можна было прызвычаіцца. Яны ня ўзгадвалі пра дэльфінаў, толькі хіба, можа быць,

трэці. Але калі толькі сам сабе. Ніхто не размаўляў. Усе чагосьці чакалі, чакалі разьвязкі, бо вада і ежа скончаліся. Засталося нешта каля паўбутэлькі вады, і было відавочна, што доўга ім не працягнуць. Яны часьцей спыняліся, але часам і наадварот, рабілі нечакана вялікія пераходы. У такіх выпадках усе неяк губляліся і рухаліся на аўтамаце...

...Крок за крокам. Быццам не было мэты. Ці, можа быць, мэта і стала іхным сэнсам. Хто-небудзь ведае, што яшчэ можна зрабіць у падобнай сытуацыі? Аўтаматычныя рухі. Толькі думкі дзесьці далёка-далёка, і наўрад ці разам.

Сонца зноўку пачало распальваць хмары і сілы скончаліся. Бедныя хлопчыкі. Гонкія загарэлыя целы. Вытанчаныя рухі. Салодкая мяккая скура.

«Штосьці ня так?» – першы нават зьдзівіўся, калі адчуў гэтае лёгкае галавакружэньне. На некалькі сэкундаў ён спыніўся і паспрабаваў ізноўку засярodзіцца. «Не, здаецца, усё добра». Ніхто не зьвярнуў на яго ўвагі, і ён неўзабаве далучыўся да астатніх. «Можа, трохі стаміўся і толькі».

Бліжэй да вечару пяску пад нагамі паменела, пачалася галька. Часам трапляліся адмытыя морам каменныя пліты. Спачатку было нязручна, але неўзабаве хлопцы прызвычаіліся да больш цьвёрдае паверхні. Добра, што хоць штосьці зьмянілася. Часам даводзілася пераскокваць з каменя на камень... але нічога страшнага. Зрэшты, усё ж ткі невядома, што лепей... Дадатковыя думкі, якія ні на што не ўплываюць. Усё роўна трэба было ісьці наперад. Мэханічны рух трох маладых целаў, якія, падавалася, пражылі ўжо зашмат, каб быць бесклапотнымі. Вось тут і скончалася мужнасьць другога, абламваліся ўсе панты і ўся ганарлівасьць. Дзесьці ў закуцьцях розуму кожны трымаў імавернасьць таго, што праз некалькі дзён усяму канец. Але сумныя думкі заўжды былі не ў пашане. Тым болей у маладых, поўных энэргіі арганізмаў. Ды, аднак, рана ці позна арганізмы зламаюцца, і сумных думак больш ня будзе.

Як толькі прыцемкі зрабіліся заўважнымі, хлопцы спыніліся. Стомленыя ногі нылі. Яны не знайшлі аніякай драўніны навокал, і вогнішча ў той вечар у іх не было. Але дзень, сапраўды, выпаў цяжкі. Яны моўчкі сядзелі і глядзелі ў мора. Вугалькі цыгарэтаў перамяшчаліся ў паветры, лёгкія выдыхалі дым. Яшчэ крыху, і розум зноўку ненадоўга адключыцца. Цела крыху адпачне, і неўзабаве ўсё зноўку запрацуе. А там далёка было і нешта яшчэ, акрамя камянёў і вады, дзесьці не было ветру. Кожны сам маляваў сабе гэтыя карціны, сам уяўляў тое «ня тут», якога даўно ўжо ня бачыў. Целы шчыльней ціснуліся адно да аднаго… каб было цяплей.

Музыка…

Гэта падавалася немагчымым. Памяць яшчэ неяк працавала, але…

Дзяўчынка ў бруднай сукенцы, маленькая жыхарка сьметнікаў. Яна слухала і глядзела на старога, быццам бы гэта быў нейкі чараўнік. Але цудаў не бывае, хай малая гэтага яшчэ й ня ведае. Пазьней сутыкнецца з рэальнасьцю, але будзе трохі больш да яе падрыхтаваная, чым дзеці офісных службоўцаў. Пакуль што ірваныя кніжкі з карцінкамі, прынесеныя клапатліваю маці, усьмешкі і гульні, а пасьля ўсё стане па сваіх месцах. Усе цмокі загінуць ад рук невядомых, усе феі выйдуць працаваць на вуліцы, а зайцы патрапяць пад разьмеркаваньне і перастануць быць зайцамі. Але наўрад ці малой сьвяціла калі-небудзь вучыцца. Занадта ненатуральным і сапраўды нейкім казачным падаваўся ёй далёкі горад. Бо, калі маці казала «я ў горад», гэта значыла, што вернецца яна ня хутка, але, можа быць, прынясе чаго смачнага. У такія вечары дзецям трэба было раней класьціся, бо дарослыя пачыналі свае гутаркі ля вогнішча.

Яна памятала гэтага старога. Час ад часу ён таксама там сядзеў, але збольшага маўчаў у супрацьвагу іншым гаваркім мужчынам.

– Дзядуля, а ты навучыш мяне так? – нарэшце дзіцё ня вытрымала, і, узьняўшыся на пяшчаную гурбу, пацёгала дзеда за брудную куртку.

І стары навучыў яе. Ён распавёў дзяўчынцы ўсё, што яшчэ засталося ў ягонай галаве, усё, што яшчэ ня зьелі пустыя дні. Распавёў пра людзей, што жылі з таго боку закінутых заводаў, пра іхныя звычкі і лад жыцьця. Юзік ніколі ня ўмеў выхоўваць дзяцей, але тут болей не было каму. Стары раптам зразумеў, што так нічога і не зрабіў у гэтым сьвеце, і спадзяваўся хаця б так праявіць сябе ў якасьці чалавека. Юзік уяўляў сабе, як малая пасталее, і можа нават калісьці надыдзе дзень, калі яна здолее сысьці адсюль, пакінуць гэты халодны сьвет калекаў, п’яніцаў і дробных тралейбусных злодзеяў. Можа быць, хаця б у гэтага чалавечка атрымаецца пазбавіць сваіх нашчадкаў пакутаў, неабходнасьці біцца за кожную парожнюю бутэльку.

Музыка…

Праз некалькі хвілінаў дзяўчынка ўжо жвава тыцкала пальцамі па клявішах, выводзячы прасьценькую васьмібітную мэлёдыю. Шчасьцю дзіцяці, падавалася, не было канца, але стары, не зважаючы на гэта, усё казаў і казаў, паказваў усё новыя і новыя рэчы. Такім чынам, малая хутка стамлялася, але вынікі былі ледзьве не фантастычныя. Яна вучылася ўсяму і адразу.

Праз некалькі год, зрабіўшыся ўжо прыгожай маладой дзяўчынай, яна паступіла ў кансэрваторыю. Шмат хто заўважаў за ёй нейкі самабытны талент, але ў выніку, на апошнім курсе, дзяўчына падсела на нейкую модную сынтэтыку і скончыла на вуліцы. Адным ранкам прыбіральшчык раптоўна знайшоў у сьмеццябаку ейнае пасечанае на кавалкі цела, закручанае ў вэльвэтавы сьпінжак. Напэўна, тая ноч была ня лепшай у ейным жыцьці… але невядома. Дарэчы, можа быць, у гэтым быў вінаваты ня толькі бог, але і ейны настаўнік (а можа, настаўнік тут ні да чаго ўвогуле), які ў адзін цёплы вясновы дзень раптам спыніў свой маналёг, паглядзеў на неба, на-

кінуў на плечы пералатаную торбу і пайшоў кудысьці ў пустыню. Апошняе, што яна чула, было ягонае нязьвязнае мармытаньне.

Так бы ён і займаўся гэтай гуйнёй, калі б у адзін цёплы вясновы дзень нейкія хвалі не прабіліся ў ягоны розум. Гэта быў досыць моцны сыгнал наўпрост з глыбіняў космасу, і Юзік ведаў тых, хто дасылаў яго.

– Гэй, стары ты хрэн, ну што ты робіш? Дамовіліся ж. Мы табе сказалі, чым трэба займацца, да чаго прыкласьці ўсе намаганьні. А ты што прыдумаў?! – і голас той быў такім сваім, такім цёплым. Быццам бы пяшчотная маці дакарала свайго неразумнага сына. Юзік зразумеў, што там яго сапраўды хтосьці любіць.

Так, сапраўды. Ён жа абяцаў ім. Ён жа даў слова, што выратуе. Божа мой, дзед сапраўды стаў забываць... Не памятаў ні сябе, ні таго, дзеля чаго ён прайшоў вайну, дзеля чаго гадамі цёгаўся зь вялізным заплечнікам на гэтыя сьметнікі. Напэўна, ён быў занадта стары. Так лёгка забылася, выцерлася з памяці тая галоўная мэта ягонага існаваньня. Канечне ён нічога не сказаў. Нікому ня варта казаць такія рэчы. Юзік даўно страціў чалавечае аблічча, каб прабачацца і падтрымліваць звычаі і завядзёнкі.

Ён апошні раз напоўніў свой заплечнік.

Ён сабраў усё неабходнае.

Паправіў чырвоную супэркепку.

Сышоў у пустыню.

Мяккі вечар паступова пераходзіў у мяккую ноч, а апошняя, у сваю чаргу, расплывалася на ўсходзе чарговым ранкам. Не было аніякага шанцу гэтага абмінуць. Камусьці трэба было знайсьці надзейнае апірышча, камусьці папросту папусьціцца. Ноччу абрысы невыразныя. Можна адвесьці вочы ўбок, і невялікі шанец, што суразмоўца нешта заўважыць. Ва ўсялякім выпадку, звычайна гэта дзейнічала. У цемры можна схавацца, калі за табою едзе паліцэй-

ская машына ці бягуць нядобразычлівыя, пакрыўджаныя людзі.

А яшчэ цішыня, празь якую часам праступаюць гукі далёкай аўтастрады... ці чыгункі. Начны спакой, за які так шмат можаш аддаць удзень, калі напружанае паветра стогне ад мэталічных удараў, крыкаў і празьмерна ладных сьпеваў керамічных прыгажуняў. Часам пачуеш шолах крылаў якой начной птушкі, конікаў... але ня ў горадзе, ня тут...

– Я не памятаю сваіх бацькоў.

– А што зь імі?.. – ён не адразу зарыентаваўся.

– Я расла ў прытулку. Толькі чамусьці не папёрла мяне ісьці ў манашкі. Яны ўсе лічылі мяне ненармальнай і ставіліся адпаведна. А мне неяк усё роўна было. Не, я ім, канечне, удзячная, але напэўна ў дзяцінстве мне гэтага было зашмат.

Дзяўчына шмат гаварыла, а юнак усё маўчаў і маўчаў. Толькі часам паварочваў да яе свой няголены твар.

«Чаму менавіта гэты? Не, я сапраўды нейкая дурнаватая». Але думаць было ўжо позна, ды якая цяпер была розьніца. Ноч, што з кожным днём рабілася ўсё карацейшай, хутка мусіла скончыцца, а там, калі прыйдзе раніца, усё будзе ўжо зусім па-іншаму. Сьвітанак сапраўды мае такую здольнасьць – расстаўляць усё па сваіх месцах. Сьвятло прымушае адфільтраваць недарэчную рамантыку начной цішыні, рэчы зноўку набываюць цені. Там, празь якія гадзіны дзьве, яна будзе прымаць рашэньне, а пакуль хай навокал будзе спакойна.

Юнак было падумаў пра тое, што яны пачалі пра бацькоў... У чарговы раз адзначыў пра сябе ўсю гэтую альгарытмічнасьць. Лянота. Толькі ня варта паглыбляцца ў аналіз узаемінаў між... людзьмі... «Выхад, чувак, вось і ён».

«Шкада, што ён амаль увесь час маўчыць. Спачатку падаваўся такім узбуджаным. А цяпер неяк зусім...»

– Я ведаю, што трэба зрабіць, – ён неяк невыразна перапыніў ейны расповед пра рэлігійныя раскла-

ды, якія былі «такімі часам ідыёцкімі». Але дзяўчына замаўчала.

– Што... Няўжо хопіць?! – Яся паглядзела на хлопца, той неяк не чакаў такога пытаньня. Усьміхнуўся.

– Хадзем на начнік, вінчыку возьмем. Чаго тут сядзець.

Канечне, на яе месцы можна было б і крыху пакрыўдзіцца, але зацёры пра дзяцінства і манашак... Так, часам яе заносіла, ну дык што з таго?

– Хадзем...

Ноч электрычных лямпачак і яркіх абгортак, ноч сонных касірак і пазяханьня ахоўнікаў. Ноч як ноч.

Яе можна вымяраць крокамі, цыгарэтамі, ліхтарнымі лямпачкамі, глыткамі і яшчэ чым-небудзь. Але бессэнсоўна – усё роўна саб'есься. Усё адно заблытаесься ў гэтых лічбах, словах, у гэтых позірках, якія быццам бы маюць кожны свой падтэкст. Куды больш здаровым (котка на плоце як кропля рэальнасьці...) у такой сытуацыі падаецца маўчаньне, шпацыр па лёгкіх вуліцах, пазбаўленых друзу людзей і самаходаў, ці выкіданьне пустой пляшкі ў сьметніцу. Дзынь. Куды цішэй, чым кананада недапалкаў знэрваванага ў чаканьні тралейбуса грамадзтва. Рэдкая паліцэйская машына. Лянівы патруль яшчэ аднаго дзяжурства заяжджае ў дворык, каб гадзінку паспаць.

Цёплыя рукі хваляваліся і шукалі іншыя рукі. Людзі шукалі людзей. Але знаходзілі ў выніку саміх сябе, толькі не пазнавалі. Ды і не спрабавалі пазнаць. Людзі вымаўлялі нейкія гукі, глядзелі ў вочы, думалі... вельмі шмат думалі. Але ў выніку так і не пазнавалі, бо, можа, ніколі й ня ведалі тых, каго сустракалі ў чужых целах, нягледзячы на тое, што гэта было не нашмат цяжэй, чым знайсьці свой твар на групавым фатаздымку.

Ён троху папусьціўся, а яна нават крыху ап'янела. Пустыя вуліцы разьбягаліся ў невядомых кірунках, лавы прымалі стомленых, супакойвалі, а пасьля адпраўлялі далей у абдымкі электрычнасьці і жоўтага міргаценьня сьвятлафораў.

«Колькі ж спакою ў гэтай ночы! Ці мне папросту падаецца? Вельмі ціха...» – але ў асяродку гэтага спакою тоілася непазбыўная хваравітасьць. Яна магла колькі заўгодна залiваць яго вiном, затуляць размовамi, але глыбокае хваляваньне ўсё адно праступала, бы прыбярэжныя камяні, што, не зважаючы на ўгаворы хваляў, так чамусьці і застаюцца камянямі. Але вось так сядзець на лаве ўсё роўна было куды спакойней, чым мерацьь крокамі калідоры сваіх фантазіяў, свайго занадта жывога ўяўленьня.

– А што далей будзе? – Яся паглядзела на хлопца. Чамусьці яна спалохалася сваіх думак, якія так настойліва набліжалі ранак.

– А ты як мяркуеш, што будзе далей? Усё будзе як заўжды. Надыдзе новы дзень... Дарэчы, трэба ўсё ж ткі будзе выспацца... Пасьля і ён скончыцца. Людзі так і будуць хадзіць па вуліцах і гуляць у хованкі са сваімі эмоцыямі, са сваімі пачуцьцямі, будуць цікавіцца музыкай, мастацтвам... а каму, можа, і бяз гэтага добра... таму, напэўна, што іншае... Вясна, лета. Нараджэньне, сьмерць...

– Слухай, давай не цяпер... – Яся зазірнула ў ягоныя вочы, падаецца, дала яму зразумець. А ён спыніўся.

– Вось бачыш, ні манашак нам, ні сонечных карагодаў, нічога ня трэба.

– Што заўтра рабіць будзем?

– Я заўтра зьяжджаю...

– Куды?

– Адсюль.

Дзяўчына паглядзела на вуліцу, на асьветленыя ліхтарамі падмуркі будынкаў, на маладыя лісточкі на дрэвах. Дзесьці там на ўсходзе пачынала шарэць неба.

«Цудоўнае супадзеньне... Папросту містыка нейкая...»

– Шкада... – і зноўку няма сэнсу працягваць гэтае жангляваньне. І ці быў?..

Сапраўды, народу было дастаткова. Ня тое, каб вельмі шмат, але ўсё ж ткі. Сабралася ўся старая кадка аматараў таннага кайфу. Яны ўсім казалі, што ніколі ня ставяць сабе аніякіх мэтаў, нічога ня хочуць і г.д., але зь цягам часу атрымлівалі дыплёмы, уладкоўваліся на працу і чакалі папаўненьня ў сям'і. На іхныя месцы прыходзілі іншыя, а можа, і тыя ж самыя. У любым выпадку, хто б то ні быў, усё адно тут назіралася стабільнасьць. Ня тая, што вялізнымі порцыямі лілася з тэлеэкранаў. Не, ня тая, але тым ня менш стабільнасьць. Куды больш старая і куды больш надзейная, чым фізыка і радыёхвалі.

«Так, ляць, было заўжды...» – чыйсьці шэпт расплываўся ў этэры.

Навокал жылі людзі. Яны сьмяяліся, некаторыя ванітавалі сабе на боты, хтосьці цалаваў мужчынам ручку. Нічога дзіўнага, між іншага. Дэманстратыўнае ванітаваньне настолькі ж натуральнае, як і разгортваньне транспарантаў на арбіце.

«Паблітачка, сонейка, ты, па ходзе, зноўку гоніш...»

Аранжавы колер саступіў месца нэону, але, як гэта адбілася на жыцьці краіны, ніхто дакладна сказаць ня мог... бо не было краіны. І не было, і ня будзе. Толькі адны вавёркі, і вожыкі, і цукеркі-карамелькі, і нічога больш. Усім – супакоіцца. Расстраляць – расплавіцца – разагнацца... А вачэй шмат. Вачэй сапраўды шмат. І ўсе глядзяць, і глядзяць, і глядзяць, і вывучаюць навуку... няроўна дыхаць.

– Аёечкі! Якія ж мы сёньня аб'ябосікі! – хтосьці абняў безадказнае Паблава цела, хтосьці прашаптаў некалькі фразачак маладзенькім расфарбаваненькім дзяўчынанькам, і тыя дружна засьмяяліся і сказалі так шматзначна:

«Ооооооо!!!.........»

...Але ў выніку і гэтая сцэна зьнікла з поля зроку. Але колькі іншых! Колькі! Колькі! Колькі іх тут?! «Якія яны ўсе тут прыгажуні і прыгажуны, такія ўсе натхнёныя, апантаныя. Такія дынамічныя ўсе!»

Зашмат гуку. Гук пранізвае паветра, робячы яго густым, быццам бы нават вадкім. Сьвятло, нэрвовая

мітусьня промняў. Бясконцасьць страбаскапічных успалахаў ня можа не настройваць на пэўную хвалю. Разарваная на кавалкі галава ўсё яшчэ спрабавала падаць нейкія пэўныя сыгналы, але ў яе ня надта атрымлівалася. Дакладней кажучы – аніводнай цэлай думкі. Толькі паловы і чвэрці, часам настойлівыя восьмыя і шаснаццатыя, што рабілі сытуацыю яшчэ больш расхістанай і неадназначнай. Постаці са сваімі квадратнымі мэтамарфозамі і гэтыя перапэцканыя грымасамі твары, – адвечная песьня маладосьці, завышанай эмацыйнасьці і няроўных подыхаў. Празьмерна белыя ад асьвятленьня, дзявочыя кашулі плямамі выбіваліся на тле сіне-чорнай, перарэзанай каляровым сьвятлом матэрыі. Жорсткія выявы. Яны непакоілі вочы. Яны выгіналіся, набліжаліся і зноўку хаваліся дзесьці ў кутох, а на іх месцы выплывалі іншыя... белыя кашулі і пахі парфумэрыі і алькаголю. Аднекуль з кутоў выпаўзалі дзіўныя, абцягнутыя тканінаю пачвары з роўнымі, бездакорнымі ўсьмешкамі. Яны схіляліся да вушных ракавінаў і нешта нашэптвалі. Было бачна, як напружваюцца зьвязкі на аголеных, роўных, як фарфоравыя вазы, шыях. Пасьля твары адводзіліся троху ўбок і з усьмешкаю глядзелі ў вочы, чакаючы рэакцыі... рэакцыі...

Зашмат рэакцыі. Усё асяродзьдзе патрабавала рэакцыі, спрабавала адхапіць сабе як мага большы кавалак увагі, прымусіць верыць, хоць і не на доўгі час, у новыя прыярытэты, верыць у знадворнасьць, верыць сваім пачуцьцёвым рэцэптарам. Сынтэтычная эмацыйнасьць? Гэта ўжо занадта.

Расфарбаваныя малпы скакалі па сцэне і ўдала апэравалі мускуламі твараў. Яны быццам бы гулялі ў «кракадзіла», спрабуючы паказаць нейкае слова, ды нічога ў іх не атрымлівалася. Але гэтае «нічога» цалкам адпавядала настрою...

«Чые гэта думкі?»

Флюарысцэнтныя дэльфіны на сьценах глядзелі падбадзёрвальнымі позіркамі. Хацелася піць. Чараўніцы ля барнай стойкі. Трэба толькі вымавіць

некалькі словаў, і вакол пачынаецца бесьперапынная магія. Тоны бліскучай кітайскай магіі, але аніякіх драконаў. Хіба толькі ўмераная біямэханіка. Драконы пакінутыя сярэднявечччу. Навокал толькі мяккія мядзьведзікі і робататэхніка. Плястмаса!

– Ну дык як... – прыемны дзявочы голас, але ня той, што калісьці так прагнуў пачуць.

– Спакойна.

– Тады хадзем, – і куды гэта ён пайшоў, няўжо ён так усё і пакіне? Відаць, што так. Ну і гуй зь ім.

Малпы біліся ў канвульсіях і выстаўлялі кіслотныя жоўта-зялёныя зубы. Постаці рухаліся і сьцякалі потам на бэтонную падлогу. Усе колеры дыму ў паветры. Усе словы на сваіх месцах. Будзьце больш уважлівымі з дыкцыяй.

Дзьверы і нечаканы вакуўм.

Яны зьбілі сабе галовы, у некаторых нават праступіла кроў. Гэтай ноччу ніхто нічога ім не сказаў, і калі яны прачнуліся, то нейкі цень панікі прабег па тварах. Яны нават не адразу зразумелі. Апошнім часам начныя пропаведзі сталі самім сэнсам іхнага жыцьця. У іх была нейкая надзея на будучыню, нейкі станоўчы пачатак. Мужчыны кіраваліся ім на сваім шляху, ён надаваў упэўненасьці і спакою гэтаму да скрайнасьці неадэкватнаму сьвету...

Шэсьць мужчынаў бязвольна ляжалі пасярод вуліцы і мэтадычна білі галовамі аб нагрэты сонцам асфальт. Навокал сьпявалі троху зьдзіўленыя ўмяшальніцтвам гэтых барбараў птушкі, і нягучна перамаўляліся гіпсавыя жанчыны на фасадах.

– У іх жа мазгі павыцякаюць! Што ж яны робяць? – казала адна.

– Ды не было ў іх ніколі мазгоў! Ты чула, што яны ўвечары нарабілі?! – другая, відаць, была больш рухавая і эмацыйная. Магчыма, так задумаў скульптар.

– Не... а што?

– Ты ўжо спаць пайшла. А гэтыя, значыцца, сядзелі там сабе за столікамі, курылі. Здавалася б, што

ўсё нармалёва, ды раптам як паўскоквалі, як пачалі тут фігнёй займацца!

– Што ты кажаш?!

– Дык так і было! Унь у Тэрпсіхоркі спытай, тая ўвогуле ў шоку была.

Да іх далучылася трэцяя:

– Скажу табе па шчырасьці, ніколі я такой, прабач мне, гуйні ня бачыла. Ладна, памятаеш, тыя ў скуры на мапэдах. Памятаеш?

– Ну.

– Дык тыя фігня, дзеці горкія ў параўнаньні з гэтымі.

– Што ты кажаш?! – другая нават троху разгубілася, ня тое, што зьдзівілася. – А ўчора, як прыйшлі, дык такімі цывільнымі падаліся. Усё размовы такія ладныя і сур'ёзныя вялі. Звычайна і не пачуеш... Дык а што там канкрэтна было? – зь цікаўнасьцю другая зьвярнулася да суседак, а тыя трымалі паўзу, бы сапраўды надавалі гэтаму столькі значэньня. А можа, так і было, бо доўгі час тут сарпраўды анікога, акрамя птушак, котак і зьдзічэлых ужо сабак, не назіралася.

– Ды спачатку, падавалася б, і нічога. Ну, памаліліся ля таго дальняга помніка, потым сюды прыйшлі, за столікі паселі. Гэта ж ты памятаеш?..

– Ну, так. Гэта памятаю.

– А пасьля сядзелі курылі, усё навакольле задымілі, а потым павыносілі з дому мэблю, шафы ўсялякія, сталы, склалі кучаю і падпалілі. І ўсё чамусьці ля помніка таго. Неяк падазрона. Ну, мы спачатку думалі – сэктанты, дык то не сэктанты, то вар'яты нейкія! Колькі жыву, ані разу такога тутака не было...

Размова на падвышаных шэптах пад рытмічныя ўдары галоваў аб асфальт. Шырока раскрытыя вочы. Быццам паламаныя мэханічныя лялькі, мужчыны чамусьці мала нагадвалі сябе. Напэўна, бармэн быў бы зьдзіўлены, пабачыўшы іх у такім стане. Мужчыны хапалі ротам паветра, быццам выкінутая на бераг рыба. У шкляных вачох тлела нейкае пакрыўджанае расчараваньне, бездапаможнасьць пе-

рад здрадаю. Раптам яны апынуліся ў нейкай беспаветранай прасторы, без надзеі, якая яшчэ ўчора выклікала ў галаве бездакорную ўпэўненасьць у слушнасьці ўсіх рухаў.

– Дык а што там далей было?..

– А пасьля пачалі біць адзін аднаго. Шкло вунь у булачнай выбілі. Пасьля хтосьці дастаў клетку з курамі... – яна на імгненьне спынілася, бо адзін з мужчынаў у тую ж самую сэкунду пачаў крычаць нешта незразумелае. Немагчыма было пазнаць словаў, ды іх, напэўна, і не было. Гукавая мешаніна, якая паступова вылілася ў адзін працяглы ці то вой, ці то плач.

– Дык што з курамі?

– Яны іх зьелі...

Да першага далучыўся яшчэ адзін, і праз паўхвіліны ўсе шэсьць былі настолькі размазаныя па гэтай вуліцы, што з вокнаў выбівала шкло. Мужчынаў трэсла і кідала па асфальце. Ніхто з гіпсавых сук больш не адважваўся неяк тлумачыць сытуацыю, гэта для іх сапраўды было ўжо занадта. Ляпныя фасадныя ўпрыгожваньні вельмі хутка губляюцца, калі гутарка заходзіць пра разуменьне чалавечага крызісу.

(котка на плоце)
Прабітыя вусны.
Мой прапар – мішэнь для імгненьняў.
Высланы сэрцам за межы,
Стаю і маўчу ні пра што.
За пляшку гарэлкі мяне нарадзілі,
Сьвятар крыж паклаў
І прайшоўся па фэну, каб сілаў прыдбаць
Распаўсюджваць Сьвятое Пісаньне.
І дзякуй, што маме здароўе маё
Было не да жопы.
І часам яны зь дзядзем Толем
Бралі бананы з калгаснага саду.
Ды мне не давалі,
Казалі, што трэба мне волю выхоўваць...

А зараз мне погуй.
І тыя бананы, і маці, п’яная стрытовая сука.
Калісьці
Яны прыляцелі,
дасталі прылады і ўсё падлічылі.
Прамілі ды грамы ды іншыя мэтры…
Яны мне сказалі, што хутка ўжо фініш,
Што трэба падумаць і аб збаўленьні.
А я ім адказваў, згаджаўся і плакаў,
Казаў: «Вы прабачце мне, калі ласка...
Ды толькі скіпніце вы… прэч.
А добрыя людзі шапталі на вуха,
Што чыстую веру, нібыта сьвятую,
Ня трэба мяшаць з вокам зьвера.
А сонца пакіньце ў спакоі…

Нeяк цёпла было. Невыразнасьць. Немагчымасьць выразіць тую цеплыню, што ахутвала гэтае занядбанае цела. Усе гэтыя людзі так і засталіся людзьмі. Чамусьці за дзень бесьперапыннай п’янкі яны так і не ператварыліся ў жывёлаў. Ці гэта толькі так падавалася? Магчыма, але ў любым выпадку рэальным было тое, што адчувалі рэцэптары, а ня тое, што сказалі б пра гэта якія-небудзь добра выгаленыя хлопчыкі пры гальштуках. Чаму звычайна ўсё куды ў большай ступені залежыць ад іх, чым ад звычайнага чалавека, простага, не схаванага за касмэтычнымі лініямі ды ўльтрагігіенай? Толькі тут і цяпер, братка. Толькі тут і цяпер. Гэта адзінае, што мае хіба нейкую значнасьць.

Мужчыны слухалі свайго таварыша. Яны сядзелі, падпёршы цяжкія галовы рукамі, час ад часу перабіралі вачыма навакольле. Сонца адлюстроўвалася ў вокнах будынку насупраць. Некалькі апошніх промняў напярэдадні ночы.

...А тыя, што ціха шапталі,
Пазьней напісалі даведку,
Што стаў я нарэшце сабою,
Што буду цяпер чалавекам.

І што зь перапою я буду сумленна ад гэтага часу
Цягнуць сваё цела кудысьці.
Ды ветрамі з захаду ў сьпіну
Шаноўныя богі пінаць
Мяне будуць пад сраку.
Зь вясёлай усьмешкаю будуць
Зьліваць мне ў вушы навіны
Тралейбусных дынамікаў.
І я распісаўся пад тым,
Што буду імёнамі бога
Я стрымліваць зранку ваніты,
Што буду цяпер усьміхацца, махаць
Сваім прапарам белым...
Але ўсё ж ткі чорным, пайшлі яны на гуй.
Чорным махаць куды лепей...
На тронак яго напідорыць,
Паперку зь пячаткаю ў зубы ды ўсьмешку.
Іксец, харэ крышна...

Калі б Пал Палыч ня быў такім п’яным, напэўна, ён бы запатрабаваў блюзу. Так, старога, архаічнага блюзу з хрыпатым вакалам, і пляшку віскі. Так, ён быў ня больш чым лашком і эстэтам, але мог сабе гэта дазволіць. Відаць, мог... гэта менавіта той момант, калі прынята рэагаваць папускною ўсьмешкаю і адпаведным узмахам рукі... маленькія дзяўчаткі яшчэ раяць казаць пры гэтым «да ну на гуй», але гэта быў сапраўдны вечар сапраўдных мужчынаў. Для іх ня стала б цяжкасьцю выпіць і яшчэ, і справа тут зусім не ў алькаголі і ў немагчымасьці своечасова спыніцца. Няма неабходнасьці. У такой сытуацыі ўвогуле няма неабходнасьці ні ў чым. Пал Палыч гэта выдатна разумеў, і, напэўна, таму так тупа ўсьміхаўся. Усё было вядома яшчэ і раней, але чамусьці менавіта сёньня старому хрэну давялося прачнуцца халера ведае дзе і ўзгадаць сваё сранае мінулае. Ён папросту ня змог знайсьці лепшага сэнсу на сёньняшні дзень, чым даць троху блюзу. Сёньня не знайшоў нічога лепшага за далёкія закуцьці нецьвярозай памяці. Флэшбэкі. Мінулае было іншага колеру. Ва

ўсялякім выпадку, Пал Палычу падавалася менавіта так. Ён губляў раўнавагу, губляў магчымасьць годна трымацца, шмат разоў падаў на жопу, але чамусьці зноўку ўсплываў на паверхню, дзе заўжды штосьці заставалася. Ніхто ў гэтым сьвеце цяпер ня змог бы сказаць, што гэты чалавек халодная, цынічная скаціна. Ён заўжды быў празьмерна лірычны. Заўжды прагнуў справядлівасьці і шчырасьці ў стасунках паміж людзьмі. Ён насамрэч, як яму падавалася, ведаў, што гэта значыць – сапраўды кахаць... жыцьцё было досыць неадназначным, і шмат у ім надаралася ўсялякага лайна. Але ўсё было па шчырасьці. Ані граму ілжывасьці і пад’ябосу... А сёньня – стома.

Гаўно ты, Пал Палыч. Гаўно і дурань.

Чэмпіён залез на сьмецьцябак і, размахваючы напалову поўнай пляшкаю, дэклямаваў адтуль, падобны да старажытнарымскага рытара. Хаця хто іх калі бачыў, тых рымлянаў і іхных рытараў. Але Івана Пятровіча, відаць, яны мала хвалявалі.

Але мёртвай котачцы сьціплай
У вочы сьвятыя
Я зазірнуў і спытаў у кагосьці:
«Хто з вас бязгрэшны, рабяты?»
Усе прамаўчалі.
«Ну хто з нас ня злодзей?!»
Галовы схілілі і файкі шукалі ў кішэнях, нэрвовыя сукі...
І закурыў разам зь імі.
А што мне,
Даведка зь пячаткаю, прапар.
Такі, як усе,
Чалавек...
...ды стаялі анёлы,
ды мне ўсё ўсьміхаліся,
а можа, ня мне, не істотна.
Ізноўку нудоту сваю зацягнулі.
Малітвы ці «мурку» – адна халера.
Вось толькі мне неяк ня тое што блага,
Ды ўсё ж неспакойна...

Усё загаілася:
Вусны... і сэрца заткнулася,
Ціха.
Анёлы пайшлі па віно ды разьбілі бутэльку аб зморшчаны лоб...

Але далей Пал Палыч ужо ня мог узгадаць. Можа, пройдзе час, і карцінкі зноўку набудуць пасьлядоўнасьць і зладжанасьць. Мужчына ціха захінуўся ў паліто і пайшоў... Сонца канчаткова адмовілася працаваць, і стала зусім цёмна. Але ніхто не заўважыў. Колькі тых мужчынаў на гэтым раёне? Можа, сотні. Людзі з наўмысна сапсаванай памяцьцю. Але ўсё на гэтым раёне часова, і раніцаю звычайна карцінкі займаюць свае месцы ў фотаальбомах. Раз на год іх праглядаюць, адзначаючы беднасьць каляровых палітраў і «як даўно гэта было», а пасьля зноўку закідваюць у Дальні Кут Памяці.

# 3

Тралейбусы ня толькі ламаліся. Часам іх можна было адрамантаваць і пусьціць далей па маршруце. Але яшчэ тралейбусы самаўзнаўляліся. Тралейбусы нараджалі тралейбусы. І так было заўжды, увесь час, колькі яны існавалі на гэтай плянэце. Але ніхто, як падавалася, ня быў супраць. Ведаеце, як дзецям тлумачаць? Прыйшоў тата-тралейбус да мамы-тралейбуса і... ляць, панеслася па поўнай праграме, так што суседзі да раніцы варочаліся ў ложках і зайздросьцілі, ляць, чужому шчасьцю... а пасьля ў іх нараджаўся маленькі тралейбусік.

Брыдота?..

Калі іх толькі выпускалі на маршрут, яны яшчэ блішчэлі вокнамі і сьвежай фарбаю, усьміхаліся і падаваліся вельмі прыгожымі. Людзі, калі даводзілася натрапіць на такі, нават на некаторы час схіляліся да думак пра тое, што ў сьвеце ўсё добра. Але толькі ў новыя звычайна запускалі кантору, а гэта ўжо запара. Калі нейкая сука з-за твайго пляча пытаецца, ці заплаціў ты за сваё права радавацца бліскучым поручням... Так, таварышы, а што вы думалі? Гэты сьвет хоча цябе дзеля!.. толькі ня трэба рабіць такія вочы, ты таксама яго частка, а значыцца, і ты гэтага хочаш. То бок, іншымі словамі, ты ня супраць, каб старая нафарбаваная цётка з грубым, нібыта драўляным, тварам біла агромістым малатком па крохкіх крышталіках тваёй сьветлай раніцы. А калі сам пад гэтым падпісаўся, тады і не псьці, а гані свае дзьвесьце пяцьдзясят і глядзі колькі заўгодна на гэтае бліскучае хараство ранішняга транспарту.

«Так рана, а ўжо пачынаюцца прагоны... Можа, і ня рана, можа, папросту трэба час ад часу спаць», — Янка азірнулася, салён быў пустым, калі ня ўлічваць алькаша, што, уткнуўшыся падбародзьдзем у грудзі, спаў ці толькі спрабаваў спаць. Брудные паліто, рэшткі ванітаў, сьліна з роту на каўнер...

А так думкі, канечне, блыталіся. Горад быў горадам, Янка была Янкаю і нічога звышнатуралнага такія акалічнасьці не прадугледжвалі. Яна ведала, што рана ці позна па яе душу прыйдуць, і нікуды ёй ад гэтай расплаты не падзецца, калі, канечне, раптам ня здарыцца які-небудзь цуд. Але гэта з той жа опэры, што і нараджэньне тралейбусаў. Вынік заўжды быў адзін і той самы, і яго яшчэ ніхто не пазьбягаў. Яна – забойца. І нічога ў гэтым страшнага няма. Жыцьцё куды больш каштоўнае, калі разумееш, што хутка яго ня стане. Зрэшты, Янка занадта стамілася, каб апэраваць такімі вялізнымі паняцьцямі, як жыцьцё, лёс, непазьбежнасьць. Быў толькі ранак і пусты навенькі плястыкавы салён, які праз якую гадзіну прыме на борт сонных працоўных і службоўцаў і ад прыпынку да прыпынку будзе ўсё болей і болей набірацца паказак, прачытаных у газэце гісторыяў, плётак. Раніцаю ўсе ўсіх ведаюць. Хай можа часам і вонкава, але гэтага ўжо дастаткова. Можа быць, гэта дае ім надзею на тое, што яны ўсе разам, што няма чаго баяцца, калі побач знаёмы твар з суседняга двара ці няхай мікрараёну. Людзі ў тралейбусах нават не заўважаюць, як яны сталеюць, яны бачаць адзін аднаго ледзьве не штодня, і не заўважаюць, як бяжыць сэкундная стрэлка. Часам толькі фіксуюць прыпынкі, дзе хто выходзіць.

Ня тое, што яна раптам узгадала пра яго. Не. Янка неяк увесь час трымала яго на ўскрайку думак. Толькі неяк ці то страшнавата было, ці што. Ці, можа, не хацелася засіраць сабе галаву дадатковымі эмоцыямі? Можа, той дзед насамрэч ва ўсім вінаваты? Але ўжо ўсё роўна. Няма сэнсу шукаць вінаватых, калі ўсё вырашана. Дзяўчына запусьціла руку ў сумку. І дзесьці на самым дне знайшла яго, маленькае, ахайнае і старое. Люстэрка ў далоні.

«Дэманы? Можа й так».

У любым выпадку, далей справа ня пойдзе. Янка ніколі не магла нармалёва рэагаваць на сваё атачэньне, на сваякоў, на нейкіх там знаёмых. Усе яны штосьці хацелі, чагосьці патрабавалі. Але звычай-

на, канечне, нічога не атрымлівалі. Відаць, празьмерна імкнуліся. Гэта было калісьці, магчыма, у іншым жыцьці і нават з кімсьці іншым. Ці ёсьць нагода лічыць сябе ўвасабленьнем усясьветнага зла? Ды і ўвогуле ўсё гэта неяк бязьзьвязна.

Дзяўчына нарэшце паслала ўсіх і зірнула ў люстэрка. Канечне, нічога дзіўнага. Думаць, што гэты сьвет поўніцца містыкай, цудамі і таямніцамі – усё адно, што глядзець нямое кіно з заплюшчанымі вачыма. Можна ўявіць, але нельга быць упэўненым. Ніколі нельга быць упэўненым. Але... Як там было ў той старажытнай казцы... Пра Пэрсэя?.. ці пра што вы?..

– Ну дык што, Пабліта, дабро ізноўку перамагло жанчыну?

Сумнаю ўсьмешкаю ён усьміхаўся. Адзін сярод поля. Насамрэч ён ня ведаў, што сабе адказаць. Відаць, праўды было так. Цікава, каго часьцей перамагае дабро, мужчынаў ці жанчынаў. Стомлены пасьля доўгай ночы, пасьля бессэнсоўнага бадзяньня... Трэба было адразу пайсьці, ня боўтацца па гэтых родных, ляць, вуліцах. Але такою яна і была заўжды, гэтая раніца. Толькі невядома, якая яна ўжо па ліку. Яшчэ адзін распачаты фізычнаю разьбітасьцю дзень, яшчэ адна перамога. Непераможны ветэран міжгалактычнага фронту вяртаўся на базу. Дзе былі тыя ворагі, калі ня ўсё яшчэ было выпалена, калі вочы яшчэ хацелі бачыць, а думкі ведаць імёны? Ворагі скончыліся. Нават калі і ня позна цяпер спыніць гэтую самаадданую паказальную барацьбу за незалежнасьць, дык ужо і ня хочацца. Дый немагчыма ўсё ж ткі. Загуляўся, хлопчык, у сваіх салдацікаў, у сваіх робатаў і супэргерояў. Усясьвет стаў бліжэй, ды кантакты з чалавекам пагубляліся, зацерліся, як нумары тэлефонаў на паперках з кішэняў папрасаваных нагавіцаў. Сапраўды прысьпеў час разгортваць наступ па ўсіх кірунках.

«Дзесьці ж быў квіток», – і сапраўды, пакорпаўшыся ў вопрытцы, Пабла зь лёгкасьцю адшукаў

складзены трубачкаю прастакутнік. Літаркі і лічбы. Праз тры гадзіны трэба быць на вакзале.

Дастаў з кішэні і працягнуў правадніцы.

– Пашпарт, – нэрвова кінула жанчына, спрабуючы выпрастаць памятасьць. Неахайнасьць, відаць, яе раздражняла.

Пабліта паказаў пашпарт, паказаў твар. «Калі-небудзь гэтыя рэчы не пакінуць табе шляхоў да адступленьня. Тады ўжо ня зможаш вярнуцца». Якія знаёмыя словы, бы той напужаны трус, якога фокусьнік дастае з капелюша! Але ўсе выдатна ведаюць, што падобныя рэплікі застаюцца дзесьці за плячыма, і тыя, чые вусны нэрвова іх вымаўляюць, ніколі ня пойдуць самі па гэтай сьцежцы.

Я...аныя рамантыкі!

Адвечны падзел сьвету на тых і гэтых, на сваіх і чужых. Пабла сапраўды стаміўся ў ім удзельнічаць. Стаміўся ад гэтай вайны, ад гэтай мясарэзкі. Але ўсё было вельмі даўно. Можа, усе дваццаць стагодзьдзяў таму, а можа, і раней. Даты страцілі свой сэнс. Як, зрэшты, і месцы. Прастора і час сталі кропкаю. Нічога больш не пагражала спакою і ўраўнаважанасьці... Шмат падзеяў... але ўсё нарэшце скончылася.

– Малады чалавек, праходзьце ў вагон. Не затрымлівайцеся, – нэрвовы позірк правадніцы.

«Чаго ты хочаш, жанчына? Прасі, і я зраблю ўсё, што змагу».

Але жанчына маўчала. Жанчына ня ўмела чытаць думкі. Жанчына была на працы.

«Ну і маўчы сабе».

Пабла залез на сваю верхнюю бакавушку і нечакана хутка заснуў. Нарэшце яго папусьціла, нарэшце нэрвовая сыстэма супакоілася. Наркотыкі, танная радасьць няголенага сумленьня заўжды маленькага дзіцяці.

Суфіі, між іншага, надавалі снам асаблівае значэньне...

Яму сьніўся нэон і хлопчыкі з напамажанымі вуснамі. Сьніліся паліцэйскія, што старанна апрацоўвалі дубіналам моладзь на танцполе. Усьмешкі зьмянялі-

ся выразам страху. Успышкі стробаў, твары, поўныя крыўды і адчаю, твары, перанасычаныя нянавісьцю. Быццам бы фатаздымкі, кадры са слайдфільму. Можа, нейкі фатакомікс...

...А пасьля быў грукат колаў і белае сьвятло. Пабла ізноўку апынуўся ў цягніку. Пабла зноў зрабіўся Паблам. Сонца зьнікла, на зьмену яму прыйшлі аблокі. Даўно ўжо прысьпеў час скончыць з гэтай звышнатуральнай сонечнай актыўнасьцю. Невыразныя лясы зьмяняліся такімі ж невыразнымі палямі і лугавінамі... апошнія сполахі страбаскапічных маланак дзесьці на ўскрайку ўсьведамленьня... роўнае белае сьвятло. Бязь ценяў, без кантрастаў. Ляжаў і лыпаў вачыма, так і рабіў бы ўсё жыцьцё.

Той раніцаю першаму стала зразумела, што ён нарэшце па-сапраўднаму захварэў. На гэты раз чыстая фізыялёгія. Невядома як і невядома на што, але гэта было ўжо дакладна. Цела ныла і адмаўлялася працаваць як сьлед. Напэўна, паднялася тэмпэратура. Хлопец не разумеў нічога, ня ведаў што і адкуль... Гук хваляў падаваўся занадта рэзкім, розум занадта павольным. Учора ён пачуваў сабе ня лепшым чынам, але, ва ўсялякім выпадку, ня мог нават і падумаць, што на ранак будзе балець усё цела, што месца галавы зойме адно шчыльнае воблака, праз якое анічога немагчыма пабачыць.

Але першы ўсё выдатна разумеў. Розум быў чысты і ясны. Толькі адзінае што яго ставала на ўсе ўнутраныя працэсы, а тое, што рабілася звонку, ён аніяк ня мог ахапіць. Немагчыма было разабраць аніводнага слова, усё зьлівалася ў адзіны манатонны гул. Але вецер ясна лавіўся вухам, як, зрэшты, і хвалі. Іх было вельмі шмат. Падавалася, што зь іх створаны ўвесь сьвет. Вочы таксама не працавалі. Карцінкі тармазіліся і ня мелі дакладных абрысаў. Расплываліся, як адлюстраваньне на воднай паверхні ці замаруджаныя кадры зьнятага на відэа танцу вугалька на канцы падпаленага тронку. Нейкая ірэальная сытуацыя.

Суцэльная адсутнасьць разуменьня ўсяго, што адбываецца навокал.

Ён ляжаў і глядзеў кудысьці ў мутную шэрую бездань. Ці гэта было неба, ці штосьці яшчэ... але першы лічыў гэта небам. Спрабаваў патлумачыць сабе, што зь ім такое, але ніяк не атрымлівалася. Гэта было папросту немагчыма. Увесь сьвет знаходзіўся дзесьці па той бок шкляной сьцяны, але шкло не празрыстае, праз яго можна было заўважыць толькі агульныя абрысы. Ды і вонкавасьць была хутчэй дадуманай, чым натуральнай; хіба на восемдзесят адсоткаў аб'ектыўнай. Калі ўвогуле можна казаць аб нейкай аб'ектыўнасьці. Дзесьці глыбока ў сутарэньнях мозгу першы знаходзіў інфармацыю пра тое, што і як мусіць адчувацца, асэнсоўвацца, але насамрэч гэта ўсё былі толькі думкі, своеасаблівая ўнутраная дакумэнтацыя. Сухія лічбы.

Магчыма, упершыню ў жыцьці хлопец адчуў сябе па-сапраўднаму самотным. Канечне, былі і іншыя выпадкі, калі ён скардзіўся сам сабе на пакінутасьць, але тут ён нават ня мог успрымаць знадворны сьвет. Ён не адчуваў вецер як вецер. Не ўспрымаў прадметы як прадметы. Раптоўна ўсё зьмянілася. Бездапаможны, першы ляжаў на жвіры і марна спрабаваў прыстасавацца да новага адчуваньня. Гэта, напэўна, была толькі брыдота...

А скалы па-ранейшаму глядзелі кудысьці ў мора. Яны захоўвалі свой халодны спакой тысячагодзьдзямі і ў куды больш сур'ёзных выпадках, чым невядомая хвароба нейкага чалавека. Камень не пакутаваў, ня вёў бессэнсоўных спрэчак. Але на ім, нягледзячы на ўсю цьвёрдасьць, там-сям прарастала насеньне дзікіх дрэваў. Жыцьцё паўсюль было жыцьцём, нават на такой грубай глебе. Толькі дрэвы не крычалі, не махалі рукамі, і, натуральна, нічога не жадалі. Скалы і вецер давалі ім усё, што неабходна, а ў іншым выпадку іх бы тут і не было.

– Што зь ім? – другі схіліўся над хворым, зазірнуў у заліты чырваньню і болем твар і занепакоена паглядзеў на трэцяга. Той таксама толькі прачнуўся і цяпер

корпаўся ў заплечніку ў пошуках цыгарак. Яшчэ сонны, ён урэшце зьвярнуў увагу на зьмятае ды падранае цела першага. Падпаліў і падышоў да другога.

– Напэўна, захварэў, – ціха прамовіў трэці. Ён зацягнуўся і зазірнуў у вочы хворага. Там не было ніякіх пачуцьцяў. Толькі вочы як прылады для зроку. І ўсё.

Сябры клікалі яго, але першы не рэагаваў. Час ад часу ягоныя рукі варушыліся, білі па зямлі. Часам яго трэсла. Але дапамагчы яму было немагчыма. Дый хлопцы і ня ведалі, і не разумелі ўвогуле нічога. Навокал палалі вогнішчы і рваліся бомбы, толькі там, у глыбіні, гэта не знаходзіла аніякага адлюстраваньня. Яны паспрабавалі даць першаму вады, але той не прыняў, нават ніяк не адрэагаваў на яе. Вадкасьць выцекла з чырвоных вуснаў і, незапатрабаваная, пралілася па падбародзьдзі.

Хлопчыкі займелі яшчэ адну праблему. Нэпэўна, яны былі занадта маладымі для ўсіх гэтых выпрабаваньняў, але што... Было зразумела, што нічога зрабіць для першага яны ня змогуць, у іх не было ані мэдыкамэнтаў, ані ведаў. Сілы?.. Другі сядзеў ля першага і маліўся, а трэці глядзеў у мора. У той дзень яны так нікуды і не пайшлі. Першы раз за ўвесь гэты час хлопцы сядзелі на адным месцы. Яны ня ведалі, чым сябе заняць. Хада хаця б неяк забірала сілы, патрабавала аддачы фізычнай энэргіі і ў выніку стамляла. Але на месцы... гэта зусім па-іншаму. Час ад часу хворы спрабаваў узьняцца, аднак яго арганізм быў занадта слабы, і ў выніку цела ў чарговы раз падала долу, ня здольнае заняць звычайную вэртыкальную пазыцыю.

Крок за крокам ён ішоў ды ішоў. Можа быць, наперад. Згублены ў часе і прасторы стары, яшчэ адзін аскепак чалавецтва. Міналі дні, але ногі чамусьці ўсё яшчэ працавалі, вочы бачылі, і падавалася, нічога ня можа пакінуць адбітак на гэтым выпаленым твары. Дзіўна, але заплечнік выглядаў не такім ужо і цяж-

кім, нягледзячы на тое, што ў ім мусіла зьмяшчацца як мінімум паўсьвету. Можа, усё, што нёс стары, згарнулася да такіх маленькіх памераў. Калі, канечне, падобныя мэтамарфозы магчымыя. Усё паменшылася, згубіла ваду, бы паралонавая губка. Стары нёс шмат, ды толькі звонку падавалася, што гэта звычайны хударлявы бамжарка са сваімі пацёртымі рэчамі. Але Юзік не глядзеў у твары, а калі і глядзеў, дык дакладна не разьбіраўся ў іхных уладальніках... можа, ня мог? Дый патрэбы не было ў гэтым. Ці мала што магло падавацца ўсім гэтым аматарам хуткага суду? Быццам бы хто зь іх мог сказаць старому штосьці дагэтуль не вядомае... дый штосьці важнае ўвогуле. А ці значылі што-небудзь цяпер для Юзіка ўсе гэтыя твары, усе гэтыя вочы і іншыя прыстасаваньні, што так выдатна валодаюць словамі і позіркамі, што так удала прымаюць розныя паставы? Гэты стары чалавек стаў для іх мерцьвяком куды раней, чым яны перасталі зьвяртаць на яго ўвагу. Стары ведаў толькі адно – куды і дзеля чаго ён ідзе. Гэтага цалкам ставала, як і хлеба з вадою. Больш – ужо зашмат. Дзе б ён ні ішоў, заўжды знаходзіўся хтосьці, хто глядзеў на яго, быццам бы бачыў прывіда, ці, ва ўсялякім выпадку, натрапіў на нешта звышнатуральнае. Што ж зробіш, людзі заўжды любілі прыфантазіраваць, асабліва тыя, хто ня меў разумовай магчымасьці, ці, што яшчэ больш патрэбна для гэтага, волі, дабрацца да сутнасьці чаго б то ні было. Але паўсюль людзілі любілі імёны. Часам падавалася, што гэта адзінае папраўдзе для іх каштоўнае. А Юзік іх ужо амаль забыў. Словы ён пакідаў цяпер іншым і мала на іх рэагаваў. Апошняе вэрбальнае пасланьне, што стары яшчэ больш-менш здолеў разабраць, было зусім не ад людзей. Але ад каго, ён ніколі б адказаць ня змог, таму што менавіта ў такой сытуацыі адказы былі ўжо зусім недарэчнымі. Гэта было б падобным да... (дада)

Стоп!

...ніякім чынам ён не спрабаваў спыніць жыцьцядзейнасьць свайго арганізму, дый забіў на яго куды

больш, чым хто ў гэтым ўзросьце. Напэўна, яму цяпер было б цікава, пра што гэта ён крычаў тым людзям шторанак, калі жыў у горадзе. Было б цікава ў тым выпадку, калі б людзі мелі хіба якое значэньне. Не, канечне, у выніку атрымлівалася, што адны яны і былі ў гэты момант ягонай канчатковай мэтай, але тут і цяпер на іх зважаць было ня варта. Адно, для нараджэньня падобных меркаваньняў былі патрэбныя думкі, якіх больш не існавала. Юзіку ставала папросту ісьці, папросту перамяшчаць сваё цела... і ня болей. Рана ці позна ён прыйдзе і зробіць сваю справу, а пасьля, можа быць, і здарыцца штосьці яшчэ... Ці ня здарыцца.

Усе гэтыя разгароты на самай справе зьяўляліся ня больш чым прыгожанькімі карцінкамі. Чамусьці гэты дзіўны дзядуля так, напэўна, і не пасталеў, так і ня стаў старым у поўным сэнсе гэтага слова. Яго немагчыма было ўявіць на мягкім фатэлі ля каміну, захутаным у плед. Ён ня мог быць дзеўбанутым дзядком, з тых, што кожны ранак бегаюць па парку ў спартовых портках. Яго не магло быць у гэтых парках... ды і на вуліцах гарадоў ён ужо не трапляўся на вочы стрытовых паэтаў і басоты. Старога паламала і панесла нейкая незразумелая сіла. Незразумелая усім, акрамя яго самога. Юзік заўжды ведаў, што рана ці позна ўсё застаецца ў мінулым, але ў апошні час ён не імкнуўся з кімсьці размаўляць і ня быў схільны адкрываць камусьці сваю памятую душу. Колькі ўжо год прайшло?.. Ды і нікому яна, зрэшты, і не была патрэбная, тая ірваная прасьціна. Нават, калі па шчырасьці, і таму дзіцяці з будаўнічых сьметнікаў. Толькі дзяўчынка яшчэ верыла ў значэньне слова «хачу», а стары ўжо, напэўна, не.

На самай справе старыя нікога не кранаюць, не расчульваюць. Толькі хіба сацыяльных службоўцаў, што мараць аб нейкай кар’еры. Але адзінае, чаго яны змогуць дасягнуць, гэта... ня тое. Зрэшты, усё толькі гоніва. Нельга растлумачыць чалавеку тое, што ён будзе ў стане зразумець толькі пазбавіўшыся сваёй чалавечай сутнасьці. А тым, хто безтурботна п’е пят-

ніцамі гарэлачку ды лічыць дні да адпачынку, ім застаецца толькі зьдзіўляцца ды глядзець праз плот ці з-пад броваў на чарговага жабрака, што неасэнсавана нашэптвае сабе нешта ды з чагосьці там сьмяецца.

Пустыня. Што дала ты Ісусу? Шчасьце і галаўны боль... і назвала ягоным імем вуліцы? У адказ Пустыня глядзела і ўсьміхалася, расплывалася вакол гэтага чалавечага арганізму, што даўно ўжо адпрацаваў сваё. Ніякай небясьпекі ў гэтых барханах. Чалавек заставаўся чалавекам толькі ў тым выпадку, калі пазбаўляўся чалавечага. Такія вось парадаксальныя думкі перасякалі прастору. Але яны былі не ўласьцівыя людзям. Тады каму?.. Ды і адкуль увогуле бярэцца ўся падобная халера?

– Гэй, мужык! Дай цыгарэту, ня ў падлу!

– Шо?..

– Дай, ляць, цыгарэту! Шо ты шокаеш?!!

– А?.. – п’яныя думкі, ногі няздольныя трымаць цела... Чаму ён так і ня змог прымусіць сябе яе ўтрымаць?.. напэўна, мала хацеў. Хацеў мала хацець. Пал Палыч ведаў усе гэтыя сытуацыі і, на жаль, вельмі добра ўсё разумеў. Псыхіка аніяк не магла супакоіцца. Навокал віравала жыцьцё, але дзесьці пад скураю ўся чалавечая сутнасьць балела. Тоны памылак, якія насамрэч ніколі не былі памылкамі. Папросту ісьці ў натоўпе куды зручней аднаму, але заставацца ў спакоі сам-насам са сваімі думкамі не заўжды бясьпечна. Можна пазбавіцца...

– Дай цыгарэту!.. дай...дай...дай...дай...

ECHO/DELAY

П’янае цела было вельмі нязручным для карыстаньня, і Пал Палычу ўвесь час хацелася вызваліцца. Відаць, ён троху перабраў, але гэтыя кавалкі думак ніяк не маглі паўплываць на ягоныя ўчынкі. Было занадта позна прыводзіць сябе да ладу. Мозг адключаўся. Калі яна была дзесьці побач, было ўсё неяк ня так, але нічога ня зробіш, малады арганізм ірвецца на прасторы, недасяжныя для сталага розу-

му, яго цяжка супакоіць, спыніць. Там, дзе працуе цела, розум недарэчы. Пал Палыч вельмі добра ўсё памятаў, і менавіта таму было сумна і пагана. Але п'яны розум заўжды бег наперад, спрабаваў усё зьмяніць, нягледзячы на тое, што гэта, натуральна, было немагчыма. Ніколі нічога нельга зьмяніць ці перайначыць. Час ідзе толькі наперад, і кожны вымушаны згадзіцца: ніколі ня будзе вяртаньня да таго, што калісьці было пакінута за плячыма, прынесена ў ахвяру чамусьці іншаму. Карцінкі таксама жывуць сваім уласным жыцьцём. Яны бягуць, скачуць... бы тыя дваццаць чатыры на сэкунду. Толькі тут, у гэтым сьвеце, няма аніякіх ctrl+z, няма Undo.

Пал Палыч вельмі хацеў, каб увесь гэты жах як мага хутчэй скончыўся. Падавалася, што гэты ўжо зусім не малады чалавек так і застаўся нейкай часткаю свайго сэрца ў мінулым, застапарыўся на нейкім эпізодзе, што, зацыклены, бесьперапынна ўзнаўляецца і ўзнаўляецца, перажываецца дзесьці тут, паралельна з рухам тралейбуса, з нараджэньнем дзіцяці, з чарговым выпітым булькам. Штосьці застаецца і нудзіць, даводзіць, бы тая паліцэйская сырэна сярод цёплай травеньскай ночы, калі ў адкрытую фортку мяккаю плыньню іл'ецца спакой і прахалода вуліцы, пах кветак. Паліцыя ці хуткая дапамога, што заўгодна... пакрыўджаны марфэй, растурбаваны сон. Нічога не праходзіла. Шкло заставалася ў целе і час ад часу рэзала матэрыю. Шкло, якое так і заставалася заўжды нічым. Адна празрыстасьць. Ніякай каштоўнасьці яна ня несла. Шкодны іншародны прадмет, якім так хацелася валодаць, але нагуляўшыся, наглядзеўшыся праз яго на сонца... Усе цацкі рана ці позна закідваюцца далёка на паддашак. Такая тэма ў чалавечага жыцьця. Пал Палыч усё гэта выдатна ведаў. Ён кожны дзень бачыў гэта паўсюль, але найперш у самім сабе. І што ён мог з сабою зрабіць? Акрамя таго, каб мэтаскіравана атручваць свой арганізм, які чамусьці аніяк не жадаў паддавацца. Адвечная барацьба з самім сабою. Барацьба з думкамі, са звычкамі, з праўдамі, якія напоўнілі душу кіпенем эмоцыяў.

– Ды ён цябе ігнорыць, – нейкія галасы на ўскрайку ўспрыманьня. Хлопчыкі радуюцца жыцьцю.

– Ты шо, сука, агуеў?!! – далей можна было і бяз словаў.

Заціснутая ў далоні запальнічка. Чалавек сьціскае ў далоні запальнічку і непакоіцца. Чалавек б'е чалавека. Чалавек б'е чалавека і крычыць, ён любіць быць лепшым сярод іншых да сябе падобных. Чалавек хоча быць асноўным у сваім статку. Чалавек ня можа дазволіць сабе ўсумніцца ў сваёй праваце. Ён замахваецца і што ёсьць моцы б'е кулаком у твар. Просты, каменны, безапэляцыйны ўдар.

Людзі любяць людзей. Реасе.

– Ты каго на гуй паслаў?!! – шмат пытаньняў, на якія не патрабуюцца адказы. Такія вось рытарычныя пытаньні. Вуліца таксама мае сваю філязофію. Свае тэмы, свае гіерархічныя лесьвіцы і, адпаведна, сваю дыялектыку. Але тут патрэбныя факты. Тут усё вырашае патэнцыя, гатовая ў любую сэкунду ператварыцца ў кінэтыку. Факты вымяраюцца ў джоўлях.

Пал Палыч зусім не разумеў сытуацыі. І куды яму было да спасьціжэньня высокай сутнасьці пытаньняў, што з такой хуткасьцю сыпаліся на ягоную галаву?

«Чаму заўжды трэба змагацца з гэтымі надакучлівымі флэшбэкамі? Чаму б, сапраўды, было ўсё не спрасьціць, не папусьціцца, ня даць сабе магчымасьці заснуць у гэтым мяккім фатэлі, не дазволіць чымсьці пяшчотным рукам укрыць тваё цела коўдраю? Чаму трэба было яе адпускаць?..» – зашмат пытаньняў у гэтую неспакойную ноч.

Звонку, з таго боку вачэй, мільгацелі твары. Твары рабілі нейкія мімічныя пасы, штосьці выкрыквалі. Спрабавалі перадаць нейкую інфармацыю. Можа, яны мелі рацыю, калі казалі, што ўсё навокал толькі нагрувашчваньне кубікаў? Рана ці позна любая вежа не вытрымлівае і рассыпаецца па падлозе. Задача ў тым, каб паставіць як мага больш кубікаў, падоўжыць яе, прымусіць пратрываць яшчэ некалькі імгненьняў. Захоўваць раўнавагу?..

Кулакі білі па галаве. Але ня доўга, хапіла некалькіх трапных удараў, каб перадаць эстафэту нагам. У гэтым не было нічога страшнага. Цела выкручвалася і не з такіх сытуацыяў. Яно ўсё рабіла аўтаматычна. Ногі падціскаліся, а рукі закрывалі твар. Заставаліся толькі ныркі. Боты білі, але хлопчыкі былі не вайскоўцамі, абутак лёгкі, вясновы. Гарачыя маладыя сэрцы! Гонар і адвага! Колькі іх там было? Два? Можа й тры?.. Неістотна. Добрыя людзі з разьюшанымі позіркамі. Яны заўжды адчуваюць хваробу, але не баяцца падчапіць вірус. У іх імунітэт.

– Ну што, сука, думаў, лашкоў знайшоў?! Ты, ляць, думаў, на чужым раёне так проста пантавацца будзеш, гаўно?! На табе, сука, ляць, панты!..

«Як мы любім даваць сабе нагоды для перажываньняў! Як любім усе гэтыя эмоцыі і пачуцьці!.. Навошта ты ўвесь час пра яе думаеш, а, Пал Палыч? Падаецца, даўно ўжо трэба супакоіцца і трымацца ўраўнаважанага мэтраному, без аніякіх аўтбітаў. Падобны да маленькага хлопчыка з заплаканымі вачыма, апранутага ў пацёрты халат састарэлага паэта-рамантыка...»

– Што, дзядзя, не атрымалася памажорыць?! Вось які ты ў нас цяпер круты! Шыкоўна выглядаеш, але будзе яшчэ лепей... – моцныя штуршкі па ўсім целе. Трэба ж кудысьці падзець маладую энэргію.

«Ты ж яшчэ тады выдатна ведаў, што скончыцца ўсё менавіта так. Але няўжо кагосьці маглі спыніць падобныя веды? Ніхто ні пра што ня думае, калі вочы залітыя прыгожымі фарбамі і рэцэптары нагружаныя пад завязку. Ды і ці быў калі сэнс глядзець наперад, зазіраць у будучыню? Ніколі, але прыкладна таго ж варты гэты позірк у мінулае. Адвечны доўгі позірк на сябе, на троху іншага, чым на наступнай карцінцы, але насамрэч такога ж самага...

Трэба з гэтым сканчаць...»

Цела больш ня рухалася. Але хлопчыкі асабліва не зважалі. Асьцярожна, каб не запэцкацца крывёю, адзін зь іх прайшоўся па кішэнях. На жаль, марна. Ён хацеў знайсьці, але на гэты раз паўсюль было пуста.

– Ляць, няма ў яго лапатніку...
– Як няма?
– Ну так, ва ўсіх кішэнях глядзеў. Няма.
– Мля-а! А тэлефон?
– Таксама.
– Пісьціш.
– Мля буду!..
– Ладна, хадзем. Хоць патузаліся.

Чалавек любіць чалавека.

Peace.

Шэсьць мужчынаў не глядзелі ў люстры.
Шэсьць мужчынаў глядзелі ў люстры.
Шэсьць мужынаў не глядзелі ў люстры.
Шэсьць мужчынаў адрасьцілі вусы і доўгія бароды. Яны глядзелі ва ўсе вочы, але так і не маглі заўважыць. Мужчыны былі падобныя да мужчынаў. Валасы вылазілі са скуры і расьлі, расьлі. Мужчыны не клапаціліся пра тое, каб пастрыгчыся ці пагаліцца. Нічога звышнатуральнага ўжо не здаралася. Усе прыгоды засталіся ў мінулым. Адзінае, што яны часам любілі, дык гэта пабіць што-небудзь, ці спаліць некалькі жылых будынкаў у горадзе, ці сядзець на пагорку і назіраць за тым, як палае невялічкая вёска.
Сядзець. Курыць. Назіраць.
Яны жылі выключна чаканьнем цуду. Але часам не атрымлівалася захоўваць спакой і некалькі разоў даходзіла да бойкі. Тыя, хто быў больш ураўнаважаны, спрабавалі асабліва не замінаць. Мужчыны вырашылі: кожны мусіць рабіць тое, што яму хочацца, і па магчымасьці ня ўмешвацца ў справы астатніх. Канечне, атрымлівалася не заўсёды, але што паробіш, жыцьцё такое. Яны шмат курылі і пілі да халеры гарбаты. Нэрвовыя, яны чакалі і грукалі пальцамі па непрацёртых сталах кавярань. Чакалі, што голас бога дасьць ім выйсьце. Але, зрэшты, мала хто ўжо верыў у зьмены.

Толькі адзіны момант прымусіў мужчынаў задумацца. Сонца, якое нястомна паліла зямлю ўвесь гэты час, раптам схавалася за аблокамі. Іх нанесла адкульсьці з захаду, калі, канечне, мужчыны не памыляліся, а яны не адкідалі такой верагоднасьці. Мазгі былі ўжо не на месцы. Роўнае белае сьвятло з раніцы да ночы. Ні выразных ценяў, ні сонечных зайчыкаў, нічога... дзіўна, што не было чым дыхаць. Гарады, нягледзячы на адсутнасьць самаходаў і людзей, ператвараліся ў духоўкі, як гэта бывае ў ліпені. Але да сярэдзіны лета мусіла прайсьці яшчэ некалькі месяцаў... ды, зрэшты, мужчыны ня доўга надавалі столькі ўвагі гэтай акалічнасьці. Яны дрэнна разьбіраліся ў геаграфіі і ведалі, што маглі памыляцца ў сваім месцазнаходжаньні. Ды і апатычнасьць усёй іхнай сытуацыі не спрыяла разважаньням і пытаньням кшталту «чаму так адбываецца?». Ім ставала пытаньняў і без таго, але адказаў ужо ніхто не шукаў.

Аднойчы шэсьць мужчынаў зьявіліся на вуліцах невялічкага курортнага мястэчка. Тут пахла морам і нейкай аксамітнай даўніною, што хаваецца звычайна за старымі тынкаванымі платамі, у нечакана сьветлых завулках і за хісткімі рыпучымі дзьвярыма.

«Напэўна, прысьпеў час скончаць увесь гэты цырк», – некаторыя зь іх былі схільныя і да такіх думак, але пакуль што ніхто імі асабліва не дзяліўся. Мала што падумаюць астатнія? Але, зрэшты, адзінае, што ім усім і заставалася – думаць. Ну часам яшчэ біць шкло ў буціках і адміністрацыйных установах. А больш, па сутнасьці, і нічога. Шэсьць мужчынаў у капелюшох ня вельмі любілі чытаць. Але гэта ўжо, зрэшты, і так зразумела.

Мужчыны ішлі па вулачках у бок мора. Быў час спыніцца і выпіць па кубачку. Троху адпачыць. Коткі, што было зьбіраліся перабегчы дарогу, спуджана адскоквалі ўбок. Рашучыя крокі. Безапэляцыйныя і цьвёрдыя, як камяні на ўскраіне гэтага гарадка. Прысыпанае пылам бітае шкло рыпела пад падэшвамі. Час ад часу. Неба, зацягнутае аблокамі, нізкае і невыразна белае, падавалася, аніяк не рэагавала на

сытуацыю. Сонца супакоілася і пакінула поле бітвы. Вецер зьлёгку варушыў адрослыя валасы і бароды, вочы... Вочы... Ён нёсься з мора, ірваны і крывы, бы лахманы, у якія зь цягам часу ператвараецца ганарова ўзьнятае палотнішча.

Шэсьць мужчынаў у капелюшах пабачылі ваду. Яна білася аб пустыя, закутыя ў бэтон пірсаў і ўзьбярэжных водмелі, што мусілі быць пляжамі. Калісьці яны былі імі, а цяпер тут сканчалася зямля, і ўсе шэзьлёнгі і навесы выглядалі бессэнсоўна. Нават постбессэнсоўна, калі гэтае слова зможа перадаць карціну закінутага курорту больш дасканала. Шэсьць мужчынаў глядзелі ў мора, і кожны зь іх быў падобны да скалы. Такія ж цьвёрдыя і шэрыя ўдзельнікі рэчаіснасьці... Толькі яны былі, напэўна, больш крохкімі з выгляду, але на тварах гэта зусім не адбівалася. Мужчыны паднялі перакуленыя ветрам крэслы і прымусілі запальнічкі спрацаваць. Яны, відаць, завялі свае рытуалы. Было падобна да гэтага, але наўрад ці мужчыны надавалі падпальваньню цыгарэты шмат увагі. Маўчалі. Звонку ўсё магло падавацца зусім іншым, але «звонку» ўжо не існавала. Жывёлы і сьцены – ня ў лік.

Хтосьці пайшоў па гарбату. Яны былі вельмі падобныя адзін да аднаго, і, напэўна, таму было цяжка вылічыць, хто гэта быў. А яшчэ яны больш ня ведалі, хто зь іх хто. То бок ведалі, але не надавалі шмат увагі імёнам і ўласьцівасьцям, тым больш апошнія зь цягам часу паступова сьціраліся. Ніхто ўжо не баяўся нявызначанасьці, ды і ўвогуле, чаго можна баяцца нявызначанаму чалавеку зь цьмянай будучыняй, калі нічога немагчыма сплянаваць, калі няма нават за што зачапіцца? Зачапіцца ў такой будучыні, дзе няма чалавека, і адзінае, што сьведчыць пра ягоную колішнюю наяўнасьць, гэта руіны ўтылітарнасьці і прымітыўнай духоўнасьці.

Так ці інакш, але гарбата заняла сваё месца ў кубках, кубкі сталі на стол. Цукар і лыжачкі. Чамусьці мужчыны карысталіся ўсімі гэтымі прыладамі з ахайнасьцю і належнымі праявамі этыкету. Відаць, нека-

торыя звычкі стала пераўтварыліся ў рэфлексы, але гэта зусім ня тое, чаму ёсьць сэнс зьдзіўляцца. Так адбывалася заўжды. Шэсьць мужчынаў у капелюшох закурылі яшчэ па адной і глядзелі на мора. І на нізкае неба. Можа, хтосьці зь іх і спадзяваўся на зьмены, але большасьць, напэўна, вырашыла не рызыкаваць з думкамі падобнага кшталту. Звычайна яны нараджалі дэпрэсію і правакавалі гвалт. Рукі пачэсвалі бароды. Вочы глядзелі ўдалеч. Сонца выпаліла іх, ператварыла ў прылады зь нявызначанай мэтаю і сышло кудысьці, пакінуўшы самім разьбірацца ў гэтай сытуацыі. Моцны вецер лез у вушы і прыносіў грукат хваляў і рэдкія крыкі крачак. Гарманічная какафонія прыроды.

...Мякка ступаючы па бэтоннай паверхні, аднекуль з поўдня да кавярні набліжаўся стары чалавек зь вялізным заплечнікам. Ён ішоў проста. Занураны ў свае думкі, час ад часу кідаў невыразны позірк на мора, ды ізноўку вяртаўся ў яго глыбіні. Было такое адчуваньне, што чалавек па некалькі разоў на дзень праходзіць па гэтай узьбярэжнай. Чалавек не зьвярнуў на мужчынаў аніякай увагі. Ён мінуў столік і нават не адчуў ані паху, ані дыму палёнага тытуню, ні чыёйсьці прысутнасьці. Відаць, было не да гэтага. Роўнай хадою ён прайшоў міма, нешта мармычучы сабе пад нос.

Бэмц!!!

Там нічога асаблівага не паказвалі. Што можна пабачыць у звычайным просьценькім люстэрку, акрамя сябе? Ды толькі Янцы быў жыцьцёва неабходны хаця б нейкі, самы маленькі, самы нязначны, цуд. Толькі цуду ня здарылася. Ні тут, ні на футбольных палёх Англіі. Люстэрка так і засталося на дне сумкі. Але час ад часу дзяўчына зазірала ў яго, спадзявалася знайсьці адказ на пытаньне, чаму ўсё адбываецца менавіта так. У выніку бачыла толькі свой расколаты твар і па-ранейшаму нічога не разумела.

Аднойчы Янка знайшла сябе на падлозе электрычкі. Відаць, заснула і сасьлізнула з драўлянага крэсла. Паліто было брудным, і неўзабаве трэба будзе знайсьці месца, дзе можна прывесьці сябе да ладу. Чамусьці падобныя пытаньні ўсё менш і менш кранаці яе. Дзяўчына баялася, што рана ці позна яе знойдуць... і тады, канечне, усё. Як бы яна не ўгаворвала сябе, як бы не спрабавала заставацца спакойнай і моцнай, праз шчыліны ўспрыняцьця ўсё ж працякала тое пачуцьцё неспакою, што рана ці позна мусіла перарасьці ў паніку. Але Янка трымалася як магла і часам нават была здольная пераканаць сябе ў тым, што пра яе забылі. Шкада толькі, ненадоўга ставала такіх перакананьняў.

Янка бегла прэч, спрабавала як мага радзей трапляцца на вочы ўсялякім небясьпечным тыпажам. Канечне, наколькі гэта было ўвогуле магчыма. Яна мяняла электрычкі і дызэлі, пераскоквала зь цягнікоў на выпадковыя машыны, поўныя няякаснага тытуню і нахабных кіроўцаў... Але што яна магла з гэтым зрабіць? Не заўжды прыемна пакідаць за сабою выпаленыя лугавіны і разьбітыя вазы, наперадзе можа чакаць далёка не такая сьветлая будучыня, як тая, да якой заклікалі ў старых падручніках даваенныя ідалы. Бронзавыя статуі...

Ёй часта хацелася спакою, але яшчэ часьцей тупа хацелася есьці. Натуральна, даводзілася гандляваць сабою, бо цела – адзінае, што Янка заўжды мела пры сабе. Яна спрабавала як мага больш абстрагавацца ад усяго, але часам не атрымлівалася. А здаралася, усё было нават больш-менш... Ды ў любым выпадку, «кліентаў» чакаў прыкладна адзін і той жа сцэнар. Калі пад вейкі запаўзаў сон, Янка даставала лязо і ахайненька перараразала артэрыю. А чаго яшчэ, насамрэч, можна было чакаць ад забойцы. Дзяўчына ня бачыла ў гэтым нічога жахлівага. Куды больш яе напружваў пах перагару ці празьмерная стараннасьць чарговага мудазвона.

«Хіба фінал кагосьці зь іх мог быць іншым?» – і як бы самой сабе ў адказ Янка ўсьміхалася і вы-

цірала нож аб брудныя прасьціны. У танных гатэлях ніколі няма гарантыі, што ты першы сьпіш на гэтай бялізьне. На іх спакойна мог дагэтуль памерці і хтосьці яшчэ. Нічога страшнага! Наадварот, дзяўчына неяк падмяняла чаканьне свайго жахлівага канца актуальнымі думкамі пра надзённае. Неяк пераразьмяркоўвала ўвагу на прасьцейшыя рэчы.

Адно што, навокал было пуста. Ейныя вочы глядзелі долу, не жадаючы сутыкацца зь лішнімі позіркамі. Так усё атрымалася. Сапраўды, Янка больш ня бачыла сваёй будучыні. Часам хацелася крыкнуць што было моцы:

– Вось я! Тут! Гэта я яго забіла! Я! Рабіце са мною што хочаце, але я не вінаватая! Ніхто не вінаваты! Папросту мы ўсе так жывем. Мы прызвычаіліся жыць так, і гэта нашыя законы. Адмаўляцца ад іх ужо позна і ня мае сэнсу. Так ёсьць, і ніхто не зьбіраецца штосьці зьмяняць... Я тут! Выносьце свае прысуды і не пакідайце мне выбару! Зрэшты, так яно і мае быць. Ды так і ёсьць.

Але Янка маўчала. Інстынкт самазахаваньня ніхто не ліквідаваў, ды і наўрад ці хто здолеў бы выдраць гэтую заразу з карэньнем. У чарговы раз дзяўчына супакойвалася і глядзелася ў люстэрка, папраўляючы прычоску і шукаючы адказу.

Трэснуты твар. Пацёртая міміка. Троху нэрвовы позірк, а так – усё ў норме. Нічога не наводзіла на думку пра тое, што такая прыгажосьць можа зь бесклапотнаю ўсьмешкаю рэзаць шыі і са шкадаваньнем глядзець у згаслыя вочы. Людзі адмаўляюцца верыць у такую праўду, але яна чамусьці заўжды атрымліваецца праўдзівай. Яны ніколі не заўважалі гнільлё за яркай абгорткай. Людзі заўжды больш верылі добрай і якаснай рэкляме, чым сваім галодным і такім непрывабным прарокам.

Толькі вось Янка ніколі не была ні злой, ні цынічнай. Такой яе можна было рабіць, выляпляць яе, такую мяккую і гліняную, адвечна сырую чалавечую загатоўку. Толькі гэта ўсё было ня тым... ня тым. Яна гэта ведала. Ведала і ўсё больш хавалася.

Яна вельмі любіла такое надвор’е. Калі сонца не паліла і лёгкі ветрык варушыў маладую лістоту і разносіў па гарадках белыя пялёсткі кветак. Было ўжо цёпла, але яшчэ не сьпякотна. Дыхалася лёгка, і можна было атрымліваць простую натуральную асалоду ад магчымасьці быць тут.

...ці штосьці кшталту таго.

Чарговы ахайны парэз – і ёсьць грошы на ранішнюю каву, на чарговы квіток, на сьвежыя бананы і яблыкі.

(котка...котка...котка...котка...)

Тут днямі ў адной файнай кніжцы прачытаў і падумаў…

У сярэдзіне чатырнаццатага стагодзьдзя ў Рыме зьявіўся адзін натарыюс, які забаўляў сваімі прамовамі гарадзкую арыстакратыю. Тады ўся папская курыя знаходзілася ў Авіньёне і Рым мала чым адрозьніваўся ад звычайнага засранага сярэднявечнага гораду. Толькі хіба помнікі, але на гараджанаў яны ніяк не ўплывалі. Сярэднявечча не вылучалася вялікай духоўнай актыўнасьцю. Царква была адзінай праяваю нематэрыяльнага сьвету. Ды і яе, зрэшты, хапала для таго, каб задаволіць даволі невялікія патрэбы простых людзей. Хаця, па вялікім рахунку, на іх ніхто асабліва не зьвяртаў увагі. Толькі вось хіба што гэты зьявіўся. Любіў крычаць пра свабоду, пра карані Рымскай рэспублікі, пра народ. А людзі... заставаліся такімі, якімі яны былі заўжды. Маса ніколі сама па сабе не праяўляла актыўнасьці. Чалавечая гліна ёсьць паводле сваёй сутнасьці даволі інэртнай субстанцыяй. Пакуль пад сраку не дасі, варушыцца ня будзе.

Відаць, той натарыюс такім харызматычным быў. Усім падавалася, дурань дурнем, жартачкі ўсё, а ён зладзіў змову ды захапіў Капітолій. Кола ды Рыенца вырашыў вызваліць народ з-пад прыгнёту арыстакратыі, паноў-памешчыкаў. Ну і давай такім чынам людзям па вушох езьдзіць, маўляў, «На гуй! На гуй!..» Людзі павяліся. Ды і сам натарыюс, відаць, моцных

перакананьняў быў. У выніку яго абвясьцілі трыбунам і ўсклалі на яго ўсе свае надзеі. Той адразу давай секчы галовы, вешаць, у турмы запіхваць ці папросту штрафы сшыбаць. Ад імя народу, канечне, як жа па-іншаму? Ды і ня даў бы яму ніхто самому па сабе барагозіць. Канечне, спачатку яшчэ не такі нахабны быў, верыў у тое, што казаў. Рым сапраўды за некалькі месяцаў вельмі ўзьняўся, суседзі зайздросьцілі. А Кола ды Рыенца быў такім нармальным, свойскім дыктатарам. Усё, ляць, дзеля народу. Але, канечне, рана ці позна дах мусіла сарваць. Вядома ж – такое напружаньне і такія спакусы! Маліўся шмат, але не дапамагло. Вельмі хацеў ён славы і тытулаў і прызначаў іх сабе сам. Ніхто ня быў супраць. Звонку ўсё выглядала вельмі прыгожа: харугвы, рыцарскія латы, палымяныя прамовы; толькі мерыўся былы натарыюс усё вышэй і вышэй. Напэўна, думаў быў і царкве зь цягам часу пакінуць толькі духоўную ўладу, а там таксама дурных не было.

У выніку, пакуль трыбун рэзаў і вешаў ворагаў, прымаў новыя тытулы, выдаваў законы і ліў новую дэмакратыю людзям у вушы, у Авіньёне вырашылі з гэтым сканчаць. Выклікаў яго, значыцца, да сябе кардынал Бэртран і кажа: «Што ж гэта ты робіш? Як табе, сучынаму сыну ня сорамна?» Сказаў гэта кардынал, і, відаць, паглядзеў яшчэ так, бровы зьвёў. Ну тут натарыюсу, напэўна, сорамна нарэшце і стала. Адразу працьверазеў, расплакаўся, прызнаў віну, адмяніў усе дэкрэты, выракся ўсіх тытулаў і званьняў і зьбег, на гуй, у горы, хавацца. На гэтым, падаецца, усё і скончылася. А можа і не? Ва ўсялякім разе, далей капаць ужо ня мае сэнсу. Сутнасьць ня ў гэтым. А ў тым сутнасьць, што чувак вельмі любіў гнаць пра ўсялякае ўзраджэньне/адраджэньне. Кшталту back to the roots. А ў выніку...

У выніку нічога новага не адбылося. І гісторыя гэтая падаецца шараговай замалёўкай на тэму дбаньня пра лёс простых людзей, у сытуацыі падвышаных амбіцыяў. Чувак паўгоду меў неабмежаваную ўладу, а так анічога не зрабіў і ў выніку размазаўся пад

позіркам чарговага кіраўніка, як лайно пад абцасам. «Рамантызм», – скажуць на некалькі стагодзьдзяў пазьней якія-небудзь французы. А яшчэ пазьней людзі і проста прапусьцяць паўз вушы такую гісторыю. Толькі, хіба, калі хтосьці знарок будзе паварочваць іхныя галовы, што зь лёгкасьцю і даволі ненапружна было магчыма зрабіць у любыя часы. Можа быць, Кола ды Рыенца і меў добрыя намеры, можа, сапраўды хацеў дапамагчы падыхаючым з голаду, але ўсе жаданьні ў выніку сканчаюцца падобным чынам. Чалавек атрымаў, чалавек паставіў новыя мэты. Ён ніколі ня можа задаволіцца тым, што мае. Заўжды патрэбна штосьці яшчэ, чагосьці нестае. І небарака бяжыць, спрабуе дасягнуць чагосьці яшчэ не дасягнутага, непакоіцца, пакутуе, а ў выніку атрымлівае ня тое жыцьцё, якое хацеў. Пакрыўджаны, ён малюе сабе ворагаў, вінаватых, скрайніх і робіць новыя скачкі, новыя спробы дагнаць гэтую недасяжную лань, але ў выніку непазьбежна губляе сілы і падае тварам у бруд.

А бруду погуй. Ён спакойны. Толькі чалавек, напэўна, можа так самааддана змагацца з рэальнасьцю і імкнуцца пазбавіцца спакою, ірвацца да новых праблемаў і канфліктаў, не зьвяртаючы ўвагі на вечнасьць... такую ж недасяжную, як і заўжды. Толькі чалавек, толькі ён заўжды застаецца незадаволеным і зноўку як мага глыбей прагне акунуцца ў турботы і марную нібыта дзейнасьць. Схільны да дэстабілізацыі свайго існаваньня (і, адпаведна, ня толькі свайго), ён хоча, хоча ды зноўку хоча... сказаць усім, які ён, данесьці сябе да іншых жыхароў гэтай камуналкі, бо толькі ён адзіны ведае, як трэба і як слушна...

Я.я.яя.я.я.я.я.я.я.я.я..я.я.я.я.я.я…я.я...

Шэсьць мільярдаў...

Бегуноў...

Раней, калісьці даўно, стары нават нейкі час быў рыбаком, але ўжо ўсё забыў. Ды які зь яго тады быў рыбак, так, назва адна. Толькі мора ён сапраўды ша-

наваў. Заўжды любіў слухаць начамі музыку ветру і хваляў. Часам яны пяшчотна шапталі, напаўняючы ноч спакоем, а часам раўлі, бы дзікія падводныя зьвяры, пужалі дзяцей і прымушалі жанчынаў непакоіцца. Але Юзік любіў усе праявы мора... калісьці раней, відаць, яшчэ да вайны, ён пісаў зусім іншыя карціны, не такія, як цяпер. Там было куды болей пачуцьцяў, болей экспрэсіі. Нехта нават час ад часу іх набываў. Але цяпер стары нават не памятаў таго. Ды і не зважаў на адсутнасьць успамінаў увогуле. Ён ішоў па беразе і час ад часу глядзеў у неспакойную далячынь. Троху штарміла. Вочы старога жмурыліся ад ветру, але на твары была напісаная нейкая маўклівая бестурботная цеплыня. Нейкая ўпэўненасьць і задаволенасьць, якая бывае пасьля сканчэньня цяжкай працы.

Юзік ішоў. Заставалася ўжо няшмат, і ён быў спакойны. Зрэшты, стары заўжды быў спакойны, толькі цяпер па зморшчаным твары гуляла нейкае падабенства ўсьмешкі. Дзеці зь цікаўнасьцю глядзелі на старога. Камусьці магло падацца, што гэта нейкая дзіўная разнавіднасьць Дзеда Мароза, такі летні, абарваны варыянт. Дзеці рэдка зьвяртаюць увагу на вонкавасьць, то бок на тыя знадворныя парамэтры, да якіх настолькі ўважлівыя дарослыя. Дзеці куды больш любяць цуды, нават яшчэ верацъ у іх. А пазьней, канечне, яны пра іх забываюць. Ня тое што перастаюць верыць, а папросту забываюць. Выкідаюць прэч з галавы, а на іх месца ставяць розныя гіерархічныя схемы. Яны больш дарэчы, чым нейкае там незразумелае, невыразнае...

Юзік зайшоў у чарговы горад і адразу зразумеў, што гэты будзе апошнім на ягоным шляху. Тут было зашмат курортаў, і ён патрапіў на адзін зь іх. Людзі пакрысе рыхтаваліся да сэзону, ладзілі тэнты ў кавярнях. Часам дзесьці чуўся грукат малаткоў і гудзеньне сьвердлаў. Агулам усё гэта выглядала даволі спакойна і разважана. Запыленыя дзеці сядзелі на бардзюрах і ладзілі свае дзіцячыя гульні, з вокнаў невысокіх будынкаў пазіралі жанчыны, аднекуль чула-

ся музыка. Радыёстанцыі. Час рухаўся неяк запаволена, быццам абрыкосавы сыроп пераліваді з аднаго слоіка ў іншы. Пах мора зьмешваўся з пахам апошніх кветак. Для поўнай турыстычнай ідыліі неставала толькі сонца, але небасхіл быў шчыльна зацягнуты хмарамі. Апошнім часам усталявалася нейкае незразумелае надвор'е. Раз-пораз праліваўся дробны дожджык, але пасьля яго аблокі так і заставаліся на небе. Часам цёмныя, часам сьветлыя, быццам ватны дах, яны пакрывалі ўсё ўзьбярэжжа. Усё патанала ў гэтай ваце... і ў моры, усе гукі і позіркі, ды Юзік ўжо і не зважаў на іх. Апошняя сувязь зь людзьмі патроху адмірала. Назаўжды раствараласяў космасе.

Шырока раскрытыя вочы вокнаў. Назіраюць за ўсім, што робіцца навокал. Толькі назіраюць. Маўчаць. Казаць ня ўмеюць.

Стары папраўляў сваю чырвоную кепку і мінаў апошнія жылыя домікі гарадка. Маленькі хлопчык стаяў каля драўлянага плоту і праводзіў позіркам дзіўнага чалавека. Толькі чалавек быў насамрэч звычайны. Чалавек як чалавек. Юзік пройдзе яшчэ некалькі кілямэтраў па каменным пляжы і спыніцца ў адной з бухтаў. Стары даўно ўсё гэта ведаў. І ўсе размовы пра нявызначаны лёс падаліся б яму троху сьмешнымі. Нават ня сьмешнымі, а незразумелымі. Каб сьмяяцца, трэба сутыкацца зь людзьмі, а ён апошнім часам зьвяртаў на іх усё менш і менш увагі. Наўрад ці хто быў цяпер здольны патурбаваць яго – хіба што, канечне, фізычна, і тое гэта ня мела б адпаведнага ўзьдзеяньня. Было такое адчуваньне, што стары ня спыніцца нават тады, калі ў яго пачнуць паліць з кулямётаў, нават калі скінуць на яго бомбу.

Хіба можа чагосьці баяцца той, хто ведае, што сам – усё сутнае? Сам – усе яго праявы.

Сьцежка вяла на поўнач. Яна бегла між вялізных камянёў, аскепкаў старых скалаў, гублялася ў жвіры пляжаў, пакідаючы людзей дзесьці далёка ззаду. У выніку, яна ўжо пераставала быць сьцежкаю. Далей зрэдку хто заходзіў: навошта гэтак аддаляцца ад цывілізацыі? Тут паўсюль была зямля ветру і

камянёў, цмокаў, крабаў і марской пены. Людзі ня мелі неабходнасьці заходзіць так далёка дый, шчыра кажучы, пабойваліся. Ня кожны мог вытрымаць гэтую пустую паласу памежжа вады, зямлі і нябёсаў. Мала хто нармальна сябе адчуваў пад вэртыкальнымі позіркамі скалаў... дый шмат чаго яшчэ. Канечне, чалавек у казкі ня верыць, але ўсё ж ткі баіцца сутыкацца зь невытлумачальным.

Юзік рухаўся. Юзік нёс паўсьвету ў сваім пацёртым заплечніку.

Каменьчыкі рыпелі пад падэшвамі... усьміхаліся. Напэўна, усё так і было.

Трэці сядзеў на вялізным камені падабраўшы пад сябе ногі.

Хвалі аб няроўную паверхню біліся.

Чуліся крыкі...

...птушыныя...

Чалавечыя крыкі маўчалі, як індзейскія партызаны.

бббббббббббббббббббббббббббббббббббббббббб бббббббббббббббббббббббб

Ён нічога ня ведаў. Нават не разумеў, што тут робіць. Вада пад нагамі супакоілася, але чамусьці падавалася, што гэта ненадоўга. Дзесьці на захадзе над морам час ад часу зьяўляліся цяжкія хмары. Пахла штормам. Неўзабаве ўсё мусіла распачацца. Што ўвогуле ёсьць чалавек, які твар да твару сутыкаецца са стыхіяй? Настолькі невымерная розьніца. Нават такая, падавалася б, драбніца, як нязначны шторм, хваляваньне вады можа пазбавіць людзей жыцьцяў. І гэта ніяк не адаб’ецца на ўсясьветным парадку, нічога ня зьменіць. Дзеці па-ранейшаму будуць нараджацца, а старыя паміраць. (Дзеці паміраць, а старыя нараджацца.) Трэці сядзеў і ня думаў. Дакладней, спрабаваў ня думаць, і з кожным днём у яго атрымлівалася ўсё лепей. Ён адчуваў, як пад вадою варушыць плаўнікамі рыба, як пад камянямі хаваюцца патурбаваныя прылівам крабы. Усё

гэта было настолькі блізка ад яго, куды бліжэй, чым калі-небудзь дагэтуль. Нічога не здаралася навокал такога, што не было б яму цяпер... нават не зразумелым, разумець – ня тое слова. Трэці ведаў усё гэта і адчуваў нейкую роднасьць да гэтых скалаў, да вады, да ветру. Да рэштак чалавечага.

Тоеснасьць.

Джыны на даляглядзе нават калі і былі калісьці джынамі, дык ужо перасталі імі быць. Трэці так і не даведаўся, чаго яны хацелі. Ды ў кожным разе, яны ўжо пакінулі гэтую мясцовасьць. Відаць, былі ў іх тут нейкія справы, бо іначай сюды ніхто не завітвае. Але хлопец ведаў, што гэта выключна ягоныя меркаваньні, меркаваньні чалавека, а для джына, можа, тут ёсьць якая цікавасьць. Толькі было так да канца і незразумела, ці было ўсё тое адно гульнёй розуму, наступствам абвостранага ўспрыняцьця прасторы, ці... насамрэч.

«Як, цікава, плаваюць думкі? Дакладна ведаеш, што ўсё ў гэтым сьвеце натуральна. Нічога звыш няма. Толькі вось розум усё чапляецца за мінулыя глупствы, за рэшткі пустых перакананьняў, стэрыятыпнасьць. І зноўку вяртаесься назад, адкідваючы ўсё гэтае шалупіньне, вяртаесься да адзінства...

Адзінства?!! – Пагуінства!!!»

Першаму патроху лягчэла. Відаць, яшчэ крыху і яны рушаць. Калі здолеюць, канечне. Калі стане сілаў у целах. Ежы ўжо лічы што не было... засталося крыху вады... Невядома, што ў выніку атрымаецца, але трэці ўжо не асабліва надаваў гэтаму значэньня. Так, цікава, ня болей. Ён быў папросту спакойны. Не любіў панікаваць і скакаць высока-высока ў безвыніковых спробах дасягнуць небасхілу. Хтосьці быў схільны ўсё ўзважваць, раскладаць па паліцах, казаць і ведаць, хтосьці шукаў у этэры крыкі пеўня і рана ці позна, канечне, мусіў знайсьці (куды ж падзецца, калі розум робіць такія выкрутасы – значыцца, штосьці, сапраўды, мусіць быць). А трэці наогул амаль што пазбавіўся сваіх уласьцівасьцяў, ды і сорамна было цяпер за штосьці чапляцца. Калі ка-

нец вядомы дакладна, дык навошта рабіць выгляд, што сюжэт можна перайначыць, навошта спрабаваць яго адцягнуць. Усё будзе толькі так, як мусіць быць, і калі штосьці адбываецца, значыцца, так і трэба. Ак’юізм, ё тваю.

...ізм...ізм...ізм...

Хлопец дастаў пачак феадасійскага беламору. Калісьці раней было вельмі сьмешна курыць гэтыя папяроскі. Ды і цяпер сьмешна... курыць папяроскі...

Ом, адным словам. Дурацкая звычка.

Ці то падалося, ці вецер сапраўды стаў ветрам. Стаў моцным і дужым. Як вецер.

Другі глядзеў на ўсе вочы. Другі слухаў на ўсе вушы. Хацеў пеўня. Ён увесь час сядзеў над хворым першым і маліўся. Пераканаены ў тым, што Бог пачуе ягоныя просьбы, ён ціха, пяшчотным голасам супакойваў хворага:

– Нічога. Нічога. Хутка табе будзе лепей, – вусны ўсьміхаліся, але першаму чамусьці так карцела ўя...аць сукінаму сыну, павыносіць яму цуглі. Толькі небарака нічога ня мог зрабіць.

Ён быў агуенна супраць усіх гэтых ёпнутых сатанінскіх рытуалаў над ягоным бездапаможным (бедным! нікому не патрэбным!!!) целам. Але рукі ня слухаліся яго, голас ня меў моцы. Першае, што ён скажа, калі раптам зможа гэта зрабіць... Але сам адчуваў, што зможа, анікуды не падзенецца, сілы паціху, амаль што незаўважна вярталіся ў арганізм. Ва ўсялякім выпадку, ён ужо разумеў, што робіцца навокал, куды лепш чым раней... Дык вось, першае, што першы скажа... будзе:

– Ды, ляць, ад’япіся ты, ляць, мудзіла!!! Зьяпаў на гуй, курва!!!

Так і будзе. Вось толькі троху ачуняе.

Ён так і зрабіў. Самае цікавае, што чакаць давялося ня доўга.

Трэці загасіў недапалак аб камень і пачуў раздражнёнае мацюканьне. Хлопец усьміхнуўся. І сапраўды было чаму.

Толькі другі не пакрыўдзіўся, ён ведаў пра прарокаў вельмі шмат. Усё, што было яму неабходна. Юнак па-ранейшаму хацеў пеўня. Але, відаць, было яшчэ рана.

Хлопцы дапамаглі першаму падняцца. Ён, падавалася, супакоіўся, дый ня дзіўна, цела яшчэ было не настолькі моцным. Патрошку яны ўсё ж рушылі наперад. Спачатку даводзілася падтрымліваць таварыша, дапамагаць яму перабірацца праз вялізныя валуны, часта спыняцца, але неўзабаве першы зноўку прыйшоў у форму і крочыў наперад нараўне з усімі. Невядома чаму, але настрой быў нейкі вясёлы. У самы бліжэйшы час усё мусіла вырашыцца, апошні хлеб яны зьелі перад тым, як пайсьці, і было зразумела, што калі за чарговай скалою раптам ня зьявіцца вялізны плюшавы мішка з вышытаю ўсьмешкаю і выратаваньнем, то ім застанецца нядоўга.

Навокал не было ні джынаў, ні пеўняў, ні сівых шаманаў бамжаватага выгляду.

Нікога.

Мішка?..

Пабла зьлез са сваёй верхняй паліцы і сеў насупраць мужчыны. Яшчэ не канчаткова прачнуўся. Хацелася памыць заспаны твар, папіць вады. Незнаёмец на імгненьне адарваўся ад газэты і зірнуў на хлопца. Пабла не заўважыў. Ён узьняўся, і, хістаючыся, адчыніў дзьверы і прайшоў у прыбіральню... ранак як ранак, нічога такога. За вакном яшчэ адзін сьляпы дзень. Чамусьці прысутнічала такое адчуваньне, нібыта зараз яны пацягнуцца адзін за адным. Дні без аніводнага промня сонца.

Ты, Пабліта, напэўна, трылераў усялякіх у дзяцінстве пераглядзеў. Псыхалягічных...

Можа і так. Тут і цяпер гэта ўжо ня мела ніякага значэньня. Малады чалавек пад назваю Пабла стаяў у прыбіральні цягніка і глядзеў на сябе з дапамогай бруднага люстра. Ён даўно «сфармаваўся як асоба» і наракаць на выхаваньне ці на няўдалае дзяцінства

было ўжо троху запозна. Ён бачыў вынік. Можа, гэта быў і ня лепшы варыянт, але даводзілася задавальняцца тым, што маеш.

У выніку, Пабла вымыў твар і вярнуўся ў вагон. Сусед па-ранейшаму чытаў газэту. Штосьці з таннай бульваршчыны, што носяць па вагонах вусатыя мужчыны пад пяцьдзясят. Штосьці з гучнымі загалоўкамі і афігеннымі фантастычнымі артыкуламі, што мусяць выклікаць невыразныя эмоцыі. Ад чалавека пахла недарагім адэкалёнам і цыбуляй. Рупліва прычасаныя валасы з пакуль што ледзьве заўважнай залысінай. Белая кашуля, барвовы гальштук, шэры сьпінжак. Мэханічны наручны гадзіньнік на бранзалетцы «пад срэбра». Тыповы прадстаўнік тыповых прадстаўнікоў.

– Юры Аляксеевіч, – чалавек згарнуў газэту і паклаў на столік. Ягоныя добрыя вочы глядзелі суха і спакойна. Падобныя да вачэй пэрсанажаў даваенных плякатаў, яны былі мужнымі і адначасова пяшчотнымі. І гэта нават не абмяркоўвалася, таму што інакш і быць не магло.

– Павал... – троху зьбянтэжана прадставіўся юнак. Незнаёмец пачаў размову неяк нечакана. З пустога месца.

– Можа, Вы будзеце зьдзіўлены, але я ведаю, хто Вы.

«Сукі, ляць! Здалі! Ведаў жа, што ніколі нельга верыць тарчкам... Ну і што цяпер? Толькі вырваўся, і на табе, дагналі, гандоны!» – Пабліта ня ведаў, што ён можа зараз зрабіць. Ды, напэўна, нічога. Толькі вось сон адразу пакінуў галаву. Колеры сталі ярчэйшымі, а абрысы больш дакладнымі.

– Ня трэба так хваляваццa. Рана рабіць нейкія высновы, – незнаёмец трымаўся спакойна і ўпэўнена. Непакоіцца яму не выпадала. Можа, ён тут быў і не адзін, але нават калі адзін, дык куды хлопец зьбяжыць? Хіба што саскочыць зь цягніка. Але... – Можа, гарбаты пап'ем?

– Ня супраць.

Юры Аляксеевіч вычапіў правадніцу, што бегла міма, і замовіў дзьве зялёныя з цукрам. Пры гэ-

тым паглядзеў на Паблу, нібы пытаючы, ці не памыляецца, але было заўважна, што сам выдатна ведаў ягоны густ.

– Насамрэч у мяне да Вас няшмат пытаньняў, – адпрацаваным рухам службоўца чалавек дастаў з-пад століка невялічкі партфэль, расшпіліў і праз сэкунду на стале зьявілася ахайная плястыкавая тэчка. – Калі быць дакладным, толькі адно. Але ад таго, наколькі шчыра і разгорнута Вы на яго адкажаце, залежыць Вашая будучыня.

Пабла ведаў гэтыя рэплікі на памяць. Натуральна, не аднойчы сутыкаўся з падобнымі тыпажамі. І ўсе яны хацелі толькі аднаго: шляхам найменшых цяжкасьцяў атрымаць патрэбную інфармацыю, ад якой залежаў іхны заробак, і па магчымасьці раней вярнуцца дамоў да жонкі зь вячэрай і да тэлевізіі. Яны заўжды паўтаралі, што гэта папросту такая праца. Але так яно і было... усё ўжо было.

Толькі ў гэтым выпадку сытуацыя выглядала неяк інакш. Чаму ў цягніку? Ды і ўвогуле спачатку, паводле ўсіх законаў жанру, мусіла адбыцца затрыманьне... Але, зрэшты, якая на гуй, Паблу розьніца? Усё, што ён меў, засталося дзесьці далёка, за сотнямі кілямэтраў рэек. Засталося патанаць у сваім брудзе, варыцца ва ўласным лайне. Так і было. І чаму б у гэты раз і не?

Над шклянкамі танчыла пара, а сьпінжак, між тым, пачынаў сваю прылюдыю. Пабла піў гарбату і рабіў выгляд, што ўважліва яго слухае. Раптам хлопец дапёр, што службовец усё разумее. Што ён таксама ведае ўсе гэтыя позіркі і папросту па інэрцыі пасьлядоўна выконвае свой рытуал... Вэрбальныя гульні дарослых.

Толькі вось пытаньне, як высьветлілася, зусім не датычылася Пабліты і ягоных карышкоў-барыгаў. Нечакана апынулася так, што размова ішла ўвогуле не пра скуп-продаж і бартэрныя апэрацыі з усялякімі рэчывамі, якія нейкім чынам патрапілі ў сьпісы недазволеных для ўжываньня чалавекам. Пытаньне было настолькі нечаканым, што спачатку ўвогуле

падалося Паблу поўным абсурдам. Ён не адразу зразумеў, пра што яго пытаюць, і толькі калі адказны сьпінжак патлумачыў больш падрабязна, азначыў усе дэталі, якія неяк было выпалі з галавы, толькі тады хлопец пазнаў яе на фатаздымку, ці то дзяўчынку, ці то галюцынацыю...

Памяць спрацавала хутка. Адносна хутка.

Шэсьць мужчынаў у капелюшох павярнулі галовы.

Невялічкае пытаньне...

Паўза. Адзін з прыёмаў якаснай галівудзкай камэдыі. Усе сьмяюцца, ці – як у дадзеным выпадку – папросту вымаўляецца слова «раптам».

Насамрэч мужчыны не адразу зразумелі, што да чаго. Іх дзеяньні былі хутчэй аўтаматычнымі, чым абдуманымі. Нейкая рэакцыя на нейкія энэргетычныя ўспышкі. Бляклае выпраменьваньне. Менавіта тут нейкая частка кожнага з шасьці нарэшце атрымала хоць нейкі цьмяны спакой. Дзесьці глыбока-глыбока ў кожным з шасьці мужчынаў яшчэ заставаўся спадзеў. І нарэшце. Адно што, астатнія эмоцыі не маглі ўвасобіцца ў адпаведную рэакцыю.

Бог нарэшце зьявіўся.

Адзін за адным шэсьць мужчынаў у капелюшох уздымаліся з-за пластыкавага століка. Яны гасілі недапалкі, не адводзячы вачэй ад постаці, што простаю, упэўненаю хадою рушыла кудысьці на поўнач. Шэсьць мужчынаў насоўвалі капелюшы на галовы. Яны не дапівалі гарбату, можа быць, першы раз за ўвесь гэты час. Відаць, рытуалы зьмяняліся. Прастора зрабілася гусьцейшай. Сэкундная стрэлка паўзла ледзьве заўважна. Яшчэ крыху, і ўсё спыніцца. Чыйсьці палец націсьне на паўзу, і фатаздымак застанецца назаўжды ў архіўных тэчках. Хаатычныя бязладныя думкі ў шасьці галовах, аніводнай усьмешкі. Скрайняя напружанасьць і хваляваньне. Шэсьць мужчынаў крочылі вельмі асьцярожна, быццам баяліся напалохаць Яго.

Незаўважнымі зрабіліся пабудовы і дрэвы. Мора і неба былі толькі матэрыяй, што быццам бы нават і ня ўдзельнічала ў гэтай сытуацыі. Адным словам, усе вэктары перакрыжоўваліся на чалавеку ў бруднай чырвонай кепцы. Ва ўсялякім выпадку, так бачылі рэальнасьць дванаццаць вачэй. Так яе ўспрымалі дванаццаць паўшар'яў. Менавіта такім чынам імкнуліся за гэтым чалавекам дванаццаць ног... але трымаліся на нейкай адлегласьці, бо сапраўды баяліся разбурыць няўстойлівую вобразна-эмацыйную канструкцыю, разьвеяць міраж, парваць карцінку.

Закінутыя палаткі і кавярні, сьцежкі, якія пасьпелі падзарасьці маладою травою, спужаныя коткі, што вялізнымі круглымі вачыма ўважліва сачылі за ўжо забытымі дзьвюхногімі істотамі – усё ня мела сэнсу, усё было дзесьці па-за межамі. Па-за межамі актуальнасьці, ва ўсялякім разе... увагі.

Не было. Нічога не было ніколі.

Чалавек нёс свой заплечнік і не азіраўся. Міма праплывалі будынкі, ліхтарныя слупы, абвешаныя плякатамі і напісанымі ад рукі абвесткамі, пустыя завулкі, сьветлыя або ў цені дрэваў, што ўжо распусьцілі лёгкае сьветла-зялёнае лісьце. Усё гэта было дзесьці па-за. Шэсьць мужчынаў у капелюшох ішлі за нечым жывым і падобным да іх... і настолькі звышнатуральным адначасова. Чамусьці не было аніякага сумневу ў тым, што гэта менавіта Ён быў уладальнікам таго голасу, які праразаў ноч і прынасіў неспакой у стомленыя галовы. Магчыма, каб сумнявацца ў гэтым, была патрэбная сіла, тая сіла, што дазволіла б крытычна паставіцца да матэрыяльнай абалонкі, да антрапаморфнай зьнешнасьці, такой блізкай мужчынам. Але сілаў не было. Ніхто ня быў у стане нават думаць пра тое, што можа быць, а чаго ня можа. Розум празьмерна перагрэўся, і дзіўна, што яшчэ не параваў. Ніхто ня меў права сумнявацца. Калі б ня рух, такога разумніка без размоваў разарвалі б на шматкі адразу на месцы. Голымі рукамі, перагрызьлі б зубамі шыю.

Шэсьць мужчынаў рабілі асьцярожныя крокі. Чалавек ішоў упэўнена і ледзьве не аўтаматычна. Яны пакінулі горад. Стары чалавек у чырвонай кепцы быў спакойным і непахісным, ён рухаўся між камянямі і цягнуў усясьвет за сабою. У паветры вісела адчуваньне хуткай разьвязкі, але, відаць, фінал зацягваўся. Вынікі нібы адкладаліся, як абвяшчэньне слушнага адказу на прайм-таймавым ток-шоў.

Вось гаўно.

Гуй ведае, хто яны такія насамрэч, тыя барадатыя рабяты ў капелюшох. Звонку нагадваюць маладых фэрмэраў адкульсьці з поўдня. Але гэты час не прадугледжвае Каліфорніі. Тут няма такіх тапонімаў. Ёсьць камяні, мора і неба. Шэсьць мужчынаў хваляваліся і вельмі хацелі курыць. Яны булькаталі, бы рондалі на вагні. Густое паветра і нізкія хмары. Людзям неставала кіслароду, і яны дохлі як рыбы. Людзям неставала паветра, і таму ім здавалася, што з рыбамі, выкінутымі на бераг, яны маюць пэўнае падабенства. Магчыма, з дэльфінамі...

Дэльфіны – ня рыбы.

Каньяк ці соевы соўс? Што больш пасуе гэтаму паветру. Што больш да твару гэтым хмарам, якія ўжо некалькі дзён гатовыя заліць вадою вогнішчы ўсіх самаўпэўненых турыстаў і пілігрымаў?

У паветры адчувалася чаканьне. Камяні чакалі дажджу. Сонца даўно схавалася і нявызначанасьць дзейнічала на нэрвы.

Каму, ляць, на нэрвы, камяням, ці каму?!

Разьбітае цела калісьці называлася Пал Палычам. Яно, зрэшты, і цяпер яшчэ адгукалася на гэтыя гукі, але ніякай нагрузкі імёны больш ня мелі. Хіба хто думае, што можна быць апантаным засранцам, патрапіўўшы, хай нават аднойчы, у гэтую сраную чалавечую сытуацыю? Ніколі ў жыцьці. Нельга перажываць чарговыя экзыстэнцыі, калі ты сам адна бясконцая экзыстэнцыя, калі ты сам жыцьцё, яго

паўнавартасная праява. Нічым ня горшая за сабаку ці гандлярку садавінаю з латка каля гастраному, такая ж прыгожая, як яміна ў старым асфальце, як новенькі радыёпрымач ці ўсьмешка непрыгожага дзіцяці-інваліда. Наадварот? Хай нават наадварот, толькі нічога ня зьменіцца. Слова – толькі слова. Калі глядзіш у гэтую драную вечнасьць, то ня мае сэнсу, колькі алькаголю ў сябе ўліць. Колькі разоў падміргнуць сонцу...

Але, зрэшты, і яно схавалася. На неба ў чарговы раз нечакана набеглі хмары. Пал Палыч вырашыў, што ім даўно ўжо прысьпеў час. «Што гэта ўсё сонца ды сонца?» Мужчына думаў, але атрымлівалася даволі млява. Думкі блыталіся, успаміны гулялі ў хованкі. Эмоцыі?.. Гэты каталёг ізноўку пусты.

Ён быў падобны да падбітага з рагаткі анёла, толькі пасьля падзеньня яго яшчэ і пакатавалі ў палоне. Шмат тысяч гадоў. Пал Палыч дакурваў другую цыгарэту і спакойна назіраў за аблокамі, што насоўваліся на небасхіл. Ніякіх прыярытэтаў. Зьмена надвор'я, што насамрэч нічога асабліва не зьмяняе. Але чалавек ужо пасьпеў забыць, што прынята называць дэпрэсіяй, ён забыў нават як гэта. Адпаведна, Пал Палыч папросту сядзеў і дакурваў цыгарэту. Я...анае цела, змагар з хімічнымі зьяднаньнямі; розум чамусьці на дзіва ясны – як ніколі за апошнія некалькі месяцаў.

Усё па сваіх месцах, Пал Палыч. Усё засталося ў мінулым. Больш няма пра што непакоіцца. Адсюль усё ўжо позна. Адсюль адзіны толькі спакой.

Адсюль і да самае сьмерці. Ёсьць час займацца ўсялякаю лухтою. Можна рабіць што заўгодна, бо аніякай адказнасьці перад сабою ты больш не нясеш. Прабач, але так атрымалася, што лепшыя імгненьні ўсяго чалавечага ты ўжо, напэўна, прагэтасаміў. Прасьцей кажучы, прасраў усё, што мог.

Можа, так і лепей. Папросту супакойся, разваліся на сваёй канапе, не вядзіся на пытаньні. Ты ўжо скончыў усе свае справы і больш ня можаш адказваць ні за сваё цела, ні за розум. Калі раптам каму

што ад гэтых двух чыньнікаў будзе патрэбна, самі возьмуць. Расслабся. Гуляй у свае гульні, ніхто іх не зразумее. Падаецца, час яшчэ ёсьць. Замінаць табе асабліва ніхто ня будзе. Толькі ня думай, і тым больш ня ўзгадвай пра тое, што калісьці быў паўнавартасным чалавекам зь перажываньнямі і звычкамі, з нэрвамі і пачуцьцямі. Падобныя жахі табе больш не пагражаюць.

Кожны сам вырашае, што яму рабіць і да чаго ён мусіць імкнуцца. Можа, трохі зарана ты ўсё гэта разьведаў, але ў любым выпадку... ужо позна.

Чалавек памёр, засталіся толькі часткі космасу, навучаныя сапіентным кадзіроўкам.

Бывай здаровы, Пал Палыч.

Чалавек не перапытваў, у якім сэнсе здаровы. Ён не задаваў больш пытаньняў. Ён і так ужо ведаў зашмат.

Пал Палыч памятаў гэтыя кшталту сур’ёзныя моманты. Натуральна, ён прапусьціў усё, што мог, але шкадаваць больш не хацелася. Крыўда на самога сябе распаўзалася па целе. Яна была з тых тупых і безнадзейных, што ня так часта, але ўсё ж ткі ўгрызаюцца ў розум. У такой крыўды халодныя, максымальна невыразныя вочы, вочы касіркі ў вашай краме. Абыякавыя і бессэнсоўныя. Пустыя. Пал Палыч выдатна ведаў: усё, што ён цяпер адчувае, – толькі тупыя бездапаможныя флэшбэкі, і толькі цела іх уладар; з розумам жа ўсё, падаецца, яшчэ больш-менш. Толькі менавіта з тым чыстым, пазбаўленым гэтай біялягічнай інтэрвэнцыі. Колькі ж можа быць навалена сьмецьця ў чалавечай галаве! Яно захоўваецца тут гадамі і гніе, гніе... а чалавек ня ўмее глядзець унутар, ці, ва ўсялякім выпадку, спадзяецца, што ня ўмее. Чалавек ідзе па вуліцы, глядзіць на рэклямныя плякаты, бяжыць за тралейбусам, бяжыць...

Бяжыць... Гэта ён умее...

Пал Палыч усё гэта выдатна разумеў.

«Час з гэтым скончаць», – думаў ён і зноўку спрабаваў адагнаць гэтую думку, бы муху, што пазбаўляе спакою падчас сіесты. Але на небасхіл выпаўзалі

хмары. Якім бы хуткім ні падаваўся іх рух, да абеду было яшчэ далёка. Ды і ня тая гэта зямля, каб практыкаваць падобныя завядзёнкі.

Бяжы, Пал Палыч...

І Пал Палыч бег. Кожны сам сабе бег.

Чалавек падняў сваё цела і ў чарговы раз вырашыў, што прысьпеў час сканчаць. Але ці не былі гэта толькі думкі, што прыходзяць пры адпаведным настроі? Але, так і было. Так было заўжды.

Пазьней Пал Палыч і праўда шмат ужо не напружваўся. Нейкім чынам, млява перабіраючы нагамі, ён дайшоў дадому. Дом быў пусты. Няўжо яго не чакалі? Ды не, напэўна, чакалі, толькі зрабілі на пэўны час перапынак, бо трэба ж і справамі калісьці займацца. Да таго ж гэты дом быў звыклы да бздураў гаспадара, таму ніхто асабліва не надаў увагі ягонаму зьнікненьню. Толькі крышку хвалюваньняў. Досыць сьціпла.

«Прывесьці сябе да ладу, і можна прачынацца».

Валік моцна напіўся. Утупую залівае хваляваньне сінькаю. Знаёмы, даволі распаўсюджаны мэтад. Надзейны. Валік ведаў і піў, і глядзеў тэлевізар. Там кшталту было шмат усяго цікавага. Ва ўсялякім разе, штосьці адцягвала ўвагу ад жанчыны, якая так не хацела быць такой, якой было патрэбна яму. І Валік пакутаваў ды піў. Залітыя мазгі расьцякліся па канапе і неўзабаве малады чалавек вырубіўся. Усё ж ткі дасягнуў мэты, хіба на пэўны, няхай і ня надта вялікі прамежак часу пазбавіўся параноі і злосьці, што вострым нажом падступала аднекуль з дыяфрагмы. Але алькаголь і тэленавіны выдатна рабілі сваю справу. Увага паступова расьсейвалася, галоўнае было ў самы адказны момант не нарабіць глупстваў, ня выбегчы за дзьверы, агалошваючы сонныя ціхія вуліцы крыкамі.

...Не, толькі ня гэта. Такія тэмы – апошнія прыколы, якімі можна заняцца. Толькі для гэтага трэба

канчаткова ператварыцца ў сьвіньню. Звычайную чалавекападобную сьвіньню, эмацыйную ды ілжывую.

Не, ня ў гэты раз.

З Валікам такога сёньня ня здарыцца. Ён шмат нарабіў падобнай лухты і, па шчырасьці, стаміўся ад усіх гэтых камэдыяў. Толькі агонь яшчэ гарэў, і маладому духу было цесна ў гэтым целе. Можа быць, гэта быў першы раз, калі хлопец вырашыў абмежаваць сваю тупую рашучасьць, засунуць сваю эмацыйнасьць у сраку і папросту вырубіцца. Як высьветлілася троху пазьней, у гэтым, сапраўды, не было нічога звышскладанага. Насамрэч Валік быў не такім маладзенькім і дурненькім, якім яна любіла яго ўспрымаць. Ён быў іншым. Ды і Янка была зусім іншаю, не такою, якой яна была патрэбна Валіку, якой ён хацеў яе бачыць. Але ўсё ж хацеў і бачыў і вельмі злаваўся, калі штосьці не адпавядала ягоным уяўленьням, калі штосьці ішло ня так, як мусіла ісьці. Зь цягам часу яны знаходзілі нейкі кансэнсус, і сваркі сканчаліся перамір’ем. Параненыя, пабітыя, яны ў выніку больш ня мелі сілаў крычаць і нэрвавацца. Спустошаныя людзі хацелі спакою і былі гатовыя падпісацца пад чым заўгодна, толькі б скончыўся ўвесь гэты жах. І ўсё сканчалася, на пэўны час сапраўды рабілася лягчэй, на твары вярталіся ўсьмешкі і ўсё наладжвалася. Але толькі для таго, каб рана ці позна шалі ізноўку хіснуліся ў які-небудзь бок.

Калі чалавек ганарыцца сваёй здольнасьцю да кампрамісаў, часам гэта падаецца дзіўным. Даводзіцца прызнаць, што здольнасьць да кампрамісаў ня што іншае, як здольнасьць упэўніваць сябе ў тым, што твае жаданьні ніякай вагі ня маюць, а пра сябе, дзесьці глыбока, мацюкацца і рваць сьвежую адпрасаваную кашулю. Толькі ціха, хаваючыся, каб было незаўважна, нацягваць на твар хрысьціянскую ўсьмешку, спрабаваць упэўніць сябе ў тым, што ты гаўно, спрабаваць падмануць агуеўшае ego, што зь непаразуменьнем глядзіць на ўсе гэтыя выкрутасы рацыяналістычнага мозгу:

«Ты шо гоніш?!» – ну ці штосьці кшталту таго.

Самападан, адным словам. А так, усе ўсё бачаць і ўсе ўсё разумеюць. Нічога незвычайнага ў гэтых гульнях. Тое, што чалавек з такім патасам называе каханьнем – насамрэч даволі прымітыўная матывацыя біялягічнай задачы. Такая своеасаблівая кадзіроўка для розуму, неспакойнага і адвечна незадаволенага прымітыўнасьцю рэальнасьці, апантанага тысячамі перакананьняў – празьмерна ўпэўненага чыньніка чалавечага арганізму. Вясельны танец галубоў у параўнаньні з падобнай лухтою выглядае куды больш шчыра і непасрэдна. Там наёпкі дакладна няма.

Канечне, у выніку Валік усё ж ткі здолеў узьняцца. Мяккі фатэль паступова зрабіўся невыносным, праз тканіну праступілі вуглы каркасу. Можа, папросту не сядзелася. Тэлевізар працаваў і распавядаў усялякія сьмешныя гісторыі пра цікавыя падзеі... цікавыя... цікавыя... Відаць, чалавек троху прыснуў, але рана ці позна мусіла наступіць смага і ў чарговы раз расставіць рэчы па сваіх месцах. Валік стаяў ля вакна і назіраў за вуліцаю. Ужо без асаблівага энтузіязму. Нэрвовая сыстэма зноўку наладжвала сваю працу, і ў галаву прыходзіла лёгіка і ўсялякая падобная фігня.

«Чамусьці падаецца, што яна ня прыйдзе», – юнак сумна усьміхнуўся, узгадаліся самотныя мужчыны галівудзкіх мэлядрамаў або пакінутыя жанчыны, што нэрвова курылі ля вакна. Сапраўды сьмешна, але Валік не нэрваваўся асабліва. Усё было відавочна і зусім ня прыкра. Але ўсё вядома ад самага пачатку. Троху ненармальная дзяўчына захапляла, аднак адразу было зразумела, што яе не атрымаецца пераканаць у нейкай неабходнасьці... Жыць... Рабіць... Быць такой, якой хоча яе бачыць ён...

Лухта.

Валік сумна ўсьміхаўся сабе і навакольлю, такому ж няўпэўненаму і бязвольнаму. Дзесьці на гарызонце ўспыхвалі маланкі, відаць, пойдзе дождж. Так, зямлі сапраўды патрэбны добры якасны дождж. На дне пляшкі самотна варушыўся апошні глыточак алькаголю.

Час з усім гэтым сканчаць.

– Як Вы сябе пачуваеце? – натуральная, сапраўды шчырая цікаўнасьць. Чамусьці стварылася такое адчуваньне, што чалавек ня толькі выконвае свой прафэсійны абавязак.

– Нармалёва, дзякуй. Сёньня куды лепш, – Янка глядзела проста ў твар маладога доктара. Яна сапраўды хацела быць адкрытай і патрэбнай. Толькі доктар штосьці запісваў у сваім нататніку і разьвітваўся, пакідаючы дзяўчыну пад наглядам дужых, не па-жаночы складзеных санітарак. Тыя амаль што не ўсьміхаліся. Толькі хіба што калі перашэптваліся між сабою.

Але ўсё было ня так і пагана. Клініка знаходзілася на тэрыторыі нейкага старога ці то асабняку, ці то нават палацу, летняй рэзыдэнцыі якога-небудзь даваеннага арыстакрата-мільянэра. Відаць, пасьля вайны яна была троху рэканструявана, але, згубіўшы пэўную архітэктурную каштоўнасьць, набыла новае значэньне для грамадзтва... для людзей. Людзі перадусім. Янка ня ведала, ці гэта ейнае канчатковае месца перабываньня, ці яе яшчэ будуць цягаць па машынах і камэрах з вузкімі закратаванымі вакенцамі. Ды і ўвогуле дзяўчына мала разумела, што зь ёй у выніку станецца. Таму і была, напэўна, у гэтай клініцы. Ва ўсялякім выпадку, гэта дакладна адзін з найлепшых варыянтаў.

То бок аніхто насамрэч анічога не разумеў... нічога.

Янка вырашала ўсе пытаньні свайго сумленьня самастойна і, напэўна, першы раз у жыцьці доўга не вагалася між нейкімі там... Усё скончылася. Рана ці позна яна мусіла патрапіцца. Добра, што гэта былі толькі людзі. Насамрэч дзяўчына была вельмі хворай. Відаць, яшчэ з раньняга дзяцінства. Часам яна нават нічога не ўспрымала. І сядзела, проста назіраючы за скокамі птушак па плітцы дворыка, агароджанага высокімі, аплеценымі зелянінаю сьценамі. Янка нават ня думала пра тое, каб зьбегчы. Пасьля таго, як яе вылічылі, яна вельмі здала. Толькі і засталося, што яркія бяздонныя вочы і сьціплая ўдзячная

ўсьмешка. Насамрэч зь ёй абышліся звышгуманна: за столькі крывавых забойстваў адправілі, лічы што, у прафілякторы зь неблагім харчаваньнем і прыязным пэрсаналам. Можа здарыцца і такое, канечне, што ейны выпадак зацікавіў якога псыхоляга-крыміналіста, але напэўна ўсё ж ткі так атрымалася незнарок. Тым ня менш справа абсурдная. За забойства – пажыцьцёвы адпачынак. Гэта несумленна, але хто б пажадаў лепшага ў такой сытуацыі? Зь Янкаю сытуацыя была папросту выдатнаю, яна болей нічога і не жадала. Яна дзякавала і сарамліва ўсьміхалася. Радавалася ветру і сонейку, птушкам у лістоце, ужо такой зялёнай і сьвежай. Часам, калі яе выводзілі на прагулку ў зьнешні двор, як напрыклад нядаўна (у мінулую сераду), дзяўчына нават бачыла мора і ўсьміхалася яму – можа, нават больш цёпла, чым чамусьці іншаму. Усё было проста.

«Няма прыгажэйшай птушачкі, чым тая, што сьпявае цяпер сваю песеньку», – думала дзяўчына, расплываючыся ў вечаровых ценях. Можа, яна і мела рацыю.

...шчакою Янка прыціснулася да цёплага асфальту. Расьсечаныя вусны, кроў, але ўсё адно вельмі прыгожая і нават звыш таго. Ёй сказалі не варушыцца, і яна не варушылася. Паліцэйскія абступілі дзяўчыну колам, наставіўшы на яе рулі, але трымаліся яны на пэўнай адлегласьці, быццам чагосьці баяліся. Напэўна, гэтыя вылюдкі так і не маглі да канца зразумець, як такое стварэньне магло мэтадычна зьнішчаць. Таму мужчыны ў форме былі поўныя злосьці і нянавісьці. Складалася ўражаньне, нібы дзяўчына забівала ня толькі кагосьці там, але і іх, прычым менавіта ў гэтае імгненьне. Паліцэйскія ненавідзелі. Яны не памяталі пра тое, як памёр гаўляйтэр Кубэ. Падобная інфармацыя заставалася без асаблівай увагі ў школьным курсе гісторыі, як, зрэшты, і ўсялякая іншая.

Сківіца зацякла, на вуснах праступала кроў. Можа нават некалькі зубоў выбілі. Але варушыцца было

нельга, таму пэўнасьці ў гэтым пытаньні не дасягнеш. Рулі і размовы па рацыях. Пасьля ў галаве больш не было іншых думак. На месца дванаццаці духаў Юрыя Гагарына прыйшло штосьці іншае, і Янка гэтаму не супраціўлялася.

Рана ці позна яна стане падобнай да гэтых дрэваў.

Я – дрэва.

Зяляніна і птушкі. Маладыя лісточкі трымцяць у павевах ветру. Яны толькі нядаўна пабачылі сьвет, і да верасьня яшчэ вельмі далёка. Надыходзіць лета. Ужо вельмі хутка, але, зрэшты, каб не каляндар, можна было б яго папросту абвесьціць. Толькі ў людзей заведзена троху інакш. Іншы парадак.

Лёгкі ветрык абдзьмуваў голеную галаву, ня блытаўся ў валасох, але прыемна лашчыў скуру. Раней усё было... раней...

– Як Вы сябе сёньня адчуваеце?

– Папросту выдатна. Я вельмі Вам удзячная за Вашую турботу і Вашае стаўленьне да мяне. Таксама хачу падзякаваць усяму пэрсаналу клінікі, яе фундатарам, судзьдзю – за ляяльнасьць, і палісмэнам – за рашучыя дзеяньні ў адносінах да цяжкага злачынцы. Дзякуй вам вялікі, шаноўныя таварышы. Дзякуй Табе, Божа... І барані каралеву.

Хмары нарэшце цалкам закрылі сонца. Узьняўся вецер. Зрэшты, усе дэкарацыі абсалютна адпавядалі сытуацыі. Быццам на здымачнай пляцоўцы якойнебудзь карціны. Лепей бы пасавала чорна-белая стужка. Вецер, мора, скалы. Усё чымсьці нагадвала «Залаты Век» Бунюэля. Але пра што там гаворка?.. Ай! Не істотна. Ну эстэтыка падобная, а гэта цяпер галоўнае. Чым ёсьць уся гэтая пісаніна, як не адной голай эстэтыкай? Дастаткова папросту перадаць гэтае адчуваньне, што ўзьнікае падчас прагляду кадраў, зьнятых на буйное ядро ў манахроме. Прыкладна такі ж настрой панаваў на беразе. Шмат ветру, шмат неба і мора, толькі вось эмоцыі троху іншыя. І па-

сылы, адпаведна. Але насамрэч час ужо прызнаць, што калі адрозьніваць рэчы, то нельга не памыляцца. Калі надаваць рэчам ці зьявам нейкія характарыстыкі, немагчыма быць аб'ектыўным, а адсюль неіснаваньне аб'ектыўнасьці ўвогуле. Значыцца, калі надаваць рэчам нейкую ацэнку, то нельга быць дакладным, то бок увесь час памыляцца. Выкарыстоўваць умоўнасьці ў якасьці абсалюту?.. Безапэляцыйна. Бясспрэчна. Без аніякай абгрунтаванасьці. Цалкам адпавядае эстэтыцы чалавека.

Ацэнка = самападман.

Вочы ўважліва глядзелі на настаўніка, лавілі кожны ягоны рух, вушы не прапускалі ніводнага слова. Але словаў было няшмат. Ды і мала што значылі для мужчынаў тыя словы, як бы яны сябе не пераконвалі. Але тым ня менш ніводзін рух старога не заставаўся па-за ўвагаю. Нарэшце яны знайшлі тое, што хацелі знайсьці. Пабітыя сабакі вярнуліся дамоў. Яны блукалі ледзьве ня цэлую вечнасьць і нарэшце ўсё ж ткі знайшлі яго.

Шэсьць мужчынаў у капелюшох знайшлі свайго настаўніка, свайго збавіцеля, свайго Госпада. Пакуль што яны яшчэ не да канца гэта асэнсавалі, але пройдзе зусім няшмат часу, і розум нарэшце супакоіцца, атрымае магчымасьць адпачыць пасьля доўгіх бадзяньняў у прыцемках. Мужчыны самі стварылі сабе цуд і самааддана ў яго паверылі. Так, сапраўды, Ён прыйшоў за імі і зараз усё будзе зусім па-іншаму. Натуральна, што мужчыны – абраньнікі, і больш аніякіх сумневаў. Яны лічылі, што ім вельмі пашанцавала. Нарэшце ізноў да іх вярнулася надзея, якая з кожным імгненьнем ператваралася ў сьвятую ўпэўненасьць. У пачуцьцё адноўленага ўсясьветнага парадку.

Шэсьць мужчынаў у капелюшох даўно не ўсьміхаліся. Дый ніхто не памятаў, ці наогул яны калі ўсьміхаліся. Можа, калісьці ў мінулым, яшчэ ў дзяцінстве... але і цяпер іхныя ўсьмешкі былі дзесьці глыбока ўнутры. Звонку ж твары выглядалі празь-

мерна сур'ёзнымі, калі, канечне, празьмернасьць нейкім чынам магла стасавацца з падобным момантам. Уласьнікі шчасьлівае долі, яны паглыналі свайго бога ўсімі рэцэптарамі, усімі магчымымі спосабамі, хіба толькі на смак не каштавалі. Засяродзіўшы ўсю ўвагу на настаўніку, шэсьць мужчынаў у капелюшох не маглі ўспрымаць больш анічога. Яны знайшлі сваё выйсце. Тысячы кілямэтраў дарог, дзясяткі гарадоў, сотні вёсак... Усё гэта, пустое і хворае, нарэшце патанала ў нябыце. Цяпер упэўненасьць была бясспрэчнай. Усё будзе добра – у гэта яны імкнуліся верыць з самага пачатку. З гэтаю вераю яны прачыналіся шторанак і зь ёй пілі сваю я...аную гарбату. Надзея часам пакідала іх, а часам успыхвала ізноў. Гэта, напэўна, і было для іх адзіным сэнсам. Мужчыны разьдзерлі б на шматкі кожнага, хто сказаў бы, што на самай справе перад імі ніякі ня збаўца, а звычайны жабрак – разьдзерлі адно за тое, што ён паспрабаваў усумніцца. Простае і старое як сьвет абвінавачаньне ў ерасі на эмацыйным узроўні.

Мужчыны ўсё ж ткі былі людзьмі, а чалавеку падобныя рэчы ўласьцівыя. Тым больш у такой напружанай, нават, можна сказаць, крытычнай сытуацыі. Колькі народу зацкавалі сабакамі, расстралялі ці спалілі зажыва на загад суду! Што тады казаць пра падобныя пэрспэктывы ў сытуацыі, калі ўсё дазволена. Калі дэмакратыя выяўленая напоўніцу. Нават калі чатыры галасы супроць двух... але да гэтага, зрэшты, ужо нікому не было справы. Мужчыны ня мелі ані часу, ані жаданьня разважаць над падобнымі пытаньнямі. Усё даўно было вырашана. Яны ведалі ўсе свае схемы. І схемы працавалі выдатна, бяз збояў і перашкодаў.

Шэсьць мужчынаў нарэшце знайшлі свой спакой?

Хмары нарэшце прынесьлі доўгачаканую прахалоду.

Вагон у чарговы раз хіснула з боку ў бок. Нічога не зьмянялася. Напэўна, ужо некалькі хвілін ніякіх

рухаў, ніякіх словаў. Інфармацыйная плынь спынілася. Даволі напружаная паўза, але ў выніку яна таксама будзе вытрыманая, як і шмат што ў гэтым няпростым жыцьці.

– Ты ўсё зразумеў? – голас быў спакойны, бы фарбаванае матавым мэталікам жалеза. Нічога ў гэтым голасе не было, акрамя пытаньня. Ніякіх дадатковых кампанэнтаў. Чыстая пытальная інтанацыя.

Хлопец сьлізгануў вачыма па твары супэрчалавека. Няёмка. Але менавіта гэтага ад яго цяпер і патрабавалі. Неабходна было стаць гнілою драўнінаю, мёртваю мышкаю, бруднаю абгорткаю на асфальце.

– Пабла? Ты ўсё зразумеў? – было такое адчуваньне, што Юры Аляксеевіч будзе задаваць гэтае пытаньне, не зьмяняючы інтанацыі, пакуль не пачуе станоўчага адказу. З мэтаскіраванасьцю машыны для забіваньня паляў.

– А ці Вам ня ўсё роўна?! – маўчаць не было сэнсу. Ні сэнсу, ні жаданьня гуляць у наяўнасьць абгрунтаваньняў. Калі трапіўся, дык не дуры сабе галавы. Ні сабе, ні іншым. Быццам бы ёсьць у гэтым сьвеце штосьці такое, чаго можна баяцца і чаго трэба засьцерагацца. Усё гэта лухта для падлеткаў, для дарослых дзядзек, што з усёй уласьцівай ім апантанасьцю гуляюць у танчыкі і балістычныя ракеткі, у крызісы і геданістычныя збачэнствы; з такой турботаю зноў і зноў падводзяць тую рысачку, што кшталту аддзяляе жыцьцё ад сьмерці.

Відаць, Чалавек не чакаў падобнай рэакцыі, не чакаў такога простага, адкрытага і нават крыху нахабнага позірку, якім глядзеў на яго Пабла. Можа быць, нават гальштук пачаў сьціскаць шыю. Але гэта ўсё былі толькі карцінкі. Замалёўкі нігілістычнага характару. Менавіта так запэўніваў сябе Юры Аляксеевіч. «Малады яшчэ, неразумны», – але ў сэрцы ўсё ж ткі штосьці кальнула. Менавіта так разбураецца арганізм. Паміраюць нэрвы.

– Што Вы на мяне так гледзіце, ці лічыце, што я вінен Вам штосьці? Пазычаў калі, ці што?!

Ізноўку павісла паўза, але куды карацейшая. Супрацоўнік прыклаў усе намаганьні і хутка пераасэнсаваў сытуацыю

– Усё ж ткі я б табе параіў адказаць на маё пытаньне. Ты ж выдатна разумееш, што могуць быць праблемы. Яшчэ раз. Ты ўсё зразуме..?

– ...паслухайце, шаноўны, срацьь я хацеў і на Вас, і на Вашыя запалохваньні, і на ўсіх Вашых підараў з сабакамі. Я свае справы скончыў. Будзьце здаровыя!

Але незнаёмец па-ранейшаму не губляў сваёй упэўненасьці. Дый, зрэшты, яна была нават залішняй. Бо ўсё ўжо, хутчэй за ўсё, вырашана...

– Дзе яна?!

– Ня ведаю, – раптам Паблу зрабілася сьмешна. Сапраўды сьмешна, бо ён насамрэч ня ведаў, але слаў іх усіх на гуй. Усіх гэтых сук.

– А можа, усё ж ткі ведаеш?

– Не, на жаль. А можа й на шчасьце.

Але так гэта ўсё пакідаць было нельга. Трэба даводзіць справы да канца, ці ўвогуле тады не пачынаць. Шклянкі паравалі. Пабла паварушыў пакуначак з заваркаю, разьмяшаў. Вельмі горача. Хлопец маруднна паднёс шклянку да вуснаў і крыху адпіў. Якасьць гарбаты ў цягніку мае нейкае ўласнае значэньне, па-за катэгорыямі. Але вагацца не было часу.

Адным рухам рукі юнак выплеснуў кіпень у твар супрацоўніка. Крыку не было. Той машынальна паспрабаваў абараніцца рукамі, але ці то дапамагло, ці не, гэта было ўжо ня важна. Не зважаючы на гарачае шкло, Пабла выхапіў шклянку з мэталічнай падстаўкі і (дзынь!!!) праз імгненьне ягоная рука ўжо сьціскала востры аскепак. Адным трапным ударам глыбока ў шыю. Вочы Юрыя Аляксеевіча больш не падаваліся такімі халоднымі. Дый наўрад ці тут ёсьць сэнс паглыбляцца ў апісаньні. Сьцішаны хрып, і рукі ў безвыніковых спробах пазьбегнуць непазьбежнага... Праз імгненьне Чалавек застаўся сам-насам са сваім фіналам...

Бег!

Хутка перабіраць нагамі. Галоўнае ня ўпасьці. Рух наперад як мага хутчэй. Ці ёсьць яны там, за сьпінаю? Нават калі няма, нельга спыняцца, немагчыма супакоіцца, бо за гэтым спакоем сьмерць. Не матэрыяльная, але канец чагосьці такога, што немагчыма акрэсьліць, што сучасны першабытны чалавек называе «дух, ляць!».

Бег!

Але ўсе рухі мусяць быць спакойнымі і асэнсаванымі. Схапіцца за ручку ў тамбуры, павярнуць, адчыніць дзьверы, з грукатам зачыніць.

Бег!

Калі ты, Пабліта, здолееў працягнуць сябе праз усё гэтае існаваньне, дык што табе цяпер... А цяпер ужо нічога. Вагоны зьнікаюць за сьпінаю. Пляцкартныя, купэйныя, агульныя. Дзе-нідзе гараць агменьчыкі чалавечых жыцьцяў, роўныя, як полымя газавай плітکі. Пабліта чуў размовы, пазьвякваньне шклянак у падшклянніках, але асабліва зважаць на ўсю гэтую музыку часу не было. Ды і ўвогуле яго не было. Узьнікала адчуваньне, што існуе адзін толькі рух мускулаў і грукат пульсу ў скронях у перамежку з грукатам мэталічных дзьвярэй. А часу папросту не было. Існаваў толькі бег. Бессэнсоўная выдумка прыроды, інстынкт, пад завязку напоўнены вечнасьцю, ператвораны чалавекам у нейкі прыдатак, нязначны і пазбаўлены фарбаў. Просты цьвік, на які насаджана да халеры сьвяточнае мішуры.

Бег!

«Спакойна! Ва ўсю гэтую лухту паглыбляцца цяпер ня трэба. Думкі прэч! Думаць, Паблітачка, будзеш у вольны ад усяе гэтае гуяты час! Не цяпер».

Адчыніў дзьверы і выскчыў у паветра на поўнай хуткасьці. Вагоны лятуць за сьпінаю. Аўтаматычнасьць рухаў: рука, дзьвярная ручка, прыкладзеная сіла, pull, адштурхнуцца памацней, скочыць падалей. Наколькі магчыма.

Бег!

У прасторы... бяз часу...

У часе... без прасторы...

А што з хлопчыкамі?

Нічога звыш таго...

З-за скалы нарэшце зьявілася...

– Там людзі, – вельмі спакойна і нават крыху абыякава вымавіў трэці.

– Што? – другі сядзеў і прыкурваў апошнюю файку. Ягоны твар звузіўся, шчокі запалі, але ён верыў, і гэта яго нібыта адрозьнівала.

– Кажу, там за скалою людзі нейкія ёсьць, – трэці не глядзеў на хлопцаў. Трэці глядзеў у мора. Было такое адчуваньне, нібы гэта неспакойныя хвалі пра штосьці яму распавялі.

Хлопцы сядзелі на камянях і імкнуліся як мага менш глядзець адзін на аднаго. Не было сілаў. Нават на нянавісьць іх неставала. Натуральна, што зусім неўзабаве яны больш ня будуць здольнымі рухацца. Невядома, як гэта яшчэ трываў першы пасьля ягонай хваробы. Тым ня менш спадзеву было як і раней, ня менш і ня больш.

– То бок што? Ты хочаш сказаць, што за гэтай скалою людзі? Там паселішча? Мы, ляць, нарэшце прыйшлі?! Засталося некалькі соцень мэтраў і ўсё гэта, ляць, скончыцца?!! – першы ўзьняўся на ногі. Збоку было заўважна, што хлопцу гэта далося нялёгка. Шклянымі вачыма ён глядзеў на трэцяга. Вусны варушыліся. Хвалі моцна білі ў бубны камянёў.

– Тш-ш...

– Што?! Дык, можа, сходзім праверым, а? Сапраўды, мы нарэшце прыйшлі! Дзякуй табе, божанька, нарэшце ты пачуў нашыя малітвы! Слава табе!!! – першы ўпаў на калені, было незразумелым, ці то спэцыяльна, ці то са стомы. Рукі ўзьняліся ўгору, і крыкі патанулі ў хвалях.

– А ну, ляць, завалі япала!!! Маўчы, сука! Як ты, падла, можаш казаць такое Айцу нашаму?!! Сатана! пакінь яго ў спакоі!!! Адыдзі, Люцыпар! – ня вытрымаў другі.

А трэці вытрымаў. Раз і назаўжды ён вытрымаў усё.

У паветры сапраўды патыхала вар’яцтвам.

...але рана ці позна ім ўсё ж ткі давялося замаўчаць...

Хлопчыкі ляжалі на зямлі і прыводзілі свае розумы да ладу. Супакойвалі сябе, наколькі гэта было магчыма. Ніхто не хацеў паміраць з крыкам на вуснах. Усе хацелі з годнасьцю і спакоем. Ва ўсялякім выпадку, так падавалася звонку. Першы ведаў, другі верыў, а трэці маўчаў. Было падобна да таго, што сёньня ўночы...

Скалы прымалі ў абдымкі вецер. Тры постаці на пляжы. Расхрыстаныя лахманы брудных кашуляў. Худыя целы, зьбітыя ногі. Хлопчыкі ўсё ж ткі рушылі. Знайшлі сілы і рушылі. Куды ім падзецца ад сябе і сваіх інстынктаў? Ад матухны-прыроды. Пакуль была фізычная магчымасьць, цела само вырашала. Няхай нават розум пакрысе здаваў пазыцыі, але цела магло дзейнічаць самастойна. Цэнтральная нэрвовая сыстэма яшчэ ня скончыла сваёй працы.

Мыс быў вялікі і цяжкі, на скалах, відаць, апошнім часам часта здараліся абвалы. Некаторыя месцы даводзілася пераадольваць ледзьве не паўзком. Але захоўваць вонкавы спакой хлопчыкі ўсё яшчэ былі ў стане. Хвалі раўлі то дзесьці далёка ўнізе, то ледзьве не краналі сьцёртыя ногі, абрынаючы тысячы пырскаў. Вада папросту вісела ў паветры.

За камянямі насамрэч былі людзі. Ніхто не чакаў іх, але яны трапіліся на дарозе. Толькі сілаў для эмоцыяў не было. Унутры папросту штосьці пераключылася. Папросту скокнула напружаньне ў электрычнай сетцы. Ніхто ня ведаў, як рэагаваць на гэты гвалт навакольля, на шторм, на непрыступныя іклы скалаў і... на купку людзей, што неяк нечакана спакойна сядзелі ў некалькіх сотнях мэтраў. Хлопчыкі ўзіраліся, але аніякіх прыкметаў паселішча навокал не было. Зусім містычная сытуацыя безь якіх-кольвечы тлумачэньняў. Людзі яшчэ іх не заўважылі, і хлопчыкі разгублена глядзелі на... Нечакана. Зараз яны зьбяруцца зь сіламі і зробяць гэты апошні рывок. А за ім будзе іхнае выратаваньне... што яшчэ могуць думаць падлеткі ў такой сытуацыі? А можа, зусім ня гэтае?

– Хадзем, – ледзьве не адначасова выдыхнулі вусны. І ногі пайшлі.

Хлопчыкі ўжо не надавалі значэньня ні скалам, ні мору. Ва ўсе вочы яны глядзелі на купку людзей у цёмных вопратках, што сядзелі пасярэдзіне пустога, тамсям утыканага вялізнымі плітамі жвіровага пляжу. Ды і на што тут яшчэ было глядзець? Чалавек – адзінае, што можа сапраўды зацікавіць чалавека. Астатняе – лухта, надуманае. Ногі працавалі прыкладна так, як і раней. Нічога асабліва не зьмянілася. Толькі паступова розумы запаўнялі цяжкія, быццам бы сьвінцовыя думкі: «хто гэта?», «што яны тут робяць?», «што трэба ім сказаць?». Толькі думкі былі занадта цяжкімі, каб заставалася магчымасьць знаходзіць адказы ці неяк забіваць. Папросту рэагаваць на гэтую працу стомленага, але пакуль яшчэ чалавечага мозгу.

Неўзабаве іх заўважылі. Там было сем чалавек, і шэсьць зь іх узьняліся адзін за адным і павольна рушылі да хлопчыкаў. Простая вопратка, капелюшы на галовах. Яны падаліся падобнымі да рабятаў з бліжэйшага ранча. Але толькі на першы погляд – насамрэч меркаваць пра іх такім чынам не было асаблівых падставаў. Даўно ня голеныя, аброслыя бародамі твары глядзелі проста, ніякіх пачуцьцяў. Павольныя рухі і бясконцы вецер. Клясычныя карцінкі ветру, што заблытаўся ў валасох, і запаволеныя крокі. Тут усё было проста, бяз патасу і без замаруджаных відэашэрагаў.

Хлопчыкі непакоіліся, але не было магчымасьці штосьці зьмяніць. Відаць, гэтая сустрэча была прапісаная ў гісторыі вельмі даўно і тлустым шрыфтам. Ня кажучы ні слова мужчыны набліжаліся, рухі былі простымі і ўпэўненымі. Толькі адзін зь іх застаўся сядзець на пляжы і ня рушыў зь месца. Ён быў дужа старым... Напэўна, для таго, каб лішні раз не непакоіцца. Хлопчыкі спыніліся. Непаразуменьне ў маладых вачох. Каменныя твары мужчынаў не падавалі аніякіх прыкметаў надзеі, але, зрэшты, па-іншаму і быць не магло. Зараз іхны лёс цалкам пераходзіў у гэтыя каменныя рукі

Але мужчынам не былі патрэбныя чыісьці лёсы ці там душы. Навошта ім усё гэта? Дзеці... Усе іхныя дванаццаць вачэй глядзелі роўна і ўпэўнена. Яны ўжо знайшлі тое, што шукалі, і былі ня згодныя на якія-кольвечы прыгоды. Ім даўно былі непатрэбныя ўсе гэтыя перажываньні.

У некалькіх мэтрах ад напружаных твараў падлеткаў...

Шэсьць мужчынаў у капелюшох дасталі вялізныя нажы. Яны не прысьпешвалі хады. Рукі зручней перахапілі дзяржальны. Хлопчыкі зразумелі. Што тут было казаць? Канец. Рана ці позна. Першы павярнуў твар да другога, пасьміхнуўся і сказаў:

– Пад'я...аў цябе Госпад твой. Няма тут аніякага пеўня.

Некалькі замахаў адцягнулі імгненьне да апошняй мяжы. Маланкі-удары. Мужчыны працавалі зладжана. Упэўненыя рукі білі трапна. Лёзы ўваходзілі і выходзілі зь лёгкасьцю. Сьцішаныя крыкі пад акампанэмэнт мора. Галоўнае, што аніводнага стрэлу, усё цалкам гарманічна. Вочы застылі дзесьці ў прамежках паміж болем і ідыёцкім пытаньнем «чаму?»

Чаму?!

Так. Папросту.

Праз хвіліну мужчыны выціралі нажы аб брудныя, калісьці белыя кашулі, змахвалі пот з ілбоў. Чымсьці яны нагадвалі сялянаў пасьля цяжкай працы ў полі. Была ў іхным выглядзе нейкая архаіка, што прадугледжвала права на законны адпачынак, на чарку пасьля цяжкага дня. Мужчыны павярнуліся і павольна рушылі назад да свайго настаўніка. Канечне, ён яшчэ не пасьпеў іх чаму-небудзь навучыць, але неўзабаве дасьць ім сьвятло свайго царства.

Шэсьць мужчынаў так і не ўзгадалі пасьля, хто зь іх першым падняўся і бліснуў вачыма ў бок чужынцаў.

– Як Вы сябе адчуваеце сёньня? – доктар уважліва глядзеў у гэты дзявочы твар, ужо куды менш выразны, чым некалькі стагодзьдзяў таму.

– Дзякуй, сёньня мне значна лепей, – на вуснах праступала слабая ўсьмешка, вочы глядзелі прыязна і цёпла, толькі доктар быў доктарам, а дзяўчына... была ўжо невядома кім.

Канечне, доктар ведаў, што падобныя пытаньні з кожным днём рабіліся ўсё больш бессэнсоўнымі, але насамрэч яго цікавіла зусім ня гэтая ўсьмешка. Ва ўсялякім выпадку, цяпер. Дасьледаваньне, навуковая праца, кар'ера – рэчы, неабходныя для будаваньня добрага, якаснага жыцьця, для стварэньня сям'і, дзяцей. Ну, гэта ўсё зразумела. Пацыент насамрэч не пакутаваў, ва ўсялякім выпадку, так лічыў доктар, а значыцца, і ўсе астатнія, бо калі весьці гутарку пра псыхічныя расстройствы, адчуваньне хворага вызначаецца ў першую чаргу мэдыцынай, але ніяк не пацыентам. Што маглі сказаць гэтыя празьмерна ясныя дзявочыя вочы, акрамя сваёй ідыёцкай праўды, незразумелай і бессэнсоўнай? Доктар усё бачыў. Ні халеры ёй ня лепей. У апошні час стан значна пагоршыўся, пачаліся прыпадкі кататанічнай агрэсіі, бессэнсоўныя, скіраваныя кудысьці ў нікуды. Дзяўчына спрабавала пазьбягаць кантактаў зь іншымі пацыентамі і тым больш з пэрсаналам. Янка зьбівала ў кроў кулакі аб кафлевую плітку прыбіральні ці каталася па падлозе ў канцы доўгага калідора. Давялося прывязаць яе да гэтага крэсла. Нельга было дапусьціць, каб такі цікавы выпадак незнарок забіў сябе. Канечне незнарок, бо дзяўчына ўжо была ня ў стане прымаць абгрунтаваныя рашэньні.

– Доктар, а хочаце, я Вам песеньку сьпяю, – Янкіны вочы глядзелі проста і наіўна. Доктар нават на імгненьне зьбянтэжыўся, але неўзабаве зноў-ку вярнуўся да прафэсійнай этыкі.

– Зараз, адну хвілінку, Янычка, – малады чалавек палез у кішэню і націснуў на дыктафоне запіс. – Давай.

Дзявочыя вочы яшчэ некалькі імгненьняў глядзелі на мяккі, добра выгалены твар, быццам штосьці ў ім шукаючы. Нарэшце пацыент засьпяваў.

Песенька нездаровай Яначкі.

Я пайшла ў садооочак, там, дзе пахнуць ружы.
Там дзеееее пахнуць ружы,
Пчолкі дзе гудуць.
Там зь зямлі краты мне казалі казкіііі,
Толькі я не хааацелааа і ня слухала радыёстанцыю ааааа!
А яшчэ дзяяядзечка вожык там піў віно і частаваў мэханікаў цукеркаміііі
Аааааа
Аааа
Аа
Я хадзіла ў садочак, ён прыгожы быў, і вясна, і дыскатэка...
Дыскатэка!
Толькі ты не прыйшоў, мой каханы, мой прынц...
Унц-унцаааа
Ты не прыйшоў і не сказаў нічога.
І на дыскатэку ку-кукуууууу не пайшла мама мая не хкахцела рэтрамарафонаў
Бырлатронаў.
Ружы
Руды
Руны
Рупіі ііііііііііііі
Дзеванькі сказалі мне, што паехаў ты далёка,
Не са мной ты, не са мной.
Пакінуў ты мяне ў садочку па вясьне
Не пайшла на дыскатэку.
Дзьве сьлязіначкі пусьціла... па-па-пам.
І пах ружаў панюхала носікам. Котачкі на плоце.
Котачкі на плоце мне сказалі пра цябе.
Котачкі-дзевачкі і рамансыыыы,
Раааммансссыыыыы
А-аа-а
Бегла. Бегла. Бегла я па сьцежачцы, бегла у садочку,
Паламала ногі і ляжу ў лякарні,
І цябе чакаю, а ты не прыходзіш.
Бо далёка ты за морам долі лепшае шукаеш,

А мяне пакінуууў
Тут адну
Тут адну
З ружамі і коткамі.
Адну.

Галава бездапаможна паваліласа набок, стомленая ад празьмернага напружаньня. Твар пачырванеў, з вачэй, пустых і нават не халодных, крапалі сьлёзы. З мора дзьмуў вецер. Яго пальцы марна спрабавалі заблытацца ў зголеных пад нуль валасох. Янка ўжо мала была падобнай да той дзяўчыны, якой захапляліся і на якую маліліся. Цяпер кожны джэнтэльмэн быў бы абавязаным праявіць спачуваньне і...

Не атрымалася.

Доктар выключыў дыктафон, схаваў выкарыстаны шпрыц і пустую ампулу ў кішэню і накіраваўся ў кабінэт здымаць аўдыёзапіс, падшываць у справу, пісаць, пісаць...

Вецер быў ветрам. Ён гуляў зь лістотаю на дрэвах і як заўжды нічога не абяцаў.

Пабла адштурхнуўся што было моцы і пакінуў вагон. Пакінуў усіх тых, што так самааддана працавалі на дабрабыт усяго чалавецтва, на сваіх нашчадкаў, на босаў, на кожнага з жыхароў гэтай залітай газавымі аблокамі плянэты.

А ці пакінуў насамрэч? Увогуле, ці магчыма гэта – заставацца чалавекам, парваўшы з усімі праявамі чалавечага існаваньня? Невядома. Ды і хто здатны адказаць на гэтае пытаньне? Той, хто возьмецца, адразу ня будзе мець рацыі, хаця б толькі таму, што сам адказ ужо ёсьць рэакцыя на ўсё чалавечае. Але Паблу было зусім не да таго. І што яму рабіць далей, ён таксама ня ведаў. Скачок нейкім неверагодным чынам зацягнуўся, і хлопец быццам бы завіс у паветры. Ногі не краналіся зямлі, а вочы, што заплюшчыліся яшчэ ў тамбуры, аніяк не жадалі бачыць. Дакладней кажучы, было незразумелым, ці паднятыя павекі, ці не.

«Дзіўны стан. Невядома, што робіцца навокал, незразумела, што адбываецца ўнутры. Ці то сьпяваюць анёлы, ці вулічныя музыкі, ці п'яныя госьці. Ды і ўвогуле, адкуль гэта ўсё бярэцца? Я ж нічога ня чую, якія тут могуць быць сьпевы? Ніякіх. Напэўна, зашмат глядзеў сэрыялаў у дзяцінстве і зашмат увагі надаваў васьмібітнаму сьвету тэлепрыставак».

Пабла вісеў у паветры. Спачатку ён сапраўды нічога ня бачыў і нічога ня чуў. Толькі была нейкая ўпэўненасьць у тым, што ворагам давялося адстаць. Тут было спакойна. Праз некалькі ці то сэкундаў, ці то гадзінаў хлопец апынуўся на высокай скале дзесьці над пляжам. Цягнікі, людзі ў цывільным, праведніцы са сваёю сынтэтычнаю гарбатай, – усё засталося дзесьці ў невыразным мінулым. Пабла адчуў вецер. Моцныя парывы білі ў грудзі, вымушалі жмурыць вочы. Ніводнага гуку, толькі мора далёка ўнізе і агромністы арол у небасхіле вострыць на кагосьці дзюбу. Наўрад ці яго даслаў раззлаваны бог, папросту здаралася, што праганяла па міталёгіі і усялякай архетыпічнасьці. Унізе быў бераг: скалы, камяні, жвір. Мора пенілася і перакочвала хвалямі каменьчыкі. Пасэйдон ізноўку ўзяўся за свае жанглёрскія выбрыкі. Відаць, стары бог увогуле не зважаў ні на што. Каму, як ні яму, забіваць на чалавека ў непрацоўны час? Канечне, Пабла быў ня ўпэўнены, але ў любым выпадку... тое, што яму падавалася, нібы сёньня выходны, ня мела ніякага значэньня. Так, папросту прычапілася думка, невялічкі аскепак пакінутай за плячыма сыстэмы каардынатаў, простай і дакладнай... Ляць, а калісьці было ж сапраўды так! І аднойчы нават якісьці бог у гэты дзень адпачываў пасьля стварэньня сьвету. Як гэта ён дадумаўся да такога?! Сапраўды, сытуацыя, вартая ўсьмешкі. Якія мы ідыёты, нічога больш натуральнага выдумаць так і ня здолелі. Ну досыць, Пабліты гэта ўжо ня тычылася. Нарэшце ён сам сабе гаспадар. І больш ніхто за яго не вырашае.

Таксама як?..

Унізе на пляжы сядзелі людзі. Шэсьць чалавек вакол сёмага. Апошні, відаць, быў вельмі стары.

Ён увесь час корпаўся ў нейкай торбе і штосьці зь яе даставаў, магчыма, штосьці расказваў астатнім. Ягоная чырвоная кепка, нягледзячы на сваю брудныасьць, заўважна кантраставала з навакольлем. Троху справа ад іх прыбоем на пляж выкінула трох дэльфінаў. Толькі чамусьці ўся зямля навокал была ў іхнай крыві. Пабла ня мог зразумець, але ўжо ня надта і імкнуўся. Ягоныя вочы падавалі яму сыгналы, ягоныя вушы чулі, але мозг упершыню за ўвесь час свайго існаваньня меў магчымасьць абіраць, ці варта яму рэагаваць, ці не. Думкі былі лёгкімі і зусім не нагадвалі цяжкіх тлустых мух, што ўлетку гулі ў пакоі, імкнуліся прарвацца на волю празь нябачныя перашкоды. Мухі, як і тыя думкі, не разумелі шкла. Не разумелі гэтых нябачных барыкадаў. Пабла нарэшце адчуў, што можа глядзець на ўсё гэта роўна, што можа ўспрымаць гэта менавіта такім, без усялякіх прыдаткаў і кантэкстаў. Толькі чароўная фраза «такім як ёсьць» ня мела да гэтага ўспрыманьня аніякага дачыненьня. Чалавечая сыстэма каардынатаў увогуле мае мала агульнага з усясьветам, які і ўсясьветам насамрэч не назавеш. Ды як што ні назавеш, усё будзе ня больш чым бессэнсоўным ідыёцкім прагонам. Быццам бы мора калі-небудзь казала, што яно мора, а чалавек, што ён чалавек!

Юнак глядзеў долу на людзей, што працягвалі свае рытуалы. Але, можа, ён памыляўся. Увесь час. Праз імгнеьне ён ужо ня бачыў розьніцы між чалавекам і рытуалам, а праз два – паміж рытуалам і скалою.

Хвалі білі камяні, змываючы дэльфінаву кроў у мора. Нічога, праз некаторы час Пасэйдон забярэ гэтых жывёлаў дамоў, а на іхных месцах пакіне сьвежых, і чалавечы сэнтымэнталізм тут ні да чаго.

Юзік глядзеў у твары вучняў. Мужчыны ізноўку занялі свае месцы і ўважліва слухалі настаўніка. Менавіта так яны вырашылі называць яго між сабою. Ім усё было зразумела, і яны хацелі ведаў. Але

куды больш яны чакалі ад старога, што той дасьць ім выйсьце. Стары глядзеў у іхныя твары, што мелі простыя чалавечыя рысы. Людзі так любяць запэўніваць сябе! Ім так даспадобы вынаходзіць чарговыя найлягчэйшыя шляхі існаваньня... Хаця што ў гэтым дзіўнага? Гэта выдатна, калі можна прыкласьці менш намаганьняў, а атрымаць большы вынік. Толькі на карысьць такому выніку і аддаюцца жыцьці. Ды і шляхі гэтыя лёгкія даволі ўмоўна, бо кожны ўсур'ёз успрымае значнасьць усіх тых намаганьняў і вынікаў. Кожны згадзіўся працаваць па схеме, што зацыклена на сабе самой. Гэта як дзіцячая цацачная чыгунка, усё вяртаецца туды, адкуль пачалося. Толькі машыніст упэўнены ў тым, што наперадзе будзе новы паварот, і дзесьці там – новая станцыя. Людзі ставяць сабе мэты, дасягаюць іх і зноўку ставяць новыя, праводзяць усё жыцьцё, спрабуючы дагнаць штосьці, зрабіць штосьці такое... а што, ніхто зь іх дакладна ня ведае. Людзі бягуць. Бягуць. Бягуць кудысьці наперад, паўтараюць слова «прагрэс», і ім падаецца, што вось яны ўжо лепшыя, чым былі калісьці. І яны гэта сапраўды заўважаюць і запэўніваюць усіх астатніх. Каго словам, каго стрэлам. Так ці інакш, чалавек ідзе наперад да сваёй мэты, цьмянай, як завулкі начных мэгаполісаў. Чалавек кажа: «Вось я іду наперад». Ён вырашыў, дзе «наперад», дзе «назад». Ён даў імёны ўсяму і сам стаў ня больш чым імем. Словы, кадзіроўкі, назвы. Людзі заблукалі ў іх, загрузьлі ў гэтай багне, і калі хто ім гэта скажа, яны могуць пасьмяяцца, могуць пакрыўдзіцца, могуць прымусіць лячыцца ці расстраляць. Настолькі каштоўны для чалавека сьвет ягоных кадзіровак. Ад самага пачатку і да фінальнага ўздыху, жыцьцё – адна вялікая ўмоўнасьць, адзіны доўгі бег ад сьвету, бег ад рэальнасьці. Больш ніхто ня здольны спыніцца. Ну канечне, хочацца верыць, што выйсьце ўсё ж ткі ёсьць, і быццам бы можна знайсьці гэтаму прыклад у асобах сьвятых. Але тыя, хто ўсё ж ткі знайшоў магчымасьць пазьбегнуць усяго гэтага блюзьнерства, наўрад ці вернецца да статку. Але мы ізноўку ня ве-

рым. Ды і «сьвяты» – ня больш чым слова, і ізноўку ж чарговая кадзіроўка...

Калісьці, яшчэ да вайны, Юзік быў нармалёвым чалавекам. Ён вельмі любіў хадзіць у філярмонію і слухаць клясычную музыку. Асабліва яму падабалася, калі сьпявалі хоры, а яшчэ больш жаночыя арыі, але можа, ён штосьці блытаў. Цяпер ён быў ужо занадта слабы, каб разьбірацца ва ўсіх гэтых тэрміналёгіях. Ён глядзеў у твары мужчынаў, простыя, як драўляныя платы, і ня ведаў, чаго яны ад яго хацелі. Вочы ўважліва глядзелі на яго, нажы былі схаваныя. Вучыць? Ён ня ведаў, што ад яго патрабуецца. Ня тое каб забыў, папросту ўсё тое, што казалі яму гэтыя галасы аднекуль са сваіх недасяжных вышыняў, згубілася ў кілямэтрах пустыні, а можа, і яшчэ дзесьці. Ва ўсялякім выпадку, стары папросту даставаў з заплечніка свае прыстасаваньні, і банальны іржавы рондаль успрымаўся, як поўны містыкі прадмет. Тут былі плянэты і старыя кеды, ляк для пазногцяў, вятры і плястыкавыя пляшкі, сузор'і, сонечныя сыстэмы і боегатоўныя атамныя бомбы. Адным словам, нічога незвычайнага. А людзі глядзелі. Людзі верылі ў штосьці звышнатуральнае. Некалькі хвілінаў таму яны забілі нажамі дэльфінаў, ці яшчэ каго, а цяпер спасьцігалі сакральныя веды. Шэсьць мужчынаў у капелюшох былі сапраўднымі людзьмі. Яны надавалі ўвагу таму, што траплялася на вока. Яны зь цікавасьцю сачылі за рухамі старога і не заўважалі, як хутка і як далёка ад берагу адступае вада. Шэсьць мужчынаў зрэдчас папраўлялі капелюшы і, затаіўшы подых, чакалі наступнага цуду са старога заплечніка. Яны атрымлівалі, што хацелі. Седзячы сьпінаю да мора, яны ня бачылі каменных выступаў і ракавінаў. Людзі працягвалі верыць сваім казкам. Людзі прагнулі ўсё новых і новых цудаў. Пустое дно. Камяні, пясочак, троху бруду, але на дзіва няшмат.

Юзік ведаў, што будзе далей. Нават адчуваў. Канечне, усё магло скончыцца і зусім па-іншаму, але... ці ня ўсё роўна? І без таго зашмат было адда-

дзена на ўсялякія аздабленьні. Сьцяна вады, што зьявілася на гарызонце, адлюстроўвалася ў ягоных ужо падсьлепаватых вачох. Яна набліжалася і набліжалася. Заплечнік быў амаль што пусты. Засталася толькі фатаграфія хворай дзяўчынкі з выгаленым чэрапам. Шэсьць мужчынаў у капелюшох нядоўга яе разглядалі.

Можа, яны вырашылі прыдумаць штосьці яшчэ?..

Вада.

Вада была не вадою. Нічога было нічым. Папросту так атрымалася.

Пал Палыч сядзеў за столікам і піў каву. Ранак. Кавярня адчынілася зусім нядаўна, і ён быў ледзьве не адзіным наведвальнікам, калі ня ўлічваць некалькіх начных таксістаў і пары клеркаў, што па дарозе на працу зайшлі глытнуць па эспрэса. Сонца толькі ўздымалася над горадам – падобна да таго, што дзень будзе ясным. Канечне, гэта натхняла, Пал Палыч заўжды любіў сонечныя раніцы. У такія раніцы быццам бы спрацоўвала аўтападача нейкае надзеі. Нават калі навокал была зіма, сонечны ранак значна падвышаў працаздольнасьць і, што куды важнейшае, – настрой.

– Як ты сябе адчуваеш, Пал Палыч?

– Агуенна!

Ды і звонку было заўважна, што яму ўжо куды лепей. Прычасаныя валасы, гладка выгаленыя шчокі, ахайна завязаны гальштук. Чалавек выглядаў калі не на «выдатна», дык на «вельмі добра» дакладна, то бок так, як і мусіў выглядаць таленавіты, высокаадукаваны гуманітарый сярэдняга ўзросту. З усяго было заўважна, што ў жыцьці Пал Палыча ізноўку надышла белая паласа. Усё ізноўку займела сэнс, і патурбаваная псыхіка ў чарговы раз знайшла свой утульны спакой. Напэўна, зараз ён ня будзе ўзгадваць пра тое, што некалькі дзён таму яму павыносілі зубы. Мэдыцына сёньня працуе на найвышэйшым узроўні.

Новыя пратэзы нічым не адрозьніваюцца ад старых. Усьміхайцеся на здароўе, Пал Палыч! Больш усьміхайцеся! Шырэй! Ну, яшчэ! Яшчэ шырэй, ня будзьце такім сьціплым! Вось так! Зусім іншая справа!

Але ён ня меў неабходнасьці ў падбадзёрваньні. Ён насамрэч адчуваў сябе куды лепей. Ён усё ж ткі пакінуў сваю любімую жонку і адразу ўздыхнуў лягчэй. На твары зьявілася нейкая не характэрная дагэтуль сьвежасьць. Кіраўнік аддзелу тут жа гэта заўважыў, але прамаўчаў, ён і так ведаў цану свайго супрацоўніка, не было неабходнасьці яе падвышаць.

Так, дыхаць Пал Палычу сапраўды стала лягчэй. Ён зьняў сабе невялічкую кватэрку ў цэнтры. Можа, на які месяц, там будзе відаць. Ён зноўку пачаў працаваць, у чарговы раз зажыў паўнавартасным жыцьцём і адчуў сябе Чалавекам.

Чалавек замовіў яшчэ кавы і закурыў яшчэ адну, лёгкую і супэрсмачную. Пальцы кранулі старонкі сьвежае ранішняе газэты. «Што яны тут падаюць да кавы?»

«ЦУНАМІ!

Заходні бераг...

Некалькі тысячаў ахвяраў... канчатковая лічба загінулых пакуль невядомая...

Некалькі мільёнаў даляраў!..

Напярэдадні курортнага сэзону!!.

Дзясяткі паселішчаў зьнішчаныя стыхіяй...

Органы МНС...

Кіраўнікі... тэрмінова вылецелі ў раён катастрофы...

Будзе арганізаваная дапамога сем’ям пацярпелых...

Па факце ўзбуджаная...»

– Ай-яй-яй! Куды ж коціцца гэты сьвет, – Пал Палыч зморшчыў лоб.

Сапраўды, наколькі бездапаможны часам чалавек перад сіламі прыроды, трэска ў параўнаньні са стыхіяй.

Але ранак! Ранак!!!

На хвіліну ён адарваўся ад газэты. Быццам бы пра нешта задумаўся. Вочы глядзелі кудысьці далё-

ка-далёка. Думкі, ізноўку думкі. Як вас шмат у гэтым жыцьці!

Праз хвіліну чалавек спахапіўся, зірнуў на гадзіньнік. Адным глытком дапіў напалову выстылую каву, загасіў цыгарэту. Узьняўся з крэсла, расплаціўся з афіцыянтам, і, згарнуўшы газэту зь цьвёрдым намерам дачытаць пазьней, перайшоў праз дарогу і зьнік у людзях, вітрынах і самаходах.

Літаратурна-мастацкае выданне

Другі фронт мастацтваў

**ТАЛСТОЎ АЛЯКСЕЙ СЯРГЕЕВІЧ**

# БЕГ

Раман

Адказны за выпуск Уладзімір Гніламёдаў
Рэдактар Ілля Сін
Дызайн вокладкі Сяргей Ждановіч
Вёрстка Сяргей Кандраценка
Карэктар Марына Салавей
Аўтар фотаздымка Сяргей Ждановіч

На вокладцы выкарыстаная карціна
Алеся Некрашэвіча «Лабірынт».

Інфармацыйная падтрымка галерэі «Подземка»
(podzemka.org)

Падпісана да друку 18.08.2008. Фармат 84×108 1/32.
Папера афсетная. Гарнітура «Скулбук». Друк афсетны.
Ум. друк. арк. . Ул.-выд. арк. . Наклад 300 асоб.
Замова №

Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Галіяфы».
ЛИ № 02330/0150300 ад 08.04.2008 г.
Вул. Брылеўская, 11–44, 220039, г. Мінск.
E-mail: vish@bk.ru
www.goliafy.com

Паліграфічнае выкананне:
Сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Медисонт».
ЛП № 02330/0056748 ад 22.01.2004 г.
Вул. Ціміразева, 9, 220004, г. Мінск.

Кніжная серыя “Другі фронт мастацтваў” заснаваная ў 2000 годзе суполкай радыкальных літаратараў “SCHMERZWERK”.

**За 8 гадоў выйшлі кнігі аўтараў:**
Альгерда Бахарэвіча, Юрася Барысевіча,
Адама Глобуса, Вальжыны Морт, Алеся Бычкоўскага,
Сяргея Кавалёва, Змітра Вішнёва, Іллі Сіна,
Вікі Трэнас, Вольгі Гапеевай, Валянціна Акудовіча,
Віктара Жыбуля, Джэцці (Веры Бурлак),
Пятро Васючэнкі, Міхася Башуры, Ірыны Шаўляковай,
Уладзіміра Боські, Ганны Кісліцынай, Людкі Сільновай,
Сэмюэля Бэкета (пераклад Віталя Воранава), Андрэя Бурсава,
Андрэя Хадановіча, Леры Сом, Усевалада Гарачкі,
Дзяніса Хвастоўскага, Андруся Белавокага, Змітра Пляна,
Таццяны Нілавай, Аляксея Чубата.

**Выдавецтва “Галіяфы” рыхтуе да друку (2008 — 2009) наступныя выданні.**

**Серыя “Другі фронт мастацтваў”:**

– **Валянцін Акудовіч.** “Дыялогі з Акудовічам”. Размовы, дыскусіі, рэфлексіі і палемікі;
– **Аляксей Талстоў.** “Мінакі”. Раман;
– **Пятро Васючэнка.** “Ад тэксту да хранатопа”. Артыкулы, эсэ, пятрогліфы;
– **Мікола Касцюкевіч.** “Колеры”. Паэзія і проза;
– **Юрась Пацюпа.** “Зялёны яблык”. Тэксты, інтэрпрэтацыі, каментары;
– **Зміцер Плян.** “Фрагмэнты закаханага”. Паэзія;
– **Алесь Туровіч.** “АКТ”. Маніфесты, артыкулы, эсэ, даклады;
– **Ілля Сін.** “Тэатральныя дэманы”. Кніга трансгрэсіўнай прозы;
– **Ілля Сін.** “Ці баліць папяроваму чалавечку?”;
– **Міхась Башура.** “Стойкі алавяны ваяка”. Вершы і проза;
– **Зміцер Вішнёў.** “Замак пабудаваны з крапівы”. Проза;
– **Юрась Барысевіч.** “Ілюмінацыі”. Афарызмы і мініяцюры;
– **Юрась Барысевіч.** “Шэрае сонца”. Доследы літаратурна-мастацкага андэграўнду;
– **Віка Трэнас.** “Лабірынт”. Крытыка;
– **Вольга Гапеева.** “Непараўнальная лінгвістыка. Асновы”. Проза;
– **Інэса Кур’ян.** “Бэзавы бамжак”. Раман;

– **Ірына Шаўлякова.** “Сапраўдныя хронікі Поўні”. Артыкулы, эсэ;
– **Міхась Южык.** “Баль на канаце”. Крытыка.
– **Віктар Ываноў.** “Асарці”. Проза, п’есы, паэзія;
– **Анка Упала.** “Каворная сьвішнасьць”. Казкі для дарослых;
– **Віктар Жыбуль.** “Стапэліі”. Вершы;
– **Віктар Жыбуль.** “Дзяцел і дупло”. Вершы;
– **Вера Бурлак.** “Дзеці і здані”. Вершы, апавяданні, п’ескі;
– **Андрэй Федарэнка.** “Сечка”. Эсэ;
– **Уладзімір Гніламёдаў.** “Паэзія: набыткі і тэндэнцыі”. Навуковыя даследаванні;
– **Сяргей Кавалёў.** “Пачвара ў рэліктавым лесе”. Крытыка.

**Серыя “Адсутнае беларускае мастацтва”:**

– **Алесь Родзін.** Каталог рэпрадукцый;
– **Пятро Васілеўскі.** “Рэтраперспектыва”. Артыкулы, эсэ;
– **Віктар Жыбуль.** “Жыцьцяпіс беларускага футурыста”. Дакумэнтальны нарыс пра Паўлюка Шукайлу.

**Серыя “Калекцыя беларускай фантастыкі”:**

– **Серж Мінскевіч.** “Сад замкнёных гор”. Квазіфэнтэзі;
– **Алесь Бычкоўскі.** “Анамалія”. Фэнтэзі.

**Серыя “Партрэты польскай літаратуры”:**

– **“Вертыкальны трыпціх”:** Польская авангардная паэзія (пераклад І. Кур’ян).

**Дзіцячая серыя “Сланечнікі”:**

– **Алан Аляксандр Мілн.** “Файны Пуф і ўсе, хто з ім” (пераклад з англійскай І. Кур’ян);
– **Алан Аляксандр Мілн.** “Паветка на Пуфавым узлеску” (пераклад з англійскай І. Кур’ян).